Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

**М.А.Бяспалая**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЭКАНАМІЧНАЕ І САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў ГАДЫ НЭПА (1921–1927)

Мінск 2009

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Б 99

**Рэцэнзенты**

*А.М.Люты,* доктар гістарычных навук, прафесар;
*У.І.Навіцкі,* доктар гістарычных навук, прафесар

**Рэкамендавана да выдання** навуковым саветам Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

**Бяспалая, М.А.**
Б 99 Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921–1927) / М.А.Бяспалая. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 325 с.
ISBN 978-985-6798-72-9.

На падставе шматлікіх архіўных дакументаў разглядаюцца праблемы эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця беларускай вёскі ў гады нэпа, кірункі дзяржаўнай палітыкі ў 1921–1927 гг. (падатковай, зямельнай, культурнай) і стаўленне сялянства да іх. Раскрываецца сацыяльна-псіхалагічная сітуацыя ў беларускай вёсцы вызначанага перыяду.
Разлічана на выкладчыкаў гісторыі, аспірантаў, студэнтаў.

ББК 63.3(4Беи)

ISBN 978-985-6798-72-9 © М.А.Бяспалая, 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Сацыяльна-эканамічны і культурны стан вёскі, безумоўна, аказвае моцны ўплыў на развіццё ўсяго грамадства. Ва ўсе часы і ў розных народаў вёска – гэта складаны сацыяльны арганізм са сваімі праблемамі, многія з якіх існавалі на працягу стагоддзяў. Вёска – гэта і своеасаблівае духоўнае асяроддзе са шматвяковымі сямейна-бытавымі, культурнымі, этычнымі і эстэтычнымі традыцыямі. Спроба ігнараваць значэнне вёскі ў агульнадзяржаўных працэсах не садзейнічае прагрэсу грамадства. Яшчэ ў V ст. да н.э. грэчаскі вучоны Ксенафонт пісаў, што толькі тая краіна квітнее, у якой добра ідуць справы ў сельскай гаспадарцы.

Даследаванні па гісторыі вёскі, у тым ліку фундаментальная праца “Гісторыя сялянства Беларусі”, сведчаць аб шматлікіх спробах рэформаў сельскай гаспадаркі на працягу стагоддзяў. У гэтым плане перыяд 1921–1927 гг. дае рэдкую магчымасць даследавання суадносін і суіснавання старога і новага: у эканоміцы – традыцыйнай сялянскай гаспадаркі і дзяржаўнай новай эканамічнай палітыкі; у культуры – шматвяковай вясковай культуры і афіцыйнага палітычнага асветніцтва; у палітыцы – пэўнай варыятыўнасці ў падыходзе да рашэння праблем унутранай палітыкі і ўзрастання кіруючай ролі Камуністычнай партыі; у сацыяльным плане – спрадвечнага ўкладу жыцця і ўнутрывясковых адносін і новага падзелу вёскі па класавым прынцыпе. Адзначаныя ўзаемасувязі даволі выразна адлюстроўваюць працэсы, якія адбываліся ў вёсцы ў вызначаны перыяд.

Неабходна падкрэсліць, што гісторыя беларускай вёскі 1920-х гг. не засталася па-за ўвагай навукоўцаў. Распрацоўваліся фонды былога партархіва пры ЦК КП(б)Б, уводзіліся ў навуковы абарот шматлікія дакументы, пераважна афіцыйныя, аналіз якіх ствараў уражанне іх выключнага значэння ў развіцці савецкага грамадства. Манаграфіі, дысертацыі, артыкулы фарміравалі аднамернае гістарычнае ўяўленне без адваротнай сувязі. У іх народ – аб’ект уздзеяння дзяржаўнай палітыкі – паўставаў як сялянская ці пралетарская маса, што амаль аднадушна ўхваляла палітыку партыі і ўрада.

За апошняе дзесяцігоддзе пераасэнсаваны многія старонкі беларускай гісторыі, у тым ліку і перыяд нэпа. Як і раней,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новай эканамічнай палітыцы надаецца значэнне вырашальнага фактару ў развіцці савецкага грамадства 1920-х гг. Разам з тым узгадваюцца некаторыя негатыўныя моманты і ўзнімаюцца дыскусійныя пытанні. Нам падаецца, што дасягненні беларускай гістарыяграфіі і новыя метадалагічныя падыходы дазваляюць удакладніць ролю нэпа ў эканамічным жыцці рэспублікі і канкрэтна вёскі. З мэтай аб'ектыўнага ўяўлення аб месцы нэпа ў развіцці сельскай гаспадаркі патрэбна больш глыбока і дакладна карыстацца працамі вучоных-аграрнікаў 1920–30-х гг., уводзіць у навуковы абарот новыя дакументальныя крыніцы.

Такая ж неабходнасць існуе і ў даследаванні зямельнай палітыкі дзяржавы. На наш погляд, не можа быць прыняты ранейшы пункт гледжання на аграрную праблему і афіцыйныя спробы яе вырашэння як на адзіна магчымыя. Аўтар пагаджаецца з думкай, што «марксісцкая тэорыя ... упарта арыентавала практыку грамадскага развіцця на ўкараненне сацыялістычнай аднаўкладнасці. У аграрнай палітыцы гэта азначала ліквідацыю не толькі былой буйной таварнай вытворчасці, але і дробнай. Замена іх новым, грамадскім. Тым самым былі падведзены "навуковыя асновы пад негатыўную ролю прыватнаўласніцкага гаспадарання" [493, с. 220]. Апошнім часам з'явіліся цікавыя працы, аўтары якіх аналізуюць праблемы развіцця розных відаў кааперацыі. Некаторыя даследчыкі звярнулі ўвагу на адносіны сялянства да планаў вытворчай кааперацыі і прыйшлі да высновы, якой падтрымліваецца і аўтар, што для сялянства галоўнай каштоўнасцю з'яўляўся зямельны надзел, дзе пажадана выкарыстоўваць "толькі тыя формы гаспадарання, што даказалі сваю перавагу ў рэальным жыцці" [533, с. 182–183]. Таму мы паставілі задачу больш дэталёва прааналізаваць адносіны сялян да дзяржаўнай зямельнай палітыкі.

Глыбокага вывучэння патрабуе праблема ўкаранення эканамічнай палітыкі ў вёсцы. Шматлікія архіўныя дакументы дазваляюць досыць пераканаўча адлюстраваць метады ціску, сілавога рашэння, прыніжэння чалавечай годнасці, якімі карысталіся афіцыйныя органы пры выкананні дзяржаўных планаў. Таму, на наш погляд, дзеянні савецкай улады адносна сялянства падчас калектывізацыі не з'яўляліся выпадковымі, яны працягвалі і ўдасканальвалі метады 1920-х гг. з іх ухіламі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

на “насілле і выкарыстанне люмпенізіраванай масы” [493, с. 220]. Нам падаецца, што разгляд сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы з пазіцыі вяскоўцаў узбагаціць гуманістычны змест даследавання.

Культурнае развіццё вёскі гісторыкамі савецкага перыяду вывучалася па традыцыйнай схеме. У адпаведнасці з ёй падрабязна аналізаваліся партыйная палітыка ў галіне культуры і яе ўкараненне ў грамадстве. Сёння без змен засталіся і кірункі, па якіх разглядаецца культурнае жыццё гэтага перыяду: ліквідацыя непісьменнасці, беларусізацыя, тэатральнае мастацтва і, у апошнюю чаргу, палітыка-асветніцкая работа. Аднак за вялікай колькасцю лічбаў і цытаваных партыйных дакументаў амаль не заўважаецца складанасць унутрывясковай культурнай сітуацыі. Па-за ўвагай навукоўцаў засталася такая важная праблема, як успрыманне насельніцтвам афіцыйнай культуры. Асаблівае значэнне яна мела для беларускай вёскі. Як вядома, гістарычныя абставіны склаліся так, што вясковае асяроддзе заставалася адзіным творцам, носьбітам і захавальнікам традыцыйнай народнай культуры. Нельга не заўважыць і такую аб’ектыўную акалічнасць, якая характарызуе ўнутраны стан беларускай вёскі, як слабае пранікненне ў яе асяроддзе маладой нацыянальнай культуры. Не хапіла часу і сіл, каб яна змагла замацавацца ў вёсцы. Таму савецкая культура адчувала сябе тут досыць свабодна, што стала адной з умоў яе хуткага распаўсюджвання. Па гэтай прычыне працэсы пашырэння новай культуры, яе суадносіны з вясковай, успрыманне сялянствам павінны стаць важнымі кірункамі аналізу культурнага стану вёскі ў 1921–1927 гг.

У 1920-я гг. у культурным жыцці беларускай вёскі адначасова існавалі тры плыні: афіцыйна-палітычная, нацыянальна-дэмакратычная і традыцыйна-народная. І калі другая была цесна звязана з трэцяй і вынікала з яе, то прыхільнікі першай, прызнаючы другую, спрабавалі накіраваць яе ў рэчышча пралетарскай па змесце і нацыянальнай па форме. Што тычыцца народнай культуры, то духоўныя традыцыі сялянства, якія мелі шматвяковыя карані, самабытныя маральныя, этычныя правілы і нормы, – усё, што надае непаўторнасць і адметнасць кожнаму народу, разглядалася як другароднае ў ідэалагічным плане. Некаторыя праявы традыцыйнай культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры атрымалі проста знішчальныя характарыстыкі, асабліва ад камсамольскай моладзі. Напрыклад, свята Купалле вызначалася як "нацыяналістычны шабаш контррэвалюцыі", а Каляды – як "свята буржуазна-кулацкай контррэвалюцыі" [417, с. 108].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі новая культура пачала ўкараняцца ў вясковым асяроддзі ў форме культурнай рэвалюцыі. Галоўнай яе задачай стала пашырэнне ў масах партыйнай ідэалогіі. Пры актыўнай падтрымцы дзяржавы апошняя пачала цясніць спрадвечную народную культуру. Месца вялікадзяржаўнай ідэалагічнай трыяды царызму – праваслаўе, народнасць і самадзяржаўе – занялі новыя савецкія міфы: аб ліквідацыі эксплуатацыі чалавека чалавекам, аб дзяржаве рабочых і сялян, аб выключнай ролі Камуністычнай партыі і інш. У новай прапагандысцкай сістэме і ідэалагічнай праграме нівеліраваліся агульначалавечыя і традыцыйныя маральныя каштоўнасці, якія ствараліся стагоддзямі і на аснове якіх развіваецца нацыянальная культура. Нельга не заўважыць, што палітычнае асветніцтва ўвачавідкі парывала з асветніцкімі традыцыямі славянства, якія грунтаваліся на хрысціянскай філасофіі і маралі і надавалі галоўную каштоўнасць чалавеку незалежна ад яго месца ў грамадстве. У аснову дзейнасці палітасветных устаноў быў пакладзены класавы прынцып. Усе падзеі грамадскага жыцця разглядаліся праз прызму класавых інтарэсаў пралетарыяту, у імя дасягнення якіх можна было ахвяраваць народнымі традыцыямі, хрысціянскімі запаведзямі і нормамі маралі.

Адной з галоўных і першапачатковых задач савецкай улады ў галіне культуры стала распаўсюджванне новай культуры як мага шырэй, каб хутчэй далучыць да яе насельніцтва і ператварыць яго ў культурнае ў тым маштабе, у якім была зацікаўлена дзяржава. Аднак пачынаць давялося пры адсутнасці развітога культурнага асяроддзя, сацыякультурнай сферы, ва ўмовах малапісьменнасці і непісьменнасці і, самае галоўнае, пры адсутнасці кадраў, здольных выканаць сацыяльны заказ дзяржавы. Бясспрэчна, гэтыя акалічнасці адмоўна адбіліся на змесце і рэалізацыі культурных задач, самай важнай з якіх была ліквідацыя агульнай і палітычнай непісьменнасці, і поспехі ў рашэнні апошняй можна лічыць галоўным дасягненнем савецкай улады ў галіне культуры. Аднак трэба пры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаць, вясковае насельніцтва ў сваёй большасці не было далучана да здабыткаў сусветнай культуры, да агульначалавечых каштоўнасцей. Поўны кантроль партыі і дзяржавы над культурай, непамерная яе ідэалагізацыя не садзейнічалі распаўсюджанню нацыянальнай культуры і свядомасці сярод сялянства.

Безумоўна, пры вывучэнні праблем культурнага стану вёскі нельга ігнараваць цесную сувязь культуры з грамадскім жыццём, абыходзіць умовы яе сацыяльнага функцыянавання. Узаемадзеянне і ўзаемапранікненне сацыяльнай і культурнай сфер складаюць адну з важных характарыстык стану духоўнага жыцця грамадства, у нашым выпадку вясковага. Аснову афіцыйнай палітыкі фарміравалі ідэі сацыяльнай роўнасці і справядлівасці, прызнання працоўных самым дастойным класам, негатыўных адносін да буржуазіі і інтэлігенцыі і інш. Яны сталі зместам новай культуры, на аснове якой вялася афіцыйная прапаганда нейкага ідэальнага свету, своеасаблівай сацыяльнай утопіі, скіраванай у будучыню. Людзі прывучаліся да перажыванняў за сусветную рэвалюцыю, за лёс яе змагароў, іх прымушалі да матэрыяльнай падтрымкі шматлікіх грамадскіх арганізацый. Такая прапаганда падмяняла спрадвечныя пачуцці міласэрнасці, суперажывання блізкім людзям, адвучвала ад павагі да бацькоў, сямейных і народных традыцый.

Успрыманне сялянствам дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкі надзвычай складаная праблема, якая ўсё часцей становіцца аб’ектам навуковага даследавання. Неабходна адысці ад стэрэатыпных уяўленняў, што “змены гістарычных умоў выклікаюць (амаль аўтаматычна) і змены ў сацыяльнай псіхалогіі пэўнай супольнасці” [533, с. 181], і прытрымлівацца мудрасці антычных часоў: “In historia non datur saltus” (гісторыя не ведае скачкоў), таму што гісторыю сёння ствараюць пакаленні, якія сфарміраваліся ўчора, і новай можа быць форма, а змест вызначаецца ўяўленнямі гэтых пакаленняў.

Сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё вёскі беларускія гісторыкі даследавалі дастаткова шырока. Аднак галоўным аб’ектам з’яўлялася роля Камуністычнай партыі і яе палітыка ў працэсах эканамічнага, сацыяльнага і культурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця. Падрабязны гістарыяграфічны агляд навуковых прац па гісторыі беларускага сялянства зрабіў У.М.Міхнюк.

Аднак мы лічым неабходным выказаць свой пункт гледжання наконт навуковых прац савецкага перыяду, прысвечаных беларускай вёсцы 20-х гг. XX ст. На наш погляд, шматлікія манаграфіі, дысертацыі і артыкулы аб’ядноўвае адлюстраванне ролі Камуністычнай партыі, камсамола, прафсаюзаў у развіцці асобных старонак вясковага жыцця. Нельга не заўважыць, што пераважная большасць з іх напісана на аснове вялікай колькасці дакументальных матэрыялаў, выканана на высокім прафесійным узроўні і адпавядала метадалагічным і навуковым патрабаванням свайго часу. Разам з тым навуковыя працы папярэдніх гадоў фарміравалі ўяўленне і ўпэўненасць у галоўнай ролі партыі і яе рашэнняў у развіцці вёскі.

Да фундаментальных работ адзначанага кірунку належаць работы Л.І.Валаховіча, К.К.Германа, М.П.Касцюка, Ю.С.Кузняцова, С.Р.Лагуна, Н.І.Лебедзева, У.І.Мартавіцкага, У.І.Навіцкага, Я.К.Новіка, А.М.Сарокіна, М.Я.Шкляра і інш. У такім жа ключы выконваліся даследаванні па культурнай палітыцы. Сведчаннем гэтага можна лічыць манаграфіі і артыкулы Р.Ц.Гарбуновай, А.В.Маскоўкінай, І.В.Каменскай, В.В.Сарокінай, В.В.Сафонавай, П.П.Сілівончыка і інш.

На падставе аналізу навуковай літаратуры савецкага перыяду нам падаецца мажлівым вывад аб магчымасці вылучэння ў асобную групу навуковых даследаванняў 50–60 гг. XX ст., хаця гэта ў асноўным артыкулы. Безумоўна, яны таксама выкананы з пазіцый марксісцка-ленінскай метадалогіі, аднак асобныя бакі вясковага жыцця разглядаюцца без выразнай партыйнай накіраванасці. Гэта артыкулы С.Ф.Драбязкі, А.І.Сідарэнкі, С.Г.Скапцова, М.Е.Стральцова, В.І.Шаўрука і інш. Акрамя сказанага вышэй, іх вызначаюць цікавая тэматыка і багаты факталагічны матэрыял.

У апошняе дзесяцігоддзе пачалі з’яўляцца навуковыя працы, у асноўным артыкулы, у якіх аналізуецца развіццё беларускай вёскі без уліку марксісцка-ленінскай метадалогіі, а з выкарыстаннем прынцыпаў гістарызму і аб’ектыўнасці. Адным з даследчыкаў, С.М.Ходзіным, упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы была зроблена спроба сацыяльна-псіхалагічнага аналізу настрою вёскі ў адносінах да палітыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектывізацыі. З’явіліся цікавыя артыкулы Я.І.Мікулы, М.М.Пархімовіча, А.І.Хоцінай і іншых, у якіх крытычна пераасэнсоўваюцца асобныя пытанні дзяржаўнай палітыкі ў вёсцы. Апошнім часам з’явілася яшчэ шмат работ, прысвечаных 1920-м гг., але ў асноўным гэта газетныя артыкулы, што аналізуюць праблемы беларусізацыі.

Аўтарам выкарыстаны значная колькасць новых архіўных матэрыялаў, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва РБ, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці і іншых, артыкулы ў тагачасным друку, а таксама шматлікія навуковыя даследаванні. Нам падаецца, што сучасныя дасягненні грамадскіх навук і новыя метадалагічныя падыходы ствараюць мажлівасць пераасэнсавання сацыякультурнага развіцця вясковага грамадства. У плане навуковага даследавання з новых метадалагічных пазіцый перыяд 1921–1927 гг. дае багатыя магчымасці. Не выкарыстаны да нашага часу шматлікі дакументальны матэрыял з’яўляецца важнейшай базай для навуковага аналізу сацыяльна-эканамічных і культурных працэсаў у беларускай вёсцы.

Аўтар зыходзіць з канцэпцыі, што асноўныя кірункі дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкі распрацоўваліся без дакладнага ўліку галоўных эканамічных патрэб і асаблівасцей унутранага жыцця вёскі і таму аказаліся нясумяшчальнымі з эканамічнымі запатрабаваннямі і псіхалагічным настроем яе жыхароў. Архіўныя крыніцы сведчаць, што ў новых сацыяльных умовах сяляне з іх жыццёвымі стэрэатыпамі, сфарміраванымі на аснове шматвяковага ўкладу, супраціўляліся навязаным зверху пераменам. Схільнасць сельскіх жыхароў да звыклых правіл і нормаў, боязь навізны вялі да стрыманага ўспрымання большасцю з іх савецкай эканамічнай і культурнай палітыкі.

Каб даказаць вызначаную канцэпцыю, неабходна пераасэнсаваць устаялыя навуковыя погляды і падыходы да працэсаў, якія развіваліся ў вёсцы 1920-х гг. Таму аўтар спыняе ўвагу на праяўленні новай эканамічнай палітыкі ў вёсцы, асаблівасцях зямельнай рэформы, асноўных кірунках культурнай рэвалюцыі, фарміраванні новай культуры і ўкараненні ідэалагічных міфаў, інфармацыйным забеспячэнні афіцыйнай палітыкі. Акрамя таго, мы палічылі неабходным звярнуць увагу на такія пытанні, як становішча вёскі напя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэдадні нэпа, культурнае асветніцтва і яго перарастанне ў палітыка-асветніцкую дзейнасць, формы і метады палітасветработы. Такім чынам, наша канцэпцыя і яе доказ ствараюць своеасаблівы трохкутнік вывучаемых праблем: эканамічных, сацыяльных, культурных. Іх узаемадзеянне і ўзаемапранікненне вызначаюць працэсы, якія адбываліся ў вясковым асяроддзі, яны і сталі прадметам нашага вывучэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Глава 1
# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЁСКІ

## 1.1. Падатковая палітыка ў вёсцы як галоўны кірунак нэпа

Да праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі ў 1920-я гг. навукоўцы звярталіся даволі часта. Аднак, як адзначалася вышэй, яна разглядалася праз прызму партыйных пастаноў і масавага энтузіязму пры іх выкананні. Аўтар прапануе свой падыход да вызначанай праблемы – аналіз яе з пункту гледжання жыхароў вёскі. Акрамя таго, з шырокага спектра пытанняў, звязаных з сацыяльна-эканамічнай праблематыкай, у якасці прыярытэтных кірункаў мы выдзяляем падатковую і зямельную палітыку дзяржавы. На думку аўтара, менавіта яны аказвалі рашаючае ўздзеянне на перспектывы эканамічнага развіцця вёскі і сацыяльна-псіхалагічны настрой сялянства.

Трэба адзначыць, што за шэсць гадоў амаль бесперапынных баявых дзеянняў сельская гаспадарка Беларусі была адкінута далёка назад нават ад узроўню 1914 г. У тэлеграме А.Р.Чарвякова на імя камісара харчавання РСФСР паведамлялася, што “пасяўная плошча скарацілася больш чым на 50%... Многае з узятага палякамі, балахоўцамі ўліку не паддаецца, узятае без уліку перавышае харчразвёрстку...” [30, 51, л. 38]. Надзвычай сур’ёзнае ўздзеянне на разбурэнне вёскі аказалі апошнія месяцы савецка-польскай вайны, калі лінія фронту часта мянялася. Гэта выклікала адміністрацыйную неразбярыху, садзейнічала масавым рэквізіцыям, якія праводзілі войскі пры адступленні.

Па прычыне частай акупацыі сялянства Цэнтральнай Беларусі (маецца на ўвазе тэрыторыя ў межах другога абвяшчэння) аказалася малазнаёмым з харчразвёрсткай, іншымі мерапрыемствамі савецкай улады. Летам і восенню 1920 г. вяскоўцам упершыню давялося сутыкнуцца з яе шматлікімі распараджэннямі, у значнасці якіх цяжка было зарыентавацца. У адным з дакументаў гаварылася: “… пры тагачасным становішчы на месцах чыніліся анархія, шматуладдзе, валрэўкамы, райхарчкамы, ваенкамы – усе прад’яўлялі свае правы” [35, 183, л. 43 адв.].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля стабілізацыі фронту восенню 1920 г. ужо нішто не перашкаджала ажыццяўленню дзяржаўнай харчовай палітыкі, ці, па-іншаму, харчразвёрсткі. Яе праводзілі органы ваеннага харчовага апарату і Камісарыята харчавання, створанага ў лістападзе 1920 г. на чале з Я.А.Адамайцісам.

Па меры вызвалення Беларусі ад палякаў ствараліся павятовыя харчовыя камітэты. Кіраўніцтва рэспублікі заклікала работнікаў камітэтаў паводзіць сябе так, каб "сяляне не глядзелі на іх як на бандытаў, што забіраюць апошні кусок, а бачылі ў іх пасланцоў улады, якія выконваюць найважнейшыя задачы. Селянін павінен адчуць цвёрдасць, непахіснасць савецкай улады, яе справядлівасць і паслядоўнасць...". Агентам дазвалялася выкарыстоўваць любыя сродкі, каб "атрымаць ад селяніна ўсё, што неабходна. Пры спробе ўкрыцця харчпрадуктаў агент мае права бязлітасна канфіскаваць знойдзенае, а ў выпадку супраціўлення арыштаваць гаспадароў. Асновай работы павінны стаць законнасць і паслядоўнасць" [30, 20, л. 26]. Нам падаецца, што лепшай характарыстыкі развёрсткі – ад кадраў і метадаў выканання пастаўленых задач да раскрыцця сутнасці савецкай палітыкі, чым у цытуемым дакуменце, – не патрабуецца. Наркам Я.А.Адамайціс ставіў пытанне яшчэ больш канкрэтна: "Мы не спынімся ні перад чым, калі сяляне і кулакі адмовяцца здаваць лішкі..." [30, 49, л. 29].

Наогул развёрстка выконвалася "пад моцным узброеным ціскам" [30, 51, л. 38], аднак вельмі марудна. І тады ЦК КП(б)Б і ЦВК прынялі дастаткова цікавую пастанову: "Абавязаць усё сялянства безадкладна выканаць усю развёрстку" [30, 99, л. 25]. Узнікае пытанне, на якой падставе і хто меў права прымусіць хлебароба аддаваць амаль увесь збожжавы запас? У гэтым рашэнні прысутнічаюць толькі палітычны разлік і спроба дасягнуць мэты любымі, нават сілавымі, метадамі. Адны з харчагентаў прызнавалі незадаволенасць сялянства, другія здзіўляліся, чаму "вяскоўцы ніяк не могуць уявіць сабе, што ўсё ўзятае ад іх павінна быць раўнамерна размеркавана паміж усімі як вынік работы ўсіх працоўных... Нельга ўпэўнена сказаць, якая б іншая мера, акрамя абавязковай пастаўкі, магла б прынесці вынік" [30, 49, л. 19 адв.]. Здаецца, прыведзеныя дакументы адлюстроўваюць галоўны прынцып у адносінах савецкай улады да вёскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– прынцып ціску. У такіх умовах не магло быць месца эканамічнаму заахвочванню сялянства.

Адным з метадаў выканання развёрсткі з’яўляліся харчкампаніі ў форме тыднёвікаў, месячнікаў і да т. п. Першы харчтыднёвік адбыўся з 1-га па 8-е верасня 1920 г., заданні якога некаторымі паветамі былі выкананы поўнасцю. У ліку такіх аказаўся і Мінскі, у якім “сумели исчерпать” 25 тыс. пудоў збожжа і 320 галоў жывёлы [30, 49. л. 20]. У студзені 1921 г. быў аб’яўлены харчмесячнік, падчас якога прадугледжвалася выканаць усю развёрстку. Аднак давялося канстатаваць, што, нягледзячы на выкарыстанне ўсіх сродкаў, 100% развёрсткі выканаць не змаглі. У большасці сялян не было хлеба, некаторыя з іх вымушаны былі аддаваць апошняе, нават насенне, аб чым сведчыла “частае паступленне на ссыпныя пункты адборнага збожжа” [5, 7, л. 48].

Мясцовыя ўлады ў сваіх дзеяннях аказаліся яшчэ больш рашучымі, чым Цэнтр. Напрыклад, Мазырскі раённы камісар сваім загадам аб’яўляў, што “любыя адмовы ад неадкладнага выканання развёрсткі будуць лічыцца непадпарадкаваннем савецкай уладзе і бязлітасна карацца. У выпадку адмовы цэлай вёскі адразу падлягае арышту старшыня сельскага Савета, канфіскоўваецца ў падвоеным памеры развёрстка: прадукты, жывёла, сыравіна; хто адмаўляецца выконваць, арыштоўваць і аддаваць пад суд Ваенна-рэвалюцыйнага трыбунала на прадмет прымянення вышэйшай меры пакарання – расстрэлу” [30, 47, л. 31]. З прадстаўнікоў павятовага камітэта партыі, выканкама і харчкама ствараліся “безапеляцыйныя тройкі” для ўстанаўлення памеру выканання развёрсткі.

Не спрыяла паразуменню паміж вёскай і савецкай уладай рашэнне аб залічэнні ў развёрстку ўзятага палякамі і балахоўцамі, аднак “толькі ў выпадку наяўнасці дакумента ад іх з усімі подпісамі і пячаткамі” [30, 47, л. 59; 30, 17, л. 192]. Праўда, распараджэнне датычылася толькі Мазыршчыны і Случчыны, аднак факт дастаткова паказальны. Заведама разумеючы, што такіх дакументаў у сялян няма і быць не можа, улады зноў дэманстравалі непавагу да вёскі і падкрэслівалі сваю галоўную задачу: у імя не зразумелай для сялян вышэйшай мэты, не спыняючыся ні перад чым, узяць у іх ўсё магчымае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сялянства змагалася з развёрсткай сваімі сродкамі: у мяшкі са збожжам падсыпалі пясок, смецце, падкладвалі каменне. З прычыны такіх фактаў была прынята пастанова, якая папярэджвала, што грамадзяне, заўважаныя ў падобных дзеяннях, будуць разглядацца як ворагі працоўнага люду, а прыёмшчыкі – як асобы, што ім садзейнічаюць. І тыя, і другія падлягалі суду Рэўтрыбунала і маглі прыгаворвацца да расстрэлу. Аднак і такія жорсткія загады не маглі выправіць настрой вёскі. У якасці прыкладу прыводзім вытрымку з тэлеграмы РВС 16-й арміі: “Вёскі Русаковічы, Сергіевічы, Кабылічы Цітвянскай воласці Ігуменскага павета настроены контррэвалюцыйна. 9 лютага выехала камісія для дэталёвага даследавання”. Дакументы сведчаць, што ў Кабылічах было арыштавана 17 жанчын і 4 мужчыны [30, 71, л. 138 адв.]. З Мазыршчыны паведамлялі, што сяляне патрабуюць соль, якой харчкамы не мелі, таму выказвалася думка аб магчымым паўстанні [30, 48, л. 12]. Неспакойна было ў многіх пагранічных валасцях [5, 6, л. 10].

Тым не менш, пераадольваючы глухое супраціўленне хлебаробаў, толькі па Мінскім павеце з 1 кастрычніка 1920 г. па 1 красавіка 1921 г. сабралі 450 тыс. пудоў жыта, 200 тыс. пудоў бульбы, 500 пудоў масла, 220 тыс. яек, 200 пудоў птушкі, 1800 галоў буйной рагатай жывёлы, 7400 авечак, 4400 свіней [30, 49, л. 20]. Бралі не толькі харч, але і лапці, кажухі, мяшкі. Нават існавалі “мяшочная” і “лапцевая” павіннасці [5, 7, л. 25]. У выніку па развёрстцы было спагнана каля 2 614 000 пудоў збожжа [280, с. 67]. Аднак у цэлым план развёрсткі Беларусь не выканала, у сувязі з чым на яе тэрыторыі, згодна дэкрэта СНК РСФСР, не дазваляўся свабодны абмен прадуктаў [50, 9, л. 28].

Падводзячы вынік, зазначым, што за паўгода – з кастрычніка 1920г., калі ў асноўным закончыліся баявыя дзеянні, і да сакавіка 1921г., калі адбыўся X з’езд РКП(б) і было заяўлена аб новай эканамічнай палітыцы, – беларуская вёска блізка сутыкнулася з метадамі савецкай улады, даведалася пра яе галоўныя мэты і задачы. Час аказаўся выключна складаным. Новая ўлада прыдумала такое вялікае мноства розных мерапрыемстваў, што сялянства не магло разабрацца і ўспрыняць большасць з іх. Спрадвечны вясковы ўклад быў растрывожаны непамернай харчразвёрсткай, адсутнасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цяглавай сілы, насення, парадку ў надзяленні зямлёй і г.д. Не спрыялі нармальнаму жыццю вёскі дзейнасць асобных харчагентаў, стварэнне непатрэбных прамежкавых устаноў між дзяржавай і сялянствам, якія нічога не вырашалі, а толькі заклікалі. Вялікім цяжарам на вёску лажылася ўтрыманне за свой кошт чырвонаармейскіх часцей. Дзяржава не мела сілы, каб навесці элементарны парадак у адносінах з вёскай. Адно з галоўных праяўленняў ваеннага камунізму, развёрстка, якраз і адбывалася ў рамках, вызначаных дзяржавай. Кожны, хто рабаваў вёску, прыкрываўся высокімі дзяржаўнымі інтарэсамі і дзяржаўнымі дакументамі.

Безумоўна, падобная сітуацыя выклікала шырокую паўсюдную незадаволенасць сялянства, і савецкая ўлада вымушана была шукаць выйсце з сацыяльнага і эканамічнага крызісу, у якім апынулася краіна вясной 1921 г. Многа напісана аб прыняцці на X з’ездзе РКП(б) новай эканамічнай палітыкі, аб яе асноўных кірунках і задачах. Як вядома, новая эканамічная палітыка ўключала шырокі комплекс мерапрыемстваў. У галіне сельскай гаспадаркі прадугледжвалася замена харчразвёрсткі харчовым падаткам, абвяшчалася свабода выбару формаў землекарыстання, дазваляліся здача зямлі ў арэнду, выкарыстанне наёмнай працы, продаж лішкаў, якія засталіся пасля здачы харчпадатку. Тэарэтычна нэп быў задуманы як сродак выхаду з эканамічнага крызісу, аднак на самай справе гэта было інакш.

Вядома, што галоўным стала замена харчразвёрсткі натуральным падаткам, які раскладаўся не на ўсю вёску, а на кожную асобную гаспадарку. За аснову налічэння харчпадатку браліся дзве прыметы: колькасць ворнай зямлі і едакоў у сям’і і ўраджайнасць, якая ўстанаўлівалася па ўзроўні 1917 г. З улікам ворнай зямлі і едакоў усе гаспадаркі дзяліліся на 7 груп – ад 0,5 дзесяціны на едака да 4 дзесяцін і болей, па ўраджайнасці – на 11 разрадаў. Пры разліку падатку ўзнікала канфліктная сітуацыя, якая свядома стваралася дзяржавай, таму што пры аднолькавай забяспечанасці зямлёй сума падатку залежала ад ураджайнасці. Так, гаспадарка з колькасцю ворнай зямлі ад 1,1 дзесяціны да 1,5 дзесяціны пры ўраджаі 5-га разраду плаціла 2 пуды 30 фунтаў з дзесяціны, а пры ўраджайнасці па 11-м разрадзе – 6 пудоў 10 фунтаў. Устаноўленыя разрады азначалі, што “сярэдняя ўраджайнасць з

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

дзесяціны павінна раўняцца 60 пудоў” [558, с. 111]. Безумоўна, гэтая лічба намнога перавышала рэальную ўраджайнасць. Яшчэ большыя разыходжанні былі ў залежнасці ад забяспечанасці зямлёй. Сяляне з колькасцю зямлі на едака да 0,5 дзесяціны здавалі ад 30 фунтаў да 3 пудоў з дзесяціны, а звыш 3 дзесяцін на едака – ад 7 да 11 пудоў з дзесяціны [502, с. 44].

Такая методыка налічэння падатку дазваляе адзначыць, што, па-першае, падатак бралі з усіх, бедных і багатых; па-другое, падатак быў дыферэнцыраваны; па-трэцяе, памер падатку ў геаметрычнай прагрэсіі залежаў ад эканамічнага ўзроўню гаспадаркі. У выніку атрымоўвалася, што падатковая палітыка садзейнічала не падцягванню бедных гаспадарак да ўзроўню багатых, а наадварот, разарэнню багатых, пераходу іх у ніжэйшую групу. Тым самым дзяржава выбівала глебу з-пад ног у самой сябе.

Харчпадатак быў устаноўлены амаль удвая большы за харчразвёрстку, прыкладна ў 4 432 000 пудоў. Прычым сяляне павінны былі здаваць 13–18 відаў харчавання: збожжа, бульбу, алейныя культуры, яйкі, масла, сена і інш. Пералік вёўся на жытнёвыя адзінкі. Такое павелічэнне тычылася толькі Беларусі. Мабыць, улічваўся кароткі тэрмін развёрсткі на яе тэрыторыі [6, 7, л. 130 адв.; 18, 149, л. 24 адв.]. Аб’ём падаткаў быў устаноўлены вясною, нават яшчэ да заканчэння сяўбы. Не быў прыняты пад увагу недасеў каля 37% яравога кліна восенню 1920 г. Такое нерэальнае планаванне рабілася ў Маскве і адтуль спускалася ва ўсе мясцовасці. Прычым планаваліся не толькі памер падатку, а і тэрміны яго збірання. Устанаўлівалася, што 20% збожжа трэба аддаць да 15 верасня, 40% – да 1 лістапада, астатнія – да 15 снежня; сена адпаведна – да 1 снежня 1921 г., 1 студзеня 1922 г., 15 лютага 1922 г.; бульбу – 15 верасня, 1 кастрычніка 1921 г. і 1 красавіка 1922 г. [30, 82, л. 17].

Мясцовым органам заставалася толькі наладзіць тлумачальную работу сярод сялянства. Яна пачалася адразу пасля X з’езда, аднак нізкі агульнаадукацыйны ўзровень савецкіх работнікаў і вясковых камуністаў не садзейнічаў разуменню значэння нэпа [421, с.10]. Тое ж самае можна сказаць і пра большасць прадстаўнікоў кіруючага апарату. Яны адчувалі недахоп ведаў, што выклікала іх скаванасць і спадзяванні на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўказанні зверху. Улічваючы гэта, ЦБ КП(б)Б на 15 мая 1921 г. прызначыў нараду партыйных агітатараў і прапагандыстаў, гаспадарчых кіруючых работнікаў і сакратароў ячэек, на якой планавалася "зрабіць даклад і правесці дыскусію аб значэнні новай гаспадарчай палітыкі і яе ўмовах" [272, с. 87]. Інструкцыі паступалі сістэматычна. Былі распрацаваны і прысланы тэзісы па нэпе. У параграфе 7 яго ўвядзенне тлумачылася наступным чынам: "Замена развёрсткі з'яўляецца велізарнай уступкай сялянству з боку савецкай улады, уступкай пралетарыяту вясковай гаспадарцы" [15, 218, л. 121].

Пасля агітацыі на аснове такіх тэзісаў, безумоўна, сяляне мелі рацыю з асцярогай аднесціся да новай эканамічнай палітыкі і абвешчанага падатку. Ніякай эканамічнай зацікаўленасці ў новым падатку вясковы люд не выказваў. Не выпадкова на некаторых сялянскіх канферэнцыях аб'яўлялася, што "харчпадатак толькі часовая мера з мэтай агітацыі за пашырэнне пасеву", не верылі, што "развёрсткі больш не будзе", вылучалі ідэю "аб стварэнні сялянскага саюза – абаронцы сялянскіх інтарэсаў" [17, 226, л.15, 22, 28]. Аднак любыя праявы незадаволенасці ўлады адносілі да кулацкай прапаганды.

На збор падатку мабілізоўваліся 120 камуністаў, каля 40 членаў павятовых выканкамаў і 6 адказных партработнікаў – членаў ЦВК (па адным на кожны павет), для разбору скаргаў стваралася Бюро скаргаў. У распараджэнне харчовых органаў выдзяляліся падраздзяленні чырвонаармейцаў, асабліва ў Мазырскім павеце [30, 51, л. 158; 30, 47, л. 300]. 10 ліпеня пачала работу нарада харчкамісараў, загадчыкаў нарыхтоўчых кантор, старшых харчовых інспектараў, якая ставіла задачу азнаямлення з падатковымі інструкцыямі і ўзгаднення дзеянняў. Па паветах былі арганізаваны трохтыднёвыя курсы харчінспектараў, на некаторых з іх, напрыклад у Слуцку, выказвалася заклапочанасць, каб "не атрымалася ў новай палітыцы тое, што атрымалася ў развёрстцы" [30, 82, л. 12]. Здавалася, зроблена ўсё магчымае, аднак ужо першыя крокі ў падрыхтоўцы да збору падатку паказвалі паспешнасць аптымістычнага вываду. Нездарма з Масквы папярэджвалі аб неабходнасці своечасовага стварэння выязных сесій Рэўтрыбунала [30, 51, л.74, 84].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рашэнне аб пераходзе да харчпадатку было прынята ў сакавіку 1921г., аднак толькі 1 чэрвеня ў паветы пайшла тэлеграма аб заканчэнні развёрсткі. У некаторых мясцовасцях, напрыклад на Случчыне, яшчэ не выканалі развёрстку на масла, яйкі, воўну, як адразу пачалі збіраць такія ж прадукты па харчпадатку, таму што "склалася катастрафічнае становішча ў бальніцах і прыютах" [30, 204, л. 1, 3].

Умовы, у якіх пачаўся пераход да новай эканамічнай палітыкі, у Беларусі аказаліся даволі складанымі. Старшыня ЦВК А.Р.Чарвякоў пісаў у Маскву: "Рэсурсы Беларусі вычарпаны, запасы харчавання забяспечаць галодны паёк да 1 ліпеня, тавараабмен зрываецца наплывам машэннікаў і прадстаўнікоў розных арганізацый з усімі неабходнымі дакументамі" [30, 51, л. 59]. Яшчэ больш ускладняла існуючую сітуацыю катастрафічнае становішча воінскіх часцей, якія кватараваліся ў Беларусі. А.Р.Чарвякоў у тэлеграме ад 23 ліпеня 1921 г. на імя У.І.Леніна паведамляў: "Наркамат харчавання Беларусі, на які ўскладзена цяжкая, невыканальная задача забеспячэння часцей Чырвонай Арміі, папярэдзіў аб магчымым катастрафічным стане, калі Цэнтр не акажа дапамогі... Адзіны выхад – нарыхтоўка [харчавання. – *М.Б.*) шляхам тавараабмену – выслаць мануфактуру, сельскагаспадарчыя прылады на рахунак арміі. У гэтым выпадку Наркамат харчавання дае абавязак нарыхтаваць для арміі ў жніўні 30–40 тыс. пудоў хлеба і трохі мяса. У апошнія дні арміі адпушчана харчаванне на 3 дні, і трэба чакаць захопу воінскімі падраздзяленнямі нарыхтоўчых кантор" [30, 51, л. 83]. Выправіць становішча спрабавалі кампаніямі на карысць арміі. Збіралі ўсё, што магло быць карысным: збожжа, сала, бялізну, ручнікі, палатно, грошы і інш. [18, 187, л. 5].

30 ліпеня ЦВК БССР прыняў пастанову аб фарсіраванні падрыхтоўчай работы да збору харчпадатку. Згодна гэтай пастанове валасныя і павятовыя выканкамы да 15 жніўня павінны былі забяспечыць складанне спісаў падаткаплацельшчыкаў, улік аб'ектаў абкладання, вылічэнне сумы падатку з тым, каб кожнаму плацельшчыку аб'явіць, што яму неабходна здаць. За ходам работы наладжваўся пільны кантроль. Многія з тых, хто кантраляваў збор падаткаў, былі людзьмі, вельмі далёкімі ад сельскай гаспадаркі. Напрыклад, адзін з самых актыўных дзеячаў кампаніі, упаўнаважаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЦВК Штэрн, лічыў, што падатак можна будзе сабраць “безболезненно”, таму што ўраджай трэба чакаць да 50 пудоў (!) з дзесяціны [6, 6, л. 84]. Збор падаткаў яшчэ і не пачынаўся, а ў тэлеграме ад 22 ліпеня за подпісам Я.А.Адамайціса ў адрас нізавых харчовых камісій паведамлялася аб арганізацыі спецыяльных выязных харчовых сесій Рэўтрыбунала. Выязная сесія фарміравалася з трох асоб – прадстаўнікоў Рэўтрыбунала, ЦВК і НКХ, кандыдатуры якіх зацвярджаліся ЦБ КП(б)Б, а ў поўным складзе – СНК. Потым выязная сесія рэгістравалася ў Наркамаце юстыцыі як судовы орган. На кожны павет ствараліся па 2 сесіі, якія мелі права суда і следства над неплацельшчыкамі падатку, няправільнымі дзеяннямі валвыканкамаў, сельсаветаў, падатковай інспектуры [30, 205, л. 1, 6, 67].

Як бачна, меры прымаліся надзвычайныя. Таму натуральна, што такая тактыка сустрэла глухое супраціўленне вёскі. Не дапамагалі ні мітынгі, ні лістоўкі, ні агітацыя сродкамі мастацтва, дзяржава павінна была прыслухацца да настрояў вёскі, аднак гэтага не адбылося. Наадварот, палітыка прымусовага рабавання працягвалася. Архіўныя матэрыялы адлюстроўваюць вострае супрацьстаянне вёскі і ўлады і паказваюць, што нэп не стаў панацэяй ад усіх вясковых праблем. Здаецца, наадварот, ён паказаў вясковаму люду, што ў дзяржаўнай палітыцы яго інтарэсы пераважна толькі дэкларуюцца. Вёска цікавіла дзяржаву ў асноўным як адзіна магчымы аб’ект выкачвання сродкаў на розныя патрэбы савецкай улады.

Падатковая кампанія пачалася з вельмі цяжкай справы – складання спісаў падаткаплацельшчыкаў асобна на кожны від падатку. Галоўны цяжар гэтай няпростай задачы ўскладаўся на настаўнікаў, якія пазбягалі яе як маглі. Са свайго боку сяляне аб’явілі тайную вайну спробам паставіць пад кантроль іх гаспадарку: утойвалі колькасць ворыва, жывёлы, нават у масавым парадку пазбаўляліся ад яе, паказвалі большую колькасць едакоў. За несвоечасовае і няправільнае складанне спісаў улады аддавалі пад суд Рэўтрыбунала старшынь сельскіх Саветаў, асобных грамадзян, таму што “такія адносіны да справы перашкаджаюць харчовым органам цвёрда вытрымаць рэвалюцыйную лінію на правядзенне харчпадатку” [30, 204, л. 11, 12, 18]. З кожным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

днём павялічвалася колькасць застрашальных загадаў. Галоўным сродкам пакарання абвяшчалі выязную сесію Рэўтрыбунала.

Частыя нараканні сялян выклікалі ўстаноўленыя зверху разрады ўраджайнасці, якія ў многіх месцах перавышалі фактычную ўраджайнасць па воласці [30, 212, л. 15, 22]. У некаторых валасцях адбываліся розныя прыродныя здарэнні, напрыклад град ці вымачка пасеваў, аднак начальства такую бяду ўлічваць не збіралася. Наадварот, любыя скаргі, просьбы аб змяншэнні падатку прымаліся ў штыкі. Напрыклад, барысаўскі харчкамісар катэгарычна заявіў, што "такія хадайніцтвы ні ў якім выпадку разглядацца не будуць, вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасці як асобы, што перашкаджаюць ходу падатковай кампаніі" [30, 21, л. 13 адв.]. А скаргаў падавалася вялікае мноства, толькі па адной воласці Ігуменскага павета на няправільнае абкладанне падаткам паступіла 465 скаргаў і 489 хадайніцтваў аб паніжэнні ставак падатку з-за стыхійных няшчасцяў [18, 174, л. 13].

Існавалі і тэхнічныя цяжкасці. На месцах адсутнічалі інструкцыі па ўсіх відах падатку і па падрыхтоўцы спісаў па кожнай гаспадарцы на 15 відаў харчавання. Таму вынік гэтай працы аказаўся для ўлады несуцяшальным. 16 жніўня 1921 г. са Слуцка паведамлялі, што "спісы складзены толькі па 4-х валасцях па прычыне масавага ўкрыцця жывёлы і ворыва прыкладна на 35–40%" [30, 204, л. 34]. 20 жніўня 1921 г. на Случчыне адбыліся першыя сесіі Рэўтрыбунала. Разглядаліся справы, па якіх былі вынесены прыгаворы 34 сялянам ад 1 да 3 гадоў зняволення з канфіскацыяй жывёлы [30, 204, л. 32, 52, 70].

Не лепшая сітуацыя склалася ў Ігуменскім павеце. Напрыклад, у Амяльнянскай воласці, якая аб'ядноўвала 180 населеных пунктаў, на 10 жніўня нічога не было зроблена, спісы не складзены, "адсутнічала ўсякае ўяўленне аб харчпадатку. У некаторых валасцях скрытае ворыва складала 30%, у другіх – нават 50%" [30, 213, л. 13, 23]. Старшыня Дукорскага сельскага Савета адмовіўся падаць спісы скрытага ворыва. Тое ж самае адбывалася і ў Перажырскай воласці [53,1, л.1; 53, 2, л. 2]. У Барысаўскім павеце ні па адной з 26 валасцей на 20 жніўня канчатковыя спісы не былі падрыхтаваны, у асобных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валасцях яны былі зроблены неахайна, алоўкам, без роспісу гаспадароў. “Гэта не спісы, а хлам”, – ахарактарызаваў іх адзін з правяраючых [30, 210, л. 26а].

Ва ўсіх паветах аб’яўляліся розныя тэрміны добраахвотнай заяўкі скрытага ворыва: 5 дзён, тыдзень, два тыдні... Аднак станоўчых вынікаў ад гэтага практычна не было, і тады работу ў дадзеным кірунку пачалі праверачныя камісіі і выязныя сесіі. Самыя строгія меры пакарання: канфіскацыя жывёлы, турма – устанаўліваліся за скрытае ворыва. Толькі па адной Якшыцкай воласці Ігуменскага павета за гэта было асуджана 108 чалавек да розных відаў пакарання: канфіскацыі жывёлы, зямлі, турэмнага зняволення, налажэння штрафу [30, 213, л. 95]. Устанавіць агульную колькасць рэпрэсіраваных складана. У фондзе Наркамата харчавання Нацыянальнага архіва РБ захоўваецца многа справаздач аб дзейнасці Рэўтрыбунала. Аднак адсутнічае адзіная методыка падлікаў: у адных прыводзяцца даныя за тыдзень, у другіх – за дэкаду, у трэціх – за месяц і г.д. 2 лістапада 1921 г. ЦВК БССР быў вымушаны прыняць спецыяльную пастанову, якой абавязваў Наркамат харчавання распрацаваць тэрміновыя меры для выяўлення скрытайворнай зямлі.

З 21 жніўня прыступілі да выканання галоўных відаў падатку. Аб метадах яго спагнання дастаткова ясна гаварыла тэлеграма Я.А.Адамайціса, накіраваная ў гэты ж дзень у нізавыя органы: “...Паставіць усё на баявую нагу, ужываць такія сродкі націску на неплацельшчыкаў, укрывальнікаў, старшынь сельскіх Саветаў і валвыканкамаў, як права судовага і адміністрацыйнага ўздзеяння” [30, 215а, л. 18, 30]. Справа ў тым, што старшыні многіх валвыканкамаў і сельскіх Саветаў разглядалі сітуацыю з пункту гледжання вясковага жыхара, таму не ажыццяўлялі кантроль за складаннем спісаў, закрывалі вочы на ўтойванне ворыва і жывёлы, ды і свае надзелы памяншалі як маглі, пазбягалі ўдзелу ў зборы падатку. Па рэспубліцы шмат старшынь валвыканкамаў і сельсаветаў папалі пад суд Рэўтрыбунала. 2 кастрычніка 1921 г. пад прыгавор Рэўтрыбунала трапілі старшыня і сакратар Махнавіцкага сельсавета Мазырскага павета, якія паказалі толькі 219 дзесяцін, а ў валвыканкаме былі даныя на 1000. Яны былі асуджаны на 1 год і 6 месяцаў умоўна, таму што “грамадзяне сельсавета амаль выканалі падатак, і яны (асуджаныя. – *М.Б.*)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі нізкага ўзроўню развіцця”. А старшыня і сакратар Слабадскога сельсавета таго ж павета былі асуджаны за ўтойванне 85 галоў жывёлы, 8 свіней, 18 авечак на два і паўтара года адпаведна [30, 205, л. 62].

Некаторыя ўпаўнаважаныя дэманстравалі і дастаткова беспрэцэдэнтныя погляды на вёску і яе жыхароў. “Я ім (праверачным камісіям. – *М.Б.*) катэгарычна ўказаў, – пісаў адзін з упаўнаважаных па Мазырскім павеце, – знайсці скрытае, аднак ні ў якім выпадку не абараняць інтарэсы плацельшчыкаў. Апошнія заўсёды будуць у даўгу перад дзяржаваю” [30, 210, л. 34, 34 адв.].

Такое ўяўленне аб ролі і месцы сялянства ў жыцці грамадства існавала ў кіруючых колах паўсюдна. Савецкая ўлада аказалася далёкай ад інтарэсаў вёскі. Інакш, чым можна апраўдаць сцвярджэнні аб вечным даўгу сялянства перад тымі, хто жыў і карміўся з яго працы. Мабыць, у гэтай тонкай маральнай сферы, у прыкрай непавазе да працы вяскоўцаў хаваецца большасць праблем, з якімі савецкая ўлада справіцца не змагла. У адносінах з вёскай быў захаваны метад каманды, сілавога ціску, аб чым сведчаць шматлікія дакументы. Вось тэлеграма ад 19 верасня 1921 г. ужо згаданага Штэрна ў адрас Мазырскага выканкама: “Апошнія зводкі паказваюць прыметнае зніжэнне збору падатку. Бульбяны і насенны падатак зусім не паступае, нягледзячы на неаднаразовыя ўказанні сабраць да 1-га кастрычніка 85% бульбы, 100% насеннай пазыкі, 15% сена. Канстатую поўную расхлябанасць работ у вашым раёне. Жартаваць у далейшым не намераны... Катэгарычна прадпісваю страсянуць раён. Тэрмінова прапанаваць сельскім Саветам, чаго б гэта ні каштавала, пачаць вываз бульбы... Невыкананне тэрмінаў пацягне бязлітасную перадачу пад суд Рэўтрыбунала” [30, 214, л. 53].

Як ні стараліся ў Беларусі выканаць план, усё роўна не пазбеглі крытыкі на старонках “Праўды” за 7 верасня 1921 г. У адказ надзвычайны ўпаўнаважаны Усерасійскага ЦВК па Беларусі апраўдваўся тым, што 150 вагонаў насення для Паволжа адправілі да 1 верасня. Да гэтага тэрміну паступіла каля 15% падатку, прычым ніякіх тавараў у абмен рэспубліка не атрымала. Работа па спагнанні падатку, па словах асобаўпаўнаважанага, “працякала ў вельмі цяжкіх умовах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеяння шматлікіх банд, тэхнічнай беднасці, вялікага разарэння краю” [30, 51, л. 155].

Нягледзячы на прынятыя меры, падатак у тэрмін не выконваўся, і не толькі ў Беларусі, але і па ўсёй Расійскай Федэрацыі. На снежань 1921г. сабрана было ўдвая менш, чым на той жа час па развёрстцы, паступленне падатку было ў чатыры разы меншым, чым планавалася. Думаецца, што гэтыя паказчыкі можна лічыць яскравым адлюстраваннем незадаволенасці сялянства падаткам. Не выпадкова ва ўсе мясцовыя органы была накіравана тэлеграма за подпісам У.І.Леніна і другіх кіраўнікоў дзяржавы з катэгарычным загадам “закончыць збор хлеба ў снежні 1921 г., арганізаваць націск на вёску ў выглядзе харчовага двухтыднёвіка” [30,123, л. 141].

Двухтыднёвік пачаўся 15 снежня 1921 г., аднак істотных вынікаў не прынёс, нягледзячы на ўсе старанні зацікаўленых органаў. Аб’яўляўся ён і ў студзені, і ў лютым 1922 г. Галоўным сродкам яго выканання зноў былі абраны сілавыя метады. “З 15 снежня пачынаецца двухтыднёвік па харчпадатку. Наркамат харчавання прымае меры, каб паставіць работу на баявую нагу. Усе 100% павінны быць выкананы на працягу двух тыдняў, чаго б гэта ні каштавала. З аднаго боку, мабілізуюцца агітацыйныя сілы, з другога – нам трэба звярнуць увагу на прымусовы апарат Наркамата харчавання. Адзін з важнейшых сродкаў уздзеяння на падаткаплацельшчыкаў – выязныя сесіі” [30, 20, л. 102].

Чым магла абярнуцца тактыка ціску на вёску, паказваюць паведамленні з паветаў. У студзені 1922 г. на пасяджэнні калегіі Ігуменскага харчкама пры абмеркаванні выканання заданняў двухтыднёвіка канстатаваўся той факт, што з-за маламоцнасці многіх сялянскіх гаспадарак, якія б меры да іх ні прымаліся, выканаць падатак будзе немагчыма. Даведаўшыся аб такім рашэнні, Я.А.Адамайціс раіць прыняць больш рашучыя меры, у першую чаргу “падцягнуць інспектарскія кадры, тых, хто бяздзейнічае і лянуецца, аддаваць пад суд, і, наогул, узмацніць работу, інакш да 15-га лютага збор палатку не закончыцца” [30, 450, л. 2,4]. Рашаючая роля адводзілася выязным сесіям, колькасць спраў у якіх пастаянна расла. Сялянства ўпарта ўтойвала пасяўную плошчу, мясцовыя ўлады не падавалі дакладныя статыстычныя даныя, у выніку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падатак не выконваўся. Увесь дзяржаўны апарат і вёска супрацьстаялі адно аднаму, але сіла аказалася ў першага, і гэтая акалічнасць у значнай ступені вызначыла канчатковы вынік.

Як вядома, у межах новай эканамічнай палітыкі прадугледжвалася развіццё прыватнага гандлю. 14 мая 1921 г. быў выдадзены дэкрэт СНК Беларусі аб свабодным абмене. 2 ліпеня Наркамат харчавання выдаў загад, які дазваляў гандляваць толькі пры ўмове абавязковай здачы падаткаў на масла, яйкі, воўну, аб чым сяляне павінны былі мець квітанцыю [30, 52, л. 4]. Па меры развіцця кампаніі і яе нездавальняючага ходу ў якасці адной з мер выкарыстоўвалася закрыццё рынкаў у Мінскім, Мазырскім, Барысаўскім паветах [30, 47, л. 344; 30, 205, л. 20; 30, 214, л. 33].

Не лепшым было становішча з абменам сельскагаспадарчай прадукцыі на прамысловыя тавары. Калі прыбывала хоць якая-небудзь партыя мануфактуры, то яе размяркоўвалі сярод служачых і членаў прафсаюза. Напрыклад, у Мазыры 1000 аршын мануфактуры былі раздадзены служачым нарыхтоўчых кантор і канцылярый. Тое ж самае было і з партыяй абутку. Мясцовае кіраўніцтва палічыла, што “абутак не падыходзіць для сялянскага карыстання па прычыне невялікага памеру і нязначнай колькасці. Атрымае абутак нязначны працэнт, і гэта можа выклікаць у сялян незадавальненне” [30, 82, л. 19; 30, 87, л. 315, 333].

Як бачым, падатковая кампанія 1921 г. аказалася надзвычай складанай справай для ўсіх удзельнікаў. Неспадзявана для кіраўніцтва краіны яна зацягнулася да вясны 1922 г. А ці быў поўнасцю сабраны харчпадатак? Станоўча адказаць на гэтае пытанне немагчыма. Для Беларусі падатак на ўсе віды харчавання планаваўся ў памеры 4 431 539 пудоў жытніх адзінак, у тым ліку па збожжы – у 2 500 000 пудоў. За паўгода падатковай кампаніі сабралі каля 3 млн. пудоў жытніх адзінак. У выніку аказалася, што толькі па збожжы і алейных культурах падатак быў выкананы, а па бульбе, яйках, гародніне, мясе заданне аказалася невыкананым і пераходзіла ў нядоімку [46, 257, л. 36; 558, с. 110–113].

ЦВК БССР пастанавіў спыніць з 1 красавіка 1922 г. збор падатку на ўсе віды харчавання, акрамя мяса, сена, сыравіны. Падставай для гэтага стаў дэкрэт УЦВК РСФСР ад 17 са-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кавіка 1922 г. аб увядзенні з 1 жніўня 1922 г. адзінага натуральнага падатку на сельскагаспадарчыя прадукты. Насельніцтву тлумачылася розніца паміж старым і новым падаткамі. Для сялянства яна заключалася не толькі ў тым, што ў 1921 г. ад кожнай гаспадаркі патрабавалася здаць ад 13 да 18 відаў харчавання. Новы падатак павінен быў здавацца толькі шасцю відамі прадуктаў: збожжам, бульбай, мясам, маслам, алейнымі культурамі і сенам у пераліку на жытнёвыя адзінкі. Галоўнае адрозненне было ў памеры адзінага падатку, які ўлічваў магутнасць гаспадаркі ў цэлым: колькасць ворыва, жывёлы, уключаючы нават авечак. Прычым вызначаўся эквівалент параўнання, напрыклад 8 авечак ці 4 свінні прыраўноўваліся да адной каровы і г.д. Адзін з важных момантаў налічэння падатку – гэта разрад ураджайнасці, які мог цяпер у адрозненне ад 1921 г. вызначацца для сельсаветаў. Улічваліся азімае, яравое, паравое поле, колькасць едакоў, ад атрымаўшых зямельны надзел да немаўлят, адзін чырвонаармеец залічваўся за двух едакоў. Адметнай рысай новага падатку стала прадастаўленне ільгот сем’ям чырвонаармейцаў, інвалідам, беднаце, асобным гаспадарам за ўвядзенне ў севазварот тэхнічных культур. Па рэспубліцы ільготы склалі прыкладна 767 302 жытнёвыя адзінкі, таму ў канчатковым выніку трэба было сабраць 4 039 123 жытнёвыя адзінкі [32, 370, л. 3].

У пастанове УЦВК РСФСР адразу вызначаліся і меры пакарання неакуратных плацельшчыкаў, распрацаваныя вельмі дэталёва. Хто не праяўляў асаблівай упартасці, то падпадаў пад арышт на 7 сутак або яму налічвалася пеня ў памеры пятай часткі падатку. Такое ж пакаранне накладвалася за няякасную прадукцыю. Паказальна, што кіруючыя органы прадугледжвалі магчымасць ухілення ад падатку цэлых вёсак. У гэтым выпадку ўводзіліся на пастой воінскія часці, а падбухторшчыкі асуджаліся да аднаго года зняволення з канфіскацыяй маёмасці, другія – да шасці месяцаў або да выплаты падатку ў падвоеным памеры. Пры ўтойванні аб’ектаў абкладання або павелічэнні колькасці едакоў зачыншчыкі прыгаворваліся да аднаго года з канфіскацыяй маёмасці, астатнія да шасці месяцаў [30, 483, л. 10, 11].

Падрыхтоўка да збірання новага падатку праходзіла па адпрацаванай схеме: спачатку ва ўсіх паветах адбыліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарады старшынь валасных выканкамаў, валасных інспектараў, распаўсюджваліся лістоўкі “Што павінен ведаць селянін аб адзіным натуральным падатку” і “Зварот да сялян наркама Якавенкі”. Затым складаліся спісы на аб’екты абкладання, закончыць якія трэба было да 30 мая. І зноў, як і ў 1921 г., улік праходзіў не вельмі паспяхова, асабліва цяжка ішла справа з перапіскай малочнай жывёлы. Заўважаліся рэзкія адрозненні спісаў бягучага года ад папярэдніх. Па Ігуменскім павеце, напрыклад, было скрыта каля 30% жывёлы, а дзяцей да пяці гадоў прыбаўлена ўдвая [30, 450, л. 17]. Каб навесці парадак, на вёску выязджалі адказныя работнікі розных рангаў. Як адбывалася на месцах карэкціроўка спіса, можна толькі здагадвацца. Сустракаюцца звесткі аб тым, што некаторыя інспектары самачынна арыштоўвалі неплацельшчыкаў [30, 450, л. 40].

Лічым патрэбным зазначыць, што згодна дэкрэта СНК Беларусі з вясны 1922 г. вёска пачала плаціць грашовы першы агульнаграмадзянскі падатак. Яго збіралі фінагенты і фінінспектары, якія падпарадкоўваліся Наркамату фінансаў. Падатак выконваўся вельмі цяжка, таму што сяляне не мелі грошай, а каб іх знайсці, трэба было прадаць апошнія запасы хлеба, цана на які вельмі знізілася. Вось што паведамляў з Эсьманскай воласці Барысаўскага павета адзін з палітработнікаў: “З-за таго, што валвыканкам не накіраваў адпаведнага работніка для тлумачэння сялянству прычыны новага падатку... ён пачаўся хваравіта для насельніцтва... Насельніцтва стала прадаваць збожжа па вельмі нізкіх цэнах... і тым самым дало магчымасць спекулянтам нажыць вялікія барышы... Насельніцтва воласці аказалася не задаволена адсутнасцю дзяржаўных нарыхтоўшчыкаў” [18, 165, л. 9]. Сведчанне сучасніка пацвярджае адсутнасць у вёсцы падчас нэпа нармальных рынкавых адносін, гэта з аднаго боку, з другога – паказвае, як актыўна абіраліся вяскоўцы і як хутка большменш заможная праслойка бяднела і апускалася ў ніжэйшыя слаі, дзякуючы прымусовым мерам пры выкананні падатку.

З 2 лістапада 1922 г. уводзіўся другі агульнаграмадзянскі падатак. Збор яго прайшоў лепш, таму што ён збіраўся пасля заканчэння жніва. 12 лістапада 1922 г. быў уведзены грашовы падворны падатак, які аказаў на сялян “цяжкае ўражанне” [30, 487, л. 52]. У маі – чэрвені 1922 г. натуральны працоўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гужавы падатак замяняўся грашовым. У выніку згодна тагачасным разлікам сярэднестатыстычная сям'я з пяці чалавек, маючая 5 дзесяцін, 2 каровы, з 1 верасня 1922 г. павінна была аддаць на выплату ўсіх відаў падаткаў, і грашовых, і натуральных, да паловы свайго даходу [37, 11, л. 30, 16, 16 адв.]. Грашовыя падаткі ў 1922 г. склалі 21% натуральнага. Безумоўна, такая падатковая палітыка абцяжарвала стан любой гаспадаркі, абмяжоўвала яе развіццё, пазбаўляла перспектывы.

Па прычыне мокрага лета збор хлебнага падатку пачаўся толькі з 5 верасня. Не прайшло і месяца з пачатку кампаніі, як у паветы была накіравана тэлеграма за подпісам Я.А.Адамайціса: "Нягледзячы на вашы абяцанні, да 20-га (верасня. – *М.Б.*) сабрана зусім мала. Зацяжка харчкампаніі ў вашым павеце можа прывесці да правалу. Прапаную перайсці ад слоў да справы, прымяняць самы жорсткі нажым арыштам, судом, адкіньце непатрэбныя ілюзіі самацёку. Пачынайце дзейнічаць сур'ёзна" [30, 534, л. 51].

Шматлікія дакументы досыць пераканаўча сведчаць, як пачалі "дзейнічаць сур'ёзна". Галоўная роля адводзілася харчсесіям, а памеры пакарання былі вызначаны дэкрэтам УЦВК. Толькі па Мінскім павеце за ліпень – жнівень 1922 г. у адміністрацыйным парадку было прыцягнута да адказнасці 180 чалавек, а да суда – 128. У параўнанні з іншымі паветамі на Мазыршчыне найбольш часта канфіскоўвалі жывёлу, да судовай адказнасці былі прыцягнуты 123 вяскоўцы. На Случчыне, наадварот, часцей за ўсё накладваліся штрафы, сяляне вымушаны былі плаціць нават золатам, але многа штрафаў плацілі і збожжам. Насельніцтва пастаянна страшылі рознымі загадамі, напрыклад накшталт таго, што "няспраўным плацельшчыкам літасці не будзе. Каб забяспечыць іск, з таргоў будзе прададзена ўсё, што мае хоць якую-небудзь каштоўнасць" [30, 493, 18 адв.; 30, 505, л. 22; 30, 507, л. 1, 2, 3, 4, 5; 30, 509, л. 24, 31, 32].

Калі пачалі збіраць харчовы падатак, то тут ужо ніхто не мог чакаць літасці: ні ўдава, ні ўчарашні чырвонаармеец, ні тыя, хто пацярпеў ад стыхіі. Звестак аб колькасці і відах рэпрэсій у архівах захавалася мноства, аднак знайсці некалькі аднолькавых лічбаў амаль немагчыма. Мабыць, гэта таму, што Цэнтр патрабаваў звесткі за кожныя 10 дзён, а пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малапісьменнасці выканаўцаў у справаздачах атрымоўваўся значны разнабой. У параўнанні з 1921 г. можна заўважыць вялікую колькасць рэпрэсіраваных сярод харчінспектараў і мясцовых улад. Іх аддавалі пад суд, штрафавалі на карысць галадаючых Паволжа, выносілі вымовы і г.д. [30, 481, л. 32]. Хлебаробаў заключалі ў дом прымусовых работ (допр), штрафавалі, канфіскоўвалі і прадавалі іх маёмасць. У некаторых мястэчках, напрыклад Халопенічах, размясцілі ўзброены пост у 150 штыкоў. Праўда, у сістэме пакарання сяляне змаглі знайсці слабае месца. Справы разбіраліся восенню, і асуджаныя падпадалі пад амністыю да 5-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднак улада хутка зразумела гэтую хітрасць і пачала выносіць прыгаворы без права на амністыю.

У кастрычніку 1922 г. ва ўсе паветы была накіравана тэлеграма за подпісам кіраўнікоў рэспублікі, у якой канстатаваўся слабы ход збору падатку, невыкананне якога асабліва зацягнулася ў Барысаўскім і Бабруйскім паветах, становішча ў Мазыры прызнавалася “злачыннай бяздзейнасцю”. Ад мясцовых улад патрабавалася закончыць збор падатку да 1 лістапада 1922 г. [30, 493, л.62]. У снежні 1922 г. Наркамат харчавання дакладваў аб поўным выкананні натуральнага сельскагаспадарчага падатку. Калі да яго дадаць іншыя падаткі, то атрымаецца прыкладна 5 млн. пудоў. Аднак падатковая кампанія 1922 г. выявіла многія адмоўныя рысы: груваcткасць, нязручнасць захавання, адсутнасць зацікаўленасці сялянства ў развіцці таварна-грашовых адносін. Тагачасныя беларускія эканамісты звярталі ўвагу на гэтую акалічнасць і прапаноўвалі замяніць натуральны падатак грашовым. Ва ўсякім выпадку, на думку навукоўцаў, ён не мог быць большы за папярэдні, інакш у гаспадарках засталося б па 15 пудоў на едака, а гэта, згодна эканамічных разлікаў, ужо галодная норма [378, с. 55].

Своеасаблівым пераходам да грашовых падаткаў наступных гадоў стаў адзіны сельскагаспадарчы падатак, які ўводзіўся ў 1923 г. замест натуральнага, працоўна-гужавога, агульнаграмадзянскага, падворнага грашовых падаткаў і ўсіх мясцовых: за прыпынак вазоў на гандлёвай плошчы, утрыманне пчол, карыстанне лесам і інш. Часткова ён мог выплачвацца прадуктамі, часткова – грашыма, налічваўся ад колькасці ворыва, дарослых членаў сям’і, ураджайнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

VII з’езд КП(б)Б у сакавіку 1923 г. канстатаваў, што “ў бліжэйшы час падаткі на сельскую гаспадарку не могуць быць паменшаны” [272, с. 138]. Здача падатку пачыналася з 1 кастрычніка 1923 г., таму што з гэтай даты пачынаўся першы гаспадарчы год, на які быў распрацаваны бюджэт. Падатак прадугледжвалася выконваць паэтапна: натурай да 1 сакавіка, а грашыма – да 1 кастрычніка 1924 г. У адрозненне ад папярэдніх гадоў улік аб’ектаў абкладання быў перададзены ў валасны выканкам. У выніку кантрольныя лічбы ўліку былі перакрыты, а сама працэдура прайшла “бязбольна” [32, 370, л. 29, 30].

Працэс збору новага падатку мала чым адрозніваўся ад папярэдніх гадоў. Адной з галоўных яго асаблівасцей стала ўстанаўленне для кожнага павета абавязковых суадносін грашовай і натуральнай частак, якія збіраліся адпаведна Наркаматам фінансаў і Наркаматам харчавання. Самы вялікі працэнт грашыма (75%) павінен быў здаць Мінскі павет, самы малы (30%) – Слуцкі, жытніца рэспублікі. І вось тут узнікла супярэчнасць: нарыхтоўчыя органы спачатку прымалі ў разлік 260 руб. за пуд жыта, у Койданаве (мабыць, тут улічвалася прыгранічнае становішча) 230 руб. У гэты ж час на рынку можна было прадаць пуд збожжа за 250–260 рублёў, таму такі расклад падатку сяляне вытрымлівалі. Аднак з канца кастрычніка ў прыёмных пунктах разлікі вяліся ў памеры 350 рублёў за пуд жыта, а прадаць яго селянін мог толькі па старой цане. Безумоўна, земляробу гэта было вельмі нявыгадна. Каб выплаціць грашовую частку, ён губляў 100 рублёў на кожным пудзе падатку. У працэсе збору мяняўся і эквівалент замены жыта аўсом ці ячменем, вядома, не на карысць хлебаробаў [24, 186, л. 72, 89].

Нельга не адзначыць больш-менш спакойнага ходу кампаніі. Мабыць, бакі прыстасаваліся адзін да аднаго, вяскоўцы змірыліся са сваёю цяжкай доляй і бясконцымі абавязкамі на карысць дзяржавы рабочых і сялян, ды і гаспадарчае жыццё патроху наладжвалася. Як сведчаць дакументы, найбольш часта ўлады карысталіся арыштам сялян на 7 сутак за ўкрыццё аб’ектаў абкладання, за пратэрміноўку здачы падатку. Заўважым, што больш суровыя меры пакарання мелі месца на Барысаўшчыне: канфіскацыя маёмасці, турэмнае зняволенне да аднаго года; сустракаліся там і выпадкі асуджэння за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антыпадатковую агітацыю тэрмінам да двух гадоў [30, 902, л. 3, 19; 30, 903, л. 8, 13; 30, 904, л. 16, 17, 19].

Перад пачаткам кампаніі ЦВК і СНК БССР у жніўні 1923 г. пастанавілі зняць з сялян усе нядоімкі па натуральным падатку 1921 г. і часткова 1922 г. (масла і яйкі), даўгі па насенных пазыках за 1921 г. Аднак здача падатку адбывалася не так хутка, як планавалася. Гэтая акалічнасць абмяркоўвалася на розных узроўнях, прымаліся адпаведныя рэзалюцыі. Некаторыя з іх ацэньвалі сітуацыю досыць рэалістычна, другія аддавалі перавагу ідэалагічнаму падыходу да праблемы. У студзені 1924 г. Мінскі павятовы фінаддзел накіраваў пісьмо выканкаму, у якім, з аднаго боку, паказваў аб’ектыўныя цяжкасці: высокія патрабаванні да кандыцыі збожжавых, высокі грашовы эквівалент замены пуда жыта (непараўнальна вышэй за рынкавую цану), што прымушала сялян чакаць ліквідацыі такіх недарэчнасцей. З другога, работнікі фінансавых органаў бачылі прычыну запавольвання здачы падатку ў дзеяннях калег-канкурэнтаў – прадстаўнікоў органаў Наркамата харчавання. Апошні распарадзіўся “не націскаць”, каб нарыхтоўчыя канторы маглі планамерна прымаць збожжа, і рабіў захады да больш актыўнага паступлення натуральнага падатку. На думку аўтараў пісьма, “сялянства, якое прывыкла, каб яго падштурхоўвалі, аслабіла выкананне падатку, і гэта стала асноўным фактарам яго слабага паступлення” [6, 36, л. 226, 226 а].

Пры аналізе прычын такой з’явы ўвага абавязкова надавалася сацыяльнаму стану неплацельшчыкаў. Адназначна адмоўную пазіцыю займалі ўлады ў адносінах да заможных сялян, якіх рэкамендавалася “тэрмінова аддаваць пад суд”. Не выклікала цяжкасцей вызначэнне групы бяднейшых, якія не хадайнічалі аб вызваленні ад падатку, аднак “уздзейнічаць на іх праз суд або іншымі сродкамі не мела сэнсу”. Заставалася група серадняцкіх і бядняцкіх гаспадарак, якія “заразіліся дурацкім прыкладам першых, чагосьці чакаюць, не разумеючы, што могуць паплаціцца маёмасцю ў падвоеным памеры ці турэмным пакараннем да 6 месяцаў”. Прапаноўвалася не чапаць іх колькі дзён пасля суда над першай групай, таму што “аддача іх пад суд можа разбурыць іх гаспадарку” [6, 38, л.7, 8а].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некаторыя сельсаветы стваралі камісіі па абследаванні гаспадарак неплацельшчыкаў, на аснове заключэння якіх вырашаўся лёс апошніх: або аддаць пад суд, або вызваліць ад падатку. У асобных мясцовасцях у якасці ўплаты нядоімкі забіралі курэй, палатно, свіней, лён, прадметы дамашняга ўжытку і інш. [6, 38, л. 7, 8, 9, 10, 16 адв.]. Толькі па Мінскай акрузе 29 тыс. неплацельшчыкаў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, 891 – да судовай. У сваю чаргу ад сялян паступіла 6701 скарга, з іх былі задаволены 4595 [34, 72, л. 11].

У выніку з беларускага сялянства на 1 сакавіка 1924 г. (першы тэрмін здачы) спагналі 11 232 514 пудоў збожжа [558, с. 272], а да 1 кастрычніка (другі тэрмін) яшчэ каля 8 млн. рублёў [20, 6, л. 66]. Разлікі эканамістаў аб аптымальных памерах падатку не былі ўлічаны, наадварот, 5-мільённы рубеж быў перакрыты больш чым удвая. Тым самым вёска расплацілася за стабілізацыю рубля, атрымаўшы ў абмен “таварны голад” 1924 г. Адзінае, што адрознівала падатак 1923/24 г. ад папярэдніх, гэта спагнанне яго часткі грашыма, тым самым ён аказаўся пераходным да чыста грашовых відаў падатку. З гэтай прычыны ў сакавіку 1924 г. спыніў сваю дзейнасць Наркамат харчавання. Падатак 1923/24 г. працягваў развіваць класавы прынцып падатковай палітыкі, што адмоўна адбівалася на перспектыўных сялянскіх гаспадарках. Калі ў 1921 г. падатак плацілі ўсе, у 1922 г. бядняцкія гаспадаркі плацілі прыкладна пудоў пяць, то ў 1923 г. амаль 26 тыс. бядняцкіх гаспадарак у розным аб’ёме вызваляліся ад падатку [24, 186, л. 1]. Аднак сума падатку раскладалася на заможныя і кулацкія гаспадаркі. Пры разліку атрымоўвалася, што з аднаго едака беднаты бралі 0,16 пуда, а з аднаго заможнага – 30,76 пуда, што ў 80 разоў больш, а валавы збор заможных быў толькі ў 25 разоў большы, чым у беднякоў [172, с. 32].

Пасля 1923 г. падатковая палітыка дзяржавы развівалася ў кірунку падаходнага падатку. Сялянства прызвычаілася да савецкай падатковай сістэмы, таму ў 1924–1927 гг. такога супрацьстаяння вёскі і ўлады, як у першыя гады нэпа, не назіралася. Аднак падатак заставаўся вельмі цяжкім абавязкам. Аб важнасці своечасовай здачы падатку сялянам тлумачылі ў лістоўках, на мітынгах і разнастайных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канферэнцыях. На адной з іх у Астрашыцкім Гарадку ў верасні 1924 г. прысутных беспартыйных сялян пераконвалі весці актыўную барацьбу з тымі, хто ўтойвае сапраўдны памер пасяўной плошчы, дэлегатам тлумачылі, што “своечасовае выкананне падатку забяспечыць устойлівасць савецкага рубля, хутчэйшы ўздым прамысловасці і сельскай гаспадаркі” [8, 5, л. 2]. Аб неабходнасці замацавання грашовай рэформы за кошт павелічэння падатку гаварылася і ў афіцыйных дакументах [22, 5, л. 66].

На наш погляд, пытанне аб значэнні сельскагаспадарчага падатку ў адраджэнні прамысловасці, фінансавай сістэмы патрабуе спецыяльнага вывучэння. Без сумнення, роля як натуральнага, так і грашовага падатку велізарная. Аднак займаліся вывучэннем азначанай праблемы вельмі нямногія, у ліку іх М.Е.Стральцоў [502; 503]. Згодна яго высноў, доля непадатковых паступленняў у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты ў 1923/24 гаспадарчым годзе складала 17,6%, у 1924/25 – 25,6% і ў 1925/26 гаспадарчым годзе 36,3% [503, с. 51]. Значыць, можна дапусціць, што астатняя частка бюджэту фарміравалася з падатковых паступленняў, за кошт якіх адбывалася адраджэнне эканомікі.

Да падатку 1924/25 г. пачалі рыхтавацца загадзя, спрабуючы ўлічыць інтарэсы розных бакоў: дзяржавы, прамысловасці, фінансаў. У сувязі з немагчымасцю гарантаваць забеспячэнне горада харчаваннем (у першыя гады нэпа такой гарантыяй з’яўляўся натуральны падатак) перад дзяржавай паўстала задача зацікавіць сялян у продажы хлеба. Яна вырашалася за кошт вёскі. Як інакш можна расцэньваць увядзенне сістэмы абавязковых хлебанарыхтовак, акрамя грашовага падатку, каб забяспечыць горад хлебам і прамысловасць сыравінай, устанаўленне максімальных цэн, “каб не было канкурэнцыі нарыхтоўшчыкаў”? Для Беларусі гэтыя лімітныя цэны вызначаліся вельмі нізкімі, што выклікала незадаволенасць сялян і ў выніку – сабатаж нарыхтоўчай акцыі. Прадугледжвалася закончыць яе да 31 студзеня 1925 г. [51, 5, л. 189], аднак сялянства рэспублікі здолела выканаць толькі 52% ад плана хлебанарыхтовак [558, с. 275].

Звернем увагу і на такую акалічнасць: увядзенне нізкіх лімітных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю непасрэдна суадносілася з дзяржаўнай цэнавай палітыкай на прамысло-

выя тавары. І ў першым, і ў другім выпадку цэны вызначаліся ўладай, што дазваляе карыстацца гэтымі фактамі ў якасці адмоўнай ілюстрацыі да пытання аб ролі нэпа ў аднаўленні эканомікі. Дырэктыўнае ўстанаўленне цэн не толькі на прамысловыя тавары, якія ў асноўным выпускала цэнзавая прамысловасць, але і на прадукцыю прыватных сялянскіх гаспадарак стала адным з галоўных элементаў дзяржаўнай палітыкі, што мела мала агульнага з ідэяй нэпа.

Палітычны разлік прысутнічаў у кожным эканамічным рашэнні, часта насуперак здароваму сэнсу. У жніўні 1924 г. на пасяджэнні ЦК КП(б)Б падкрэслівалася, што ўраджай 1924 г. мала лепшы за ўраджай 1923 г., таму і падатак 1924/25 г. не павінен быць вышэй за папярэдні, аднак, “прымаючы да ўвагі неабходнасць замацавання ажыццяўляемай грашовай рэформы, для Беларусі, пры ўмове крайняй напружанасці сіл, магчыма ўстанавіць 4-ты разрад ураджайнасці” [22, 5, л. 59]. На справе саюзныя органы ўстанавілі разрады ў сярэднім на 1/4 вышэй запланаванага чацвёртага, і ў выніку сялянства Беларусі павінна было выплаціць 14 360 000 рублёў [24, 536, л. 265], што перавышала амаль напалову грашовы падатак 1924 г.

Безумоўна, ён аказаўся празмерна цяжкім для хлебаробаў. Напрыклад, са Шклоўскага раёна, які лічыўся паказальным у Магілёўскай акрузе, паведамлялі, што падатак для сялян непасільны. Цэнтр палічыў магчымым у паказальным раёне павялічыць падатак з 3 руб. 10 кап. на чалавека, як па ўсёй акрузе, да 4 руб. 44 кап. Прычым усе сельсаветы абкладаліся аднолькава, незалежна ад эканамічнага ўзроўню [22, 7, л. 323]. Гэта яшчэ адзін яскравы прыклад адміністрацыйнага падыходу да рашэння жыццёва важнага для селяніна пытання. Дзеянні дзяржаўных органаў зусім не адпавядалі патрабаванням хлебаробаў аб неабходнасці пры абкладанні ўлічваць магутнасць кожнай гаспадаркі [24, 886. л. 291], ці, па-іншаму, ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход да аб’ектаў абкладання.

Таму, на нашу думку, заканамерным было слабае паступленне падатку ў розных раёнах Беларусі. Не давалі вынікаў частая адтэрміноўка, агітацыя праз органы аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КПБ, Галоўпалітасвет. Ускладнялася сітуацыя і тым, што зімой 1925 г. не было снегу і марозу, і калі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раней сялянства падтрымлівала сваю гаспадарку заробкамі па нарыхтоўцы лесу, то цяпер яно аказалася пазбаўленым такой магчымасці і страціла больш за 1 млн. руб. Гэтыя абставіны, а таксама “вялікі падатак у параўнанні з папярэднім годам, нізкія цэны на хлеб і жывёлу вельмі аслабілі вёску” [20, 5, л. 219].

Тым не менш дзяржаўныя інтарэсы патрабавалі своечасовага і дакладнага выканання падатку. У дакуменце Саўнаркама БССР за подпісам Зм.Ф.Прышчэпава як намесніка старшыні СНК раілася акружным выканкамам і фінаддзелам “прыняць найбольш рашучыя і рэальныя меры дзеля выпраўлення дэфектаў, у найбольш слабыя месцы кінуць энергічных работнікаў”. У дакуменце выказана ўпэўненасць, што інтарэсы дзяржавы будуць выконвацца толькі ў выпадку праяўлення “цвёрдай волі і вялікай энергіі” [4, 24, т. 2, л. 51]. Што канкрэтна разумеў наркам земляробства пад апошнімі словамі на падставе працытаванага дакумента, вызначыць цяжка. Хутчэй за ўсё ў вярхах адчувалася глухая незадаволенасць вёскі і памерам падатку, і ўвядзеннем ільгот значнай часткі гаспадарак – бядняцкіх, чырвонаармейскіх і інш. У такіх абставінах выправіць сітуацыю магла толькі рашучасць фінагентаў.

На несправядлівае налічэнне падатку паступала шмат скаргаў, бо некаторыя гаспадаркі вымушаны былі выплачваць да 24% ад прыбытку [76, с. 185]. Напрыклад, каля 60% гаспадарак Зембінскага раёна скардзіліся на няправільнае абкладанне [8, 429, л.221; шмат прашэнняў было пададзена на зніжэнне абкладання па прычыне стыхійных бедстваў, з Мінскай акругі, напрыклад, 500 [55, 72, л.11]. Высокая стаўка падатку вымушала некаторыя сем’і ісці на раздзел гаспадаркі. Гэты працэс па часе супадаў з падзеламі, выкліканымі абрэзкай зямлі і, безумоўна, яшчэ больш ускладняў унутранае жыццё вёскі.

Вышэй звярталася ўвага на больш-менш спакойнае спагнанне падатку, аднак хутчэй за ўсё гэта толькі вонкавае ўражанне. Штогадовае яго павелічэнне пры марудных тэмпах аднаўлення сялянскай гаспадаркі не магло не выклікаць незадаволенасці вяскоўцаў, асабліва заможных. Калі ў 1921–1923 гг. амаль не існавала ільгот бядняцкім гаспадаркам, то іх увядзенне ў 1924–1925 гг. абвастрыла сітуацыю ў вёсцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яшчэ больш. Безумоўна, не было такога гвалтоўнага рабунку, як у першыя гады нэпа, не ўводзіліся на пастой ваенныя часці, аднак шматлікія скаргі сведчаць аб адмоўным стаўленні да падатку большасці хлебаробаў.

Дзяржаўная падатковая палітыка аказалася не зусім дасканалай, магчыма, таму, што не быў выпрацаваны адзіны крытэрый характарыстыкі сацыяльна-эканамічнага стану гаспадарак асобных рэгіёнаў. Паводле высноў тагачасных навукоўцаў, нельга было ўраўноўваць заможныя групы сялянства Самахвалавіцкага ці, напрыклад, Бягомльскага раёна. Серадднякі з першага мелі больш культурныя і багатыя гаспадаркі, чым кулакі з другога, аднак першыя карысталіся ільготамі, а другія плацілі ўсё спаўна [423, с. 11]. У рашэнні праблемы, да якой групы аднесці канкрэтнага вяскоўца, важнейшая роля належала сельскім Саветам. Яны вырашалі яго згодна мясцовым умовам і традыцыям, чым уносілі свой уклад у стварэнне напружанасці на вёсцы.

У 1924–1925 гг. заможныя гаспадары за ўхіленне ад падатку прыцягваліся да суда, штрафаваліся, апісвалася іх маёмасць. У кожным раёне рэпрэсіраваных гаспадарак налічваліся дзесяткі, нават сотні. Напрыклад, у Слуцкім была апісана маёмасць 352 гаспадарак, аштрафавана 340, судовыя справы былі ўзбуджаны супраць 26 гаспадароў. У Глускім канфіскавалі жывёлу ў 56 гаспадарках, у Талачынскім была прададзена маёмасць 15 заможных кулацкіх гаспадарак, па Віцебскай акрузе было 4462 выпадкі прыняцця рэпрэсіўных мер [24, 536, л. 169 адв.].

Падобныя дзеянні ў адносінах да сялянства ў гістарычнай навуцы савецкага часу атрымалі характарыстыку “эканамічнага абмежавання кулака”, або “працэсу выраўноўвання дакалгаснай вёскі”. Такая пазіцыя адпавядала тагачаснаму стану навукі. Новыя дасягненні гістарычнай навукі апошняга дзесяцігоддзя дазваляюць нам разглядаць гэты працэс як разбурэнне вёскі і ў цэлым эканамічнага фундаменту дзяржавы і пагадзіцца з думкай, што “эканамічныя планы з’яўляліся вытворнымі і залежнымі ад практыкі палітычных дзеянняў партыйна-дзяржаўнай улады” [494, с. 58].

З суцэльнай лініі штогадовага нарастання падатку выпадае 1925/26 бюджэтны год, калі падатак аказаўся паменшаным на 43% у параўнанні з папярэднім годам і для Беларусі склаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8 518 500 руб. [24, 872, л. 271]. Ільготы незаможным, культурна-паказальным гаспадаркам, кааператывам, калектывам захоўваліся і ахоплівалі да 30% гаспадарак [502, с. 51]. Затое падаткам абкладаліся не толькі даходы ад асноўных крыніц, але і ад другарадных, ад неземляробчых заняткаў і промыслаў. І, самае галоўнае, уся сума падатку раскладалася на астатніх сялян, якія не падпадалі пад ільготы. У сіле заставаліся і хлебанарыхтоўкі, якія прадугледжвалі закупку 8,3 млн. пудоў збожжа [558, с. 276].

Дзеля таго каб выканаць план, рознымі інстанцыямі прымаліся падрабязныя пастановы. У іх прапаноўвалася "тэрмінова прыступіць да спагнання падатку", выяўляць самых злосных і ўпартых неплацельшчыкаў, у адносінах да якіх "адразу прымаць законныя меры рэпрэсій", выбарчым парадкам праводзіць "вопіс і продаж маёмасці неплацельшчыкаў", падрыхтаваць "абвінаваўчыя матэрыялы на работнікаў сельсаветаў, якія халатна адносяцца да выканання службовых абавязкаў" [24, 872, л. 25].

Афіцыйныя крыніцы сведчаць, што сялянства з задавальненнем успрыняло змяншэнне падатку. Безумоўна, некаторыя спадзяванні на больш рэальную пазіцыю дзяржавы ў падатковай палітыцы маглі быць. Тым не менш весткі з месцаў адлюстроўваюць маруднасць выканання падатку. Напрыклад, з Мазырскай акругі дакладалі: "У 1925 г. падатак выкананы амаль без выкарыстання рэпрэсій. Калі ў 1924/25 г. было 1013 вопісаў маёмасці, 165 продажу, 119 чалавек аддадзены пад суд, то ў 1925/26 г. вопісаў – 576, продажу – 6, пад суд – 6 сялян" [22, 14, л. 81]. З Астрашыцкага Гарадка паведамлялі, што "кампанія праходзіць вельмі туга, давялося прадаць маёмасць шасці гаспадароў". У Чэрвеньскім раёне паступленне падатку адбывалася настолькі дрэнна, што "ў кожны сельсавет накіравалі ўпаўнаважанага" [4, 276, л.38]. Па Віцебскай акрузе кампанія таксама праходзіла слаба, і кіраўніцтва палічыла неабходным аддаць пад суд старшынь сельскіх Саветаў, якія "абыякава аднесліся да кампаніі" [24, 886, л. 63]. Вельмі дрэнна ішлі справы ў Расонскім, Ульскім і Полацкім раёнах, дзе на люты 1926 г. аказалася выканана толькі чвэрць задання. У Багушэўскім раёне Аршанскай акругі ўзнікла пагроза зрыву падатку. Мясцовае кіраўніцтва адну з прычын гэтага бачыла ў "кволым скарыстанні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадугледжаных законам мер прымусовага ўздзеяння". У самых неактыўных вёсках былі праведзены паказальныя суды, пасля якіх нядоімкі былі ліквідаваны [24, 678, л. 11, 12]. Улады настойвалі на рашучых мерах супраць злосных неплацельшчыкаў, якіх "патрабавалася аддаваць пад суд, аб'ездзе ўсіх сельсаветаў і выкарыстанні мер супраць неплацельшчыкаў" [24, 543, л. 354]. У кожнай акрузе некалькі раёнаў аказаліся адстаючымі, і супраць мясцовага сялянства прымаліся законныя меры, якія не абыходзілі і старшынь сельскіх Саветаў [24, 872, л. 39; 894, л. 30].

Затрымка з выкананнем падатку і харчнарыхтовак прывяла да харчовага крызісу. У лютым 1925 г. ЦК КП(б)Б даручыў сакратарыяту ЦК звярнуцца ў Маскву з просьбай аб неабходнасці тэрміновай дапамогі збожжам [22, 5, л. 225]. Дарэчы, з гэтага года пачынаецца завоз хлеба ў рэспубліку: у 1925/26 бюджэтным годзе – 9,5 млн. пудоў, у наступным – 19,9 млн. пудоў [366, с. 14].

Падатковая праблема для вяскоўцаў заставалася важнейшай і ў наступныя гады. Па прызнанні аднаго з членаў ЦВК БССР, кожны год абмяркоўвалася магчымасць памяншэння падатку, які "на самай справе з'яўляецца самым вялікім пытаннем сялянства" [4, 193, л. 222]. На 1926/27 бюджэтны год планавалася спагнаць з вёскі 8 831 700 руб., што на 1% менш, чым у папярэдні. Прадугледжвалася магчымасць значна большых, аж да 66,23% супраць 41,5% у 1925/26 г., адлічэнняў у мясцовы бюджэт. Падатак 1926/27 г., па сутнасці, з'яўляўся падаходным, таму што ён раскладаўся на ўсе галіны гаспадаркі (нават другарадныя) і пабочныя заробкі – пчалярства, лесанарыхтоўкі, кустарныя промыслы і інш. [24, 872, л. 270, 271].

Такі падыход да налічэння падатку прайшоў папярэдняе абмеркаванне. Спецыялісты сельскай гаспадаркі аргументавана пярэчылі абкладанню падаткам па колькасці засеянага, дробнай жывёлы, заробку ад лесанарыхтовак. Яны звярталі ўвагу дзяржаўных органаў на тое, што колькасць пасеваў будзе супярэчыць дзейнасці зямельных органаў, якія заклікаюць сялянства пашыраць засеяныя плошчы і пераходзіць да шматполля [24, 872, л. 83; 4, 886, л. 275].

Больш дэталёва, чым у папярэднія гады, была распрацавана сістэма ільгот. Ад выплаты падатку вызваляліся гаспа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даркі, у якіх даход раўняўся 30 руб. на едака, а калі сям'я складалася з двух чалавек, то 50 руб. на гаспадарку. Поўнасцю вызваляліся 51 перасяленец, частковая скідка вызначалася пацярпелым ад стыхіі і за сяўбу культурных траў на насенне, на 50% атрымоўвалі скідку сем'і ваеннаслужачых і навучэнцаў. У выніку атрымалася, што на 1 снежня 1926 г. зусім не плацілі падатак 183 763 гаспадаркі, часткова – 42 859 гаспадарак, што складала каля 30% ад усёй іх колькасці [33, 23, л. 76, 213]. У найбольш слабых у эканамічных адносінах Полацкай і Барысаўскай акругах ад падатку былі вызвалены 43% гаспадарак [550, с. 142]. Каб аблегчыць сялянству здачу падатку, СНК БССР вылучыў ідэю яго калектыўнай здачы, бо стварыць сетку пунктаў прыёму ў сельскіх Саветах аказалася нерэальным. Аднак сялянства не давярала гэтай форме здачы, а "работнікі сельсаветаў не хацелі браць на сябе такі цяжар і адказнасць" [4, 24, т. 2, л. 67].

Сістэма ільгот не прыводзіла да адпаведнага памяншэння агульнарэспубліканскага падатку. Наадварот, уся сума раскладалася на астатнія гаспадаркі. Заможная частка вёскі выплачвала амаль палову ўсёй сумы – 49,5%, кулацкая – 13%. У сярэднім падатак на заможныя і кулацкія гаспадаркі ў параўнанні з папярэднім годам павялічваўся на 32% [550, с. 142]. Безумоўна, цяжар падатку аказаўся для многіх непасільным, але такую палітыку праводзіла дзяржава, і змагацца з ёю не было сэнсу.

Вельмі паказальнай у гэтым плане з'яўляецца пазіцыя наркама земляробства Зм.Ф.Прышчэпава, якога навукоўцы савецкага часу прымалі за абаронцу кулакоў і хутароў, а сучасныя даследчыкі абвясцілі чалавекам, які бачыў правільны кірунак развіцця сялянскай гаспадаркі ў пашырэнні хутарской сістэмы. Мы пагаджаемся з тым пунктам гледжання, што Зм.Ф.Прышчэпаў быў чалавекам свайго часу, а адзінае, што адрознівала яго ад некаторых іншых кіраўнікоў, – неўспрыманне метадаў дыктату ў адносінах да сялянства [531, с. 14]. Цытуемы ніжэй дакумент яскрава пацвярджае імкненне наркама да эканамічных мер уздзеяння на хлебаробаў. У прадмове да даведніка аб ільготах, якія даюцца бядняцкім і незаможным сялянскім гаспадаркам, ён пісаў: "...На аснове разгорнутага нэпа ў вёсцы (арэнда зямлі, наём рабочай сілы, прыватны гандаль) даць магчымасць развівац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца гаспадарцы кулака. Кулак плаціць вялікі падатак, а грошы гэтыя савецкая ўлада можа выкарыстаць для крэдытавання і ўзмацнення гаспадарак беднякоў і сераднякоў. Мы даём магчымасць наладжваць і паляпшаць гаспадарку кулаку, але сочым, каб ён не ўзяў палітычнае кіраванне на вёсцы” [33, 23, л.136 адв.].

У выніку некаторых абставін, напрыклад выкрыцця ўтоеных аб’ектаў абкладання, у асобных раёнах падатак аказаўся нават вышэйшым за папярэдні. Таму яго спагнанне адбывалася з ужываннем досыць вядомых сялянству метадаў: вопісаў маёмасці, накладання разнастайных штрафаў і г.д. Астрашыцка-Гарадоцкі выканкам, напрыклад, распрацаваў цэлую сістэму ўзаемазамены грашовых і натуральных штрафаў: 16 руб. нядоімкі можна было ліквідаваць, здаўшы жарабя і авечку; 8 руб. – парася і авечку; 7 руб. – здаўшы саламарэзку, 75 руб. – калі аддаў лепшую карову і дзве авечкі, у апошнім выпадку ў залік нядоімкі ішла прымусовая праца на працягу 12 дзён; 48 руб. замянялі два самавары, дзве шафы і насценны гадзіннік і г.д. Толькі на пасяджэнні выканкама 20 студзеня 1927 г. былі накладзены разнастайныя штрафы на 88 сялян [4, 389, л. 20].

Незадаволенасць сялянства падаткам адлюстроўваецца ў значнай колькасці скаргаў. Змест іх самы разнастайны: ад скаргаў на няправільны падлік аб’ектаў абкладання да просьбаў паменшыць падатак за асушэнне і распрацоўку балот [39, 142, л. 5; 143, л.3, 4, 5]. Многія ўстрымліваліся ад выплаты падатку па самых розных прычынах. Напрыклад, сяляне Вяліка-Раеўскага сельсавета Капыльскага раёна скардзіліся на пагранічны атрад, які не плаціць ім грошы каля двух гадоў. Аднак, нягледзячы на гэта, мясцовыя ўлады вырашылі спагнаць падатак поўнасцю, прыцягваючы вінаватых да адказнасці. У Бягомльскім раёне прыдумалі праверыць усіх нядоімшчыкаў падворным абходам і перапісаць маёмасць, затрымаць аплату ў лясгасах і г.д. [24, 1341, л. 30, 47 адв., 48].

Вынікі падатковай кампаніі 1926/27 г. не адлюстраваны ні ў архіўных дакументах, ні ў навуковых работах, відаць, план быў выкананы. Безумоўна, з вялікімі цяжкасцямі праходзіў працэс хлебанарыхтовак, асабліва, калі ўлічыць дрэнны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўраджай 1926 г. Планавалася нарыхтаваць каля 7 млн. пудоў [366, с. 23], а атрымалася толькі 527 тыс. пудоў [281, с. 23].

Падатак на 1927/28 г. павялічваўся і склаў 9 060 000 млн. руб. і 2 500 000 пудоў па хлебанарыхтоўках [401, с. 14; 281, с. 27]. Адначасова ўзрастала і колькасць ільгот, якія распаўсюджваліся на маламоцныя гаспадаркі. Павялічваўся неабкладаемы мінімум: з 30 руб. на адну гаспадарку, як у 1926 г., да 50 руб. Да 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі дадаткова вызваляліся ад падатку яшчэ 10% двароў, звыш 25% вызваленых па закону аб сельскагаспадарчым падатку. З беднаты здымаліся нядоімкі за папярэднія гады, а таксама па займах. У выніку льготамі рознага аб'ёму ў 1927/28 г. карысталіся амаль 40% ад агульнай колькасці гаспадарак [550, с.143].

Для больш-менш эканамічна ўстойлівых гаспадарак падатак узрастаў у 2–3 разы. Як паказваюць даследчыкі, сялянам забараняўся вываз збожжа на рынак, у тых, хто не выконваў гэтага патрабавання, збожжа канфіскоўвалася [299, с. 76; 461, с. 3]. Тым самым улада фактычна пачала карыстацца метадамі харчразвёрсткі. Апынуўшыся перад такой перспектывай, частка серадняцкіх гаспадарак стала ліквідаваць жывёлу [535, с. 4–5]. У той жа час пленумы некаторых сельсаветаў лічылі падатак 1927/28 г. больш правільным за леташні [10, 104, л. 22]. Бедната прымала актыўны ўдзел у правядзенні ўліку аб'ектаў абкладання, выяўляла скрытыя дзесяціны, незаяўленую жывёлу. "Адмоўныя ў маральна-псіхалагічных адносінах вынікі, – канстатуе У.А.Палуян, – мела практыка аддаваць 25% канфіскаванай у кулакоў маёмасці беднаце, што ўзмацняла нездаровыя імкненні ў часткі сялян пажывіцца за кошт іншых і выклікала зацікаўленасць іх у такіх мерах" [398, с. 102]. Такім чынам, дзяржаўная падатковая палітыка працягвала паглыбляць раскол вёскі, павялічваць сацыяльную напружанасць, разбураць перспектыўныя гаспадаркі.

Акрамя ўплаты сельскагаспадарчага падатку, вёска выконвала і іншыя павіннасці. У жніўні 1924 г. уводзілася абавязковае самаабкладанне сялян, праз тры гады яно было ўдасканалена ў бок "прапарцыянальнага размеркавання цяжару самаабкладання сярод сялянства на аснове ўліку іх гаспадарчай самастойнасці" [24, 1184, л. 37, 38]. Пытанні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самаабкладання вырашаліся на агульных сходах вяскоўцаў, якія вызначалі яго суму і мэтавае прызначэнне. Гэтыя сродкі поўнасцю паступалі ў мясцовы бюджэт і павінны былі ісці на гаспадарчыя, культурна-асветніцкія і іншыя патрэбы вёскі. Такім чынам, за кошт усё тых жа заможных гаспадарак савецкая ўлада планавала “разгарнуць работы па добраўпарадкаванні дарог, будаўніцтве мастоў, клубаў, хат-чытальняў, школ і г.д.” [550, с. 144]. Класавая лінія пры самаабкладанні была вытрымана ў тых жа прапорцыях, што і пры спагнанні падатку. Аднак кіраўніцтва, напрыклад Мінскай акругі, лічыла, што “існуючая прагрэсія не здольна падарваць эканамічную базу верхніх слаёў вёскі”. Можна толькі канстатаваць, што сельгаспадатак і самаабкладанне не затрымліваюць тэмпы далейшага гаспадарчага росту верхніх слаёў вёскі. Самаабкладанне як адзін з метадаў уцягнення ў культурна-гаспадарчае будаўніцтва зберажэнняў вёскі, безумоўна, сябе апраўдвала [4, 250, л. 87]. Толькі па сталічнай акрузе сума самаабкладання дасягала больш за 23% ад падатку [4, 250, л. 87 адв.].

Нельга пакінуць па-за ўвагай факт самаабкладання вёскі на карысць некаторых арганізацый, напрыклад камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. За кошт здачы ад 3 да 10 фунтаў збожжа з дзесяціны, а таксама заворвання грамадскіх участкаў у іх фонд паступалі збожжа і грошы, якія камітэты выдавалі бяднейшым. Напрыклад, з 1 кастрычніка 1924 г. па 1 чэрвеня 1925 г. было раздадзена 174 тыс. пудоў збожжа і 18 800 руб. [558, с. 281]. Відавочна, што на ўзроўні вёскі адбывалася прымітыўнае пераразмеркаванне сродкаў, праўда, не ў значных памерах. Аднак у кожным канкрэтным выпадку гэта нервавала сялянства.

Патрэбна спыніцца і на фактах распаўсюджвання разнастайных пазык сярод сялянства. Спасылаючыся на сусветную буржуазію, якая “не выдзеліла крэдыту”, урад знайшоў унутраныя магчымасці, аб’явіўшы аб увядзенні так званай “меднай пазыкі”, 6-працэнтнай залатой, выйгрышнай і інш. У пачатку 1924 г. была выпушчана “сялянская пазыка, аблігацыі якой прымаліся пад уплату падатку” [6, 38, л. 48]. Акрамя гэтага, сярод сялянства распаўсюджваліся 5-працэнтная выйгрышная пазыка, 12-працэнтная выйгрышная пазыка 1925 г. Сялян прымушалі купляць па 2 аблігацыі 6-пра-

цэнтнай залатой пазыкі, праводзіліся кампаніі цукровай пазыкі. Каб актывізаваць іх распаўсюджванне сярод вясковага люду, падключаліся ўстановы Галоўпалітасвета, шэфскія таварыствы, праходзілі пленумы райвыканкамаў, сельсаветаў, сходы беднаты, канферэнцыі настаўнікаў і інш. Рэалізацыя пазыкі ажыццяўлялася праз сельсаветы, лесанарыхтоўчыя арганізацыі, паштальёнаў, настаўнікаў, спецыяльна створаныя тройкі і інш. У сувязі з тым, што пазыка аб'яўлялася справай добраахвотнай, заможныя сяляне вельмі слаба і на малую суму куплялі аблігацыі, на думку кіраўніцтва, толькі для таго, "каб стварыць уражанне, што і яны прымаюць удзел у мерапрыемствах Савецкай дзяржавы" [4, 250 а, л. 87 адв.].

Уводзілася абавязковае дзяржаўнае страхаванне, па якім вызначаліся вельмі высокі першы ўзнос і кароткі тэрмін пагашэння. Затое атрымаць страхоўку можна было, толькі "пераадолеўшы вялікія перашкоды" [8, 311, л. 5]. У некаторых мясцовасцях страхоўку збіралі адпрацаванымі метадамі, карыстаючыся вопісам маёмасці, масавымі наездамі на вёску страхагентаў, каб "побудить к усилению сдачи страховки" [10, 71, л. 36].

Тым не менш выплата абавязковай дзяржаўнай страхоўкі ў некаторых мясцовасцях поўнасцю спынілася [24, 1341, л. 30]. Страхаванне таксама прадугледжвала сістэму ільгот для бядняцкіх гаспадарак, якая ў 1925/26 г. ахапіла больш за 56 тыс. гаспадарак, а ў 1926/27 г. – больш за 135 тыс. [30, 23, л. 182].

Мы не закранаем пытання аб такой праяве нэпа, як арэнда зямлі. Па-першае, яно падрабязна прааналізавана А.М.Сарокіным [460, с. 128–137], па-другое, аўтар пагаджаецца з высновай, што арэнда ў сялянскай гаспадарцы ў 1920-я гг. не атрымала шырокага распаўсюджання [398, с. 55].

Гэтак жа можна ахарактарызаваць і працэс далучэння сялянскай гаспадаркі да рынкавых адносін, таму што дзяржаўная эканамічная палітыка абмяжоўвала іх таварныя магчымасці. У адной з аналітычных тагачасных прац канстатавалася, што "збожжавая рыначная прадукцыя сялянскай гаспадаркі праяўляе тэндэнцыю да скарачэння, прыстасоўваючыся да патрэб унутранага рынку... Сялянская гаспадарка імкнецца не да грашовага, а да матэрыяльна-натуральнага назапашвання" [467, с. 17, 67]. Гісторыкі савецкага часу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама прызнавалі зніжэнне яе таварных магчымасцей, адны – амаль напалову ад даваеннага ўзроўню [566, с. 155], другія – у тры разы [460, с. 6].

Не з'яўляецца важным паказчыкам пранікнення на вёску новых эканамічных адносін і факт выкарыстання ў некаторых гаспадарках наёмнай рабочай сілы. Заўважым, што праблема лішніх рабочых рук на вёсцы ўзнікла ў другой палове XIX ст. і не была вырашана царскім урадам. Пасля рэвалюцыі яна яшчэ больш абвастрылася. Згодна афіцыйных даных, у 1925 г. у летні час не знаходзілі выкарыстання 30% рабочых рук, гэта больш за мільён чалавек [33, 6, л. 10]. Той факт, што па найме працавалі толькі 81,1 тыс. ад гэтай колькасці [399, с. 94], яшчэ больш пацвярджае няздольнасць сельскай гаспадаркі заняць свабодную рабочую сілу.

Дзяржаўная палітыка не магла спрыяць хуткаму ўздыму сялянскай гаспадаркі, стымуляваць яе развіццё. Наадварот, на дзяржаўным узроўні падтрымліваліся дробныя, слабыя гаспадаркі, якія, нягледзячы на разнастайныя ільготы, не здолелі дасягнуць неабходнага эканамічнага ўзроўню. Адначасова адбываўся супрацьлеглы працэс – аслабленне больш-менш заможнай часткі сялянства. У выніку вёска не багацела, а прыметна бяднела. Усе спробы спыніць гэты працэс, прымаючы пад увагу галоўным чынам ідэалагічныя варункі, не маглі прывесці да станоўчых вынікаў. Такую палітыку нельга лічыць разумнай і перспектыўнай, таму што яна не дапамагала ўмацаванню гаспадарак, якія мелі пэўны прагрэс у сваім развіцці і маглі стаць эканамічным фундаментам адраджэння вёскі. У выніку атрымоўвалася, што дзяржава разбурала сваю эканамічную базу, асноўную крыніцу даходаў фінансавання будучых праектаў.

У сувязі са сказаным паўстае пытанне аб значэнні нэпа для беларускай вёскі. Як бачна, на практыцы новая эканамічная палітыка праводзілася ў форме падатковых кампаній, аснову якіх склаў прынцып павелічэння памераў падатку [дадатак, табл. 1.1]. Такая падатковая палітыка, з аднаго боку, абмяжоўвала магчымасці хуткага эканамічнага адраджэння вёскі, а з другога – падрывала веру вясковага люду ў справядлівасць савецкай улады.

На наш погляд, галоўную ролю ў развіцці сельскай гаспадаркі адыграла спрадвечная прага селяніна да зямлі і да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свабоднай, без каманды і прымусу працы на ёй. Аб гэтым жа пісаў і вядомы эканаміст А.В.Чаянаў: “Задачай сялянскай працоўнай гаспадаркі з’яўляецца здабыванне сродкаў існавання для працуючай сям’і шляхам найбольш поўнага і найбольш удасканаленага выкарыстання сродкаў вытворчасці і працоўнай сілы, якія маюцца ў яе распараджэнні, чым і тлумачацца яе выключная выжывальнасць і супраціўленне эканамічным нягодам” [545, с. 36]. Трэба пагадзіцца з думкай вучонага і прызнаць, што менавіта такім імкненнем сялянства перш за ўсё абумоўлена адраджэнне сельскай гаспадаркі.

## 1.2. Праблемы зямельнай рэформы

Стабілізацыя фронту і доўгачаканае заканчэнне ваенных дзеянняў абудзілі ў сялянства новыя надзеі на зямлю, спадзяванні на тое, што ўлады ўрэшце прыступяць да выканання шырокавядомага дэкрэта аб зямлі.

Зямельная рэформа пачалася з выдання Тэзісаў па аграрным пытанні, прынятых ЦК КПЛіБ 24 мая 1920 г., і Інструкцыі аб перадачы нацыяналізаваных зямель былога непрацоўнага землекарыстання калектывам і аднаасобнікам, зацверджанай ЦК партыі 2 чэрвеня 1920 г. У снежні 1920 г. ІІ Усебеларускі з’езд Саветаў прыняў Тэзісы і рэзалюцыю па аграрным пытанні, якія аб’яўлялі аб пераходзе зямлі ў дзяржаўную ўласнасць, аб перадачы яе грамадзянам бясплатна ў бестэрміновае карыстанне і аб забароне куплі і продажу зямлі. Гэтае рашэнне моцна знізіла давер вёскі да новай улады, таму што сяляне даўно выкупілі свае надзелы. Як вядома, у лістападзе 1905 г. былі адменены выкупныя плацяжы, і хлебаробы законна лічылі зямлю сваёй уласнасцю. Савецкая дзяржава пазбавіла іх магчымасці распараджацца сваім багаццем, а разам з тым і адчування ўласнай годнасці і ўпэўненасці, якія набывае селянін праз усведамленне сябе гаспадаром на сваёй зямлі.

З’езд акрэсліў план работы зямельных органаў на зіму 1920/21 г.: улічыць усе землі непрацоўнага і працоўнага карыстання і колькасць працоўнага земляробчага насельніцтва. Трэба заўважыць, што за час Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў і рэвалюцыі зямельныя адносіны аказаліся вельмі заблытанымі. Адсутнічалі зямельныя дакументы, часткова



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывезеныя палякамі, таму вельмі востра адчувалася неабходнасць дакладнага ўліку. Для выканання такіх маштабных планаў патрабаваліся спецыялісты, а іх не хапала. У сувязі з гэтым А.Р.Чарвякоў звярнуўся ў НКЗ РСФСР з просьбай тэрмінова накіраваць спецыялістаў сельскай гаспадаркі – ураджэнцаў Беларусі – у распараджэнне рэспубліканскіх зямельных органаў, таму што Савецкая Беларусь “прыступіла да арганізацыі сельскай гаспадаркі на новых, сацыялістычных прынцыпах...” [35, 176, л. 4].

Свабодная зямля знаходзілася ў былых памешчыцкіх маёнтках, і па распараджэнні Мінскага аддзела земляробства (з 26 жніўня 1920 г. наркамат) яшчэ ў 1919 г. пачаўся іх улік. Спачатку яны былі перададзены рабочым камітэтам маёнткаў, а потым саўгасам, хаця згодна Дэкрэта аб зямлі “памешчыцкія маёнткі, а таксама землі ўдзельныя, манастырскія, царкоўныя з іх жывым і мёртвым інвентаром, сядзібнымі пабудовамі і ўсімі прыналежнасцямі пераходзяць у распараджэнне валасных зямельных камітэтаў і павятовых Саветаў сялянскіх дэпутатаў” [371, с. 19].

На тэрыторыі Беларусі існавалі больш за 500 былых маёнткаў, якія мелі каля 500 тыс. дзесяцін зямлі. Найбольш культурныя ператвараліся ў савецкія гаспадаркі, будучыя “фабрыкі хлеба”, астатнія перадаваліся ў часовае карыстанне калектывам і нават прыватным асобам. У будучым планавалася на 118 тыс. дзесяцін стварыць 188 народных гаспадарак. Што тычыцца надзялення беззямельных і малазямельных сялян, то спачатку прадугледжвалася прырэзка ім зямлі за кошт заможных аднавяскоўцаў. Аднак у 1920 г. было вырашана перадаць “усе маёнткі, акрамя найбольш перспектыўных, у зямельны фонд і менавіта з яго надзяляць зямлёй беднату” [32, 3, л. 78].

Новы перадзел зямлі нечакана аказаўся справай складанай як з матэрыяльна-тэхнічнага боку, так і з псіхалагічнага. Для кожнага рэгіёну вызначалася асобная норма зямлі з улікам яе наяўнасці і колькасці жадаючых яе атрымаць, спісы такіх складалі сельсаветы. Аднак з самага пачатку было відаць, што зямлю цяжка, а іншы раз і немагчыма правільна размеркаваць, таму што надышла вясна, трэба было сеяць, і сяляне захоплівалі ўчасткі без усякай нормы і парадку. Тым больш, што з’явіўся і заклік: “Засеяць усё, чаго б гэта ні каштавала”. Ніяк нельга было абмінуць праблему кадраў. Надзяленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямлёй пачалося без геафізічных планаў мясцовасці сіламі 22 каморнікаў, на якіх прыходзіўся адзін тэадаліт. На канец года колькасць спецыялістаў усяго толькі падвоілася, не на многа павялічылася і колькасць інструментаў [32, 23, л. 119]. Ужо першыя крокі ў надзяленні зямлёй паказалі немагчымасць хуткага вырашэння зямельнай праблемы. Можна канстатаваць, што ў 1921 г. фактычна земленадзяленне не адбылося, таму што зямля размяркоўвалася часова, без дакументаў. Многія не паспелі яе засеяць. Калі ж з гэтых надзелаў пачалі патрабаваць падатак, хлебаробы сталі ад іх адмаўляцца.

ІІІ Усебеларускі з’езд Саветаў (снежань 1921 г.) на 1922 г. паставіў перад зямельнымі органамі задачу закончыць размеркаванне амаль паўмільёна дзесяцін запаснога фонду і больш за 200 тыс. дзесяцін саўгасаў і калгасаў. Аднак планы не былі рэалізаваны зноў жа з-за адсутнасці кадраў і слабасці матэрыяльна-тэхнічнай базы [32, 1235, л. 11, 12, 44; 26, 26, л. 168]. А дапамогі ад дзяржавы чакалі 57,2% ад усёй колькасці гаспадарак, якія мелі ад 1/4 да 3/4 дзесяціны на душу і адносіліся да бядняцкіх [59, с. 25]. Не быў выкананы план надзялення зямлёй і адмежавання калектыўных гаспадарак і ў 1923 г. У пачатку работ выявілася значная колькасць няўлічанай зямлі, і спецыялістаў стала патрабавацца яшчэ больш.

У 1924–1925 гг. праблема земленадзялення значна абвастрылася. Трэба было надзяліць і данадзяліць зямлёю прыкладна 260 тыс. гаспадарак, якія не мелі нават мінімальнай нормы. Прычына была не толькі ў невыкананні распрацаваных планаў, але і ў настроі сялянства, якое напружана назірала за зямельнай палітыкай дзяржавы і чакала зямлі. Зямельны голад не толькі не знік, а наадварот, набіраў сілу па прычыне росту сельскага насельніцтва і дзялення гаспадарак. Нельга не звярнуць увагу на некалькі лічбаў, якія на першы погляд адлюстроўваюць поспехі надзялення зямлёй у савецкі час, аднак калі больш уважліва да іх аднесціся, то іх значэнне аказваецца адваротным. Да 1917 г. сялянам належала каля 42% зямлі (па другіх даных – 47,5%), а ў 1925 г. – 67%, прычым у гэтую лічбу ўключана зямля, якой яшчэ планавалася надзяляць сялянства [10, 362, л. 187].

Да 1924 г. размяркоўвалася ў асноўным зямля былых маёнткаў, а з-за адсутнасці неабходных кадраў працэс земле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надзялення развіваўся досыць марудна і спантанна. Хаця афіцыйна было прызнана, што фонд гэтых зямель выкарыстаны, аднак у некаторых месцах маёнткавыя землі не былі размеркаваны нават у 1925–1926 гг. [10, 2, л. 224]. Сесія ЦВК БССР у 1923 г. пастанавіла пачаць спецыяльныя работы па адшуканні запаснога фонду. Наркамат земляробства распрацаваў план яго стварэння ў памеры 500 тыс. дзесяцін з лясных і дзяржаўных зямель і абрэзкі сялянскіх гаспадарак, прычым апошнія павінны былі скласці, па адных даных, 150 тыс. дзесяцін, па другіх – больш за 200 тыс. [33, 5, л. 35].

Па сваім уздзеянні на псіхалагічны настрой вёскі рашэнне аб абрэзцы мела выключнае значэнне. Яно закранула большменш развітыя гаспадаркі, таму што за іх кошт данадзялялася бядняцкая частка вёскі. Безумоўна, прыняцце падобнага рашэння дыктавалася прынцыпам класавага падыходу, які абсалютна не адпавядаў эканамічным інтарэсам вёскі і самой дзяржавы і абвастрыў унутрывясковую сітуацыю. Неабходна прызнаць, што ўвядзенне абрэзкі давала падставу лічыць яе новай рэформай сялянскага землекарыстання, на якую савецкая ўлада не мела ні маральнага, ні юрыдычнага права. У вёсцы пачынаўся чарговы перадзел зямлі, якую сяляне лічылі сваёй уласнасцю. Трэба дадаць, што многія сяляне купілі зямлю ў гады Першай сусветнай вайны і паслярэвалюцыйнай неразбярыхі і аддаваць яе суседзям не жадалі. Па гэтай прычыне абвастрэнне адносін паміж рознымі сацыяльнымі групамі вёскі было абсалютна заканамерным. Улада пайшла яшчэ далей і рэкамендавала ў кожным раёне стварыць камісіі па абрэзцы напаўпрацоўных гаспадарак, што садзейнічала паглыбленню канфлікту, супрацьпастаўленню розных груп насельніцтва. Новы Зямельны кодэкс БССР, які ўводзіўся ў дзеянне з 1 красавіка 1925 г., дазваляў “абрэзку і праверку гаспадарак, што перавышалі норму, праводзіць і па другіх прычынах, а не толькі з мэтай земленадзялення” [407, с. 133].

Рабоце надаваўся тэрміновы, “баявы характар”, завяршыць яе планавалася праз два гады. Адначасова з прыняццем Зямельнага кодэкса сесія ЦВК БССР дала дазвол на правядзенне абрэзкі напаўпрацоўных гаспадарак, тым самым справа набыла законны характар. Дзяржава адмовілася ад размеркавання зямлі па едаках, таму што “чорны перадзел не будзе мець канца”. Замест гэтага прынцыпу ўстанаўліваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

максімальная і мінімальная нормы, разлічаныя асобна для кожнага сельскагаспадарчага раёна [32, 1731, л. 13]. За норму абрэзкі ўзялі сярэднеарыфметычнае паміж працоўнай (максімальнай) і спажывецкай (мінімальнай) нормамі, і атрымалася, што абрэзцы падлягалі гаспадаркі, якія мелі нямногім больш за 10 дзесяцін зямлі і сенажаці. Аднак зямельнага фонду ўсё роўна не хапала, каб забяспечыць усіх малазямельных, і тады было прынята рашэнне аб надзяленні з разліку ад сярэдняй нормы. Але і ў гэтым выпадку ненадзеленымі засталіся б больш за 115 тыс. гаспадарак [33, 5, л.35 адв.]. Трэба заўважыць, што згодна разлікаў тагачасных эканамістаў мінімальная эканамічна рэнтабельная гаспадарка павінна мець ад 4,6 да 6,35 дзесяціны зямлі. Ні ў якім разе не павінен быў падлягаць драбленню двор памерам ад 9,6 да 13,7 дзесяціны [156, с. 38].

Неабходна адзначыць, што ў кіруючых колах рэспублікі, асабліва ў Наркамаце земляробства, які ў гэты час узначальваў Зм.Ф.Прышчэпаў, разумелі небяспечнасць сітуацыі. Радавыя выканаўцы заклікаліся “пры вызначэнні межаў у натуры быць беражлівымі да думкі і жаданняў гаспадаркі, якая падлягае абрэзцы, памятаць, што работа праводзіцца не ў мэтах сацыяльнай помсты, а па прычыне крайняй неабходнасці знайсці крыніцу для надзялення беззямельных і малазямельных. Пры малалетнім складзе сям’і і калі трэба абрэзаць 2–3 дзесяціны, то можна і не абразаць, дзейнічаць уважліва і асцярожна” [407, с. 135]. Можна дапусціць, што непасрэднае дачыненне да зместу дакумента меў наркам земляробства, які быў працiўнікам неапраўданага ціску на сялянства.

З дзяржаўным рашэннем сялянства спрабавала змагацца пры дапамозе фіктыўных унутрысямейных раздзелаў, бо зямельная норма разлічвалася на двор. У сваю чаргу ўлада прыпыніла сямейныя раздзелы, што, на наш погляд, аказалася не самым разумным. Штучна стваралася сітуацыя, калі моцная гаспадарка аслаблялася абрэзкай, а слабая – не магла за кароткі час эфектыўна выкарыстаць атрыманы надзел, і ў выніку адбывалася пагаршэнне стану вёскі ў цэлым.

Як і ў папярэднія гады, калі адбывалася размеркаванне маёнткавых зямель, так і ў час правядзення новай рэформы, звязанай з абрэзкай напаўпрацоўных гаспадарак, галоўная роля адводзілася землямерам. Аднак і пасля трох гадоў зя-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мельных работ кадраў і спецінструмента катастрафічна не хапала, што заведама ставіла пад пагрозу выкананне плана. Спецыяльнай пастановай землямерам забаранялася праводзіць работы ў прыватным парадку, нават у вольны час. Парушальнікам пагражала прыцягненне да крымінальнай адказнасці. Як і ў многіх іншых выпадках, загады не дзейнічалі хаця б па той прычыне, што каморнікам зарплаты не плацілі, і, каб пражыць, яны самавольна адбівалі межы, некаторыя за грошы здавалі сялянам сенажаць [48, 39, л. 164, 166].

Кіраўніцтва рэспублікі разумела складанасць зямельнай праблемы і на той момант займала больш-менш рэалістычную пазіцыю. Не выпадкова А.Р.Чарвякоў у выступленні на І Усебеларускім з’ездзе зямельных работнікаў (1925) прызнаваў: “Для рашэння гэтых задач мы вельмі абмежаваны ў сродках. Патрэбна кваліфікаваная сіла, якая б магла кіраваць гэтай работай, але гэтай сілы мы налічваем дзесяць, можа быць, сто чалавек. Пытанне надзялення зямлёй у бліжэйшы час не можа быць вырашана па прычыне адсутнасці зямельнага фонду” [32, 1731 л. 118]. З прыведзеных слоў відаць, што перспектыва ўяўлялася не надта аптымістычнай, аднак сітуацыя характарызавалася праўдзіва.

Безумоўна, новая зямельная рэформа з яе прынцыпам абрэзкі напаўпрацоўных гаспадарак аказалася самай балючай праблемай вёскі. У некаторых месцах, напрыклад у Віцебскай акрузе, кіраўніцтва, беручы пад увагу значную колькасць хутароў, што ўскладняла абрэзку, вырашыла расфарміраваць некаторыя неперспектыўныя саўгасы. Рэспубліканскія органы выказалі адмоўную рэакцыю на гэтую ініцыятыву. Тым не менш зямлю некалькіх саўгасаў перадалі сялянам. Напрыклад, толькі ў адным саўгасе “Пагаевічы” Чашніцкага раёна абрэзалі 800 дзесяцін з 1300, якія ляжалі дзірваном, таму што гаспадарка не здолела апрацоўваць столькі зямлі [24, 536, л. 145]. А ў Гаранскім сельсавеце Магілёўскай акругі, наадварот, большасць зямлі атрымалі ад абрэзкі [24, 543, л. 298].

Ёсць падставы сцвярджаць, што ўзніклая сітуацыя турбавала партыйныя і савецкія органы. Не выпадкова Бюро ЦК КП(Б) канстатавала, што “многія работнікі скажалі лозунг надзялення зямлёй з запаснога фонду на лозунг абрэзкі”. Аднак і ў гэтым выпадку адыграла сваю ролю ідэя аб правя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзенні класавай палітыкі на вёсцы, аб саюзе з серадняком. Партыйнае кіраўніцтва асцерагалася, што “абрэзка можа закрануць і серадняцкія гаспадаркі”. Бюро ЦК прыняло рашэнне: “Прызнаць абрэзку няправільнай, яна адлюстроўвае бядняцкія ілюзіі і ўраўнілаўку. Абрэзку праводзіць толькі там, дзе на гэтым кавалку можна стварыць новую гаспадарку” [22, 5, л. 293]. Другая частка пастановы, безумоўна, правільная. Аднак паўстае пытанне: ці дайшла пастанова да вёскі? Калі ўлічыць нязначную колькасць вясковых камуністаў і актывістаў, складанасць унутрывясковых адносін, то адказ можа быць адмоўным. Дарэчы, згодна даных, што прагучалі на X з’ездзе КП(б)Б (сакавік 1927 г.), абрэзка шматзямельных гаспадарак дала 141,5 тыс. дзесяцін. На працягу года змаглі размеркаваць толькі 134 726 дзесяцін [272, с. 383].

Падводзячы вынік новай рэформы, спашлёмся на даныя Наркамата земляробства, згодна якіх на канец 1927 г. было выкарыстана трохі болей 1/3 часткі запаснога фонду, надзелена каля 12 тыс. бядняцкіх гаспадарак і данадзелена каля 55 тыс. двароў [33, 23, л. 213]. Такім чынам, калі прыняць памеры гэтага фонду ў межах 650–700 тыс. дзесяцін [33, 5, л. 35], то напярэдадні калектывізацыі працэс надзялення зямлёй аказаўся незавершаным. Гэтую выснову можна аргументаваць данымі з выступлення наркама земляробства Зм.Ф.Прышчэпава на I Усебеларускім з’ездзе земработнікаў зімой 1925 г. Ён адзначыў, што “колькасць малазямельных гаспадарак дасягае 20–25%, яны не забяспечаны нават галоднай зямельнай нормай і не могуць весці нават спажывецкую гаспадарку” [32, 1731, 12]. Спасылаючыся на паказчык колькасці сялянскіх гаспадарак у 688,6 тыс. [398, с. 101] і вызначыўшы 20% ад гэтай лічбы, можна заўважыць, што ў 1925 г. зямлю чакалі каля 150 тыс. беззямельных гаспадарак, атрымалі яе за два гады каля 70 тыс., гэта значыць, на палову менш (дадатак, табл. 1.3). Таму, на наш погляд, нельга гаварыць аб завершанасці земленадзялення, і ёсць усе падставы далучыцца да высновы У.М.Міхнюка аб недастатковым вывучэнні пытанняў, “колькі сялян было надзелена зямлёй, на колькі павялічылася іх землекарыстанне ў выніку правядзення аграрнай рэвалюцыі... аб складзе надзеленага зямлёй насельніцтва...” [385, с. 180–182].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна ўлічваць, што бесперапынна нарастаў працэс драблення сялянскіх гаспадарак. Па даных Зм.Ф.Прышчэпава, на 1925 г. узніклі 117 тыс. новых гаспадарак [32, 1731, л. 13]. Значыць, колькасць зямлі на сям'ю мела тэндэнцыю да памяншэння, што выклікала неабходнасць данадзялення новых гаспадарак. Таму факт зніжэння сярэдняга памеру сялянскай гаспадаркі ў канцы 1927 г. да ўзроўню 1917 г. [398, с. 101] з'яўляецца заканамерным і пацвярджаецца дакументальна.

Не меншыя цяжкасці чакалі савецкую ўладу і пры землеўладкаванні, якое дзяржаўная зямельная палітыка не магла ігнараваць. Вядомы беларускі эканаміст А.В.Бонч-Асмалоўскі, спасылаючыся на здымкі нямецкіх ваенных атрадаў у Магілёўскай губерні, адзначаў, што толькі 10–20% сялянскіх надзелаў маюць больш-менш прыгодныя межы. Большая частка раскідана так далёка ад сяліб, так расцягнута, што пры якім хочаш севазвароце весці гаспадарку неспадручна. Дзяржава прызнавала, што "землеўладкаванне ёсць самая важная і тэрміновая мера для пад'ёму сельскай гаспадаркі, што толькі пры ім сяляне маюць магчымасць перайсці да лепшых формаў землекарыстання" [32, 1171, л. 6 адв.].

Аднак, нягледзячы на разнастайныя мерапрыемствы, становішча ў вёсцы не паляпшалася. Наадварот, зямельная рэформа не паспявала за працэсам драблення сялянскіх двароў і справядлівым жаданнем сялян хутчэй вызначыцца з формай карыстання сваім надзелам. З месцаў паведамлялі, што "ў некаторых сельскіх Саветах землеўладкаванне не праводзілася наогул і нават не запланавана на 1926/27 г." [24, 1341, л. 60]; у другіх яно "пачалося толькі з 1925 г.", у трэціх "многа спрэчных спраў і насельніцтва не можа приступіць да работы" [24, 521, л. 133]. Сустракаліся выпадкі, калі сяляне заключылі дагаворы на землеўладкаванне яшчэ ў 1923 г., "але і праз тры гады нічога не зроблена" [24, 872, л. 247, 250]. У некаторых мясцовасцях вяскоўцы самі адмяралі сабе надзелы на выдзеленых пасёлках, таму што "каморніка немагчыма дачакацца". Нягледзячы на тое, што з самавольных надзелаў спаганяўся падатак, будавацца на іх не дазвалялася [39, 223, л. 3]. Дзяржава спадзявалася ўзяць гэты працэс пад кантроль. Спецыяльныя пастановы настойліва напаміналі, што "земле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўладкаванне і далей будзе праводзіцца сіламі каморнікаў па заяўках сялян і пасля папярэдняй аплаты” [8, 235, л. 21].

Ад пачатку зямельнай рэформы прайшоў ужо не адзін год, а праблема адсутнасці дастатковай колькасці кадраў заставалася. На Мінскім акруговым з’ездзе Саветаў у сакавіку 1927 г. канстатавалася, што план землеўладкавання па гэтай прычыне выкананы толькі на 75%. Загадчык зямельнага аддзела звяртаў увагу на тое, што “для канчатковага землеўладкавання спатрэбяцца яшчэ не менш за 10 гадоў і значная колькасць кадраў” [4, 318, л. 67].

Безумоўна, у Наркамаце земляробства добра разумелі, што гаспадарка, асабліва маламоцная, не мела перспектывы развіцця без правядзення шэрага мерапрыемстваў агратэхнічнага характару, у шматлікіх цыркулярах Наркамат прызнаваў неабходнасць паскоранага землеўладкавання пры “максімальнай рацыяналізацыі гэтых работ” [32, 1834, л. 81]. Аднак на практыцы працэс праходзіў бескантрольна. Цэлы шэраг гаспадарак, якія атрымалі зямлю, аказаліся пакінутымі на волю лёсу, і ў выніку на новых землях “назіралася тое ж самае трохполле, перавозіліся старыя будынкі, ставіліся без усялякага плана” [32, 1834, л. 57].

Рашэнне пытання тармазілася адсутнасцю неабходнай колькасці спецыялістаў і сродкаў. У адпаведнасці з бюджэтам на 1924/25 г. Наркамату выдзялялася больш за 260 тыс. рублёў. З іх 150 тыс. павінна было пайсці на землеўладкаванне бядняцкай і сераднядкай часткі вёскі і на павелічэнне акладаў аграномам, 30 тыс. – на ветэрынарную службу [33, 5, л. 4 адв.]. Безумоўна, такія сродкі не маглі дапамагчы ў вырашэнні праблем, у 1925 г. у рэспубліцы працавалі ўсяго 220 аграномаў, кожнаму з іх прыходзілася абслугоўваць каля 260 населеных пунктаў у радыусе 18–20 вёрст [33, 5, л. 26]. Такім чынам, факты паказваюць немагчымасць хуткага дасягнення прыметных зрухаў у развіцці сельскай гаспадаркі.

Якасны стан гаспадаркі таксама быў незайздросны. На вёсцы пераважалі слабыя сялянскія гаспадаркі і трохполле як галоўны метад агратэхнікі. Па прычыне недасканаласці тагачаснай статыстыкі і частай змены эканамічных характарыстык амаль немагчыма уніфікаваць даныя маёмаснага стану сялянскай гаспадаркі. У сярэднім яны прыкладна выглядалі наступным чынам: дробнапасяўная група з надзелам да 0,9

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзесяціны на едака складала да 45% ад 688,6 тыс. гаспадарак [дадатак, табл. 1.5]. Справаздачы з месца паказваюць да 50% дробных гаспадарак [4, 276, л. 6]. Да гэтай характарыстыкі неабходна дадаць, што амаль 16% гаспадарак не мелі рабочай жывёлы, па другіх даных – да 40% [22, 7, л. 797], 15% не мелі плуга і сахі і інш. У некаторых мясцовасцях, напрыклад на Полаччыне, да 80% гаспадарак працягвалі ўжываць саху і смык [10, 302, л.188]. Многія гаспадаркі наогул не мелі зямлі.

Рэальнае становішча большасці сялянскіх гаспадарак было катастрафічным, аб чым расказваюць многія дакументы, сярод іх запісы, якія праводзілі студэнты Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі ў час летняй практыкі. З іх бачна, што амаль усе апытаныя скардзіліся на недахоп грошай і хлеба ці на працягу ўсяго года, ці да часу, калі “боб цвіце”, і сцвярджалі, што “да вайны хлеба і грошай хапала” [49, 113, л. 2]. Адзін з практыкантаў прама на афіцыйным бланку напісаў: “Галеча і беднасць блукаюць па Бачэйкаўскай воласці. Карова аддаецца амаль задарма, выпасу няма, скаціна пасецца ўдзень і ўначы за 3 вярсты ад вёскі. Сенажаці зусім няма. З дзесяціны бяруць усяго 30 пудоў” [49, 84, л. 5 адв.].

У пачатку 1924 г. органы Рабоча-сялянскай інспекцыі правяралі работу 18 сельскіх Саветаў. У выніковым дакуменце канстатавалася: “Сельская гаспадарка даследаваных сельскіх Саветаў знаходзіцца ў стане, які нічым не адрозніваецца ад даваеннага. Усюды трохполле, а ў некаторых населеных пунктах нават аднаполле па прычыне дробнасці надзелаў. Вельмі нізкая забяспечанасць коньмі” [4, 20, л. 82 адв.].

Якасная характарыстыка сельскай гаспадаркі асобных раёнаў Беларусі не была аднолькавай. Калі ў Мінскай і Слуцкай акругах прыметным з’яўлялася палепшанае збожжавае земляробства, то на Мазыршчыне існавалі гаспадаркі з залежнай сістэмай, адсутнасцю ўстойлівага севазвароту. Адначасова ў многіх месцах рэспублікі развіваліся як даваенныя, так і створаныя ў 1923–1924 гг. гаспадаркі са шматпольным севазваротам. Па даных НКЗ, такіх гаспадарак налічвалася каля 2%, ці прыкладна 13 тыс. [33, 6, л. 5 адв.]. Аднак, як гаварылася вышэй, дзяржаўная падатковая палітыка вымушала пераходзіць ад інтэнсіўнай сістэмы гаспадарання да менш інтэнсіўнай. У гэтай сітуацыі найбольш пацярпелі гаспадаркі з развітой жывёлагадоўляй і вытворчасцю ільну.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што аптымальным кірункам развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі з'яўлялася жывёлагадоўля. Наданне ёй збожжавага ўхілу не магло быць выгадным ні па кліматычных, ні па глебавых умовах і садзейнічала захаванню яе спажывецкага характару. Старшыня СНК Я.А.Адамовіч афіцыйна засведчыў у адным з выступленняў у 1925 г., што "калі па пасяўной плошчы мы падыходзім да ўзроўню 1913 г., то ўраджайнасць у параўнанні з гэтым годам знізілася з 45 пудоў да 30 пудоў з дзесяціны" [32, 1731, л. 6, 9]. Толькі з 1924 г. заўважаецца некаторая цікавасць сялян да мінеральных угнаенняў, хаця да вайны праз земскія склады вёска атрымоўвала іх значную колькасць.

У выніку бядняцкія і нават серадняцкія гаспадаркі не маглі забяспечыць сябе хлебам. Да адзначаных абставін далучаліся дзяржаўны падатковы ціск, нізкія цэны на збожжа і жывёлу. На пачатак 1925 г. недахоп збожжа па Беларусі складаў каля 2 млн. 700 тыс. пудоў. Кіраўніцтва прызнавала цяжкі харчовы стан рэспублікі і прасіла дапамогі ў Цэнтра. На Віцебшчыне крытычная сітуацыя склалася ў чатырох раёнах, дзе 25–30% і нават больш гаспадарак не маюць хлеба. Улады распарадзіліся паслаць у гэтыя раёны некалькі тысяч пудоў жыта і ячменю і "прадаваць згодна пасведчання сельскіх Саветаў і сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі" [22, 5, л. 225, 245; 24, 536, л.178, 202]. Не зусім бясспрэчным з'яўляецца агульнапрызнаны факт аднаўлення ў 1925 г. даваеннага ўзроўню пасяўной плошчы. У перспектыўным плане работ па аднаўленні і развіцці земляробства БССР на 1925–1929 гг., падрыхтаваным у Наркамаце земляробства ў 1924 г., ставілася задача дасягнуць даваенных памераў пасяўной плошчы і забеспячэння жывёлай толькі ў 1927 г. На 1924 г. прызнавалася асвоеным каля 82% ад узроўню 1913 г. [33, 6, 7 адв., 11].

Значна абвастрылася праблема перанаселенасці беларускай вёскі. Прырост сельскага насельніцтва адбываўся вельмі хутка, слабая прамысловасць не магла заняць лішнія рабочыя рукі. Не было магчымасці выкарыстоўваць замежных эмігрантаў, ды ўнутраных таксама. Наадварот, пэўная колькасць беспрацоўных з прамысловых цэнтраў Саюза вярнуліся на радзіму. Наяўнасць значнай колькасці "лішніх" людзей спрыяла абвастрэнню сацыяльна-псіхалагічнай сітуацыі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вёсцы, да гэтага дачыніліся шырока распаўсюджанае бытавое хуліганства, самагонаварэнне і іншыя негатыўныя з’явы.

Дадатковыя праблемы для кіраўніцтва рэспублікі стварала прыгранічнае становішча паловы акругоў, таму што стан вёскі ў пагранпаласе заставаўся вельмі складаным. Не было ніякай магчымасці ліквідаваць існуючыя абмежаванні перамяшчэння ў пагранпаласе. Акрамя гэтага, да 1925 г. сяляне выконвалі натуральныя павіннасці на карысць пагранчасцей і абслугоўвалі іх [22, 9, л. 221]. Немалаважнае значэнне набывала палітыка польскага ўрада, якая вымушала савецкую ўладу прыглядацца да падатковай і зямельнай рэформаў у суседняй краіне.

Нельга пакінуць па-за ўвагай умовы жыцця сельскага насельніцтва, якому пагражалі разнастайныя хваробы, выкліканыя ваенным ліхалеццем і беднасцю. Старшыня СНК БССР Я.А.Адамовіч у прамове на І Усебеларускім з’ездзе зямельных работнікаў у 1925 г. сведчыў наступнае: “... Мы жывём яшчэ вельмі бедна, наша вёска не мае электрычнасці, а многія хаты асвятляюцца лучынай. Зараз пры нізкім культурным развіцці сялянства, пры вялікай масе непісьменных селянін жыве так, што не можа паслаць сваё дзіця ў школу” [32, 1731, л. 6]. На думку Старшыні СНК, вёска ў цэлым бедная, на яе сацыяльную дыферэнцыяцыю ён увагі не звяртае.

Аднак у навуковай літаратуры рабіліся шматлікія спробы высветліць сацыяльную дыферэнцыяцыю, ці так званы працэс асераднячвання дакалгаснай вёскі. За аснову бяруцца самыя разнастайныя паказчыкі. У выніку замацаваўся вывад, адпавядаючы тагачасным ідэалагічным установукам, аб кансалідацыі і пашырэнні праслойкі серадняакоў за кошт скарачэння беднякоў і эксплуататарскай групы. Разнастайныя і шматлікія паказчыкі, якімі карысталіся даследчыкі пры вывучэнні праблемы, прааналізаваў У.М.Міхнюк. У выніку ён канстатуе, што навукоўцы пры высвятленні сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства не выпрацавалі адзіныя падыходы да методыкі даследавання гэтага пытання [386, с. 105–106]. Мы згодныя і з яго заўвагай наконт высновы М.Е.Стральцова, што “пры Савецкай уладзе зямля ўжо не з’яўлялася прадметам куплі-продажу, а таму згубіла значэнне адной з галоўных прымет пры ўстанаўленні сацыяльнага тыпу сялянскіх двароў” [386, с. 106; 503, с. 109].

Гэтае заключэнне пацвярджаецца аналізам стану сялянскай гаспадаркі, зробленым у 1923 г. наркамам харчавання Я.А.Адамайцісам. На падставе даных Наркамата ён робіць выснову, што галоўную частку насельніцтва вёскі, каля 90%, складаюць бедната і дробныя серадлякі, прычым першых каля 55%, другіх 35%, астатніх можна аднесці да кулакоў [58, с. 28]. Наркам карыстаецца рознымі параметрамі: аб’ядноўвае сялянскія гаспадаркі па колькасці ворыва, сенажаці, жывёлы, што дазваляе яму выдзеліць 9 груп гаспадарак. Невялікія адступленні ў розных характарыстыках не перашкаджаюць у пацвярджэнні вышэйпрыведзеных лічбаў. Наркам прызнаў, што не існуе метаду, які дазволіў бы дакладна дыферэнцыраваць сялянства, тым больш, што ў розных мясцовасцях, у залежнасці ад агульнага забеспячэння сялян зямлёй і культуры земляробства, метады і прыметы, якія вызначаюць сацыяльны характар сялянскай гаспадаркі, розныя.

Цікавыя назіранні наконт размеркавання сялян па асноўных сацыяльных групах зрабілі беларускія вучоныя 1920-х гг. Яны прама ўказвалі, што гэты працэс “вытвараецца сельсаветам і з ім звязана атрыманне або, наадварот, пазбаўленне некаторых ільгот па лініі сельгаскааперацыі і крэдыту. Розніца ў атрыманні гэтых ільгот вызначаецца не абсалютнай лічбай сельскагаспадарчага падатку, а тым, да якой сацыяльнай групы аднесены селянін. У выніку атрымоўваецца, што гаспадарка, абкладзеная падаткам каля 25 рублёў, у адных раёнах належыць да серадлякоў, а ў другіх – да кулакоў” [422, с. 11]. Хутчэй за ўсё недасканаласцю сельсавецкай методыкі падлікаў, уплывам унутрывясковых адносін тлумачыцца шырокая разнастайнасць колькасных даных сацыяльнага складу вёскі. Важнае назіранне пакінулі тагачасныя навукоўцы ў дачыненні да якаснай характарыстыкі гаспадарак, асабліва так званых кулацкіх, якія “па тэхніцы вытворчасці нічым не адрозніваліся ад астатніх” [422, с.12]. ЦК КП(б)Б канстатаваў, што “праслойка кулацтва прыметна ў Лёзненскім раёне Віцебшчыны, у Слуцкай акрузе, у большасці астатніх раёнаў яно раскідана па адным” [22, 7, л. 797].

Вучоныя-аграрнікі 1920-х гг., напрыклад А.В.Чаянаў, М.Пелехаў, А.В.Бонч-Асмалоўскі, лічылі, што галоўную ролю ў росце матэрыяльнага дабрабыту сям’і выконвае не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямельная плошча. Памеры апрацаванага надзелу залежаць ад магчымасцей сям'і. Спашлёмся на аўтарытэт А.В.Чаянава, які даказваў, што "ў сялянскай гаспадарцы пастаяннай вызначальнай велічынёй з'яўляецца не капітал (зямля), а наяўнасць рабочай сілы. Адначасова з ростам сям'і растуць і параметры яе гаспадарчай дзейнасці, і плошча зямлі, якую сям'я апрацоўвае. Нават часовыя ваганні ў складзе сям'і адбіваюцца на аб'ёме яе гаспадарчай дзейнасці" [545, с. 36].

Ва ўмовах Беларусі гэтая акалічнасць набывала надзвычай важнае значэнне па прычыне значнага памяншэння дарослага мужчынскага насельніцтва пасля вайны. Не выпадкова многія гаспадаркі, якія не мелі дарослых мужчын, былі вымушаны здаваць зямлю ў арэнду. Ускосным пацвярджэннем гэтага факта з'яўляюцца архіўныя даныя аб спагнанні нядоімак з сем'яў, якія мелі дастатковую колькасць зямлі, а не маглі яе апрацоўваць, таму што не хапала рабочых рук. Яшчэ адным доказам прызнання важнасці такой акалічнасці, як рабочая сіла, можна лічыць рашэнне ўлады не праводзіць абрэзку гаспадарак, што мелі лішак зямлі і хлопчыкаў-падлеткаў, але не мелі сталага гаспадара. У гэтым выпадку дзяржава бачыла перспектыву і мела рацыю. Аднак нельга абыходзіць і факт наяўнасці ў беларускай вёсцы значнай колькасці свабодных рабочых рук. Згодна статыстычных даных, якія паўтараюцца ў архіўных матэрыялах, у працах многіх даследчыкаў, у калектыўных выданнях і падручніках і якія па гэтай прычыне можна лічыць адпаведнымі сапраўднаму стану, у беларускай вёсцы налічвалася больш за 40% лішніх рабочых рук [33, 19, 35 адв.]. Такім чынам, можна канстатаваць складанасць і неадназначнасць сацыяльных працэсаў, якія праходзілі ў вёсцы.

Вядома, калі б у сельскай гаспадарцы адбывалася так, што на рост ураджайнасці, а з ёю на дабрабыт сялян і ўсёй дзяржавы ўплываў які-небудзь адзін крытэрый, то перспектывы былі б цудоўныя. Аднак зямля патрабуе вельмі вялікіх фізічных намаганняў і матэрыяльных затрат, не выпадкова ў 1921 г. сяляне не змаглі нават засеяць увесь яравы клін з-за недахопу рабочых рук, насення, коней. У наступныя гады сітуацыя мянялася вельмі павольна, што выклікала падзенне даходнасці сялянскіх гаспадарак у параўнанні з даваеннымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гадамі, а значыць, і зніжэнне іх таварных магчымасцей і матэрыяльнага стану.

У зямельнай палітыцы працягваў ужывацца класавы падыход пры рашэнні праблем. СНК БССР у спецыяльнай пастанове ў пачатку 1926 г. прапанаваў зямельным органам у першую чаргу ўлічваць інтарэсы маламоцных двароў: выдзеліць такую колькасць зямлі, якая б абумовіла стварэнне рэнтабельных гаспадарак; поўнасцю забяспечваць беднату лесам і будаўнічымі матэрыяламі; выдаваць беднаце доўгатэрміновыя (да 8 гадоў) крэдыты на землеўладкаванне [550, с.132]. Аднак хацелася б звярнуць увагу на тое, што ідэалагічная ўстаноўка на падтрымку беднякоў на месцах выконвалася не заўсёды. Вельмі складаным з’яўлялася ўнутрывясковае жыццё, і ні адзін, нават самы найлепшы, дакумент не мог улічыць яго разнастайнасць. Кожная сям’я мела свой, адметны ад суседзяў інтарэс па любым пытанні, якое хвалявала вёску, даводзілася ўлічваць і надаваць важнае значэнне адносінам з сельскім Саветам і г.д.

Партыйныя і савецкія дырэктывы не здолелі аслабіць сацыяльную напружанасць вакол зямельнага пытання. Палітыка падтрымкі бедняка на справе яшчэ больш ускладняла сітуацыю, аб чым сведчаць шматлікія скаргі прадстаўнікоў усіх слаёў у розныя інстанцыі. Бяднейшая частка спадзявалася на пераразмеркаванне сродкаў вытворчасці на сваю карысць, таму і з’яўляліся пісьмы, аналагічныя допісу ўраджэнца Дубровенскага раёна, курсанта адной з ваенных школ, у “Крестьянскую газету” са скаргай на несправядлівы, на яго думку, падзел лесу мясцовага значэння: «Паўсотні гектараў лесу яшчэ да рэвалюцыі заможнікі купілі ў памешчыка, а ў 1926 г., у час перадачы лесу ўсёй вёсцы, яго зноў-такі захапілі. Райкам партыі, безумоўна, прыняў бок бяднейшай часткі вёскі і вырашыў перагледзець пытанне, каб “палажыць канец кулацкай дзейнасці”» [39, 528, л. 5].

Прынцып класавага падыходу ў адносінах да сялян быў найбольш выгадны для савецкай улады і шырока выкарыстоўваўся пры фарміраванні яе сацыяльнай апоры. Гэта ўносіла дадатковыя складанасці ў псіхалагічны настрой вёскі. Апошняе асабліва відавочна, калі прыняць да ўвагі рэзкую змену сацыяльнай палітыкі: да рэвалюцыі ўсямерна падтрымліваліся заможныя гаспадаркі, пасля – маламоцныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бядняцкія. Вядома, што бедната карысталася шматлікімі дзяржаўнымі ільготамі, кампенсацыя якіх адбывалася за кошт заможных гаспадарак. Гэтым падрывалася іх эканамічная моц, што, у сваю чаргу, негатыўна адбівалася і на эканамічным стане самой дзяржавы. Калі ўзяць лічбы, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў архіўных матэрыялах і навуковай літаратуры, то сацыяльны партрэт вёскі сярэдзіны 1920-х гг. мог бы выглядаць наступным чынам: бядняцкія гаспадаркі – ад 25,7% да 31%; серадняцкія – ад 64,5% да 65,2%; кулацкія – ад 4,5% да 9,1%, хаця аўтар схіляецца да высноў Я.А.Адамайціса [дадатак, табл. 1.4].

Пры планаванні далейшага развіцця сваіх гаспадарак большасць сялян бачылі выйсце перш за ўсё ў выдзяленні на хутары, у развядзенні тэхнічных культур і ўжыванні шматпольных севазваротаў. З усіх канцоў Беларусі паступалі шматлікія заявы аб жаданні выселіцца на хутар ці водруб. Аднак савецкая ўлада адразу пачала абмяжоўваць імкненні хлебаробаў. 27 ліпеня 1920 г. на пасяджэнні Мінскага павятовага зямельнага аддзела прынята наступнае рашэнне: “Маючы на ўвазе ўпартае імкненне сялян да пераходу на хутарнае ці водрубнае вядзенне гаспадаркі, лічыць задавальненне такіх імкненняў не супярэчным палажэнню аб сацыялістычным землеўладкаванні пры ўмове, што гэты перадзел павінен адбывацца пад кіраўніцтвам аддзела земляробства” [35, 21, л. 1, 2]. На дадзеную пастанову аддзел земляробства Мінскага рэўкама за подпісам У.М.Ігнатоўскага даў тлумачэнне: “Хутарская гаспадарка не дапушчальная. Водруб пажадана, аднак без абавязковага ўраўнення...” [35, 21, л. 3]. Падобная сітуацыя склалася і ў другіх месцах. З Бабруйшчыны ў жніўні 1920 г. паведамлялі: “Жыхары адной з вёсак, спаленай у час баявых дзеянняў, прасілі рассяліць іх на хутары. Аднак пасля тлумачэння каморніка, што савецкай уладай рэкамендуецца рассяленне на пасёлкі, яны пагадзіліся на такую ўмову” [35, 183, л. 6 адв.]. У некаторых паветах права выхаду на пасёлкі таксама абмяжоўвалася. У Мінскім павеце было прынята рашэнне аб дазволе выхаду на пасёлкі не менш чым 20 сем’ям. А на Мазыршчыне наогул прыпынілі 7 спраў аб высяленні на пасёлкі па прычыне парушэння інструкцыі [32, 213, л. 7].

Зямельны кодэкс БССР 1923 г. адмаўляў хутарскую і водрубную гаспадаркі як сістэму, дапускаючы ў патрэбных па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мерах і на прымальных умовах асобныя выпадкі. Найбольш перспектыўным відам землеўладкавання лічыліся пасёлкі [32, 1731, л. 54], якія павінны былі стаць асновай для будучай калектыўнай формы вядзення гаспадаркі. У 1924 г. органы кантролю інфармавалі адпаведныя ўстановы аб “аслабленні ў некаторых раёнах барацьбы са шкоднай тэндэнцыяй рассялення на хутары” [228, с. 58]. Неабходна заўважыць, што “калі для захавання аднаасобных формаў землекарыстання патрабавалася пастанова большасці гаспадарак населенага пункта, то для пераходу да калектыўных формаў такой пастановы не патрабавалася” [175, с. 289]. Падобная палітыка ў адносінах да індывідуальнай сялянскай гаспадаркі ўлічвала не эканамічны інтарэс і перспектыву, а найперш класавы прынцып, ідэю супрацьстаяння на вёсцы кулакоў і астатняга насельніцтва. Ігнаравалася магчымасць земляробаў самім выбраць аптымальныя формы гаспадарання, вызначыць спецыялізацыю сваёй гаспадаркі, наладзіць сувязь з рынкам і інш. Вёска не атрымлівала рэальнай дапамогі ў надзяленні зямлёй, не даваліся крэдыты на закупку сельскагаспадарчых прылад, а ў арганізацыі аграрнага асветніцтва пераважалі парады, як і што рабіць. Таму нічога дзіўнага не было ў тым, што сяляне захоплівалі зямлю адзін у аднаго, у саўгасах, у лясніцтве. Зямельныя камісіі, створаныя ў адпаведнасці з Зямельным кодэксам для рашэння спрэчных пытанняў, на Бабруйшчыне, Мазыршчыне разглядалі амаль 50% спраў аб захопах зямлі, у іншых месцах такіх спраў было каля 15% [157, с. 40].

Для тых вяскоўцаў, якіх надзялілі зямлёю на пасёлках, усе праблемы толькі пачыналіся, таму што ў першую чаргу атрымоўвалі надзелы малазямельныя ці маладыя сем’і, якія аддзяляліся ад бацькоў. Патрэбны быў лес, каб пабудаваць ці паднавіць пабудовы, грошы, каб набыць жывёлу і неабходны інвентар. І пачыналі людзі абіваць парогі ў сельскіх Саветах і зямельных камісіях, аднак дзяржава лічыла, што ўмацаванне гаспадаркі павінна ісці за яе ўласны кошт. Сялянства шукала выйсце ў самавольных парубках лесу, у спробах паменшыць падатак праз утойванне плошчы ворыва, сенажаці, паведамленне аб павелічэнні колькасці едакоў. Такім чынам, працэс выбару формаў землекарыстання аказаўся вельмі складаным як з матэрыяльна-тэхнічнага, так і з сацыяльна-псіхалагічнага боку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Савецкая ўлада прапанавала новую форму землекарыстання – калектыўную апрацоўку зямлі, хаця можна было ўлічыць вопыт правядзення сталыпінскай рэформы, а таксама жаданні хлебаробаў. Ідэя тэарэтычна пачала распрацоўвацца з 1919 г. У лютым ЦВК зацвердзіў Палажэнне аб сацыялістычным землеўладкаванні і аб мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства. Асноўныя думкі Палажэння знайшлі адлюстраванне ў рашэннях VIII з'езда РКП(б). У іх падкрэслівалася неабходнасць "арганізацыі саўгасаў, падтрымкі сельскагаспадарчых камун, калектыўных гаспадарак і таварыстваў па апрацоўцы зямлі" [289, с. 86]. Менавіта на шляху штучнага насаджвання на вёсцы калектыўных формаў арганізацыі працы бачылася яе сацыялістычная перспектыва. Такая тэорыя магла ўзнікнуць толькі ў асяроддзі, якое не ведала псіхалогію земляроба і не надавала ёй належнай увагі. Сярод кіраўнікоў партыі і дзяржавы ніхто, акрамя У.І.Леніна, не займаўся вывучэннем асаблівасцей сацыяльнага развіцця вёскі. Таму і магчымы былі падобныя рашэнні, далёкія ад рэальнага жыцця. Вельмі трапна сказаў вядомы навуковец А.Ц.Кірсанаў на агранамічным з'ездзе: "Вялікая справа – энтузіязм, але яшчэ лепш, калі ён ідзе пасля арыфметыкі" [32, 1731, л. 34].

У гэты самы час такую прадуманую "арыфметыку" прапаноўваў вядомы тэарэтык і практык сельскагаспадарчай навукі А.В.Чаянаў. Ён прапагандаваў ідэю сялянскай кааперацыі, якая, па яго разліках, уяўляла дасканала арганізаваны варыянт сялянскай гаспадаркі. Вучоны даказваў, што "камуна будзе заўсёды слабей кааперaванай гаспадаркі. Па сваёй структуры яна вымушана аб'ядноўваць у буйных формах не толькі тыя галіны гаспадаркі, якія ёй выгадны, але і тыя, у якіх дробная вытворчасць тэхнічна заўсёды больш дасканалая... Камуна... будзе прайграваць у параўнанні з каапераванымі сямейнымі гаспадаркамі ва ўнутры гаспадарчым транспарце, у стараннасці назірання і догляду за біялагічнымі працэсамі, не маючы ў той жа час ніякіх пераваг у другіх галінах... Пераход ад частковай кааперацыі да поўнай камунізацыі вытворчасці з тэхнічнага боку не можа лічыцца з'явай прагрэсіўнай" [545, с. 42]. Як вядома, да аргументаваных вывадаў вучонага не прыслухаліся, у краіне расквітнела "агра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рамантыка”, пачалі з’яўляцца і ў хуткім часе распадацца камуны, арцелі, ТАЗы.

Справа з арганізацыяй калектыўнай працы не ладзілася і на тэрыторыі Беларусі. Ігнараванне псіхалогіі селяніна і жаданне даказаць магчымасць сумеснай работы гультая і недарэкі з працавітым селянінам ужо з самага пачатку былі асуджаны на няўдачу. У гэтай палітыцы яскрава выявіліся малакампетэнтнасць бальшавіцкіх лідэраў у пытаннях сельскай гаспадаркі і псіхалогіі сялянства, іх прага падпарадкаваць законы эканамічнага развіцця палітыцы. Пастановы з’ездаў і другія дакументы яскрава ілюструюць спробу інтэграцыі прыватнай гаспадаркі з сацыялізмам, прычым самымі паскоранымі каманднымі метадамі. Аднак у сувязі з тым, што праблемы землекарыстання адзначанага перыяду ў навуковай літаратуры прааналізаваны дастаткова падрабязна, не лічым патрэбным паўтараць вядомае.

Малаэфектыўнасць зямельнай палітыкі яскрава паказвалі дасягненні сельскай гаспадаркі. Нават даследчыкі савецкага перыяду адзначалі зніжэнне з 1925 г. тэмпаў яе росту, што праяўлялася ў скарачэнні на пачатак 1928 г. у параўнанні з 1925 г. апрацаванай плошчы на цэлых 25 тыс. га, зніжэнні ўраджайнасці з 49 пудоў (7,5 ц) да 45 пудоў (7,2 ц), памяншэнні колькасці жывёлы [дадатак, табл. 1.2]. Сялянская гаспадарка заставалася спажывецкай, амаль палова збожжа (42,2%) ішла на асабістае ўжыванне, 43,2% – на ўнутрыгаспадарчае, таварная частка складала каля 8,6%, амаль на палову меней, чым да вайны [366, с.20]. Нам падаецца, што апошняя лічба выразна адлюстроўвае ўзровень таварна-грашовых адносін у беларускай вёсцы.

З лютага 1926 г. пачалося абследаванне матэрыяльна-тэхнічнага стану сялянскіх гаспадарак па праграме, выкладзенай на 20 старонках [32, 2248, л. 3]. Вынікам гэтай працы сталі цікавыя звесткі аб сапраўднай сітуацыі на вёсцы, якія выразна характарызавалі ўзровень яе развіцця пасля так званага аднаўлення. У якасці прыкладу выкарыстаем некаторыя звесткі з абследавання Уздзенскага раёна ў першай палове 1927 г. Акты складаліся па аднолькавай схеме: колькасць двароў (у нашым выпадку 5510), колькасць ворыва на едака, працаўніка і гаспадарку (на Уздзеншчыне каля 6,5 дзесяціны); форма землекарыстання (цераспалосіца і хутар, каля

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

20% гаспадарак перайшлі на пасёлкі), колькасць коней, буйной рагатай жывёлы. У нашым прыкладзе звернем увагу на тое, што больш чым з 4,5 тыс. коней толькі каля 30 палепшанай пароды, з 9,9 тыс. кароў толькі 45 швіцкай пароды. Не выпадкова і ўраджай заставаўся на даваенным узроўні. У раёне чатыры кааператыўныя аб’яднанні, з іх два машынныя, адно садаўнічае і адно малочнае, чатыры саўгасы, якія “нічога паказальнага сабой не ўяўлялі” [4, 404, л. 2, 9 адв.]. Вынікі абследавання іншых раёнаў, напрыклад Бягомльскага, Чашніцкага, яшчэ больш засмучаюць [422, с.75– 79]. Нават у найбольш развітой Мінскай акрузе “23% ворыўнай зямлі займаў папар, і толькі на 1930 г. планавалася павялічыць плошчы пад караняплодамі і канюшынай” [4, 318, л. 6, 7 адв.].

Справаздачы з асобных месцаў досыць паказальныя ў сэнсе падтасоўкі фактаў, падачы іх у лепшым выглядзе, чым было на самай справе. Напрыклад, Астрашыцка-Гарадоцкі райвыканкам паведамляў аб павелічэнні статку пародзістай жывёлы на 75% (было 40, стала 70), пашырэнні на 1% плошчы пасеваў кармавых траў і на 5% – караняплодаў (не ўдакладняючы першапачатковыя лічбы) і г.д. Аднак на самай справе ў 1926 г. у раёне назіраўся вялікі недарод у параўнанні з 1925 г., “выкліканы позняю вясною, халодным, дажджлівым летам” [4, 389, л. 12].

У цэлым па рэспубліцы ўраджай 1926 г. аказаўся ніжэйшым за папярэдні год. Некаторыя крыніцы, напрыклад “Савецкая Беларусь” за 3 кастрычніка 1926 г., называюць лічбу зніжэння ўраджайнасці на 7%. У матэрыялах да справаздачы ЦК КПБ X з’езду партыі канстатавалася, што дэфіцыт таварнага хлеба складаў 10,8 млн. пудоў [366, с. 23]. На рынках Беларусі было нарыхтавана толькі 527 тыс. пудоў хлеба супраць 2,5 млн. у 1925/26 г., хаця Дзяржплан рэспублікі прадугледжваў нарыхтаваць 7 млн. пудоў [366, с. 23]. Па просьбе кіраўніцтва Беларусі саюзны Наркамат гандлю за апошнія месяцы 1926 г. паставіў у рэспубліку больш за 1,3 млн. пудоў пшаніцы і жыта [558, с. 276]. У паведамленнях з месцаў, напрыклад з самай багатай Слуцкай акругі, якую называлі нават “Беларускай Украінай”, канстатавалася “зніжэнне ўраджайнасці па большасці культур, акрамя бульбы, у параўнанні не толькі з даваеннымі гадамі, але і з 1923 годам” [5, 2, л. 4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кіраўніцтва Полацкай акругі адзначала, што “па-ранейшаму больш чвэрці гаспадарак не мелі рабочай скаціны, амаль палова карыстаецца яшчэ драўлянымі сохамі, землеўладкаванне не завершана, сістэма землекарыстання крайне заблытана” [32, 2042, л. 16, 21]. Акрамя гэтага, паведамлялася аб “недасеве азімых, недахопе насення, кармоў, невысокіх ураджаях у 30–40 пудоў з дзесяціны” [24, 521, л. 293]. Згодна са справаздачай Мазырскай акругі СНК БССР, сельская гаспадарка “застаецца з прымітыўнымі сістэмамі земляробства і мае вельмі малыя ўраджайнасць і малатаварнасць. Першае месца займае двухполка, другое – пералог, потым трохполка” [25, 476, л. 20].

Некаторыя раёны, напрыклад Лёзненскі на Віцебшчыне, Самахвалавіцкі на Міншчыне, змаглі захаваць досыць высокі ў параўнанні з суседзямі ўзровень гаспадарання, які, трэба падкрэсліць, мае яшчэ даваенныя карані, у гэтых мясцовасцях развівалася народная жывёлагадоўля, што патрабавала значных сродкаў, сіл і ўмення. З другога боку, гэта давала падставу ўладам лічыць адзначаныя раёны заможнымі.

Такім чынам, трэба прызнаць, што зямельная палітыка савецкай улады аказалася малаэфектыўнай, даволі складана і павольна развіваўся працэс земленадзялення і землеўладкавання. Замест звыклых і пажаданых для сялянства формаў землекарыстання ў выглядзе хутара, водруба насаджаліся пасёлкі, якія павінны былі, на думку кіраўніцтва, стаць базай пераходу да калектыўнага вядзення гаспадаркі. Адначасова замест першапачатковай кааперацыі актыўна прапагандаваліся і насаджаліся калектыўныя формы гаспадарання ў выглядзе таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі, калгасаў, саўгасаў і камун.

У той жа час кіраўніцтва рэспублікі і спецыялісты зусім слушна заўважалі, што вёска знаходзіцца перад пачаткам “працяглага працэсу глыбінных змен у галіне зямельна-гаспадарчых адносін” [33, 6, л. 7 адв.]. У перспектыўным пяцігадовым плане работ па адраджэнні земляробства, распрацаваным у 1924 г., звярталася ўвага на мерапрыемствы па яго інтэнсіфікацыі, якая бачылася не ў фарсіраванні вытворчай кааперацыі, а ў “паскораным абароце сялянскага капіталу, павышэнні прадукцыйнасці працы і рацыянальнай арганізацыі гаспадаркі” [33, 6, л. 8, 9].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* * *

Вышэйсказанае дазваляе прыйсці да высновы аб складанасці сацыяльна-эканамічных задач, якія вырашала савецкая ўлада ў 1921–1927 гг. Неабходна прызнаць, што большасць праблем яна атрымала ў спадчыну, да іх трэба аднесці, перш за ўсё, зямельную з такімі яе праявамі, як беззямелле і малазямелле, нізкая агратэхнічная культура і беднасць большасці гаспадарак, вялікая перанаселенасць вёскі і інш. Гэта яшчэ больш праявілася ва ўмовах бесперапынных баявых дзеянняў, якія прывялі да пагаршэння матэрыяльна-тэхнічнага і фізічнага стану вёскі і ўсёй краіны.

Савецкая ўлада планавала выйсце з экстрэмальнай эканамічнай сітуацыі праз увядзенне новай эканамічнай палітыкі, для сялян яна выражалася ў падатковых кампаніях, якія штогод удасканальваліся, аднак не сталі стымулам прагрэсу ў сельскай гаспадарцы. Галоўнай мэтай падатковай палітыкі заставалася спагнанне па магчымасці большых сродкаў з вёскі для матэрыяльнага забеспячэння дзяржаўных планаў у галіне фінансаў і эканомікі, дэклараваная свабода гандлю практычна ніяк не праяўлялася. Не атрымалі шырокага распаўсюджвання такія кірункі нэпа, як арэнда зямлі і наём рабочай сілы.

Трыяда зямельнай праблемы – земленадзяленне, землеўладкаванне і землекарыстанне – таксама не магла быць вырашана за кароткі перыяд 1921–1927 гг. Прычыны гэтага караніліся ў слабай матэрыяльнай і кадравай базе, заблытанасці і складанасці зямельнага пытання ў межах кожнай вёскі і нават двара. Таму, на наш погляд, няма дастаткова аргументаваных падстаў лічыць аграрную рэформу завершанай. На X з'ездзе КП(б)Б (сакавік 1927 г.) планавалася закончыць землеўладкаванне на працягу 7–8 гадоў [272, с. 382]. XI з'езд (лістапад 1927 г.) канстатаваў нізкую агракультуру гаспадарання, недастатковасць забеспячэння бяднейшай часткі вёскі сельгасінвентаром, разыходжанне цэн на сельскагаспадарчыя і прамысловыя вырабы [272, с. 485].

Сённяшні стан гістарычнай навукі не дазваляе пагадзіцца з устойлівымі поглядамі на аднаўленчы працэс толькі як на поспех партыйнай лініі ў ажыццяўленні новай эканамічнай палітыкі. У ім самым зацікаўленым бокам з'яўлялася сялянства, якому была навязана пасіўная роля выканаўцы кірую-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чых дырэктыў. Нацыяналізацыя зямлі, падзел земляробаў па класавым прынцыпе і адпаведны падыход да ўсіх праблем вёскі пазбавілі савецкую ўладу магчымасці выкарыстаць эканамічныя законы ва ўздыме сельскай гаспадаркі. Камандаванне вёскай, наданне прыярытэту палітычным і адміністрацыйным сродкам рашэння праблем кінулі сельскую гаспадарку ў бесперапынны крызіс. Усе дзяржаўныя рэформы 1921–1927 гг. адбываліся за кошт сродкаў, спагнаных з сялянства, аднак самастойнасці ў вырашэнні сваіх праблем і эканамічнай падтрымкі дзяржавы яны не атрымалі. Замест іх шырока ўжываліся метады загаду, прымусу, вокрыкі і каманды, якія не давалі бачных вынікаў, а толькі нервавалі вёску. Не атрымліваючы хуткіх станоўчых дасягненняў ад шматлікіх спроб палітычнага рашэння праблем сельскай гаспадаркі, савецкая ўлада перайшла да кардынальнай перабудовы ўсіх бакоў вясковага жыцця. Дзяржаўны эксперымент завяршыўся адабрэннем XV з’ездам ВКП(б) у снежні 1927 г. лініі на вытворчую кааперацыю дробнасялянскай гаспадаркі.

# Глава 2
# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВЁСКІ

## 2.1. Сутнасць і асноўныя кірункі дзяржаўнай культурна-асветніцкай палітыкі

Даследчыкі савецкай культурнай палітыкі канцэнтравалі ўвагу вакол пытанняў партыйнага кіраўніцтва культурай, ідэалагічнай дзейнасці партыі і дзяржавы на вёсцы, палітычнага асветніцтва, вывучалі гісторыю народнай асветы і ліквідацыю непісьменнасці, ролю друку ў культурным уздыме вёскі. У апошняе дзесяцігоддзе актыўна даследуюцца праблемы беларусізацыі. Аднак па-за ўвагай навукоўцаў засталіся пытанні аб узаемадзеянні новай, пралетарскай культуры і традыцыйнай, сялянскай, уплыву культурнай рэвалюцыі на сельскіх жыхароў, іх стаўлення да новай культуры і асветніцтва. На наш погляд, раскрыццё гэтых праблем дазволіць раскрыць асаблівасці працэсаў, якія праявіліся ў вёсцы Цэнтральнай і Усходняй Беларусі ў адносінах да савецкай культурнай палітыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яе тэарэтычныя асновы распрацаваны ў шматлікіх артыкулах У.І.Леніна, А.В.Луначарскага, Н.К.Крупскай і інш. У бальшавіцкай літаратуры знайшла асэнсаванне ідэя аб існаванні ў грамадстве дзвюх культур, буржуазнай і пралетарскай. Адным з галоўных стала палажэнне аб неабходнасці крытычных адносін да буржуазнай культуры. Згодна высноў У.І.Леніна, толькі дакладнае веданне культуры, створанай усім развіццём чалавецтва, толькі перапрацоўка яе дазволяць будаваць пралетарскую культуру [320, с. 304]. У савецкай гістарычнай навуцы дадзеная думка не падлягала крытычнаму навуковаму аналізу, яна прымалася за аксіёму, і ў шматлікіх не толькі гістарычных, але і філасофскіх, сацыялагічных публікацыях даводзілася яе права на існаванне. На падставе цытат з твораў У.І.Леніна, Н.К.Крупскай даказвалася перавага пралетарскай культуры над буржуазнай.

Аналіз катэгорыі “пралетарская культура” выклікае пытанне аб месцы ў грамадстве народнай культуры. Аўтар мае на ўвазе этнаграфічную культуру, якая стваралася ў вясковым асяроддзі на працягу стагоддзяў і вусна перадавалася з пакалення ў пакаленне. Акрамя песеннай або музычнай спадчыны, гэтая культура сфарміравала і захоўвала цэласную сістэму этычных, маральных нормаў і правілаў, якія па прычыне вядомых гістарычных абставін вызначалі менталітэт беларускай вёскі, змест яе духоўнага жыцця. Нягледзячы на тое, што тэарэтычныя распрацоўкі лідэраў бальшавіцкай партыі, якія надавалі галоўную ўвагу ідэалагічным пераўтварэнням у грамадстве і абыходзілі праблему суадносін і суіснавання новай, пралетарскай культуры і народнай, яна была пастаўлена жыццём.

Новая культурная тэорыя як адна з частак дзяржаўнай ідэалогіі не пакідала месца роздуму аб дабры і зле, злачынстве і непазбежнасці пакарання, маральнай адказнасці тых, хто ўзяў на сябе смеласць вучыць другіх шчасцю, роўнасці, братэрству. Замест агульначалавечых нормаў маралі павінна была ўмацоўвацца новая, пралетарская мараль. У імя нейкай уяўнай мэты ігнараваліся такія абавязкі кожнага разумнага чалавека, як пачуццё павагі да бацькоў, асабістай адказнасці за справу, знішчалася гістарычная памяць народа. Савецкая ўлада разлічвала, што яна зможа абысціся без народнай шматвяковай маралі, створанай на аснове хрысціянскіх уяўленняў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

без старой непралетарскай інтэлігенцыі, носьбіта буржуазнай культуры. Наркам асветы першага савецкага ўрада А.В.Луначарскі падкрэсліваў: “На шляху пралетарыяту ў яго барацьбе за правы чалавека стаялі або зусім абыякавыя людзі, або скрытыя контррэвалюцыянеры, недастаткова смелыя, каб перайсці ў адкрытую барацьбу ... якія ставяць сябе вышэй партыі, якія імкнуцца да нейкай асобай, надкласавай культуры, на іх думку, выключна вялікай і цудоўнай... Толькі ідэалогія пралетарыяту можа быць агульначалавечай...” [126, с. 2].

Відавочна, што пралетарыят аб’яўляўся адзіным класам, які ўвасабляў духоўны і маральны прагрэс, быў нацэлены на будучыню. Менавіта тут знаходзілася адна з галоўных псіхалагічных памылак бальшавікоў: разрыў з гістарычным мінулым, беспадстаўнае наданне неабмежаванага значэння тэарэтычным развaжанням, а не жыццёваму вопыту, нават іх адкрытае супрацьпастаўленне. У сувязі з тым, што партыйная ідэалогія разглядала чалавека як спрыяльны сацыяльны матэрыял для шліфоўкі, важнай уяўлялася задача прывівання новай, пралетарскай культуры на магутнае дрэва народнай культуры, каб абагаціць народ духоўнымі каштоўнасцямі новага зместу, выхаваць яго на аснове ідэалогіі навуковага сацыялізму, усталяваць нормы новай грамадскай маралі і паводзін, пачуцці савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму. Аднак даўно даказана навукоўцамі і пацверджана жыццём, што кожная, нават самая элітарная культура можа развівацца толькі на аснове роднай мовы, багатай духоўнай спадчыны народа.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны У.І.Ленін лічыў неабходным сканцэнтраваць асноўную ўвагу на пытаннях палітычнай і культурнай асветы. Галоўным метадам абвяшчалася культурная рэвалюцыя. У сваю чаргу яе важнейшым зместам павінна была стаць ліквідацыя непісьменнасці, таму што малаадукаваныя людзі не маглі эфектыўна ўспрымаць ідэі новай культуры. Яшчэ 29 кастрычніка 1917 г. у сваёй першай дэкларацыі наркам асветы А.В.Луначарскі пісаў: “Усялякая сапраўдная дэмакратычная ўлада ў галіне асветы ў краіне, дзе кіруюць непісьменнасць і невуцтва, павінна ставіць сваёй мэтай барацьбу супраць гэтай Цемры. Яна павінна дабіцца ў кароткі тэрмін усеагульнай пісьменнасці шляхам арганізацыі сеткі школ, адпаведных патрабаванням сучаснай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагогікі, і ўвядзення ўсеагульнага абавязковага і бясплатнага навучання” [260, с. 5].

Безумоўна, з пазіцыі нашага часу зразумела, што наркам ставіў нерэальныя задачы, якія адлюстроўвалі рэвалюцыйны максімалізм і неразуменне сапраўднай сітуацыі і маштабаў праблемы. Праз пэўны час А.В.Луначарскі ўдакладніў сутнасць асветніцтва, якое, на яго думку, павінна грунтавацца “на дактрыне рабочага класа і камуністычнай праграме і з’яўляцца палітычным. Падставамі павінны служыць непахіснасць волі рабочага класа, яго цвёрдая ўпэўненасць у тым, што ён робіць абсалютнае дабро для ўсяго чалавецтва, мае на ўвазе агульначалавечыя ідэалы” [126, с. 9].

Шырока прапагандавалася ідэя аб самадзейнасці працоўных мас і ўсебаковага пашырэння нізавой ініцыятывы. Планаваліся адкрыццё элементарных школ для дарослых, народных універсітэтаў, спецыяльных сельскагаспадарчых і тэхнічных школ і курсаў, стварэнне вандроўных універсітэтаў і лектарскіх атрадаў для распаўсюджвання ведаў. У якасці метадычнага дапаможніка рэкамендавалася кароткая праграма, так званая “Грамата грамадзяніна”, дзе давалася схема лекцый па асноўных пытаннях прыродазнаўства, гісторыі і сацыялогіі. Галоўная мэта праграмы – даць асновы камуністычнага светапогляду. Паводле задумы аўтара, яна адпавядала пастаўленай мэце, таму што прадугледжвала вывучэнне дастаткова шырокага спектра тэм, напрыклад “Паняцце аб зямным шары”, “Асновы астраноміі”, “Паходжанне Зямлі”, “Гісторыя Зямлі”, “Далейшае развіццё чалавецтва” і інш. [261, с. 13–14].

Заўважым, што, нават улічваючы сённяшнія магчымасці, арганізаваць у агульнадзяржаўным маштабе такія лекцыі нерэальна. Тым больш нерэальна было выканаць такую праграму ва ўмовах 1920-х гг. Затое яна добра ілюструе утапічныя планы, якія ўзнікалі ад неразумення сапраўднага становішча, непахіснай веры ў сілу загадаў, распараджэнняў і ідэй. Сказанае можна аднесці і да прапановы У.І.Леніна аб стварэнні некалькіх дзесяткаў помнікаў буйнейшым грамадскім дзеячам мінулага, а таксама ўсім наватарам у галіне літаратуры, мастацтва і навукі. Планавалася шырока выкарыстоўваць манументальную прапаганду праз спецыяльныя барэльефы з надпісамі, адпаведнымі задачам новай культуры, арганіза-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыю масавых агульных свят, упрыгожванне гарадоў плакатамі, створанымі буйнейшымі прадстаўнікамі рускага мастацтва, афармляць спецыяльныя вітрыны з нагляднымі дапаможнікамі, якія маюць тлумачальныя тэксты. На думку аўтараў праектаў, гэта “давала магчымасць шляхам нагляднасці даць малападрыхтаваным масам асноўныя паняцці аб усіх галінах ведаў” [261, с. 31].

Акрамя асветніцкага кірунку, ідэя актывізацыі самадзейнасці мас прадугледжвала арганізацыю розных з’ездаў, якія ў хуткім часе сталі прыметным элементам новага жыцця. Мала-памалу амаль кожны грамадзянін аказаўся ўдзельнікам самых розных мерапрыемстваў. Выключнае значэнне атрымалі мітынгі, лекцыі, вусная агітацыя. Узнікла ўражанне, што толькі з прыходам савецкай улады вясковае насельніцтва далучаецца да пэўнай культурнай справы. Але ж яшчэ да Першай сусветнай вайны ў Беларусі існавалі 237 клубаў і 56 кінаўстановак [391, с. 12], большасць з іх утрымліваліся за кошт земстваў. Пасля рэвалюцыі яны перайшлі ў падпарадкаванне пазашкольнага аддзела Наркамата асветы.

У выніку бясконцых змен улады сістэма культурна-асветніцкай работы ў Беларусі аказалася не наладжанай, хаця на хвалі рэвалюцыйнага энтузіязму на свабоднай тэрыторыі ўзнікалі клубы, хаты-чытальні, народныя дамы, харавыя і (асабліва часта) драматычныя самадзейныя гурткі. Падобныя ўстановы ў Цэнтральнай Расіі дзейнічалі ўжо даўно, аднак, па прызнанні Н.К.Крупскай, “на арганізацыю іх работы затрачаны не адзін мільён, а вынікаў не адчувалася” [17, 218, л. 41]. Адна з прычын такой з’явы была ў незацікаўленасці насельніцтва, ігнараванні ім працэсу ўтварэння новых устаноў. Таму здарылася так, што большасць хат-чытальняў існавалі толькі на паперы.

Аднак лінію партыі неабходна было праводзіць. З’езды РКП(б) і іншых грамадскіх арганізацый рэгулярна прымалі рашэнні аб актывізацыі культурна-асветніцкай работы на вёсцы, распрацоўвалі новыя формы работы. Цэнтрам яе лічылася хата-чытальня, якая павінна была быць і клубам, і сталом даведак, і апорным пунктам камсамольскай ячэйкі. Вакол хаты-чытальні павінны былі гуртавацца школы для дарослых, драматычныя гурткі і іншыя культурна-асветныя аб’яднанні. Безумоўна, тэарэтычна тут было ўсё правільна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але адсутнічала асноўнае – выканаўцы. Дадзеная акалічнасць істотна зніжала запланаваную эфектыўнасць асветніцкай работы на вёсцы. Праблема кадраў існавала на ўсіх узроўнях, асабліва нізавым. У адным паведамленні з Лагойскай валасці гаварылася: “Калі мы зараз запытаем сябе, што перашкодзіла і перашкаджае да сённяшняга часу рэальна правесці арганізацыю камуністычнага ладу, то мы зараз жа атрымаем адказ: няма людзей, і таму не справіліся... Што б мы ні пачыналі рабіць, усюды адно і тое ж: няма людзей і баста” [18, 12, л. 26].

Тым не менш аддзелы Наркамата асветы розных узроўняў актыўна кіравалі дзейнасцю палітасветустаноў, разумеючы сваю задачу ў “рэвалюцыянізацыі і пралетарызацыі мас”. Гэты прынцып быў характэрны для ўсіх відаў палітыка-асветніцкай работы. Напрыклад, Гомельскі аддзел народнай асветы папярэджваў аб “неабходнасці звяртаць выключную ўвагу на падбор п’ес, вершаў і г.д. У супрацьлеглым выпадку кіраўнікі ўстаноў будуць прыцягвацца да самай вышэйшай меры пакарання” [45, 6, л. 11].

Нейкі час у 1920 г. Гомельскі губернскі аддзел кіраваў работай аддзелаў асветы неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, і да нас дайшлі цікавыя дакументы гэтага перыяду. У студзені 1920 г. з Гомеля ва ўсе паветы накіроўваецца цыркуляр наступнага зместу: “Прапануецца тэрмінова прыслаць даныя аб стане лекцыйнай справы – аб’ёме, характары і кірунку работы. У выпадку адсутнасці планамернай лекцыйнай работы прадпісваецца стварэнне лекцыйных бюро сумесна з партыйнымі камітэтамі. Лекцыі павінны весціся на палітычныя тэмы партыйнымі таварышамі. На тэмы навуковыя, сельскагаспадарчыя, гігіены і санітарыі лектарамі са школьных работнікаў. Неабходна (у першую чаргу) абслугоўваць вёску, валасці” [45, 7, л. 6].

Як бачым, патрабаванні да лекцыйнай работы былі даволі высокія, але не аказаліся забытымі і іншыя віды культурнай асветы. Праз месяц у валасныя аддзелы быў пасланы новы загад: “Да сённяшняга часу музыканты і спевакі быццам бы не адчуваюць прысутнасці савецкай улады і яе задач і працягваюць карміць сялянскія масы старымі буржуазнымі, часта банальнымі, нават кафэшантаннымі матывамі. Аддзел народнай асветы прадпісвае… не дапускаць ні на адным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спектаклі ці канцэрце матываў, процілеглых духу пралетарскай дыктатуры, падабраўшы для выканання рэчы, якія выключна адпавядаюць духу пралетарскай рэвалюцыі” [45, 12, л. 3].

Адначасова з указаннямі і пагрозамі кіраўніцтва губернскім аддзелам давала мясцовым работнікам і свае парады наконт арганізацыі працы. Школьным работнікам, напрыклад, рэкамендавалася падабраць найбольш таленавітых вучняў і развучваць з імі лепшыя рэвалюцыйныя п’есы і вершы, выкарыстоўваючы зборнік “Рэвалюцыя” і зборнікі пралетарскіх паэтаў. Для “падняцця мастацкага ўзроўню мас і выяўлення іх творчых сіл” прапаноўвалася “мабілізаваць усе наяўныя сілы і ствараць у воласці культурна-асветныя гурткі з некалькімі секцыямі: мастацкай, музейнай, літаратурнай, харавой, драматычнай, у якія запрашаць выключна сялян з мэтаю ў іх асобе мець у будучым інструктараў для працы на вёсцы” [45, 11, л. 7].

Многія з дакументаў мелі надзвычайны характар, суправаджаліся грыфамі “тэрмінова”, “цыркулярна” і да т.п. Адно з такіх распараджэнняў тычылася правядзення тыдня селяніна ў жніўні 1920 г. і папярэджвала аб неабходнасці “напружыць усе сілы для аказання дапамогі культурна-асветніцкай рабоце на вёсцы: адкрываць школы, вячэрнія курсы па ліквідацыі непісьменнасці, мабілізуючы пісьменных у парадку працоўнай павіннасці; узмацніць работу хат-чытальняў, а дзе іх няма – прыступіць да арганізацыі, забяспечыць іх газетамі, бібліятэчкамі і іншым; арганізаваць мітынгі-канцэрты, народныя спектаклі” [45, 7, л. 13].

На наш погляд, змест цытуемых дакументаў сведчыць аб адсутнасці пачуцця рэальнасці ці спробы хоць бы якоганебудзь аналізу тагачасных падзей. Рэвалюцыйны энтузіязм не даваў магчымасці па-сапраўднаму ацаніць сітуацыю. Гэтым тлумачыцца наступны цыркуляр, датаваны 24 красавіка 1920 г., аб неабходнасці барацьбы з палякамі, якія наступалі. Пад грыфам “тэрмінова” клубная секцыя Гомельскага аддзела народнай адукацыі прапаноўвала ўсім павятовым секцыям прыняць наступныя меры: “1. Праводзіць у клубах, народных дамах і г.д. канцэрты, мітынгі, даклады аб перажываемым моманце. 2. Сур’ёзную ўвагу звярнуць на Дамы працоўнага селяніна, штодзённа праводзіць гутаркі і па магчымасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэрты. Дзе такіх Дамоў няма, тэрмінова прыступіць да іх арганізацыі" [45, 6, л. 7]. Безумоўна, было б вельмі добра, калі б такімі сродкамі можна было спыніць ваенныя дзеянні.

Звернемся яшчэ да аднаго дакумента аналагічнага характару, які тычыўся манументальнай прапаганды. У канцы 1919 г. Гомельскі аддзел народнай асветы пастанавіў тэрмінова прыступіць "да забеспячэння ўсіх валасцей, сёл, вёсак, гарадоў і мястэчак манументальнымі дошкамі, адпаведнымі рэвалюцыйнымі лозунгамі, дзеля чаго карыстацца старымі шыльдамі, фанерай, люстэркамі, мармурам" [45, 11, л. 12]. Дасылаўся спіс кандыдатур на ўвекавечанне па наступных кірунках: рэвалюцыйныя дзеячы ўсіх часоў і народаў, напрыклад Спартак, Бабёф, К.Маркс, Ф.Энгельс, А.Бабель, Марат, Рабесп'ер, Гарыбальдзі; музыканты – Бетховен, Мусаргскі, Глінка, Шапэн; пісьменнікі – Л.Талстой, Ф.Дастаеўскі, М.Лермантаў, А.Пушкін, М.Някрасаў, Т.Шаўчэнка; навукоўцы – М.Ламаносаў, Ул.Салаўёў, Дз.Мендзялееў, І.Мечнікаў; мастакі і архітэктары – А.Рублёў, А.Кіпрэнскі, Растрэлі і інш. Аднак жыццё ўнесла свае карэктывы, і з месцаў, напрыклад з Барысава, паведамлялі: "Не маючы магчымасці падрыхтаваць што-небудзь у гэтым кірунку ў сувязі з эвакуацыяй і стратай павятовага цэнтра, аддзел асветы просіць аб вырабе для павета помнікаў: Бабёфа, Маркса, Энгельса, Марата, С.Разіна, Спартака, Песцеля, Л.Талстога, Някрасава, Салтыкова-Шчадрына, Кальцова, Мечнікава, Урубеля, Мусаргскага, Рымскага-Корсакава, Камісаржэўскай, а таксама іх партрэтаў, з разліку на 10 валасцей павета" [45, 11, л. 14, 15]. Нават самая багатая фантазія не дапаможа ўявіць, што ведала беларуская вёска аб названых асобах. Відавочна, што падобная прапаганда, акрамя выдаткаў, не магла мець ніякіх станоўчых вынікаў.

На самай справе планы ў галіне новай культуры аказаліся нерэальнымі, што і паказала яе развіццё падчас Грамадзянскай вайны. Да такой высновы прыйшлі кіраўнікі дзяржавы і Наркамата асветы. Яны бачылі прычыну ў "наяўнасці некалькіх незалежных адна ад адной арганізацый, якія вялі культурна-асветніцкую работу ад выпадку да выпадку і давалі разнастайную па змесце інфармацыю. Па гэтай прычыне і ў выніку недахопу адпаведных кадраў увага была накіравана не на тыя групы насельніцтва, і не выконвалася задача прапаганды асноўных ідэй РКП(б)" [126, с. 8].

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Праблема ліквідацыі адзначаных недахопаў разглядалася на І Усерасійскай нарадзе палітасветаў у лістападзе 1920 г., якая стала важным этапам у станаўленні і развіцці сістэмы палітасветы. Аб наданні ёй вялікага значэння сведчыць удзел у яе рабоце У.І.Леніна, А.В.Луначарскага, Н.К.Крупскай і інш. З яркай, узнёслай прамовай выступіў наркам асветы РСФСР, які непасрэдна звязаў неабходнасць перабудовы культурнай работы з заканчэннем Грамадзянскай вайны. Асноўным вынікам нарады стала стварэнне Галоўнага палітыка-асветнага камітэта, больш вядомага пад назвай Галоўпалітасвета. У аснову яго дзейнасці былі пакладзены прынцыпы аб'яднання ўсіх арганізацый, якія вялі асветніцкую работу сярод дарослых. Гэтай рабоце надаваўся рэзка акрэслены палітычны змест [126, с. 9], аб чым сведчыць ужо і назва створанай арганізацыі. Дарэчы, з гэтага часу і да 1946 г. работа сярод дарослых называлася палітыка-асветніцкай, а ўстановы, якія яе ажыццяўлялі, палітыка-асветнымі, што выразна адлюстроўвае іх асноўны змест і задачы.

Адной з галоўных мэт гэтай работы абвяшчалася дасягненне вышэйшага віду класавай самасвядомасці пры дапамозе агітацыі, у тым ліку і сродкамі мастацтва: "...песня, эмблема, плакаты, роспіс, архітэктура – усё, што ўздзейнічае на душу, павінна служыць справе агітацыі". Тэарэтыкі культурнай палітыкі лічылі, што "ўсякае відовішча, якое б'е на эфект, можа ўздзейнічаць на чалавека толькі пэўны час, таму ўсе віды мастацтва павінны быць прасякнуты палітыкай, і ў той жа момант да палітыкі ўсё зводзіцца не павінна" [126, с. 7]. Аднак як на практыцы знайсці такую "залатую сярэдзіну", яны не тлумачылі.

На лістападаўскай нарадзе былі распрацаваны прыкладная схема палітасветустаноў і асноўныя кірункі асветніцкай работы: вытворчая прапаганда, арганізацыя ўсеагульнага навучання, развіццё бібліятэчнай справы. Галоўным дакументам стала рэзалюцыя па дакладзе Н.К.Крупскай "Аб чарговым плане работы ГПА", які закрануў усе бакі палітыка-асветніцкай работы, ад яе зместу і метадаў да кадравых пытанняў. На думку аўтараў, Галоўпалітасвет павінен кантраляваць, накіроўваць, аб'ядноўваць культурна-асветніцкую дзейнасць па ўсёй краіне, а работа ГПА ў сваю чаргу ставілася пад кантроль партыйных органаў. Важнейшым кірункам работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэк, музеяў, школ павінна была стаць “прапаганда асноўных ідэй праграмы РКП(б) як праграмы, што найбольш правільна ацэньвае перажываемы гістарычны момант і ўказвае шлях далейшага развіцця і прапаганды асноўных кірункаў эканамічнага будаўніцтва” [126, с. 5]. Прадугледжвалася магчымасць узнікнення часовых палітычных і эканамічных задач, увасабленне якіх у жыццё павінна было суправаджацца “ўдарнымі і агітацыйна-прапагандысцкімі кампаніямі” з боку палітасветустаноў.

Закранала нарада і кадравае пытанне, якое вырашалася таксама дастаткова проста – шляхам далучэння да асветніцкай дзейнасці не толькі работнікаў пазашкольных аддзелаў Наркамата асветы, але актыўных і арганізаваных прадстаўнікоў масы.

Такім чынам, на канец 1920 г. бальшавіцкая праграма культурнай рэвалюцыі была ўдасканалена і прыстасавана да мірных умоў, заставалася толькі ўкараніць яе ў жыццё. У нашым выпадку сацыяльнай базай эксперыменту станавілася сялянства, хаця, паводле слушнай заўвагі даследчыкаў гэтага пытання, “ніхто з расійскіх сацыял-дэмакратаў, акрамя У.І.Леніна, не займаўся сур’ёзным аналізам асаблівасцей яго мыслення, звычаяў і маралі дзеля таго, каб выкарыстаць гэтыя веды ў асветніцтве вёскі” [540, с. 87]. Неабходна заўважыць, што сярод дзяржаўна-партыйнага кіраўніцтва Беларусі праявіліся дзве тэндэнцыі ў падыходзе да культурнага будаўніцтва: арыентацыя на нацыянальныя каштоўнасці і традыцыі і далучэнне працоўных да новай, пралетарскай культуры. Працэс нацыянальна-культурнага адраджэння прадугледжваў пашырэнне ўжывання беларускай мовы, ліквідацыю непісьменнасці, развіццё нацыянальнай літаратуры, тэатра, мастацтва. Аднак, з’яўляючыся часткаю РКП(б), Кампартыя Беларусі павінна была падтрымліваць афіцыйную ідэалагічную лінію. З-за непісьменнасці беларускай вёскі менавіта яна апынулася пад актыўным уздзеяннем партыйнай ідэалогіі і новай, пралетарскай культуры, якую актыўна прапагандавалі палітыка-асветныя ўстановы. Праблема ўкаранення новай культуры ў вясковае асяроддзе аказалася дастаткова складанай. Па-першае, вёска была малапісьменнай, таму ўспрымаць партыйную прапаганду ў пажаданым аб’ёме не магла; па-другое, у Беларусі асноўная частка насельніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пражывала на вёсцы, таму не хапала ні сродкаў, ні кадраў, і, па-трэцяе, на вёсцы вельмі моцна трымаліся традыцыйная народная культура, паданні, вераванні, і хутка пераадолець іх аказалася немагчымым. Яшчэ адна важная прычына абмяжоўвала пранікненне новай культуры: гэта шырокая незадаволенасць сялянства дзяржаўнай эканамічнай палітыкай. Негатыўныя адносіны да эканамічных эксперыментаў пераносіліся і на афіцыйную ідэалагічную работу. Ва ўмовах незадаволенасці вёскі выйсце бачылася ў пашырэнні агітацыі за лінію партыі.

## 2.2. Палітычнае асветніцтва

### *2.2.1. Структура і кадры*

Палітычнай асвеце сярод дарослых дзяржава надавала вялікую ўвагу. Падрастаючае пакаленне ідэалагічна можна было выхоўваць у школе, павярнуць жа велізарную колькасць дарослых на шлях, вызначаны Камуністычнай партыяй, было складаней. З пераходам да мірнага жыцця стала ясна, што адных дырэктыў аб змесце асветніцкай працы, заклікаў да яе актывізацыі ўжо недастаткова. Новая сітуацыя патрабавала, з аднаго боку, стварэння сталай сеткі адпаведных устаноў, якімі можна было кіраваць і якія можна было кантраляваць, а з другога, мець пастаяннага праваднікa партыйнай палітыкі ў вёсцы.

На тэрыторыі рэспублікі ствараць сістэму палітасветы фактычна прыйшлося з чыстага ліста. У канцы лістапада 1920 г. быў створаны Галоўпалітасвет БССР. Яго задачы акрэслены ў рэзалюцыі IV з’езда КП(б)Б (25 лютага – 1 сакавіка 1921 г.): “Палітычная асвета бярэ на сябе галоўным чынам арганізацыйныя задачы праводзіць навуковую і вытворчую прапаганду. Абслугоўванне ўсіх клубаў, арганізацыя хат-чытальняў, Дамоў селяніна, беспартыйных, шырокіх канферэнцый і г.д. павінна быць тэрмінова перададзена Галоўпалітасвету” [272, с. 82–83]. На працягу сакавіка 1921 г. замест павятовых пазашкольных аддзелаў Наркамата асветы ствараліся павятовыя палітасветы. Аднак, як падкрэслівалася ў адным з цыркулярных пісем, “палітасвет ёсць састаўная частка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аддзела народнай асветы; загадчык палітасвета, як і ўвесь аддзел асветы, атрымоўвае дырэктывы ад мясцовага партыйнага камітэта, які непасрэдна кіруе ўсёй дзейнасцю палітасвета. Спробы самастойнасці і аддзялення з'яўляюцца глыбокім непаразуменнем, прычына якога – у недастатковым разуменні кроўнай роднасці палітыка-асветніцкай работы сярод дарослых з усімі відамі работы аддзела народнай асветы, што таксама выконваюць задачу выхавання дзяцей у камуністычным кірунку" [17, 218, л. 12]. У сваю чаргу Наркамат асветы клапаціўся аб кадравым забеспячэнні новага органа. Аб гэтым сведчыць адзін з цыркуляраў, у якім, між іншым, гаварылася: "Там, дзе яшчэ да гэтага часу няма спецыяльных асоб для кіраўніцтва палітасветамі, павятовым аддзелам асветы неабходна звярнуцца з хадайніцтвам у партыйны камітэт аб выдзяленні падрыхтаванага работніка" [17, 218, л. 3].

На пачатак 1921 г. у асноўным была вызначана структура кіруючых органаў палітасветработы. Прапагандысцкі аддзел кіраваў работай савецкіх і партыйных школ, клубамі, бібліятэкамі, пунктамі ліквідацыі непісьменнасці, экскурсійна-выставачнай дзейнасцю. Агітацыйны аддзел арганізоўваў шматлікія агітацыйныя кампаніі, мастацкі – наладжваў агітацыю сродкамі мастацтва. Агульныя ўказанні аддзелы Галоўпалітасвета атрымоўвалі ад партыйных органаў. Асноўная нагрузка прыпадала на нізавую структуру – вясковыя хаты-чытальні і валасныя палітасветы, якія складаліся са старшыні валасной партыйнай або камсамольскай ячэйкі, прадстаўніка аддзела народнай асветы і старшыні культасветнага аб'яднання.

Пэўныя захады па ўмацаванні палітасветустаноў прымалі кіруючыя органы рэспублікі. У пачатку 1921 г. СНК БССР прыняў пастанову, дзе прадпісвалася наступнае: "Наркамату асветы і выканкамам правесці падрабязнае абследаванне ўсіх памяшканняў, раней занятых асветнымі ўстановамі, якія цяпер знаходзяцца ў распараджэнні ваенных і другіх ведамстваў, дзеля ўстанаўлення, якія з іх тэрмінова могуць быць прыстасаваны і перададзены для патрэб НКА. Да 1 верасня неабходна перадаць не менш за 20% памяшканняў, занятых іншымі, не выключаючы і ваенных, а на працягу 1921 г. – усе астатнія. Памяшканні, занятыя палітасветустановамі і вызваленыя для іх, не могуць быць занятыя нікім... без згоды



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наркамата асветы” [36, 70, л. 21]. На справе ніхто не збіраўся лічыцца з распараджэннем. Напрыклад, у лістападзе 1921 г. чырвонаармейцы занялі хату-чытальню ў в. Каланіца Сёмкава-Гарадоцкай воласці, і ўсе спробы валаснога аддзела асветы вызваліць яе аказаліся марнымі. Памяшканні клубаў, тэатраў займалі пад ссыпныя пункты для харчпадатку [17, 226, л. 34]. Пастанова, аб якой гаварылася вышэй, была дапоўнена рашэннем ад 31 снежня 1921 г. Яно забараняла высяляць школы і другія асветныя ўстановы з памяшканняў у былых маёнтках, з устаноў НКА не дазвалялася браць арэндную плату [24, 172, т. 2, л. 341]. У ліпені 1922 г. паміж наркаматамі асветы і земляробства было падпісана пагадненне аб замацаванні пабудоў у былых маёнтках за школамі і палітасветустановамі.

Для большасці насельніцтва тагачаснай невялікай Беларусі арганізацыя палітасветустаноў аказалася справай новай. Частка насельніцтва, асабліва моладзь, з энтузіязмам успрыняла партыйныя заклікі: пачалося стварэнне хат-чытальняў па ініцыятыве знізу. У хуткім часе ва ўсіх паветах рэспублікі былі дзесяткі, нават сотні хат-чытальняў, дзесяткі народных дамоў, валасных і перасоўных бібліятэк [17, 218, л. 87]. З пункту гледжання сацыяльнай псіхалогіі такая сітуацыя аб’ектыўна была апраўдана. Разумеючы “вялікі кансерватызм і адсталасць сялянства”, улада рабіла стаўку на вясковую моладзь, якая павінна была “адыграць значную ролю ў справе замацавання савецкай улады і камуністычных ідэй на вёсцы” [17, 218, л. 111]. Не трэба забываць, што рэвалюцыя і Грамадзянская вайна ўзмацнілі рэвалюцыйны энтузіязм моладзі, якая будавала ў сваім уяўленні карціны “новага свету”. Ствараючы хаты-чытальні, яна лічыла іх прадвеснікамі новага жыцця і новай культуры і ўзнёсла заяўляла аб гэтым. Напрыклад, удзельнікі Мінскай павятовай канферэнцыі работнікаў асветы ў рэзалюцыі напісалі наступнае: “Мы, праваднікі пралетарскай культуры на беларускай вёсцы, сваёй несупыннай працай творым і безупынна будзем тварыць з кожнай школы, хаты-чытальні і народнага дома моцныя фарты саюза рабочых і сялян. Аб гэтыя бастыёны разаб’ецца хваля контррэвалюцыйнага наступу” [45, 49, л. 300].

Аб стварэнні хат-чытальняў прымаліся рашэнні на сходах моладзі. Вось прыклад аднаго з іх, прынятага ў Магільнян-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скай воласці: “Ва ўсіх вёсках арганізаваць хаты-чытальні, дзеля чаго запрасіць настаўніка, каб ён увесь свой вольны час аддаваў рабоце па асветніцтве мясцовага насельніцтва шляхам чытання газет і ўсемагчымых брашур”. У рашэнні сходу моладзі Сёмкава-Гарадоцкай воласці чытаем: “Сход моладзі, каля 30-ці чалавек, 17 ліпеня 1921 г. заслухаў даклад аб хаце-чытальні, які коратка акрэсліў яе значэнне. Пастанавілі: адчыніць хату-чытальню і прасіць палітасвет даваць кнігі і газеты” [17, 218, л. 21; 226, л. 33 адв.].

Нічога дзіўнага ў такіх прымітыўна-наіўных рашэннях няма, яны адбітак свайго часу, ілюстрацыя выканання нізамі дырэктыў зверху. Тым больш, што і апошнія не з’яўляліся прыкладам логікі. Звернемся да інструкцыі аб стварэнні хаты-чытальні, падпісанай Н.К.Крупскай: “...Валасны аддзел асветы павінен добра ўяўляць значэнне хаты-чытальні. Арганізатар ідзе перш за ўсё ў мясцовы партыйны орган і выканкам і там вядзе агітацыю за хату-чытальню. У воласці ці раёне ён зможа знайсці каго-небудзь з сялян, хто мае ўплыў і ўмее гаварыць, і разам з ім ідзе ці едзе на вёску. Лепш за ўсё браць такога селяніна, які сам ужо працаваў па арганізацыі хаты-чытальні ў сваёй вёсцы, дзе справа ўжо наладжана і г.д.” [18, 149, л. 22]. Большую неадпаведнасць рэчаіснасці, чым у гэтай і падобнай ёй інструкцыях, цяжка нават уявіць. Часта чытальняй аб’яўлялася хата камсамольца або другога мясцовага актывіста, які адначасова з’яўляўся яе загадчыкам, атрымліваў газеты ці які-небудзь агітацыйны матэрыял і лічыў сваю ролю выкананай. Таму не трэба здзіўляцца вялікай колькасці палітасветустаноў, якія ў канцы 1920 – пачатку 1921 г. утварыліся на тэрыторыі Беларусі. У хуткім часе большасць з іх перастала існаваць, напрыклад, на Барысаўшчыне з 311 на пачатак 1922 г. засталіся 124 хаты-чытальні [18, 470, л. 49].

У адзін з самых цяжкіх момантаў у жыцці вёскі, час актыўнага збору харчпадатку, сялянам было прапанавана ўзяць на сваё ўтрыманне ўстановы Наркамата асветы, ад школ да хат-чытальняў. Дзяржава не мела магчымасці матэрыяльна забяспечваць вясковыя асветныя ўстановы. V з’езд КП(б)Б у кастрычніку 1921 г. прыняў рашэнне аб пераводзе ўстаноў Наркамата асветы, у тым ліку і палітасветных, на ўтрыманне сялянства [272, с. 106]. Аднак было ясна, што “сялянства не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пойдзе насустрач дзяржаве” [18, 149, л. 4], а тым самым матэрыяльна не падтрымае вясковыя палітасветустановы.

Тым не менш з 1 лютага 1922 г. яны пераводзіліся на ўтрыманне за кошт вёскі, з дзяржаўнага забеспячэння здымаліся загадчыкі валасных палітасветаў. Пры ўмове адсутнасці сродкаў дапускалася закрыццё ўстаноў палітасветы. Праўда, такі крок прызнаваўся “не зусім пажаданым”, бо толькі ў іх сяляне могуць развівацца і забяспечыць свае духоўныя запатрабаванні” [18, 383, л. 6, 37]. У выніку на месцах узнікла поўная неразбярыха, ніхто не разумеў, што і як рабіць. Бабруйскі павятовы палітасвет, напрыклад, выслаў цыркуляр у воласці: “...абавяжыце сельскія Саветы ўтрымліваць хатычытальні, дзеля чаго правядзіце агітацыю. Загадчыкамі хатчытальняў прызначце старшыняў сельскіх Саветаў, якіх абавяжыце працаваць без аплаты... Правядзіце калектыўную падпіску. І (самае галоўнае! – *М.Б.*) трымайцеся цыркуляраў” [18, 181, л. 27].

Яшчэ больш ускладнялі сітуацыю распрацаваныя ў кабінетах ГПА пастановы накшталт наступнай: “Прымаючы пад увагу цяжкі эканамічныя стан, для выхаду з якога неабходны калектыўныя высілкі ўсяго працоўнага насельніцтва, праводзьце агітацыйныя кампаніі, каб азнаёміць з гэтым рабочых і сялян. Ваша работа павінна быць пастаўлена на ваенную нагу – дакладная, гнуткая, энергічная, а таму катэгарычна прапануецца: 1. Узмацніць і падняць сваю дзейнасць, каб яна адчулася насельніцтвам воласці і павета. 2. Да 5-га чысла кожнага месяца прысылайце падрабязныя даклады аб зробленай рабоце. 3. Актывізуйце культурна-асветніцкую работу шляхам мітынгаў, спектакляў. 4. У сувязі з нэпам выпісвайце калектыўныя газеты і арганізуйце іх галосную чытку” [18, 383, л. 9, 19].

Безумоўна, можна было прымаць шмат розных пастаноў, развіваць бурную паштовую дзейнасць, аднак факт застаецца фактам: сялянства ўстаноў палітасветы не падтрымала. Прычыну гэтага дастаткова выразна акрэсліў адзін з настаўнікаў Вяліка-Далецкай воласці: “Сялянства ў масе сваёй стагоддзямі выступала з пазіцыі непарушнасці прыватнай уласнасці, таму існаванне палітасветустаноў, што знаходзяцца на ўтрыманні інакш думаючай масы, асуджана на правал” [18, 181, л.53]. І на самай справе самаабкладанне не прыжылося, хаты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытальні пачалі актыўна ліквідавацца, з сотняў іх засталіся адзінкі. Сялянству аказалася не пад сілу вытрымліваць падатковы цяжар 1922 г. і аддаваць апошняе на ўтрыманне ідэалагічных устаноў савецкай улады. З велізарнейшымі цяжкасцямі змаглі заключыць, ды і то не ўсюды, калектыўныя пагадненні на ўтрыманне школ, а толькі пачаліся размовы аб самаабкладанні на карысць палітасветустаноў, то вяскоўцы пачалі гаварыць: “Адкуль жа браць хлеб, гэта ж не пясок?” [18, 158, л. 7].

Правал ідэі быў прызнаны і на дзяржаўным узроўні. Н.К.Крупская лічыла, што хаты-чытальні пачалі закрывацца па прычыне адсутнасці матэрыяльнай падтрымкі з боку насельніцтва і што гэты працэс супаў з тым “грозным момантам, калі ў сувязі з нэпам для вёскі ўзнікла небяспека захлынуцца хваляй дробнабуржуазнай стыхіі” [296, с. 55]. Па гэтай прычыне XI з’езд партыі зняў пытанне аб аднаўленні дзейнасці хат-чытальняў на вёсцы. Згодна з яго рашэннямі з 1 кастрычніка 1922 г. у кожнай воласці ў асобным памяшканні павінна была адчыняцца хата-чытальня, загадчыкам якой прызначаўся ці загадчык валаснога палітасвета, ці сябра камсамольскай ячэйкі. З’езд рэкамендаваў вясковым палітасветустановам праводзіць работу ў “арганізацыйна-гаспадарчым і культурна-асветным кірунках замест адміністрацыйна-прымусовага і палітыка-агітацыйнага” [289, с. 499].

22 лістапада 1922 г. ГПА Беларусі паведамляў, што ён бярэ на свой баланс 96 хат-чытальняў: па Мінскім павеце – 10, Мазырскім – 13, Слуцкім – 15, Бабруйскім – 20, Барысаўскім – 20, Ігуменскім – 18 [18, 149, л. 101]. Пры гэтым падкрэслівалася, што хаты-чытальні будуць знаходзіцца пад сумесным кантролем павятовых палітасветаў і аддзелаў агітацыі і прапаганды павятовых камітэтаў партыі. Пры іх павінны дзейнічаць стацыянарныя і перасоўныя бібліятэкі для абслугоўвання воласці, арганізоўвацца гурткі, бюро даведак.

На працягу 1923 г. працэс фарміравання дзяржаўных палітасветустаноў на вёсцы амаль завяршыўся. Іх кіруючым органам заставаўся Галоўны палітыка-асветны камітэт БССР, які ўваходзіў у сістэму Наркамата асветы, але дзейнічаў пад непасрэдным кіраўніцтвам аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б. Галоўпалітасвет канкрэтызаваў агульныя партыйныя палажэнні аб мэтах і задачах палітыка-асветніцкай работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносна ўмоў вёскі, вызначаў метады правядзення іх у жыццё, займаўся кадравымі пытаннямі. З 1924 г. структура яго органаў уключала акруговыя і раённыя камітэты паліт-асветы і нізавыя ўстановы. Гэтая акалічнасць дазволіла партыйнаму і савецкаму кіраўніцтву больш настойліва праводзіць партыйную лінію сярод сялянства, каб прыцягнуць яго на бок савецкай улады. Аднак не ўлічвалася складанасць гэтай задачы з пункту гледжання псіхалогіі сялянства, таму што многавяковыя культурныя стэрэатыпы сялянства ў хуткім тэмпе пераадолець аказалася немагчыма. Трэба дадаць, што дзяржаўныя палітасветустановы не змаглі таксама справіцца з пастаўленай задачай і па іншых прычынах, якія будуць разгледжаны ніжэй.

Пасля першага ўзбуйнення БССР у 1924 г. пачалася новая адміністрацыйная рэформа, яна пацягнула за сабою змены ў структуры палітыка-асветных устаноў. Адпаведна ёй у кожным раёне ствараліся народны дом ці паказальная хата-чытальня, акрамя гэтага, не менш яшчэ за 2 хаты-чытальні. У тым выпадку, калі насельніцтва раёна перавышала 35 тыс. чалавек, там адчынялася яшчэ адна, дадатковая хата-чытальня. Як і ў многіх іншых выпадках, лічбавыя даныя не супадаюць ні ў архіўных дакументах, ні навуковых даследаваннях, аднак дынаміка росту сельскіх палітпрасветустаноў прасочваецца. Можна дадаць, што ў 1925 г. спрабавалі падлічыць установы палітасветы (на гэта адводзіўся тыдзень), аднак з месцаў ніхто не даслаў статыстычных справаздач [39, 155, л. 3, 8]. Тым не менш па архіўных дакументах можна прасачыць пэўную дынаміку, згодна адных даных у канцы 1924 – пачатку 1925 г. у рэспубліцы дзейнічалі 249 хат-чытальняў і 67 народных дамоў [38, 1277, л. 34], па другіх апошніх было 79 і нават 87 [52, 19, л. 840], а на пачатак 1926 г., па звестках Галоўпалітасвета, дзейнічалі 273 хаты-чытальні і 55 народных дамоў [350, с. 296]. У канцы 1927 г. у рэспубліцы існавалі 307 хат-чытальняў і 57 народных дамоў [23, 136, л. 149].

З разгортваннем палітыкі беларусізацыі нацыянальныя меншасці атрымалі магчымасць карыстацца роднай мовай у школах, установах палітасветы. У месцах кампактнага пражывання нацменшасцей адчыняліся нацыянальныя хаты-чытальні. У 1925/26 г. у рэспубліцы дзейнічалі 8 польскіх, 5 яў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэйскіх, 1 латышская хата-чытальня, праз год адпаведна – 19, 10 і 4 [23, 136, л. 152]. Некаторыя з іх ствараліся шэфамі. Напрыклад, Маскоўскім польскім рабочым клубам была адчынена хата-чытальня ў ваколіцы Пушча на Лагойшчыне. Шэфы дапамагалі літаратурай, накіроўвалі студэнтаў падчас канікул, каб наладзіць працу хаты-чытальні [123, 65, л. 3–6].

Досыць цікавая з’ява – узнікненне так званых нясеткавых, ці дагаворных, хат-чытальняў. Яны ствараліся часцей за ўсё па ініцыятыве камсамольцаў ці шэфаў і адлюстроўвалі арыентацыю моладзі на падтрымку мерапрыемстваў савецкай улады. Нагадаем вытрымкі з пісьма аднаго са стваральнікаў такой хаты-чытальні з вёскі Якубы Гомельскага раёна: “Уся вёска спала непрабудным сном. За сталом сядзелі тры партыйцы, два камсамольцы, школьны работнік і стары рабочы. Сядзелі і абмяркоўвалі, як арганізаваць хату-чытальню. Хаця наша вёска і недалёка ад горада (усяго 2 вярсты), але за 6 гадоў, якія прайшлі перад намі, на вёсцы не відаць яснага разумення перавароту ў нашай краіне, Савецкай улады, яе значэння, яе імкнення правесці ў жыццё ідэі У.І.Леніна” [416, с. 4].

Дагаворныя хаты-чытальні ўзнікалі спантанна, але і хутка знікалі, таму статыстыка гэтай з’явы не можа быць дакладнай. Выкарыстаем некалькі лічбаў у якасці ілюстрацыі тэндэнцыі развіцця названага працэсу: на 1 студзеня 1925 г. існавалі 359 дагаворных хат-чытальняў [22, 5, л. 46], на 1 кастрычніка – 346, з іх 123 шэфскія [22, 19, л. 294]. Такія ж абставіны характэрны і для ўзнікнення дагаворных чырвоных куткоў, назва якіх гаворыць сама за сябе. Становішча дагаворных устаноў было катастрафічным, таму што ў мясцовых ініцыятараў сродкаў не хапала, шэфы часта забываліся наведваць падшэфныя хаты-чытальні, часта наогул адмаўляліся даваць грошы [14, 216, л. 38].

Дырэктывамі адпаведных устаноў прадпісвалася мець сцэны ў кожным народным доме і куткі У.І.Леніна ва ўсіх хатах-чытальнях. У сувязі са стварэннем у кожнай акрузе паказальных раёнаў для мясцовых хат-чытальняў прадугледжвалася выпіска дадатковай перыёдыкі [23, 19, л. 83]. Аднак у цэлым матэрыяльны стан палітасветустаноў заставаўся вельмі цяжкім. У 1924 г. толькі 45% хат-чытальняў знаходзіліся ў спецыяльна адведзеных будынках. Па другіх даных – 23%, 12%



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– у адным памяшканні з сельскім Саветам, астатнія ў сялянскіх хатах [38, 1277. л. 35]. У раённым бюджэце не прадугледжвалася спецыяльнага каштарысу на ўтрыманне хат-чытальняў, быў адзін агульны на ўсе віды палітустаноў. Суадносіны паміж каштарысамі палітасветы і народнай асветы ўстанаўліваліся як 1 да 5, аднак ні ў адной акрузе гэтыя суадносіны не вытрымліваліся [22, 19, л. 299]. Адпаведна бюджэту 1924/25 г. на народную асвету выдзялялася каля 2,5 млн. рублёў, з іх на працу ў вёсцы каля 25 тыс., аднак заўважым, што з гэтай сумы, па даных НК Рабоча-сялянскай інспекцыі, было выкарыстана чамусьці толькі 10 тыс. руб. [38, 2178, л. 66].

Акругі таксама не выдзялялі сродкаў на хаты-чытальні, што, безумоўна, не садзейнічала развіццю ініцыятывы хатнікаў. У 1924 г. на гаспадарчыя расходы прадугледжвалася толькі 5 руб., на гэтую суму нельга было забяспечыць рамонт, ацяпленне і інш. Некаторыя раёны задавальнялі гаспадарчыя патрэбы хат-чытальняў па чарзе [38, 1277, л. 11]. У паказальным Шклоўскім раёне палітасвет спыніў работу, заняўшыся рамонтам і абсталяваннем трох хат-чытальняў [24, 541, л. 54]. Некаторыя загадчыкі непасрэдна выходзілі на шэфаў і прасілі заплаціць пэўную суму за рамонт, таму што “раённы палітасвет сродкаў не мае” [20, 6, 4 адв.]. Чэрвеньскі РПА прапанаваў перадаць хатам-чытальням усе сады, агароды, лугі, якія знаходзяцца непадалёку, каб хатнікі змаглі перайсці на самазабеспячэнне [19, 216, л. 82]. Загадчык Хутарской хаты-чытальні гэтага раёна, каб знайсці сродкі, планаваў зрабіць падпісны ліст і распаўсюдзіць яго сярод грамадзян [14, 187, л. 21].

Вынікі праверкі поўнасцю адпавядалі паведамленням з месцаў. Напрыклад, у справаздачы Мінскага акруговага палітасвета канстатавалася, што “зімовы перыяд 1924/25 г. для многіх хат-чытальняў аказаўся вельмі цяжкім. У некаторых раёнах яны засталіся без дроў і святла, з-за адсутнасці сродкаў не маюць дастатковай мэблі. У большасці сваёй хаты-чытальні брудныя, няўтульныя, некаторыя па сваім знешнім выглядзе ўбогія і не прыцягваюць наведвальнікаў” [14, 64, л. 141]. Надзвычай важнай і адначасова складанай аказалася праблема кадраў. Ад іх ініцыятывы і кваліфікацыі залежаў поспех партыйнай лініі. Як вядома, на той час спецыялістаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітасветработы не існавала зусім, ды і больш-менш адукаваных людзей не хапала. Прынцып "чыя хата прызнана чытальняй, той яе і ўзначальвае" не мог быць эфектыўным, таму што ўся дзейнасць такой установы заключалася ў атрыманні газет.

ЦВК БССР быў вымушаны звярнуцца да работнікаў культуры, ураджэнцаў Беларусі, з заклікам: "Ваша вызваленая Радзіма кліча вас да сябе". На першым часе кадры папаўняліся з ліку былых чырвонаармейцаў, членаў батальённых ці палкавых культурна-асветных аб'яднанняў. Большасць з іх не ведала ўмоў Беларусі, асаблівасцей яе вясковага ўкладу і народнай культуры, аднак дакладна выконвала лінію партыі. Была спроба стварыць сістэму падрыхтоўкі кадраў для палітасветных установ. У красавіку 1921 г. ЦК РКП(б) накіраваў цыркуляр у рэспубліканскія партыйныя арганізацыі, які быў прадубліраваны на месцах. Згодна з ім у Мінску "ў сувязі з выкананнем важнейшых задач камуністычнай асветы мас" з 20 жніўня 1921 г. адкрываліся 6-месячныя курсы для палітасветработнікаў. Яны павінны былі рыхтаваць з рабочых і сялян работнікаў па асобных відах палітасветы: клубнай справе, бібліятэчнай, музейна-экскурсійнай, па ліквідацыі непісьменнасці. У нізавыя арганізацыі спускалася разнарадка [18, 148, л. 117]. Аднак трэба прызнаць, што дадзены дакумент – яшчэ адна ілюстрацыя адарванасці партыйных органаў ад рэальнага жыцця. Не хапала сродкаў для таго, каб наладзіць работу курсаў, ды кандыдатуры слухачоў курсаў таксама падабраць было складана. Праўда, некаторыя даследчыкі [391, с. 22] прыводзяць лічбы некалькіх соцень і нават тысяч падрыхтаваных палітасветработнікаў у Беларусі, што, на наш погляд, малаверагодна.

У пачатку 1920-х гг. асноўнай крыніцай кадравага папаўнення аказалася армія. Многія палітасветработнікі павятовага і валаснога ўзроўняў з'яўляліся ўчарашнімі чырвонаармейцамі, і метады іх дзеянняў былі адпаведныя. Дастаткова выразны дакумент – наступная заява з неразборлівым подпісам: "Як член РКП(б) 38-га стралковага палка, маючы прызванне да культасветработы, добраахвотна прыняў на сябе вядзенне спраў палітасвета Крайскай воласці" [18, 406, л. 3]. Адзін з такіх работнікаў, Я.Лукін, паведамляў вышэйшаму начальству, што насельніцтва супраць яго "довольно обострилось, и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этим затруднялась газетная агитация”. Праз некаторы час ён жа паведамляў з другой воласці: «За жнівень 1922 года асабіста мною распаўсюджаны па вёсках на мітынгах лістоўкі “Што павінен ведаць селянін аб адзіным натуральным падатку” і “Зварот да сялян наркама земляробства Якавенкі”. Лістоўкі пра халеру таксама размеркаваны, а з удзельнікаў культасветгуртка выдзелена сантройка, якая абавязана кантраляваць чысціню на вёсцы... Выпісваем газету “Бедната”, але на рукі не даём, бо сяляне рвуць яе на цыгаркі, а не карыстаюцца друкаваным словам» [18, 165, л.181].

Пытанне аб падборы кадраў, якія адпавядалі б вылучаным задачам, паўстала вельмі востра з 1924 г., калі сфарміравалася структура і вызначылася мэта сельскіх палітасветустаноў. У плане работы ГПА на 1924/25 г. першым пунктам стаяла неабходнасць сур’ёзнага падбору кадраў палітасветы на вёсцы шляхам гутарак, знаёмства з анкетамі, перапіскі [19, 23, л. 125]. На падрыхтоўку кадраў звярталі ўвагу розныя інстанцыі. Не выпадкова нарада старшынь райвыканкамаў у лютым 1925 г. вырашыла ў 1925/26 навучальным годзе адчыніць пазашкольны тэхнікум і пачаць перападрыхтоўку хатнікаў [26, 1766, л. 28]. Большасць загадчыкаў сельскіх палітасветустаноў з’яўляліся членамі партыі ці камсамола. Згодна даных партыйных органаў, члены КП(б)Б складалі сярод іх 13,7%, кандыдаты ў члены партыі – 18%, члены КСМ – 45,5%, беспартыйныя – толькі 22,8% [23, 19, л. 295]. Безумоўна, лічбы не могуць быць дакладнымі па прычыне значнай цякучасці кадраў. Кадравая сітуацыя мянялася штодня, аднак прынцып падбору па партыйнай прыналежнасці прасочваецца досыць выразна. Што тычыцца агульнаадукацыйнага ўзроўню, то, напрыклад, большасць загадчыкаў народных дамоў і хат-чытальняў Мінскай акругі мелі толькі пачатковую адукацыю [14, 159, л. 74, 75].

Па гэтай прычыне пажаданага эфекту не прынеслі летнія курсы перападрыхтоўкі хатнікаў, арганізаваныя ў 1925 г. у Віцебску, Магілёве, Мінску. Як сведчаць афіцыйныя дакументы, яны не далі належных вынікаў. Дарэчы, з 60 слухачоў мінскіх курсаў 54 мелі дамашнюю ці пачатковую адукацыю, лекцыі ім чыталі выкладчыкі з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Мінскія курсанты выпусцілі нумар насценгазеты, падрыхтавалі матэрыял для часопіса, аднак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпусціць яго не змаглі. Пры закрыцці курсаў паставілі спектакль [29, 529, л. 76, 77, 78]. Адзначалася, што да “метадычнай працы хатнікі абсалютна не падрыхтаваны, адсутнічае належная ініцыятыва, многія не ўмеюць арганізаваць свой актыў і з’яўляюцца адзіночкамі” [38, 1277, л. 23]. Акрамя гэтага, хатнікі не займаліся і самаадукацыяй. Як паведамлялася ў адным з дакументаў, “некаторыя нават не чытаюць газет, што адбіваецца на рабоце хат-чытальняў. Метадычную літаратуру не перапрацоўваюць і нават не разразаюць самай неабходнай” [14, 208, л. 148].

Дзеля паляпшэння работы хатнікаў у многіх месцах практыкаваўся абмен вопытам на больш-менш рэгулярна праводзімых канферэнцыях з папярэдне вызначанымі тэмамі. На іх абмяркоўваліся пытанні ўдзелу палітасветработнікаў у агульнадзяржаўных кампаніях, масавай рабоце, у працы настаўніцкіх гурткоў, антырэлігійнай прапагандзе, выпуску насценных газет, іншых відах работы [14, 4, л. 125]. Аднак на адной з нарад засведчана, што “за 9 год Галоўпалітасвет не выхаваў майстроў-хатнікаў, бо гэта нялёгка” [8, 300, л. 71].

Намі адзначалася вышэй цякучасць кадраў. Адной з прычын гэтага з’яўлялася дрэннае матэрыяльнае забеспячэнне хатнікаў, аклад якіх у сярэдзіне 1920-х гг. вагаўся ў межах 12–26 руб., хаця згодна ўрадавых пастаноў павінен быў раўняцца зарплаце настаўніка, 30–36 руб. у месяц. Цякучасць сярод загадчыкаў хат-чытальняў, напрыклад Магілёўскай акругі, выражалася наступнымі данымі: з 40 работнікаў толькі трое мелі стаж 4 гады, 13 чалавек – 2 гады, адзін – 3 гады і 23 хатнікі працавалі менш года [23, 5, л. 40]. Пытанне цякучасці кадраў абмяркоўвалася на розных узроўнях. У ліку мер яе ліквідацыі разглядаліся магчымасць павелічэння зарплаты, адкрыццё спецыяльнай навучальнай установы, умацаванне існуючых хат-чытальняў без пашырэння іх сеткі і інш. [23, 19, л. 298].

Большасць хатнікаў з’яўляліся сакратарамі камсамольскіх ячэек і таму ператваралі сельскія палітасветустановы ў клубы моладзі. Старшыня ГПА, адзначаючы гэты факт, канстатаваў, што “работа ідзе па лініі найменшага супраціўлення, робяцца спектаклі і танцулькі” [23, 11, л. 62]. Сялян сталага ўзросту хата-чытальня не прываблівала. Вырашыць іх праблемы гэтыя ўстановы не маглі па прычыне сваёй матэрыяльнай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кадравай слабасці. Культурная рэвалюцыя на вёсцы прывабіла толькі моладзь, якая стала яе актыўным удзельнікам і праваднікам.

На нашу думку, самага падрабязнага вывучэння патрабуе пытанне аб ролі сельскага настаўніцтва ў жыцці вёскі, у тым ліку і ў культурным. Безумоўна, настаўнікі з'яўляліся галоўнымі выканаўцамі ўсіх партыйных і савецкіх дырэктыў. Каб уявіць ролю настаўніцтва ў тагачасным жыцці, працытуем справаздачу М.Ліпскага, настаўніка Пухавіцкай сямігодкі: «10 дзён працаваў па сельскагаспадарчым падатку, у камісіі па праверцы пісьменнасці дапрызыўнікаў, па перавыбарах сельсаветаў, з'яўляюся членам і санітарным апекуном Пухавіцкага сельсавета, старшынёй рэвізійнай камісіі камітэта сялянскай узаемадапамогі, выступаў з дакладамі "Лясы мясцовага значэння" і "Карысць страхавання" на сходах грамадзян, 2 разы на тыдзень праводзіў заняткі ў вячэрняй школе, пішу артыкулы ў насценную газету» [44, 127, л. 25]. Відавочна, што работа праводзілася значная, прычым у вольны час і без матэрыяльнага заахвочвання [141]. Аднак партыйныя органы дзеля надання ўсёй рабоце палітычнага зместу распарадзіліся арганізаваць курсы палітпадрыхтоўкі для сельскай інтэлігенцыі. Па Мінскай акрузе праз іх прайшло каля 70% настаўнікаў, а вось урачы, аграномы палітпадрыхтоўку праігнаравалі [14, 197, л. 30].

Вышэй адзначалася, што адной з умоў поспеху культурнай рэвалюцыі з'яўлялася ўсямернае развіццё самадзейнасці мас. Як адну з праяў такой палітыкі можна расцэньваць стварэнне савета хаты-чытальні, у які ўваходзілі загадчык, тры прадстаўнікі ад сялянства і па адным прадстаўніку ад ячэек. Савет быў справаздачны перад раённым палітасветам. Аднак моцных саветаў існавала мала, на думку кіраўніцтва, усяго толькі каля 20% [23, 19, л. 296].

Метады кіравання нізавымі палітасветустановамі – яшчэ адна праблема. Шматлікія архіўныя дакументы сведчаць, што быў абраны стыль каманды, загадаў, пасылкі ўпаўнаважаных, якія не аказвалі ні практычнай, ні маральнай падтрымкі, толькі праводзілі "накачку". Асабліва вызначалася кіраўніцтва Барысаўскага павятовага палітасвета, якое патрабавала рэгулярных справаздач з валасцей, таму што "інакш немагчыма арыентавацца, у якім стане работа і ў якім кірунку рабіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульныя кіруючыя ўказанні. Невыкананне загаду пацягне за сабою суровыя меры пакарання, аж да арышту загадчыка валпалітасвета і перадачу яго пад суд за бяздзейнасць на службе" [18, 381, л. 21, 41].

Паўстае пытанне: чаму ўзнікла такая схема адносін у сістэме палітасветы? На нашу думку, па-першае, яна з'яўлялася часткай структуры савецкага грамадства і пазбегнуць уздзеяння камандных сродкаў кіравання не магла; па-другое, як кіраўніцтва, так і радавыя работнікі палітасветы аказаліся маладасведчанымі людзьмі ў сваёй галіне, а некаторыя – нават і малаадукаванымі, таму яны больш спадзяваліся на сілу загаду і пагрозы, чым на свае веды і аўтарытэт. Патрэцяе, увачавідкі праяўляўся "астаткавы прынцып" пры размеркаванні сродкаў, інакш не з'яўляліся б наступныя рэзалюцыі: "Служба ў хатах-чытальнях не патрабуе цяпла ці спецыяльнага адзення, расходаў на ацяпленне і асвятленне" [18, 383, л. 416].

Паміж кіруючымі і нізавымі кадрамі палітасветаў адбывалася як бы нейкая гульня: адны аддавалі загады, другія (асабліва тыя, хто меў некаторы жыццёвы вопыт) пісалі аптымістычныя справаздачы. Вось, напрыклад, як выглядала справаздача Крайскага валпрасвета: "Работа вялася быццам бы нармальна, але справаздачы не высылаліся з-за адсутнасці хоць трохі адукаванага загадчыка. У сакавіку быў пастаўлены спектакль з канцэртам на карысць Чырвонай Арміі. На выпіску газет сродкаў не было... Школьныя работнікі ў прыватным парадку куплялі газету і арганізоўвалі галосныя чыткі. Чыталі вечарамі ў школе і ў заключэнне пад шумок праводзілі мітынгі, якія не рэгістраваліся, але прыкладна 12. Большая частка сялян цікавіцца газетай, і пасля чытання свежай газеты лёгка правесці мітынг" [18, 406, л. 78]. На нашу думку, справаздача была разлічана на кіраўніцтва павятовага палітасвета і выканана ў жанры лепшых бюракратычных узораў, што характарызуе дастаткова высокі адукацыйны ўзровень яе аўтара, а не сапраўдны стан палітыкаасветніцкай работы ў воласці.

Захавалася зводка работы Лагойскай хаты-чытальні з 1 па 15 студзеня 1923 г. Згодна з ёй праца кіпела кожны дзень: 1-га – палітычны агляд за 1922 г.; 2-га – лекцыя аб паходжанні жыцця на Зямлі; 3-га – лекцыя аб паходжанні чалавека;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4-га – лекцыя аб рэвалюцыі 1905 г.; 5-га – свабодная вечарына; 6-га – аб свяце КСМ, аб арганізацыі драмгуртка; 7-га – святкаванне гадавіны КСМ, даклад аб значэнні Камуністычнага саюза моладзі, канцэрт і г.д. Загадчык прыводзіць вялікія лічбы наведвальнікаў – ад 20 да 100 чалавек [18, 193, л. 18], што павінна засведчыць значную папулярнасць хаты-чытальні. Аднак калі яна і была, то толькі сярод моладзі, таму што справаздача адлюстроўвае палітыка-асветны характар работы, якая прываблівала ў асноўным моладзь і ператварала хату-чытальню ў камсамольскі цэнтр.

Пры аналізе выступлення на шматлікіх канферэнцыях, нарадах ствараецца ілюзія бурнай дзейнасці. Напрыклад, на нарадзе прадстаўнікоў павятовых палітасветаў у снежні 1921 г. па Мінскім павеце прыводзіліся такія лічбы: “Арганізавана 249 мітынгаў, 131 лекцыя, 37 беспартыйных канферэнцый, 13 спектакляў. Другія паветы давалі значна меншыя лічбы, а прадстаўнік Мазыршчыны наогул заявіў, што хаты-чытальні існуюць толькі на паперы”. Загадчык Бабруйскага палітасвета паведамляў аб слабай рабоце хат-чытальняў, таму што “іх загадчыкі не атрымоўваюць зарплаты, аднак апошнім часам сталі прызначаць чырвонаармейцаў і работа пачала наладжвацца”. Звярталася ўвага на “контррэвалюцыйныя настроі сярод школьных работнікаў” [18, 149, л. 4, 5]. Гэтыя выступленні адлюстроўваюць розныя падыходы да справаздачы, прама супрацьлеглую ацэнку дзейнасці хат-чытальняў і тым самым розную ступень падрыхтаванасці і кемлівасці мясцовага кіраўніцтва.

Галоўпалітасветам у 1925 г. для загадчыка была распрацавана даволі цікавая інструкцыя. Напрыклад, у §7 гаварылася: “Перад адкрыццём хаты-чытальні ўсё павінна быць падрыхтавана: запалена святло, чыста вымыта і падмецена, перыядычны друк раскладзены на сталах, плакаты і лістоўкі развешаны па сценах”. У §8 загадчыкаў заклікалі зрабіць хаты-чытальні “як мага больш зручнымі і ўтульнымі для наведвальнікаў. Пры наяўнасці некалькіх наведвальнікаў приступаць да чыткі газет і абмеркавання”. Мабыць, зверху ўяўлялася, што як толькі сяляне пачнуць чытаць, дык адразу стануць падтрымліваць палітыку савецкай улады. Па гэтай прычыне ў §12 гаварылася пра абавязак хатніка “цесна зліцца з масай, бліжэй да яе падысці, прыслухоўвацца да яе патрэб, культур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-бытавых патрабаванняў”. Самае галоўнае заключалася ў апошнім параграфе: “Загадчык хаты-чытальні сумесна з яе саветам адшуквае сродкі з мясцовага фонду для задавальнення патрэб хаты-чытальні, рамонту, ацяплення, асвятлення, утрымання тэхнічнага персаналу. Аб выніках пажадана рабіць справаздачы на валасных выканкамах, копіі іх адсылаць у павятовы палітасвет” [18, 151, л. 249].

У адносінах да ўсёй сістэмы палітасветы на справе пераважала думка аб яе другараднасці, хаця на словах прызнавалася вялікае значэнне. Доказам гэтага факта можа быць астаткавы прынцып матэрыяльнага забеспячэння, аб чым ужо гаварылася раней. Дарэчы, раённае звяно палітасветы таксама слаба ўяўляла сваё месца паміж прафсаюзам і камсамолам [14, 216, л. 39]. У самой структуры палітасветы квітнела “камчванства” ў адносінах да ніжэйшых устаноў. У канцы 1926 г. старшыня ГПА С.А.Шамардзіна на пасяджэнні інспектуры настойвала на “закручванні гаек”, на высвятленні “фактычнага становішча”. Была распрацавана падрабязная схема праверкі ўстаноў палітасветы, якая ўключала блокі пытаняў аб матэрыяльным стане, усіх кірунках працы, адносінах насельніцтва, справаздачнасці [14, 211, л. 94, 121]. Аднак трэба прызнаць, што нізавыя работнікі не спяшаліся выконваць загады, аб чым сведчаць шматлікія грозныя распараджэнні ў іх адрас. Напрыклад: “...пры абследаванні палітасветпрацы высветлілася, што некаторыя дырэктывы райпалітасветкамамі не выконваюцца... Таксама (што асабліва характэрна) не выконваюцца тыя планы, якія складаюцца самімі ж РПА. Такім асобым гонарам ад РПА да выканання дырэктыў заражаюцца і некаторыя хаты-чытальні. Напрыклад, загадчыкі Жодзінскай, Грабенскай хат-чытальняў не прачыталі ніводнага ліста, якія ім пасылаліся, нягледзячы на жыццёвую іх неабходнасць для працы” [14, 166, л. 152]. Падчас раённых канферэнцый хатнікаў усе выступоўцы скардзіліся на адсутнасць увагі і дапамогі з боку раённага начальства, на бессістэмную і бязмэтавую перакідку загадчыкаў вясковых палітасветустаноў з месца на месца, нават без іх згоды і ведама акруговага кіраўніцтва [14, 444, л. 12].

Падчас праверкі стану вясковых палітасветустаноў быў занатаваны ў афіцыйных дакументах вывад, што некаторыя кіраўнікі глядзяць на культработніка як на «выканаўцу іх волі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і задання, а не як на роўнага сабе работніка ў агульнай справе. Прычым найбольш актыўная частка нагружаецца “да адказу” на шкоду сваёй асноўнай рабоце. Адносіны да неактыўнай часткі адмоўныя, нават момантамі пагардлівыя, не наш, маўляў, элемент» [38, 2175, л. 39]. Асобныя кіраўнікі лічылі, што вылучэнне хатнікаў на грамадскую працу “служыць доказам іх аўтарытэту ў вачах насельніцтва” [14, 159, л. 65 адв.]. Перапіска паміж загадчыкамі вясковых паліт-асветустаноў і раённым начальствам адлюстроўвала толькі патрэбу ў статыстыцы, але як ажывіць работу, прыстасаваць да інтарэсаў вёскі, рэкамендацый не давалася. Фактычна загадчыкі хат-чытальняў працавалі самі па сабе.

Каб трымаць палітыка-асветніцкую работу на вёсцы пад кантролем, раёны практыкавалі выклікі хатнікаў з вуснымі дакладамі. Уводзілася спецыяльная справаздачнасць. На чатырох вялікіх старонках размяшчаліся самыя падрабязныя пытанні па раздзелах “Агульныя звесткі”, “Масавая работа”, “Гурткі”, “Бібліятэкі”, “Газеты”, “Куткі”, “Даведачная праца”, “Кааператыўная прапаганда”, “Ліквідацыя непісьменнасці”, “Пажаданні хатнікам”. Для многіх вясковых работнікаў стымулам для запаўнення справаздачных формаў з’яўляўся “страх перад начальствам” [15, 9, 72, 73]. Запаўняць іх трэба было ў двух экзэмплярах штомесячна, і, безумоўна, малапісьменныя хатнікі рабілі гэта як маглі. Аднак сустракаюцца і досыць цікавыя справаздачы, аб якіх будзе сказана ніжэй. Трэба заўважыць, што раздзелы справаздачнай ведамасці адпавядаюць асноўным кірункам асветніцкай работы на вёсцы, канчатковае вызначэнне якіх прыпадае на 1924 г. Акрамя гэтага, кожная хата-чытальня павінна была складаць каляндарныя планы, кантраляваць дзейнасць гурткоў, весці ўлік актыву, культурных сіл, справаздачныя кнігі і дзённік.

Пры абмеркаванні працы вясковых палітасветустаноў заключэнне рабілася не на іх карысць. Як сведчаць архіўныя дакументы, яе прызнавалі нездавальняльнай у пераважнай большасці выпадкаў. Падставай для такіх рашэнняў з’яўляліся розныя ўмовы: адсутнасць планаў, невыкананне дырэктыў вышэйшых органаў, бяздзейнасць гурткоў, слабы кантакт з настаўніцтвам. Абмяжуемся толькі дзвюма крыніцамі – пратаколамі пасяджэння Магілёўскай саўпартшколы і інспектарскай нарады Мінскага акруговага аддзела народнай асветы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першым на падставе вынікаў зімовай практыкі курсантаў у 24 раёнах 10 акруг зазначалася: “Вельмі малая ўвага надаецца палітасветустановам з боку партыйных і савецкіх установў. Палітасветустановы ў загоне, шмат у прахадных пакоях, сумесна з сельсаветамі, у сялянскіх дрэнных хатах або ва ўласным заняпалым будынку. Слабы падбор хатнікаў, калі ёсць здольныя, дык яны перагружаны... Працай хат-чытальняў ніхто не цікавіцца і не кіруе, працуюць як давядзецца. Адсутнасць уліку і планавасці, таму не можа быць і пераемнасці... Абсталяваны хаты дрэнна” [14, 187, л. 398]. Другі дакумент, на нашу думку, – дадатковая ілюстрацыя да першага. Ён напісаны на аснове абследавання хат-чытальняў у Смалявіцкім і Лагойскім раёнах і канстатуе: “Верхменьская хата-чытальня зусім не ацяпляецца, Кораньская знаходзіцца ў былым ксяндзоўскім доме, дом вялікі, яшчэ моцны, але дах згніў, цячэ, столь гніе, коміны разваліліся. 100 руб., якіх патрабаваў загадчык на рамонт даху, не было адпушчана, а цяпер і 500 руб. будзе мала. У адным памяшканні і бэлькі абваліліся, наогул увесь дом пад пагрозай. Дах над чытальняй так цячэ, што дажджом змывае плакаты са сцен, а з плакатаў – фарбу. Коміну вышэй столі няма, дым сцелецца пад дахам, а іскры сыплюцца са столі...” [8, 300, л. 153]. Вывад з гэтых фактаў быў зроблены адпаведна прынятым у той час правілам: загадчыку хаты-чытальні аб’явілі вымову, а раённыя арганізацыі абавязалі зрабіць рамонт.

Хацелася б засяродзіць увагу на тым, што мы спецыяльна не падбіралі адпаведныя негатыўныя факты, каб адлюстраваць дрэнны стан вясковых палітасветустаноў і нізкую эфектыўнасць іх працы. Такіх матэрыялаў архіўныя фонды захоўваюць вялікае мноства. Большасць з іх напісаны хаця і не вельмі адукаванымі, аднак адказнымі за справу людзьмі і не могуць не хваляваць сённяшняга чытача. Калі даследуюцца такія дакументы, калі сустракаецца характарыстыка палітасветработы “ні к чорту не гадзіцца”, то ствараецца абгрунтаванае ўражанне яе нездавальняльнага стану. І не таму, што яна адставала ад тэмпаў гаспадарчага будаўніцтва, патрэб сялянства і часта зменлівай партыйнай лініі, а перш за ўсё па прычыне яе неадпаведнасці сацыяльна-псіхалагічнаму настрою вёскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, працэс вызначэння структуры сельскіх паліт-асветустаноў у асноўным завяршыўся да 1923 г., у далейшым адбывалася яе ўдасканаленне. Аднак ні матэрыяльнае, ні кадравае забеспячэнне хат-чытальняў не адпавядала пастаўленым перад імі задачам. Вясковыя ўстановы палітасветы не атрымлівалі неабходнай метадычнай, інфармацыйнай і псіхалагічнай падтрымкі з боку кіруючых органаў.

### *2.2.2. Уніфікацыя формаў і метадаў*

Сістэматычная палітыка-асветніцкая работа ў Беларусі пачынае развівацца пасля X з’езда РКП(б), які паставіў задачу сканцэнтраваць камуністычную асвету ў руках ГПА і вызначыў яе галоўны кірунак у сувязі з перажываемым момантам. Уся работа палітасветустаноў падпарадкоўвалася прапагандзе нэпа, аб чым гаварылася на з’ездзе іх прадстаўнікоў у красавіку 1921 г. У маі пад грыфам “Вельмі тэрмінова” ўсім органам палітасветы была разаслана інструкцыя аб пачатку агітацыйнай кампаніі з 25 мая з умовай “ахапіць нават самыя глухія вёскі”. Агітатарам даваўся наказ: “Тлумачыць сялянам сэнс замены развёрсткі харчпадаткам, паказваць магчымасць свабоднага абмену, улічваць і выкарыстоўваць усе мастацкія сілы паветаў: тэатральныя трупы, хары, аркестры, накіроўваць у вёску сацыяльную і эканамічную літаратуру” [17, 218, л. 120].

Тлумачальнай рабоце па пытаннях новай эканамічнай палітыкі надавалася надзвычайнае значэнне, аднак, нягледзячы на інструкцыі і цыркуляры, малаадукаваныя выканаўцы не маглі імі эфектыўна карыстацца. Таму мясцовыя ўлады праяўлялі сваю ініцыятыву. Мінскі павятовы палітасвет, напрыклад, патрабаваў ад нізавых устаноў штотыднёвых лічбавых справаздач аб канцэртах, мітынгах па пытаннях нэпа, аб палітычнай сітуацыі на вёсцы і адначасова “пагражаў прыцягнуць да адказнасці ў выпадку адсутнасці справаздачы” [18, 148, л. 10, 30]. Узнікла ідэя арганізаваць на вёсцы выставы, прысвечаныя нэпу. На месцы рассылаліся камплекты плакатаў, якія павінны былі дапаўняцца канкрэтнымі лічбамі, узятымі ў выканкамах, і некалькімі дзесяткамі экспанатаў. Аднак спадзяванні на ініцыятыву нізавых палітасветустаноў не маглі спраўдзіцца ні ў якім разе, таму што нізы не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разумелі сутнасці нэпа, ды цыркуляры ішлі на вёску самыя супрацьлеглыя па змесце і дадавалі неразбярыхі.

Сацыяльна-псіхалагічную сітуацыю на месцы ўскладнялі іншыя агітацыйныя кампаніі, якія аб'яўляліся адна за адной. У пачатку 1921 г. праводзілася агітацыя за пажарную бяспеку, 25 студзеня пачынаўся тыднёвік барацьбы з бандытызмам. З Мінска ў паветы павінна была выехаць група артыстаў, таму на месцах "у парадку баявога загаду патрабавалася прывесці памяшканні ў належны выгляд" [15, 218, л. 1]. Агітацыя супраць бандытызму звязвалася з барацьбой супраць дэзерцірства. У лютым 1921 г. быў абвешчаны тыдзень дэзерціра, і да яго была напісана нават п'еса "Дэзерцір". У маі 1921 г. пад грыфам "Сакрэтна" ўсім валасным аддзелам народнай асветы, палітасветам і культасветам накіроўвалася наступнае пісьмо: "...Развіць шырокую агітацыю з дапамогай партыйных і культурных сіл; растлумачваць сялянству ўстойлівасць савецкай улады, звяртаючы ўвагу на мір з Польшчаю, дагавор з Германіяй, шырока знаёміць сялянства з новай эканамічнай палітыкай. Гэтыя формы асветніцтва абавязкова суправаджаць спектаклямі, сцэнкамі, рознымі п'есамі агітацыйнага характару... Выкананне – у парадку баявога загаду, адказнасць ускладаецца на валасныя аддзелы асветы і палітасветы" [18, 151, л. 21].

Аднак не зусім спрыяльнымі для агітацыі і прапаганды з'яўляліся эканамічныя ўмовы. Пачалася пасяўная, сялянства спяшалася ў пару адсеяцца, пасяўныя праблемы хвалявалі таксама большасць работнікаў валасных устаноў, сельскіх Саветаў і загадчыкаў хат-чытальняў. Безумоўна, у многіх месцах палітыка-асветніцкая дзейнасць фактычна адсутнічала. Цэнтр спрабаваў паправіць справу суровымі загадамі. Вось пісьмо Галоўпалітасвета ад 18 мая 1921 г.: "Большая частка літаратуры аддаецца паветам для забеспячэння хат-чытальняў і клубаў. З мясцовых справаздач бачна, што літаратура ў павятовых палітасветах залежваецца, а хаты-чытальні і бібліятэкі пустуюць з-за адсутнасці літаратуры. ГПА прапануе тэрмінова ліквідаваць гэтыя недапушчальныя з'явы... Вінаватыя ў затрымцы будуць прыцягвацца да адказнасці персанальна" [17, 218, л. 20]. У сваю чаргу з месцаў паведамлялі аб немагчымасці наладзіць эфектыўную работу, таму што "нават на базарах і кірмашах мітынгі не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдаюцца, людзі занятыя тым, за чым прыехалі, – гандлем”. Напрыклад, 10 ліпеня ў Барысаве на базары быў арганізаваны мітынг, аднак, “нягледзячы на нядзелю і ігру аркестра духавой музыкі, людзі не сабраліся” [18, 148, л. 100].

Высокія патрабаванні да нізавых палітасветустаноў не падмацоўваліся адпаведнымі адносінамі кіраўніцтва, таму што адпавядалі “апошняй ступені важнасці”. Аб гэтым, між іншым, сведчыць сумеснае пісьмо ЦК КП(б)Б і ГПА ад 10 жніўня 1921 г. у адрас павятовых камітэтаў партыі: “Павятовыя палітасветы маюць вельмі важнае значэнне ў барацьбе з дэзерцірствам і бандытызмам і выкананні харчпадатку. Тым не менш партыйцы часта накіроўваюцца на другую савецкую работу. Інструктары палітасветы, што прыязджаюць з Цэнтра, трапляючы ў павятовыя камітэты, атрымліваюць іншыя заданні. Пры такой з’яве палітасветы да гэтага часу не могуць арганізаваць і пачаць работу, выконваць дырэктывы і заданні. ЦБ КП(б)Б і ГПА прапануюць накіраваць у павятовыя палітасветы не менш трох камуністаў, прызнаць палітасветработу ўдарнай, забяспечыць інвентаром, звярнуць увагу на валасныя палітасветы, вярнуць у павятовыя палітасветы адкліканых работнікаў” [18, 148, л. 138]. Мясцовыя палітасветработнікі скардзіліся, што начальства не звяртае ўвагі на палітасвету, не аказвае ніякай дапамогі, пасылае палітасветніка на збіранне харчпадатку [18, 179, л. 16].

Пасля таго як у жніўні пачынаўся збор харчовага падатку, нізавыя палітасветустановы атрымлівалі велізарную колькасць распараджэнняў. Сярод іх было і такое: “Дарагія таварышы! У бліжэйшы час пачынаецца кампанія па зборы збожжавага падатку. У сувязі з неўраджаем у Паволжы гэтае пытанне набывае яшчэ большае значэнне. Да сённяшняга часу вялася работа па падрыхтоўцы сялянскіх мас і тлумачэнні значэння пераходу да харчпадатку. Зараз харчовыя органы прыступаюць да збору ўраджаю, а сяляне яшчэ недастаткова ўразумелі значэнне харчпадатку і, можа быць, спачатку не адгукнуцца на заклік рабоча-сялянскай улады, і работа па зборы падатку замарудзіцца, таму палітасвет лічыць неабходным: 1. У тэрмінова ўдарным парадку ўзмацніць агітацыйную работу на карысць харчовага падатку, дзеля чаго часцей арганізоўваць сумесна з камсамольскай ячэйкай сходы сялян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

<...> 3. У месцах, дзе знаходзяцца нарыхтоўчыя пункты і дзе чакаецца вялікая колькасць людзей, неабходна адкрываць агітпасты, у задачу якіх уваходзіць: 1) расклейка газет, плакатаў, лістовак, заклікаў; 2) распаўсюджанне літаратуры; 3) арганізацыя гутарак, дакладаў, лекцый; 4) агітацыя аб тэрміновай здачы харчпадатку, звароце насеннай пазыкі; 5) прыём скаргаў". (Звернем увагу: скаргі прымаў той, хто нічога не вырашаў.) У другім пісьме рэкамендуецца адкрываць чытальні непасрэдна на нарыхтоўчых пунктах, каб селянін, чакаючы прыёму падатку, мог пачытаць газету, каб "быць у курсе ўсіх падзей". Пісьмо патэтычна папярэджвала: "Момант сур'ёзны! Кожная хвіліна дарагая!" [18, 151, л. 28]. 15 снежня 1921 г. пачаўся першы двухтыднёвік па зборы харчпадатку. Установам палітасветы загадвалася "арганізаваць гутаркі сярод сялянства і тлумачыць, карыстаючыся газетнымі артыкуламі, неабходнасць здачы натуральнага падатку. Агітацыю за здачу харчпадатку развіваць у вусных газетах. Праводзіць палітсуды, напрыклад суд над селянінам, які не здаў у тэрмін падатак, суд над харчінспектарам, які халатна адносіцца да збору падатку..." [17, 218, л. 217].

Прыведзеныя дакументы, на нашу думку, досыць яскравы прыклад разыходжання задуманага і сапраўднага, таму што з восені 1921 г. сельскія палітасветустановы пераводзіліся на ўтрыманне насельніцтва. Аднак вёска аказалася не ў стане іх падтрымаць, і таму адбывалася хуткае скарачэнне колькасці хат-чытальняў. Выконваць такія інструкцыі фактычна не было каму.

Палітасветныя ўстановы павінны былі весці актыўную агітацыйную работу сярод сялянства, адчыняць агітпункты, арганізоўваць выставы і г.д. Загадчыкі хат-чытальняў былі вымушаны раз'язджаць па воласці для правядзення кампаній, прысвечаных выбарам дэлегатаў на беспартыйныя канферэнцыі, перавыбарам сельскіх і валасных Саветаў і г.д. Кампаніі так надакучылі ўсім, што ў верасні 1921 г. на нарадзе кіраўнікоў павятовых палітасветаў прысутныя гаварылі так: "Мы замучыліся ў лабірынце гэтых кампаній, дзве з якіх вельмі замінаюць адна адной – дапамога галадаючым і харчпадатак. Кампаніі сваё ўжо аджылі" [17, 218, л. 88]. Так меркавалі людзі, але ўлада зрабіла гэты від палітыка-асветніцкай работы надоўга галоўным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш відовішчнай і распаўсюджанай з'явай сталі масавыя мерапрыемствы, прысвечаныя новым савецкім святам. Пачыналіся яны са святкавання ўгодкаў рэвалюцыі 1905–1907 гг. Вось як апісвае такое мерапрыемства загадчык Лагойскай хаты-чытальні: «5 студзеня (1923 г.) адбываліся мітынг і дэманстрацыя сумесна са школай-сямігодкай на чале са старшынёй школьнага савета і двума настаўнікамі. Наперадзе роты Усенавуча – міліцыянеры, партыйныя таварышы з вінтоўкамі, і, нягледзячы на завею, пры першых словах Шкілёнка, які стаяў на трыбуне на базарнай плошчы, хор вучняў заспяваў "Вы жертвою пали", а міліцыянеры адсалютавалі залпам і разышліся стройнымі радамі. Вечарам адбыўся канцэрт самадзейнасці, чатыры разы праспявалі "Інтэрнацыянал", два разы "Песню братьям", "Смело, товарищи, в ногу", прачыталі брашуру "5 января 1905 года" і праслухалі даклад па гісторыі беларускага руху. Вечар закончыўся спевамі "Марсельезы"» [18, 199, л. 19 адв.].

Наступнае свята – угодкі Чырвонай Арміі. У час святкавання адбываліся сходы сялян, дакладней, сялянскай моладзі, на якіх рэкамендавалася "склонять крестьян к подношению Красной Армии вещественных подарков" [14, 49, л. 53].

Зусім незнаёмым, далёкім сялянству аказаўся Дзень Парыжскай камуны, наконт святкавання якога распрацоўваліся спецыяльныя цыркуляры. Згодна з імі тэатры павінны былі ставіць п'есы "Дзень Парыжскай камуны" Львова, "Жакерыя" П.Мерымэ, "Дзень Марата" Глобы і іншыя, музычныя секцыі павінны былі выконваць толькі наступныя творы: "Музычны марш" Л.Бетховена, "Эцюд № 12", "Пахавальны марш" Ф.Шапэна, "Рэквіем" В.А.Моцарта, песні "Смело, товарищи, в ногу". Дэкламаваць можна было наступныя творы: "Песня про Сокола" М.Горкага, вершы Дз.Беднага і іншых пралетарскіх паэтаў [18, 149, л. 21а]. Безумоўна, цыркуляр адлюстроўвае шырокую фантазію аўтара, бо ў тых умовах было невядома, хто, дзе і на чым мог бы выканаць названыя музычныя творы і паставіць п'есы.

Святкаванню Першага мая надавалася вялікая ўвага. У тагачасным друку можна знайсці не адно апісанне гэтага свята. Мы ж нагадаем справаздачу загадчыка Крайскага валаснога палітасвета. Не трэба забываць, што Крайская воласць з'яўлялася прыгранічнай, і таму масавым савецкім мерапрыемствам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надавалася вялікае прапагандысцкае і агітацыйнае значэнне. На наш погляд, справаздача мае характэрны пачатак: «Нягледзячы на тое, што распараджэнне аб святкаванні 1 Мая атрымана позна, усё ж такі гэтае свята праведзена паспяхова. 30 красавіка, у 5 гадзін вечара, быў пастаўлены канцэрт-мітынг, спецыяльна заклікаены падрыхтаваць насельніцтва да першамайскіх свят. Ён пачаўся з выканання "Інтэрнацыянала", першае слова было дадзена палітруку, які падрабязна растлумачыў значэнне свята. Пасля мітынга пачаўся канцэрт з двух аддзяленняў. У першым быў пастаўлены вадэвіль "Лялькі" пад акампанемент раяля, што прайшло даволі прыгожа. Струнны аддзел складаўся са школьных работнікаў і другіх аматараў. Было прайграна некалькі рэчаў з танцаў і песень. Канцэрт-мітынг быў закончаны "Марсельезай" у 10 гадзін вечара. Раніцай 1 Мая на плошчы вакол трыбуны сабраўся народ з усіх вёсак. У 11 гадзін сюды прыйшлі ваенныя часці разам з работнікамі валаснога выканкама і работнікамі асветы з чырвонымі сцягамі і спевамі рэвалюцыйных песень. Чырвонаармейцы і савецкія служачыя былі прыведзены да прысягі, пасля чаго аматары сталі па чарзе высвятляць святкаванне 1 Мая ў нас, у СССР, і ў буржуазных краінах. Потым адбылося шэсце па ўсіх вуліцах мястэчка з лятучымі мітынгамі. Шэсце закончана спяваннем "Беларускай марсельезы". Пасля адбыўся канцэрт» [18, 406, л. 5, 6]. Падобным чынам першамайскія святы адзначаліся і ў другіх месцах. Напрыклад, з Бягомля паведамлялі, што, "нягледзячы на дрэннае надвор'е, святкаванне прайшло цудоўна і вельмі добра" [18, 174, л. 13].

Не вызначалася вялікай арыгінальнасцю і святкаванне ўгодкаў Кастрычніцкай рэвалюцыі. Інструкцыя, спушчаная зверху, рэкамендавала "ўпрыгожыць зелянінай і, дзе магчыма, чырвонымі сцяжкамі афіцыйныя памяшканні і далей дзейнічаць па плану мясцовага камітэта, ячэйкі КПБ і камсамола, арганізуючы ўрачыстыя шэсці і самадзейнасць" [14, 48, л. 15]. У якасці прыкладу нагадаем справаздачу загадчыка Хаценчыцкай хаты-чытальні: "Хата-чытальня бедная, сродкаў ніякіх, нават сцяга няма. Я ўзяў простага палатна, чырвонай фарбы і зрабіў сцяг. Паперы не было, прыйшлося лозунгі пісаць на газетах. 7-га, у 9 гадзін, прыйшлі школьнікі і насельніцтва дзвюх вёсак, сабралася каля сотні чалавек.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 11 гадзін 45 хвілін пад маім камандаваннем стройнымі радамі накіраваліся ў цэнтр, сустрэўшы на дарозе калоны валвыканкама і саўгаса... З рэвалюцыйнымі песнямі ішлі паўз граніцы, з грамадзянамі прыгранічнай вёскі правялі мітынг, спявалі рэвалюцыйныя песні...” [17, 339, л. 68].

Мы ўсведамляем сваё некаторае злоўжыванне цытаваннем архіўных матэрыялаў, аднак, на нашу думку, дзякуючы такім дакладным вытрымкам з тагачасных дакументаў ствараецца досыць выразная карціна ўнутрывясковага культурнага жыцця. Гэты прыём дазваляе зрабіць выснову, што асноўную частку ўдзельнікаў савецкіх мерапрыемстваў складала вясковая моладзь, ахопленая рэвалюцыйным энтузіязмам. Менавіта такі ўзнёслы псіхалагічны настрой моладзі, перш за ўсё камсамольцаў, садзейнічаў на першым часе некаторай прывабнасці новых свят, нягледзячы на цяжкі эканамічны стан вёскі і выкліканую гэтай акалічнасцю псіхалагічную напружанасць.

Такім чынам, правядзенне шматлікіх кампаній у форме розных тыднёвікаў і масавых відовішчных святкаванняў рэвалюцыйных дат стала адной з самых прыметных рыс культурнай рэвалюцыі на вёсцы. Іх аналіз дазваляе зрабіць вывад, што разнастайныя кампаніі і святы ініцыіраваліся дзяржавай. Гэта сведчыць аб яе настойлівым імкненні як мага хутчэй завяршыць культурную рэвалюцыю на вёсцы (мабыць, больш дакладна было б лічыць яе ідэалагічнай).

У пачатку 20-х гг. вялікае значэнне ва ўзмацненні ідэалагічнага ўздзеяння на масы стала надавацца антырэлігійнай прапагандзе. XII з’езд РКП(б) прыняў рашэнне, якое было прадубліравана VII з’ездам КП(б)Б: “Прыступаючы да пастаноўкі сістэмы антырэлігійнай прапаганды і агітацыі як аднаго з дзейсных сродкаў пашырэння партыйнага ўплыву на шырокія працоўныя масы... падкрэсліваем, што толькі праз арганізацыю шырокай сеткі палітасветустаноў, перш за ўсё хат-чытальняў, планамернае забеспячэнне вёскі кніжкай і газетай, створыцца глеба для канчатковага і поўнага выкаранення рэлігійных забабонаў” [272, с. 150]. Такім чынам, савецкая ўлада пачала наступ на важнейшую частку духоўнай культуры народа.

Рашэнні з’езда супалі з актывізацыяй дзейнасці сельскіх палітасветустаноў і сталі яе прыметнай старонкай. На



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вясковых сходах прымаліся адпаведныя рэзалюцыі, як, напрыклад, у красавіку 1923 г. у Самахвалавічах: “...удзельнікі сходу лічаць сваім абавязкам прыйсці на дапамогу сельскай масе, якая інстынктыўна змагаецца з рэлігіяй. Дапамогу аказваць шляхам гутарак, чытання навуковай антырэлігійнай літаратуры. З мэтай адцягвання насельніцтва ад царквы прадугледзець правядзенне ў царкоўныя святы спектакляў, лекцый, каб вызваліць несумленную народную масу ад гіпнозу” [14, 49, л. 110]. У хуткім часе з’явіліся справаздачы аб пастаноўцы на Сёмуху спектакляў, сярод якіх найбольшай папулярнасцю карысталася п’еса “Бог-отец, Бог-сын і К°”.

Як і ў астатніх відах палітыка-асветніцкай работы, у антырэлігійнай прапагандзе галоўная роля адводзілася сельскаму настаўніцтву, тым больш, што многія з настаўнікаў, асабліва маладыя, лічылі антыцаркоўныя дзеянні досыць эфектыўнымі. Вось якую пастанову прынялі, напрыклад, настаўнікі Койданаўскай воласці: “Настаўніку, які прытрымліваецца рэлігійных забабонаў, няма месца ў савецкай сацыялістычнай школе... Усім школьным работнікам прыступіць да антырэлігійнай прапаганды на аснове навуковага падыходу...” [14, 49, л. 123]. Аднак падобныя рэзалюцыі не маглі змяніць настрою вёскі. Даследчыкі яшчэ ў савецкі час разглядалі як негатыўныя факты нядобразычлівае стаўленне сельскага насельніцтва і многіх настаўнікаў да школ, у якіх не было абразоў і дзе не выкладаўся Закон Божы [553, с. 77].

Адначасова з працэсам стварэння структуры вясковых устаноў палітасветы пачынаецца пераход ад “мітынгоўшчыны” папярэдніх гадоў да больш-менш планамернай і акрэсленай работы. Знешняй праявай гэтых змен можа служыць з’яўленне вялікай колькасці інструкцый, пастаноў, распрацаваных рознымі інстанцыямі і прынятых на шматлікіх канферэнцыях і з’ездах. Большасць рашэнняў ГПА не адпавядалі ні эканамічным, ні кадравым магчымасцям сельскіх устаноў. Па гэтай прычыне ў дакументах ГПА ўзнімаюцца адны і тыя ж праблемы на працягу ўсяго перыяду дзейнасці з канца 1920 г. па канец 1927 г. Напрыклад, 5 лютага 1924 г. калегія ГПА ў рэзалюцыі “Аб працы на вёсцы” ўзнімае пытанне аб неабходнасці “пачаць кампанію за абсталяванне хат-чытальняў”. Быў складзены падрабязны спіс з дакладнай расцэнкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходных рэчаў, дасягнута дамоўленасць з Наркаматам земляробства аб сумеснай інвентарызацыі хат-чытальняў, прапанавана правесці кампанію па зборы мэблі для тых сельскіх устаноў, якія не маюць шэфаў [42, 11, л. 302].

Прымаючы падобнае рашэнне, ГПА, відавочна, рэальна ўяўляў матэрыяльны стан палітасветустаноў вёскі. Тым не менш задачы перад імі ставіліся вялікія. У маі 1924 г. у паветах адбываліся канферэнцыі палітасветработнікаў. На некаторых з іх з дакладам аб задачах палітасветы выступаў старшыня ГПА С.Лысаў. Ён гаварыў: “Хата-чытальня павінна стаць царквою вёскі, а хатнік – чырвоным папом. Яна з’яўляецца культурным цэнтрам, і не трэба чакаць, пакуль прышлюць тыя ці другія заданні. У вёсцы назіраецца вялікае імкненне да ведаў, моладзь сама імкнецца да асветы, аднак яе гурткі павінны быць пад наглядам хатніка. Хата-чытальня павінна быць даведачным бюро, якое можа растлумачыць усе набалелыя пытанні” [29, 527, л. 14]. Звернем увагу на канкрэтнасць задач, якія ставіліся перад нізавымі ўстановамі на майскіх канферэнцыях.

Аднак рашэнні XIII з’езда РКП(б) па пытаннях работы на вёсцы і лозунг лістападаўскага 1924 г. пленума ЦК КП(б)Б “Тварам да вёскі” прымусілі партыйныя органы звярнуць увагу на змест работы сельскіх палітасветустаноў. На думку кіраўніцтва, “утвораныя раённыя палітасветы яшчэ недастаткова аформлены, жыццё не праяўляюць. Асветніцкая работа на вёсцы не ўвязваецца з агульнапалітычнымі задачамі, мае няясныя формы, работа ўсіх асветных структур вядзецца няўзгоднена” [23, 11, л. 62]. Гэта прычына абумовіла ўдакладненне кірунку работы нізавых палітасветорганаў і іх падпарадкаванне агульным палітычным і гаспадарчым задачам. Рабоце палітасветустаноў надаваўся выразны ідэалагічны кірунак, канчатковым вынікам якога павінна стаць замацаванне ў свядомасці сялянства савецкіх лозунгаў. Выкананне пастаўленай задачы не выходзіла з-пад кантролю партыйных органаў, таму што ўсе распараджэнні органам ГПА павінны былі абавязкова ўзгадняцца з камісіяй па рабоце на вёсцы пры акруговых камітэтах КП(б)Б.

У пачатку 1925 г. адбыліся акруговыя нарады загадчыкаў народных дамоў і хат-чытальняў, на якіх удакладняліся задачы вясковых органаў палітасветы. Пасля стварэння акругоў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раёнаў гэта былі першыя нарады, якія таксама падводзілі і першыя вынікі работы, таму што заслухоўваліся справаздачы некаторых хатнікаў. Асноўныя дакладчыкі настойліва заклікалі надаваць рабоце хаты-чытальні “баявы характар”, які павінен праяўляцца ва ўмацаванні саюза горада і вёскі, у падтрымцы бедняка і серадняка, у барацьбе з ідэалагічным уплывам кулака, стварэнні шырокага сялянскага актыву, падтрымцы ўсіх ініцыятыў па паляпшэнні сельскай гаспадаркі. Важная роля адводзілася хатніку, які павінен быў стаць памочнікам партыйных і камсамольскіх арганізацый. Некаторыя кіраўнікі заклікалі “сачыць зоркім вокам за адносінамі савецкіх работнікаў да сялянства і, калі ўзнікне незадаволенасць насельніцтва, праяўляць ініцыятыву ў справядлівым вырашэнні пытанняў шляхам звароту да вышэйшай інстанцыі” [14, 197, л. 63].

На нашу думку, выступленні асобных, не вельмі пісьменных, адказных работнікаў дазваляюць досыць яскрава ўявіць сацыяльную атмасферу таго часу. У цытуемым дакуменце можна заўважыць некаторы недавер да сельсаветаў (тым больш, што ў канцы 1924 г. кампанія па іх перавыбарах правалілася), перабольшванне ролі хатніка, супрацьпастаўленне дзвюх вясковых структур і прызнанне за партыйнымі органамі галоўнай ролі ў грамадстве. Адначасова можна заўважыць, што рэдкая сетка ўстаноў палітасветы ў параўнанні з колькасцю вёсак, а таксама нязначная колькасць сельскіх камуністаў не маглі адразу аказаць прыметнага ўплыву на сацыяльна-псіхалагічны настрой сялянства, да гэтага далучаліся і другія абставіны, аб якіх будзе сказана ніжэй.

Пасля абмеркавання дакладаў і справаздач з месцаў студзеньскія акруговыя нарады прымалі адпаведныя рашэнні. Напрыклад, у рэзалюцыі Мінскай нарады гаварылася: “Хаты-чытальні пачынаюць выходзіць з перыяду культурніцтва і паступова набліжаюцца да тыпу баявой арганізацыі. У зімовы перыяд хаты-чытальні павінны пакончыць з чыстым культурніцтвам і стаць цэнтрамі асветы і арганізацыі сялянскіх мас” [14, 197, л. 66]. Як бачна, культурная праца пераставала быць актуальнай, перад сельскімі ўстановамі ставіліся другія задачы, якія патрабавалі адпаведнага інфармацыйнага і кадравага забеспячэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіраўніцтва акруговага і раённага ўзроўняў пачало звяртаць увагу на невыразнасць і няяснасць формаў палітасветработы ў папярэдні перыяд. Прызнавалася, што “папулярныя раней даклады і лекцыі абмяжоўваюцца толькі агульнымі разважаннямі, якія для сялян не ўяўляюць цікавасці. Даклады не ўлічваюць інтарэсаў асобных груп насельніцтва, чытаюцца масе, а асобныя групы не атрымоўваюць патрэбных для іх звестак” [14, 197, л. 28]. Таму адпаведным арганізацыям даручалася распрацоўка праграм і праспектаў, папулярных лекцый па сельскай гаспадарцы, медыцыне, антырэлігійнай тэматыцы. У некаторых месцах прымаліся рашэнні дапускаць на лекцыі толькі працоўныя слаі насельніцтва [20, 6, л. 6]. Дарэчы, на правядзенне лекцый ніякіх сродкаў не адпускалася. Можна было разлічваць толькі на энтузіястаў, накшталт працаўнікоў асветы з Сёмкава-Гарадоцкай воласці, якія пастанавілі: “Прысутнічаць на кожным сельскім сходзе і па магчымасці ставіць на парадак дня свае пытанні па грамадскіх навуках, прыродазнаўстве, сельскай гаспадарцы, санітарнай гігіене і г.д. Такіх лекцый павінна быць не менш за дзве ў месяц” [14, 158, л. 643].

Сярод іншых формаў палітыка-асветніцкай работы перавага аддавалася арганізацыі разнастайных гурткоў, чырвоных куткоў пры школах, кааператывах, сельсаветах, саўгасах, камунах. Трэба адзначыць як станоўчы факт прыняцце некаторымі раённымі палітасветамі рашэнняў “пазбягаць адкрыцця гурткоў зверху да таго часу, пакуль іх неабходнасць не зразумее насельніцтва” [20, 6, л. 1]. Безумоўна, такая пазіцыя была правільнай. З месцаў паведамлялі, што гурткі пры хатах-чытальнях “не разгарнулі работу. У некаторых праводзяцца гутаркі, але яны не зацікавілі людзей сталага ўзросту. Хатнікі не ўмеюць арганізаваць працу” [20, 216, л. 38]. Мала таго, асобныя раённыя кіраўнікі не бачылі сэнсу ў стварэнні разнастайных гурткоў. Досыць цікавы канфлікт узнік у Смалявічах, дзе старшыня райвыканкама і сакратар райкама партыі “выступілі з іранічнай крытыкай быццам бы слабасці і нягоднасці работы народнага дома па стварэнні драматычнага, музычнага, харавога, літаратурнага і ваенна-спартыўнага гурткоў, чым падарвалі іх аўтарытэт”. Абодва кіраўнікі ўзяліся за арганізацыю музычна-драматычнай студыі, якая павінна была замяніць гурткі [14, 164, л. 353].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Афіцыйная прапаганда з 1924 г. пачала насаджаць ідэю арганізацыі пры хатах-чытальнях самых разнастайных куткоў. Безумоўна, галоўная ўвага надавалася куткам У.І.Леніна, якія, на думку кіраўніцтва, “не павінны насіць характар святога месца і заключацца ў некалькіх лозунгах і партрэтах Леніна, а адлюстроўваць тое, што ён зрабіў для сялянства, напрыклад вытрымкі з яго артыкулаў” [14, 197, 4 адв.]. Згодна справаздач хат-чытальняў, пры іх існавалі куткі санітарныя, ваенныя, МОПРа, жанчыны, бязбожніка, батракоў. Наконт апошніх адзін з кіраўнікоў рэспубліканскай палітасветы заявіў: “Патрабуюць куток у хаце-чытальні. Я не разумею, які куток патрэбны для батракоў” [14, 187, л. 340]. Улічваючы матэрыяльныя цяжкасці, можна дапусціць, што многія з куткоў існавалі толькі на паперы. У дакументах другіх арганізацый трапляюцца звесткі накшталт паведамлення з Полаччыны, што там планавалі “адкрыць узорную ленінскую хату-чытальню, забяспечыць кожную літаратурай пра Леніна... аднак сродкаў мала, у некаторых хатах-чытальнях няма нават куткоў Леніна” [29, 933, л. 40].

Настойліва раілася праводзіць галосныя чыткі як самую практычную форму палітасветы на вёсцы. На Бабруйшчыне шырока прапагандаваўся лозунг: “Не селянін у хату-чытальню, а хата-чытальня да селяніна”. Мабыць, такі метад быў у іншых месцах, таму што з Лагойска паведамлялі: “Летам праводзіцца работа толькі па святах: чытка сялянам газет на прызбе, маёўкі-гулянкі з моладдзю ў лесе, з камсамольцамі – інсцэніроўкі, песні, вусная газета” [14, 164, л. 344]. Цытуемы дакумент досыць цікавы ў сэнсе ўмення загадчыка хаты-чытальні пабудаваць справаздачу з улікам інтарэсаў і магчымасцей кожнай сацыяльнай групы. Хатнік вёскі Матнівічы Чачэрскага раёна ў зімовы час “практыкаваў групавую агітацыю на вячорках і ў сялянскіх курылках” [23, 137, л. 27].

Аднак праверка Рабоча-сялянскай інспекцыяй некаторых раёнаў паказала не рэгулярнае правядзенне галосных чытак, а дзе-нідзе іх поўную адсутнасць [38, 1277, л. 15]. І гэта больш праўдзівая карціна, чым справаздачы хатнікаў, хаця яны і з’яўляюцца цікавай крыніцай пры вывучэнні пытання аб стане і дзейнасці вясковых палітасветустаноў. Аднак надаваць ім сур’ёзную ўвагу, на наш погляд, нельга па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прычыне неадпаведнасці рэальнаму стану спраў. У якасці доказу нагадаем гісторыю са справаздачай Каладзішчанскай хаты-чытальні за апошні квартал 1926 г. Яна ўяўляе сабою тэкст з 20 пунктаў аб станоўчых выніках працы. У той жа час адна з камісій зрабіла наступнае заключэнне: “Па прычыне наступлення халадоў у хаце-чытальні немагчыма праводзіць ніякай работы. Неабходна: зашкліць рамы, адрамантаваць дымаход, набыць жалезныя печкі; печку паставіць за сцэнай, бо нельга весці рэпетыцыі, арганізаваць суботнік па дровах. Няма сродкаў, літаратуры” [8, 311, 378]. Відавочна, падобная сітуацыя існавала ў большасці сельскіх палітасветустаноў.

Пасля XIII з’езда РКП(б) з’явілася некалькі артыкулаў Н.К.Крупскай аб вялікім значэнні тлумачальнай працы сярод сялянства з мэтай абуджэння ў яго цікавасці да хаты-чытальні. Гэтая думка праведзена ў шматлікіх пастановах, і з восені 1924 г. пачалі актыўна ствараццa даведачныя сталы. Хатнікі абавязваліся па просьбе сялян пісаць заявы, даваць вусныя тлумачэнні па пытаннях зямельнай і падатковай палітыкі, крымінальных і сямейных справах і інш. [23, 19, л. 296]. Аднак вышэйшыя інстанцыі патрабавалі ад іх “тлумачыць усе заканадаўчыя пытанні, узяўшы за аснову расшыфроўку больш балючых і хвалюючых сялян пытанняў”. Галоўная задача заключалася ў тым, каб хатнікі выкарыстоўвалі “ўсе выдаваемыя пастановы, дэкрэты для папулярызацыі камуністычнай ідэалогіі” [14, 159, л. 66].

Вясковыя палітасветнікі павінны былі несці значную адказнасць за эфектыўнасць тлумачальнай працы. У адным з дакументаў прама гаварылася, што “хатнік будзе вінаваты ў выпадку масавага спазнення з аспрэчваннем няправільнага абкладання, з заявамі аб ільготах. Неабходна ўзяць на ўлік усіх незадаволеных і ўсіх, хто мае права на ільготы” [14, 159, л. 67]. Відавочна, што на хатнікаў па ініцыятыве кіраўніцтва Галоўпалітасвета ўскладваліся функцыі работнікаў сельсаветаў. Вынікі работы не маглі быць станоўчымі, бо малаадукаваны і зусім недасведчаны ў юрыдычных адносінах работнік не мог напісаць непісьменнаму селяніну адпаведную заяву. Як правіла, ад напісаных заяў не было карысці пры далейшых пошуках справядлівасці.

У справаздачных дакументах розных інстанцый – ад хат-чытальняў да раённых і акруговых партыйных камітэтаў –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыводзяцца красамоўныя лічбы аб колькасці заяў па зямельным пытанні, аб кааперацыі, грамадзянскіх справах, аб тысячах даведак па гэтых жа праблемах. У якасці юрыдычных дапаможнікаў карысталіся кодэксамі і спецыяльнай даведачнай кнігай НКУС БССР, вяліся размовы аб выданні спецыяльнага даведніка для работнікаў хат-чытальняў [23, 5, л. 41; 14, 431, л. 73]. Аднак у 1927 г. Наркамат юстыцыі праверыў работу некаторых установ і прыйшоў да высновы "аб іх малой карысці" [55, 437, л. 17].

Адзінае, што апраўдвала вядзенне тлумачальных сталоў, гэта іх практычнае значэнне для вяскоўца. Маючы на мэце атрыманне даведкі ці напісанне заявы, ён наведваўся ў хату-чытальню. Гэты момант быў улічаны, і кіраўніцтва ў 1925 г. прапанавала арганізаваць пры іх ашчадныя касы. Але сялянства не магло даверыць сваіх грошай такой неаўтарытэтнай з практычнага пункту гледжання ўстанове. Мясцовыя ўлады сцвярджалі, што погляд сялян на касы скептычны, яны ўжо маюць вопыт і гавораць: "Ты мне кажаш, ці ж у мяне не прапалі грошы?" [14, 187, л. 503].

Каб зрабіць існаванне хаты-чытальні яшчэ больш неабходным для насельніцтва, Галоўпалітасвет пагаджаецца з праектам Наркамата пошты аб адкрыцці пры іх паштовых аддзяленняў. На хатніка планавалася ўскласці правядзенне простых паштовых аперацый і продаж марак, за што плаціць 5 руб. у месяц [23, 19, л. 87]. Аднак Наркамат асветы аказаўся больш прадбачлівым і не пагадзіўся з праектам на падставе таго, што "хатнікі не могуць нават спраўляцца са сваёй прамой задачай" [14, 158, л. 878].

Па-ранейшаму ўжывалася і такая форма масавай работы, як правядзенне кампаній, змест якіх мяняўся адпаведна зменам прыярытэтаў дзяржаўнай і партыйнай палітыкі. Згодна паведамленняў з месцаў, сялянства праяўляла зацікаўленасць толькі ў тым выпадку, калі змест кампаніі тычыўся вёскі і яе праблем. Менавіта па гэтай прычыне Усебеларуская нарада агітацыйна-прапагандысцкіх камітэтаў КП(б)Б у кастрычніку 1926 г. прыняла рашэнне звесці да мінімуму ўсялякія дні, кампаніі, за выключэннем тых, якія маюць адносіны да вёскі (дзень ураджаю, дзень лесу, перавыбары сельсаветаў) [23, 50, л. 377].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікая колькасць самых разнастайных кампаній цяжкім грузам клалася на хаты-чытальні і актывістаў. Яны праводзіліся шаблонна. “Насельніцтва ўжо менш цікавіцца нашымі святамі, з вопыту мінулых гадоў ведаючы, – канстатавалася ў адным з афіцыйных дакументаў, – што ў іх будзе ўрачысты сход, дэманстрацыя, спектакль. Яшчэ горшая справа з масавымі кампаніямі, таму што кожная з іх руйнуе працу хаты-чытальні” [8, 311, 327]. Тым не менш кампаніі аб’яўляліся па розных прычынах, перш за ўсё ідэалагічных, эканамічных. Правядзенне афіцыйных кампаній пачыналася 9 студзеня. Нічога новага прыдумана не было: даклад ці чытанне біяграфіі У.І.Леніна, спектакль, жалобнае шэсце. У некаторых месцах прымалі рэзалюцыі. Тыповай у гэтым плане з’яўляецца пастанова школьнай рады з Сёмкава Гарадка: “Мы, вучні, даём слова, што нашым лозунгам павінна быць вечная барацьба з ворагамі чалавецтва – буржуазіяй і багачамі” [14, 158, л. 466].

Наступная кампанія прысвячалася чарговым угодкам з дня смерці У.І.Леніна і выяўлялася ў адкрыцці ленінскіх куткоў, правядзенні ленінскіх вечароў і ленінскіх тдняў з дакладамі “Жыццё і дзейнасць Леніна”, “Ленін і сялянства”, актуальных і дэлегацкіх сходаў сялянак пад дэвізам “Год работы без Леніна”, ці “Два гады работы без Леніна”, ці “Тры гады...”. Некаторае ажыўленне адбывалася, калі прыязджалі шэфы або паказвалі кіно.

Нічога арыгінальнага не было прыдумана і пры святкаванні Міжнароднага жаночага дня, Міжнароднага дня дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР), гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Адзінае, што мянялася над уплывам змен у палітычным і эканамічным жыцці, дык гэта лозунгі і тэмы дакладаў. Напрыклад, да 8 Сакавіка вылучаліся заклікі: “Сялянка, вучы сваіх дзяцей ісці па слядах Леніна”, “Сялянка, змагайся са старымі забабонамі, вызваляйся ад цемры” і інш. [44, 56, л.16]. А святкаванне 3-й гадавіны МОПРа ў 1926 г. суправаджалася гутаркамі на тэмы “Расправа Цьера з камунарамі”, “Цанкаў – паслядоўнік крывавага Цьера” і расклейваннем плакатаў са зместам такога ж кірунку. Святкаванне ўгодкаў дапаўнялася месячнікамі МОПРа, падчас якіх сялян заклікалі ахвяраваць грошы і рэчы ў фонд гэтай арганізацыі. Дакументы сведчаць: у 1927 г. святкаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўгодкаў вызвалення ад белапалякаў адбывалася ў рамках тыдня абароны пад лозунгам "Абарона заваёў Кастрычніка на парозе 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі". Ад спектакляў і кіно ішлі адлічэнні ў фонд "Наш адказ Чэмберлену", праводзіўся збор і сярод сялян [14, 197, л. 161].

Да самага галоўнага дзяржаўнага свята – угодкаў Кастрычніцкай рэвалюцыі – пачыналі рыхтавацца загадзя, стваралі адпаведныя камісіі, распрацоўвалі падрабязныя планы, потым наладжвалі рэгулярную праверку. З вялікім уздымам рыхтаваліся адзначыць 10-годдзе рэвалюцыі, работа ішла па ўсіх кірунках амаль увесь год: адбыліся Першы з'езд хатнікаў, пленумы і нарады розных арганізацый. Нізавыя ўстановы выяўлялі ўдзельнікаў кастрычніцкіх падзей і Грамадзянскай вайны, праводзілі вечарыны ўспамінаў, гутаркі на тэму "Што дала Кастрычніцкая рэвалюцыя сялянам", афармлялі наглядную агітацыю, якая павінна была паказаць рост дасягненняў у сельскай гаспадарцы, адлюстраваць дасягненні школ, палітасветустаноў, кааперацыі [4, 344, л. 88].

Аддаючы даніну працэсу беларусізацыі, які афіцыйна пачынаўся ў 1924 г., некаторыя святочныя кампаніі прысвячаліся адпаведным юбілеям. У снежні 1925 г. досыць шырока адзначалася 400-годдзе беларускай культуры і друку пад лозунгам "Значэнне друку ў вызваленні працоўных і пашырэнні беларускай культуры". У святкаванні былі задзейнічаны ўсе навучальныя ўстановы, дзе 30 снежня адбываліся літаратурна-мастацкія ранішнікі. Вечарам таго ж дня праходзілі ўрачыстыя пасяджэнні ва ўстановах і арганізацыях з удзелам сялянства. Прысутныя слухалі даклады і глядзелі выступленні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці [8, 311, л. 52; 44, 4, л. 62]. 23 лістапада 1926 г. адзначалася 20-годдзе літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа. Кожная навучальная ўстанова выбірала адзін дзень "для таго, каб адлюстраваць значэнне літаратурнай і педагагічнай дзейнасці песняра" [8, 301, л. 303]. У рэчышчы лозунга аб пашырэнні беларускай культуры святкавалі юбілей У.М.Ігнатоўскага і 10-ю гадавіну смерці М.А.Багдановіча.

Акрамя святочных, праводзіўся цэлы шэраг кампаній палітычнага і эканамічнага характару: дзень кааперацыі, перавыбары сельскіх Саветаў, ячэек МОПРа, Міжнародны дзень юнацтва, пераход на метрычную сістэму, арганізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ячэек таварыства “Далоў непісьменнасць!”, збор сродкаў на патрэбы хат-чытальняў, двухтыднёвікі друку, тлумачэнні новага заканадаўства па сямейных пытаннях і інш. Некаторыя кампаніі, як, напрыклад, па добраахвотным уступленні ў камітэты сялянскай узаемадапамогі, поўнасцю правальваліся [14, 216, л. 51]. У пачатку 1926 г. пачалася антыалкагольная кампанія. Партыйныя органы адзначалі: «З выпускам “Рускай горкай” узрасло п’янства... Антыалкагольную прапаганду неабходна весці праз хаты-чытальні, палітсуды, выставы, лекцыі... У хаце-чытальні рабіць вечарынкі з цікавымі гульнямі, не дапускаць спіртных напояў “на вечарах спайкі”» [23, 50, л. 31].

Важнейшае палітычнае значэнне надавалася кампаніям па распаўсюджванні дзяржаўных пазык. Як адзначалася вышэй, мэтавым прызначэннем выпускаліся пазыкі для вёскі розных відаў і кошту. Таму падрыхтоўка грамадскай думкі выконвала галоўную ролю ў размяшчэнні пазыкі сярод сялянства. Наколькі сур’ёзна дзяржава ставілася да гэтага пытання, сведчыць факт стварэння спецыяльных камісій з прадстаўнікоў райвыканкама, райкама партыі і іншых раённых інстанцый. Перад камісіямі ставілася задача “арганізацыі агітработы ў раёне шляхам шырокай інфармацыі сялян аб пазыцы, яе ўмовах, перавазе ўкладу сродкаў у пазыку” [8, 311, л. 5]. Па пытаннях папулярызацыі пазык праводзіліся пленумы райвыканкамаў, сельсаветаў, сходы беднаты, настаўніцкія канферэнцыі і інш. Практыкаваліся абход сялянскіх двароў, вывешванне спісаў тых, хто набыў аблігацыі, чырвоныя і чорныя дошкі, выклік на спаборніцтва праз насценныя газеты і да т.п. У дзень розыгрышу чарговага тыражу ў горад запрашаліся дэлегацыі сялян, каб “азнаёміць іх з тэхнікай і парадкам тыражу”. У некаторых месцах рабілі тэатралізаваныя відовішчы, дзе закамуфляваныя пад сялян героі праз гукаўзмацняльнікі аб’яўлялі нумары выйгрышаў [4, 121, л. 13].

Патрэбы дзяржавы раслі, і ў канцы 1927 г. была ўведзена пазыка “ўзмацнення сельскай гаспадаркі” пад лозунгам “Кожны гаспадар павінен мець аблігацыю.” Пазыцы надавалася надзвычай важнае значэнне, і ў гэтай сувязі палітасветустановы заклікалі як мага шырэй знаёміць сялянства з мэтамі пазыкі і яе карысцю для селяніна. Безумоўна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хлебаробы добра ведалі, што карысна іх гаспадарцы, і не спяшаліся адгукацца на заклікі аддаваць апошнія сродкі. Менавіта гэтая акалічнасць выклікала неабходнасць шматлікіх агіткампаній.

Кожны від масавай работы меў на мэце пашырэнне дзяржаўнай палітыкі сярод земляробаў. Аднак партыйныя органы ўвялі яшчэ дзень селяніна і дзень сялянкі, якія праводзіліся сіламі раённага актыву і больш моцнымі партячэйкамі. Мэтай гэтых дзён з'яўлялася "шырокае асвятленне пытанняў бягучай палітыкі партыі і савецкай улады, мясцовага гаспадарчага жыцця і выяўленне запытаў і настрояў вёскі" [22, 6, л. 280]. Улічваючы адзначаныя вышэй негатыўныя моманты ў разгортванні палітычнай асветы на вёсцы, трэба прызнаць, што ў хуткім часе правядзенне дзён, прысвечаных пэўнай кампаніі, таксама набыло самы прымітыўны характар.

Бурная палітыка-асветніцкая дзейнасць не прыносіла прыметных вынікаў. У загадзе ГПА адзначалася: "Амаль што па ўсіх акругах няма поўнай яснасці і дастатковай адказнасці за працу. ГПА не мае досыць правераных яскравых звестак ад установ на месцах, не наладжана сістэматызаваных і акуратных справаздач". Аднак галоўнае было ў тым, што палітасветработа на вёсцы, на думку кіруючых установ, недастаткова напаўнялася палітычным зместам, "слаба ўвязвалася з практычнымі задачамі партыі, савецкай улады" [14, 187, л. 380].

Цытуемыя вышэй дакументы, на наш погляд, досыць выразна сведчаць аб падыходах да асветніцтва вёскі. Не маючы ні падрыхтаваных кадраў, ні дастатковых матэрыяльных сродкаў, ні метадычна абгрунтаванай лініі асветніцкай работы, савецкая ўлада пачала насаджаць на вёсцы новую культуру. Нельга не зазначыць, што шматлікія афіцыйныя дакументы ствараюць уяўленне аб паспяховасці гэтага працэсу, бурнай дзейнасці хат-чытальняў па правядзенні лекцый, мітынгаў, кампаній, арганізацыі куткоў, гурткоў, новых вечарынак і да т.п. Дапамагаюць стварыць такое ўражанне і справаздачы хатнікаў, многія з якіх навучыліся адпісвацца.

Каб вызначыцца з пытаннем эфектыўнасці палітыка-асветніцкай работы на вёсцы ў 1921–1927 гг., спашлёмся на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго абмеркаванне дэлегатамі Першага рэспубліканскага з’езда хатнікаў, які адбыўся ў сакавіку 1927 г. Падбор дэлегатаў праходзіў па разнарадцы зверху, згодна з пастановай Наркамата асветы, ад раёна – адзін хатнік і адзін бібліятэкар. На справе даводзілася ўлічваць наяўнасць нацыянальных меншасцей у пэўным раёне і некаторыя іншыя моманты. У выніку ў рабоце з’езда прынялі ўдзел 303 дэлегаты, з іх прадстаўнікі Мінска – 39, астатнія 264 дэлегаты прадстаўлялі правінцыю. Ад усёй колькасці дэлегатаў хатнікі складалі каля трэці – 56 чалавек, 12 – загадчыкі народных дамоў. Прысутнічалі бібліятэкары, кінамеханікі, значная група прадстаўнікоў школ сялянскай моладзі і кіраўніцтва розных узроўняў [29, 1041, л. 1].

З’езд адкрыўся вечарам 14 сакавіка 1927 г. у памяшканні Дзяржаўнага тэатра ў прысутнасці ганаровых гасцей з Украіны і Масквы. Прывітальную тэлеграму прыслала Н.К.Крупская, якая з-за хваробы не змагла прыехаць. Быў абраны ганаровы прэзідыум у складзе кіраўнікоў ВКП(б), КП(б)Б і ўрада рэспублікі, а таксама арыштаваных польскімі ўладамі кіраўнікоў Беларускай сялянска-рабочай грамады. Прывітальныя вершы з’езду прачытаў Янка Купала. З’езд быў разлічаны на чатыры дні. Планаваліся экскурсіі ў Дзяржаўны музей, бібліятэку, кабінет палітасветы. У час работы з’езда былі арганізаваны выставы насценных газет, метадычнай і сялянскай літаратуры, куток радыё і паказальная хата-чытальня пры бібліятэцы імя А.С.Пушкіна. Дэлегатам была прапанавана разнастайная культурная праграма: спектакль “Змрок”, вечар самадзейнасці рабочых клубаў Мінска, канцэрт беларускай музыкі і песні з удзелам тэатра пад кіраўніцтвам У.Галубка, кіно “Лясная быль” [23, 147, л. 57а].

Парадак дня з’езда складаўся з двух асноўных пытанняў: 1. Задачы Камуністычнай партыі на вёсцы. 2. Становішча і задачы палітасветработы на вёсцы. Прысутныя прымалі ўдзел у абмеркаванні дакладаў, а таксама ў рабоце секцый: арганізацыйнай, масавай, школьнай, самаадукацыі, бібліятэчнай, агракааператыўнай [23, 148, л. 2, 3]. Асноўныя дакладчыкі (напрыклад, першы даклад працягваўся каля трох гадзін) галоўнае месца ўдзялялі задачам палітасветустаноў, звяртаючы ўвагу на тое, якой павінна быць іх праца. У вялікім дакладзе старшыня Галоўпалітасвета С.А.Шамардзіна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыводзіла лічбы колькасці сеткавых хат-чытальняў – 366 і 362 – нясеткавыя, выказвала незадаволенасць нязначнай колькасцю вясковых палітасветустаноў, слабым фінансаваннем, частым перамяшчэннем і перагружанасцю хатнікаў. У спрэчках па яе дакладзе запісаліся выступіць 160 дэлегатаў.

Дэлегатам расказвалі, якім павінен быць план работы, настойліва рэкамендавалася аб’ядноўваць вакол хаты-чытальні шырокі сялянскі актыў і спецыялістаў, арганізоўваць працу мастацкіх гурткоў, развіваць самадзейнасць. Значная ўвага надавалася пытанню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў і канстатавалася: “Становішча па ўкамплектаванні хатнікаў такое, што прад’явіць ім сур’ёзных патрабаванняў мы не можам, таму што сістэма выхаваўчых палітасветустаноў не дае магчымасці пашырыць самой падрыхтоўкі” [23, 148, л. 31]. Роля метадычнага органа адводзілася народным дамам, кіраўніцтва ўсёй палітработай заставалася ў руках раённага палітасвета. Раёны разбіваліся на падраёны, цэнтрамі якіх станавіліся хата-чытальня і яе савет, а ролю апорнага пункта на вёсцы павінны былі выконваць чырвоныя куткі.

Выступленні ў спрэчках былі больш канкрэтнымі і крытычнымі. Прыклад падаў наркам асветы А.В.Баліцкі, які сказаў наступнае: “Чым жыве сучасная вёска? У большасці яшчэ чуткамі, часам вельмі фантастычнымі. Жыве ў цемры. Сканцэнтраваць волю працоўных мас на барацьбу з гэтай спадчынай – асноўная задача хаты-чытальні... Ці могуць прывабіць хаты-чытальні сялян сваёй добрай абстаноўкай, добрай бібліятэкай, даць магчымасць адпачыць? Не...” [88, с. 2]. Выступленне наркама было дапоўнена канкрэтнымі фактамі стану сельскіх палітасветустаноў. Выступаючыя адзначалі адсутнасць цікавай і патрэбнай для вёскі літаратуры, прыстасаваных памяшканняў, слабае кіраўніцтва раённых палітасветаў пры адначасовых “паперамании” і бюракратызме, выкарыстанне ўстарэлых формаў работы і інш.

Усебеларускі з’езд хатнікаў закончыўся на аптымістычнай ноце. Аднак справа змянілася вельмі слаба. Такое заключэнне мы зрабілі не толькі на падставе шматлікіх адмоўных момантаў у рабоце хат-чытальняў, якія не маглі знікнуць у выніку прыняцця розных рэзалюцый, але і па іншых фактах. У чэрвені 1929 г. пры абмеркаванні пытання аб становішчы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далейшых задачах палітасветработы ў БССР на Усебеларускай канферэнцыі хатнікаў выступоўцы зноў гаварылі аб тых самых праблемах, якія падымаліся на з'ездзе ў 1927 г. Аднак рэзалюцыя была прынята станоўчая: "У параўнанні з работай папярэдняга года праца значна палепшылася, хаты-чытальні больш выразна ўвасабляюць у сваёй рабоце пастановы Камуністычнай партыі па перабудове вёскі, больш яскрава праводзяць класавы падыход..." [29, 1841, л. 2]. Такія агульныя словы і стваралі ўражанне гармоніі ў палітасветнай рабоце на вёсцы і выдатных яе перспектывах, хаця рэчаіснасць дэманстравала зусім супрацьлеглую карціну. Дарэчы, наркам асветы А.В.Баліцкі ацэньваў вынікі асветніцтва на вёсцы не вельмі аптымістычна і лічыў, што яно "не змагло за кароткі тэрмін савецкай улады цалкам ліквідаваць цяжкую спадчыну..." [89, с. 5].

У заключэнне адзначым, што распрацоўка тэарэтычных палажэнняў аб неабходнасці новай культуры пачалася яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі і працягвала ўдакладняцца адпаведна зменам у грамадска-палітычнай сітуацыі. Безумоўна, кіруючая партыя не магла дапусціць існавання іншай ідэалогіі, таму яна вызначыла асноўныя кірункі і задачы работы сярод дарослага насельніцтва. Выхаваннем падрастаючага пакалення ў рэчышчы савецкай палітыкі займаліся ўстановы Наркамата асветы, галоўная роля сярод дарослых адводзілася ўстановам Галоўпалітасвета. На вёсцы да іх адносіліся народныя дамы і хаты-чытальні, дзейнасць якіх кантралявалася партыйнымі органамі і цесна звязвалася з сацыяльна-эканамічнымі задачамі. Для іх рашэння выкарыстоўваліся такія сродкі агітацыі і прапаганды, як мітынгі, лекцыі, сходы, гутаркі і інш. Усе сродкі, формы і метады палітасветработы мелі адну мэту – далучэнне сялянства да партыйнай і савецкай палітыкі.

## 2.3. Культурнае асветніцтва

### *2.3.1. Тэатральнае аматарскае мастацтва*

Аналіз шматлікіх архіўных дакументаў дае аргументаваную падставу для высновы аб адначасовым існаванні ў вёсцы на пачатку 1920-х гг. дзяржаўных палітыка-асветных устаноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у выглядзе хат-чытальняў і аматарскіх культурна-асветніцкіх гурткоў. Гэтая акалічнасць дазваляе падзяліць культурныя працэсы, якія адбываліся ў вясковым асяроддзі, на палітычнае і культурнае асветніцтва. Трэба заўважыць, што культурна-асветніцкія гурткі ўзніклі па ініцыятыве знізу яшчэ ў 1917 г. У ліку іх, напрыклад, гурток у Дукоры [19, 17, л. 18]. У 1919 г. такія аб'яднанні існавалі ў многіх месцах, асабліва на Ігуменшчыне, і пачалі працаваць больш-менш актыўна пасля адыходу палякаў [19, 132, л. 19, 19 адв.]. Адным з самых ранніх і дакументальна зафіксаваных быў культурна-асветніцкі гурток "Вір". Да яго арганізацыі мела дачыненне вучнёўская моладзь з мястэчка Блонь (былы маёнтак вядомага народніка А.Бонч-Асмалоўскага) на чале з настаўнікам В.Ажгірэем. 3 мая 1919 г. Ігуменскі аддзел народнай асветы зацвердзіў яго статут. Аднак праз год, у красавіку 1920 г., гурток, у складзе якога працавалі 25 чалавек, разагналі палякі, арыштавалі старшыню. Праз тры месяцы пасля адыходу палякаў гурток аднавіў сваю работу [19, 32, л. 36].

Мясцовая ініцыятыва была заўважана, і ўжо ў лютым 1920 г. Гомельскі губернскі аддзел народнай асветы, якому падначальваліся ўстановы асветы на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі, звярнуў увагу на неабходнасць стварэння рабоча-сялянскіх культурна-асветніцкіх гурткоў, "мабілізуючы дзеля гэтага ўсе наяўныя сілы воласці". Гурткі павінны былі складацца з некалькіх секцый: мастацкай, музычнай, літаратурнай, харавой і драматычнай, у якія "патрэбна запрашаць толькі сялян, каб у будучым яны сталі інструктарамі ў працы на вёсцы" [18, 134, л. 17]. Мабыць, такім чынам меркавалася падняць мастацкі ўзровень мас, выявіць іх творчыя сілы і магчымасці. Заклікі, загады аб стварэнні культурна-асветніцкіх гурткоў паўтараліся яшчэ не аднойчы, таму што "іх роля ў справе пазашкольнага будаўніцтва вельмі значная" [19, 32, л. 35].

Як сведчаць дакументы, пастановы вышэйшых органаў былі актыўна падхоплены. У многіх валасцях, асабліва на Барысаўшчыне, арганізуюцца культурна-асветніцкія гурткі. Рэвалюцыйныя энтузіязм і эйфарыя захапілі асабліва моладзь. Па прычыне юнацкага максімалізму яна верыла загадам і заклікам. Чым іншым можна растлумачыць з'яўленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наступных радкоў, якія запісалі 26 чэрвеня 1920 г. у пратаколе агульнага сходу настаўнікі Дзмітравіцкай воласці Барысаўскага павета: “Тэрмінова прыступіць да арганізацыі культасветгуртка ў наступных населеных пунктах... і прасіць рэўкам выдзеліць для гэтай мэты памяшканні, аддзел асветы – аб забеспячэнні ўсялякай літаратурай, п’есамі і тэатральнай абстаноўкай, а таксама аб сродках на абсталяванне культасветгуртка і ўтрыманне служачага пры ім. Для работы запрасіць школьных работнікаў і мясцовых грамадзян” [18, 26, л. 11]. Змест цытуемага дакумента дастаткова ясна адлюстроўвае энтузіязм удзельнікаў сходу, адсутнасць у іх пачуцця рэальнасці, інакш яны б не спадзяваліся на памяшканні, літаратуру, сродкі і інш.

Тое ж можна сказаць аб рашэнні сходу ў мястэчку Эсьманы ад 25 мая 1920 г.: “Звярнуцца ў павет з просьбай аб прысылцы інструкцый і статута. Кожны школьны работнік на святах павінен арганізаваць чытанні і гутаркі з насельніцтвам. Прыступіць да абсталявання сцэны, прасіць аванс і матэрыялы для сцэны” [18, 12, л. 38]. Не менш цікавым і характэрным было рашэнне сходу грамадзян мястэчка Красналукі: “Згодна загаду Барысаўскага павятовага АНА за № 60, у воласці неабходна стварыць культасветгурток... Хадайнічаць перад АНА аб рэквізіцыі памяшкання і патрабаваць сродкаў на яго прыстасаванне да мэт гуртка” [18, 12, л. 12]. Звернем увагу на форму выказвання: “згодна загаду”, “неабходна”, “патрабаваць”. У выніку на пачатак 1921 г. на Барысаўшчыне налічвалася 27 культасветгурткоў і 2 драматычныя гурткі, прыблізна такая ж сітуацыя склалася на Міншчыне, асабліва ў Койданаўскай воласці [18, 150, л. 67; 17, 229, л. 2, 23].

Рэвалюцыйны рамантызм праяўляўся ў тых высокіх мэтах, якія ставілі арганізатары гурткоў. Напрыклад, Струпеньскі гурток з Барысаўшчыны меў на ўвазе “распаўсюджванне сярод насельніцтва, асабліва моладзі, навуковых ведаў, развіццё мастацкага і музычнага густу, наогул пад’ём духоўнага ўзроўню... шляхам самаадукацыі, чытання навуковых кніг, правядзення лекцый і гутарак...” [18, 159, л. 7; 413, л. 17а]. Другія планавалі даваць па 2 спектаклі ў месяц, чытаць навуковыя лекцыі, раз у месяц выступаць з канцэртам і г.д. Аднак рэчаіснасць хутка расставіла ўсё па сваіх месцах,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таму што праблемы пачыналіся адразу, і самая галоўная з іх – адсутнасць адпаведных кадраў, неабходных сродкаў. У справе таго ж Струпеньскага гуртка захоўваюцца анкеты усіх 12 яго сяброў. Большасць з іх – настаўнікі, некаторыя закончылі народнае вучылішча, астатнія – двухмесячныя настаўніцкія курсы [18, 401, л. 1].

Сярод арганізатараў культурна-асветніцкіх гуртkоў сустракаліся і чырвонаармейцы, якім, мабыць, належыць аўтарства прыняцця рашэнняў накшталт наступнага: "Секцыі абавязаны штотыдзень падаваць праўленню справаздачу аб сваёй дзейнасці. Праўленне павінна збірацца кожную нядзелю для абмеркавання бягучых спраў. Штомесячна ў першую нядзелю пасля 1 чысла збіраць агульны сход усіх сяброў для абмеркавання справаздачы праўлення за месяц" [18, 67, л. 56 адв.]. Вось так ужываліся разам высокія мэты, юнацкі рамантызм і самы прымітыўны бюракратызм. Таму спадзявацца на эфектыўнасць працы падобных аб'яднанняў не было падстаў.

Звернем увагу на тое, што многія з культурна-асветніцкіх гурткоў ствараліся па ініцыятыве мясцовага кіраўніцтва і таму апынуліся ў арбіце дзяржаўнай палітыкі. Ад іх патрабавалася весці прапаганду партыйнай лініі, толькі ўжо сродкамі мастацтва. З цягам часу, асабліва пасля стварэння афіцыйнай структуры палітасветустаноў, цікавасць да гурткоў падае. Усе іх спробы прыцягнуць да сябе ўвагу натыкаюцца на адмоўную рэакцыю кіруючых інстанцый. Напрыклад, Барысаўскі павятовы палітасвет у 1921 г. указваў, што "дзяржаўнай установай з'яўляецца валасны палітасвет, гэтым ён і адрозніваецца ад культасветгурткоў, якія з'яўляюцца толькі прыватнай арганізацыяй, што ўзнікае толькі па ініцыятыве некалькіх асоб, альбо з'яўляецца падсобнай арганізацыяй валаснога палітасвета ў правядзенні работы" [18, 185, л. 2].

Такім чынам, на пачатку 1921 г. пошукі аптымальнага варыянта ўздзеяння на вёску закончыліся не на карысць культурна-асветніцкіх гурткоў. І хаця вясковая моладзь адгукнулася на заклік зверху, эфектыўнасць плануемай дзейнасці ў сферы партыйнай прапаганды сродкамі мастацтва не задаволіла кіруючыя органы. Стаўка была зроблена на масавыя палітасветустановы ў форме хат-чытальняў. Час



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паказаў: найбольш жыццяздольнымі з усіх культасветгурткоў аказаліся драматычныя, якія працягвалі існаваць яшчэ пэўны час. Іх дзейнасць была відовішчнай, а таму прывабнай, зразумелай, даступнай сялянскай масе. Менавіта гэтая акалічнасць дае падставу гаварыць аб адначасовым існаванні палітыка- і культурна-асветніцкай работы.

Станаўленне самадзейных драмгурткоў суправаджалася матэрыяльнымі праблемамі: не хапала прыстасаваных памяшканняў, грыму, дэкарацый, п’ес і многага іншага, адчуваўся недахоп выканаўцаў, асабліва на жаночыя ролі. Не выпадкова Мінскі аддзел народнай асветы прасіў уключыць у каштарыс пункт аб выдачы аматарскім гурткам тэатральнай літаратуры, парыкоў, дэкарацый, касцюмаў, касметыкі. Кіраўніцтва аддзела спадзявалася такім чынам “паставіць драматычныя гурткі на належную вышыню як у мастацкім сэнсе, так і сэнсе ўздзеяння на масы” [17, 337, л. 219].

Мясцовыя энтузіясты, са свайго боку, засыпалі павятовае кіраўніцтва просьбамі, даходзіла нават да смешнага. Напрыклад, з Вяляціцкай воласці, што на Барысаўшчыне, прасілі грамафон з пласцінкамі, таму “што шырокія сялянскія масы не атрымоўваюць ніякіх забаў і мала цікавяцца бібліятэкай, а калі будзе грамафон, то можна будзе іх лёгка збіраць і агітаваць” [18, 166, л. 6]. Абуранае начальства наклала наступную рэзалюцыю: “Прыслаць характарыстыку старшыні валаснога палітасвета і пратаколы” [18, 175, л. 1]. З другой воласці скардзіліся на дзяўчат-настаўніц, якія не з’явіліся на рэпетыцыю, а некаторыя нават адмовіліся ад сваіх роляў, і прасілі накласці на іх “самае строгае дысцыплінарнае спагнанне” [18, 163, л. 58]. Некаторыя гурткі прасілі прыслаць ім рэжысёра, грым, п’есы і інш.

Аднак, нягледзячы на адсутнасць дэкарацый, грыму, цвікоў, шпалераў, дошак, паперы і многага іншага, энтузіясты-аматары ставілі спектаклі, праводзілі літаратурныя вечарыны і чытанні, пашыраючы межы асветніцтва. Калі верыць справаздачам, у многіх месцах перад пачаткам спектакля арганізоўвалася чытка газет. І толькі ў адной справаздачы гаварылася, што “спектакль прайшоў не вельмі ўдала, бо артысты аказаліся дрэнна падрыхтаванымі” [18, 182, л. 13].

У азначаны перыяд вясковыя драматычныя гурткі часта супрацоўнічалі з чырвонаармейскімі, асабліва гэта тычылася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыгранічных раёнаў. Разам было лягчэй збудаваць сцэну, знайсці дэкарацыі, падабраць рэпертуар. У некаторых месцах супрацоўніцтва прыводзіла да таго, што кіруючыя асобы ніяк не маглі падзяліць уладу. Напрыклад, начальнік Койданаўскага гарнізона паведамляў загадчыку аддзела асветы аб маючых адбыцца 17–19 снежня 1921 г. спектаклях на карысць галадаючых, і па гэтай прычыне нікому не дазвалялася займаць народны дом. У адказ загадчык АНА даводзіў, што "ўсе клубы і народныя дамы воласці знаходзяцца пад непасрэдным кіраўніцтвам валаснога палітасвета, а не начальніка гарнізона. Таму палкавая трупа павінна прасіць дазволу на карыстанне памяшканнем, тым больш, што трупай выбіты шыбы, якія да гэтага часу не ўстаўлены, і пакуль гэта не будзе зроблена, сцэна давацца не будзе" [17, 229, л. 19, 20].

Разам з чырвонаармейцамі адметнае месца ў драмгуртках займалі настаўнікі. Напрыклад, у памежным мястэчку Крайск дзейнічаў гурток пад кіраўніцтвам валаснога палітасвета, створаны школьнымі работнікамі і байцамі батальёна, раскватараванага ў мястэчку. Сябры гуртка ладзілі спектаклі, праводзілі канцэрты, мітынгі, прысвечаныя харчовай кампаніі, барацьбе з бандытызмам. Перад спектаклем абавязкова адбываўся мітынг, на якім "падрабязна характарызаваліся ўстойлівасць савецкай улады і зло бандытызму". Пасля спектакляў мясцовы хор спяваў "Інтэрнацыянал", "Адвеку мы спалі..." і іншыя песні [18, 150, л. 7, 7 адв.].

Не абышлося без спробы валасных палітасветаў паставіць пад кантроль дзейнасць культурна-асветніцкіх гурткоў. Прадстаўнікі апошніх уваходзілі ў склад палітасветаў, ім прапаноўвалася выбіраць праўленне, прымаць статут і рэгістравацца ў пазашкольным аддзеле валаснога палітасвета. Аднак на справе аказвалася не так і важна, каму падпарадкоўваюцца гурткі. Палітасветы не толькі не маглі аказаць ім матэрыяльнай дапамогі, але нават былі не ў стане спыніць перадачу тэатральных памяшканняў пад розныя гаспадарчыя службы.

Закранула аматарскія гурткі і нэпаўская ідэя самаакупнасці. Напрыклад, аддзел асветы Мінскага выканкама ў канцы 1921 г. раіў усім валасным палітасветам, як трэба арганізоўваць збор сродкаў: "Па-першае, даваць платныя спектаклі, прычым толькі з дазволу павятовага ці валаснога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітасвета або валасной ячэйкі і ставіць адзін платны, адзін бясплатны спектакль. Па-другое, для бясплатных спектакляў падбіраць п'есы агітацыйнага, рэвалюцыйнага характару, для платных рознахарактарныя. Трацiна білетаў павінна выдавацца чырвонаармейцам, 5% выручкі – адлічвацца на карысць галадаючых. Аб выручаных сумах неабходна паведамляць павятоваму палітасвету, расходаваць сродкі можна толькі з яго санкцыі" [17, 219, л. 138].

Як бачым, кіраўніцтва лічыла, што працэс самаакупнасці павінен быў праходзіць пад яго поўным кантролем. Камандная сістэма ўжо на самым пачатку свайго станаўлення не магла дапусціць самастойных дзеянняў нават аматарскіх арганізацый, якімі з'яўляліся драматычныя гурткі. Ім раілі, напрыклад, "разгарнуць узмоцненую агітацыю сярод насельніцтва на карысць самаабкладання, ні ў якім разе не дапускаць стыхійнага закрыцця" [18, 174, л. 26]. Аднак даводзіцца канстатаваць, што аматарскія гурткі распадаліся, таму што ад сваёй дзейнасці ніякіх матэрыяльных сродкаў не атрымлівалі. У той жа час без пастаяннай падтрымкі (хаця б маральнай) паступова згасаў і рэвалюцыйны энтузіязм моладзі.

Як паказаў аналіз дакументаў, праблемай з праблем для аматарскіх гурткоў аказаўся рэпертуар. П'есы ставіліся без усякага разбору: ад "Мядзведзя" Чэхава, "Феміністкі" Саксажынскай да "Моднага шляхцюка" К.Каганца і "Паўлінкі" Я.Купалы. Безумоўна, кіруючыя інстанцыі не маглі дапусціць разнабою ў падборы рэпертуару. Каб забяспечыць выкананне генеральнай лініі па прапагандзе дзяржаўнай палітыкі сродкамі мастацтва, накіроўвалі нізам шматлікія рэкамендацыі. Вось адна з іх ад 18 ліпеня 1922 г.: "Драматычныя гурткі часта ставяць п'есы, якія вельмі шкодзяць гледачам, бо развіваюць нездаровыя схільнасці... П'есы рэлігійнага зместу развіваюць пакланенне перад рэлігіяй, царом, духавенствам... Ёсць многа п'ес нягодных, якія не могуць быць пастаўленымі на сцэне. Некаторыя п'есы развіваюць мяшчанскія тэндэнцыі, перашкаджаючы разрыву са старымі забабонамі" [18, 383, л. 55].

Для кантролю за дзейнасцю артыстаў-аматараў у 1922 г. пачалі ствараццa Цэнтральная і павятовыя рэпертуарна-кантрольныя камісіі, ствараліся і валасныя пры палітасветах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць Цэнтральнай камісіі ў некаторай ступені кантралявалася ГПУ Беларусі. Ва ўсякім выпадку пратаколы камісіі адсылаліся на адрас ГПУ, а Цэнтральная камісія патрабавала пратаколы ад ніжэйшых інстанцый. Яна рэкамендавала дапускаць да пастаноўкі “толькі пралетарскія п’есы альбо п’есы буржуазнага характару, але моцныя ў мастацкіх адносінах” [18, 391, л. 18].

Па ўсёй рэспубліцы былі разасланы спісы п’ес, рэкамендаваных да пастаноўкі. У першым раздзеле даваліся назвы 63 п’ес рэвалюцыйнага зместу, сярод іх – Амнуэля “Марат”, Глобы “Апошні дзень Марата”, Бясалькі “Вежа камуны”, Яхантава “Вялікі камунар”, Патапенкі “Краёчак заслоны” (спроба намаляваць карціну здзяйснення камуністычных ідэалаў). Другі раздзел насіў назву “П’есы гераічнага характару, ці вялікага пад’ёму: д’Анунцыо “Слава”, Гётэ “Эгмант”, Гуркова “Е.Пугачоў”, Гюго “Марыя Цюдор”, усяго 43 п’есы. Трэці раздзел называўся “П’есы бытавога характару” і дзяліўся на сацыяльна-бытавыя: Андрэева “Сава”, Горкага “На дне”, “Ворагі” і іншыя, усяго 29 п’ес, і на чыста бытавыя ці гістарычна-бытавыя: Гогаля “Рэвізор”, “Жаніцьба”, Грыбаедава “Гора ад розуму”, Астроўскага “Беднасць не загана” і іншыя, усяго 52 найменні. Чацвёрты раздзел уключаў п’есы з ярка выяўленым сатырычным характарам: Маякоўскага “Містэрыя-буф”, Шоў “Цэзар і Клеапатра”, Мальера “Тарцюф” і іншыя, усяго 26 п’ес. Пяты раздзел – гістарычныя п’есы: А.В.Луначарскага “Кромвель”, М.А.Астроўскага “Васіль Шуйскі”, А.С.Пушкіна “Барыс Гадуноў”. Шосты раздзел уключаў меладрамы, сёмы – п’есы вясёлага характару (вадэвілі), восьмы – агітацыйныя п’есы, прэміраваныя на двух конкурсах: Кагана “За свабоду”, Радыёнава “Дні рэвалюцыі”, усяго 18 п’ес. Дзевяты раздзел быў адведзены дзіцячым п’есам, у іх ліку “Снежная каралева” і інш. Аўтары рэкамендацый прадугледзелі рэпертуар для тэатраў з добрай сцэнай; для тэатраў, якія не маюць тэхнічных сродкаў, прапаноўвалі 19 п’ес. Складальнікі прызнавалі, што вельмі мала ў гэтым спісе п’ес “чыста рэвалюцыйнага кірунку і яшчэ менш паказальных для сацыялістычнага тэатра”. Як бачна, у спісе вельмі мала беларускіх п’ес. Затое сярод забароненых да пастаноўкі разам з чэхаўскімі “Хірургіяй” і “Прапановай” аказалася п’еса У.Галубка “Пацыенты” [18, 391, 23, 23 адв.].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, пагадзіцца з падобнай класіфікацыяй многіх сусветна вядомых твораў нельга, аднак аналізаваць яе не наша задача. Нас цікавіць працэс устанаўлення кантролю над аматарскімі аб'яднаннямі і надання іх рабоце палітычнага кірунку. Большасць самадзейных драматычных гурткоў па прычыне матэрыяльнай і прафесіянальнай слабасці дзейнічалі спарадычна, карысталіся тым, што змаглі адшукаць самі, і ў хуткім часе распадаліся, не вытрымаўшы выпрабаванняў. Таму стварэнне рэпертуарных камісій, спроба падрабязнай рэгламентацыі дзейнасці сельскіх аматарскіх гурткоў аказаліся толькі чарговымі праявамі кабінетнай, бюракратычнай творчасці. Ніякія рэкамендацыі, самыя падрабязныя і метадычна правільныя, не маглі дапамагчы малапісьменным вясковым юнакам і дзяўчатам падабраць п'есу, падрыхтаваць яе, данесці да гледачоў, стварыўшы адпаведную творчую атмасферу. Пакуль моладзь гарэла энтузіязмам, навізна справы захапляла яе, аднак з ростам матэрыяльных цяжкасцей энтузіязм паступова згасаў. І ўсё ж такі прымітыўна пастаўленыя аматарскімі гурткамі спектаклі аказаліся для вёскі новай і нават блізкай справай у адрозненне ад надакучлівых мітынгаў і кампаній.

Відавочныя перамены ў самадзейнай тэатральнай творчасці пачалі праяўляцца пасля 1923 г. Па-ранейшаму гуртоўцы не мелі магчымасці карыстацца грымам, тэатральным рэквізітам, адсутнічаў рэпертуар. Мабыць, па апошняй прычыне спектаклі ўжо "не выклікалі такога пачуцця ў гледачоў, якое яны павінны выклікаць" [14, 216, 38 адв.]. На даволі высокім узроўні, напрыклад, на акруговых з'ездах Саветаў прымаліся рашэнні "аб спыненні росту драматычных гурткоў і пераносе ўвагі на сельскагаспадарчыя", аб "ізаляцыі хаты-чытальні ад тэатральнай публікі" [24, 541, л.54, 242 адв.]. Тэатральная публіка – гэта, безумоўна, у асноўным моладзь, якая слаба ўяўляла мастацкую каштоўнасць п'есы. Галоўнае – магчымасць весела правесці вечар. Таму ладзіліся спектаклі не толькі ў хатах-чытальнях, але і ў школах і іншых памяшканнях. Перад націскам моладзі, аргументам: "Ты нам контррэвалюцыю тут не разводзь", – пасавалі многія. Вынікі ад спектакляў амаль заўсёды атрымліваліся дрэнныя: бойка, паламаныя дзверы, выбітыя шыбы [24, 300, л. 146].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На нарадзе палітасветработнікаў у маі 1924 г. старшыня ГПА звярнуў увагу прысутных на рэпертуар вясковых гурткоў, які “нікуды не варты, бо яны ставяць любую п’есу, якую тэхнічна могуць паставіць” [14, 197, л. 536]. Справаздачы з месцаў адлюстроўваюць небагаты рэпертуар аматарскіх гурткоў, не больш за 10–12 п’ес, ад “Чорт і баба” Ф.Аляхновіча і “Белая варона” В.Чырыкава да “Забойства селькара” невядомага аўтара, “Авадзень” Э.Войніч і інш. [14, 187, л. 47, 49, 55]. Па гэтай прычыне кіраўніцтва прыняло рашэнне аб распрацоўцы спіса рэкамендаваных п’ес, а таксама напісанні новых п’ес, адпаведных задачам дня. Было вырашана арганізаваць конкурс на лепшую п’есу для сялянскага тэатра і стварыць спецыяльную камісію, у якую ўвайшлі Янка Купала і Уладзімір Дубоўка [23, 19, л. 336]. Трэба заўважыць, што адсутнасць належнага рэпертуару выклікала актыўную драматургічную творчасць сярод вясковага настаўніцтва, студэнцтва, селькараў. Тэатральная секцыя Інбелькульта наладзіла двухмесячны семінар, аднак з вёскі прыехалі толькі некалькі слухачоў. Не была надрукавана плануемая да выдання кніжка “Сялянскі тэатр” з парадамі і методыкай падрыхтоўкі тэатральных пастановак, малюнкамі [23, 137, л. 260].

Інстанцыі, прызначаныя кантраляваць самадзейнае тэатральнае мастацтва, класіфікавалі гурткі вясковай моладзі адпаведна з абраным рэпертуарам. Адны з іх, на думку кіраўніцтва, складаліся з “вясковай інтэлігенцыі мяшчанскага характару, тон у іх задавалі ўсялякія папоўскія сынкі і дочкі, якія сталі настаўнікамі. Некаторыя з іх бачылі тэатр, мелі некаторую сцэнічна-аматарскую практыку і задавальнялі сябе і сялянскую масу старымі п’есамі, благімі, а іншы раз пахабнымі па сваім змесце...” [18, 383, л. 54]. Гурткі другога тыпу складаліся з мясцовых культурнікаў, пераважна моладзі. Яны “аддаюцца гэтай справе з захапленнем, працуюць без сродкаў, без ведаў тэатральнай тэхнікі, толькі карыстаючыся дапамогаю і парадамі тых ці іншых культурнікаў, якія толькі бачылі тэатральныя спектаклі”. Аўтар гэтых радкоў Я.Дыла лічыў, што вясковыя гурткі – “самавіты праўдзіва самадзейны беларускі народны тэатр, вынік вялікага рэвалюцыйнага часу” [2, 111, л. 4]. Менавіта яны аказаліся не задаволенымі неглыбокімі, зайгранымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускімі п’есамі, у якіх не было адказу на пытанні сучаснага жыцця. Таму яны прымалі ўдзел у розных кампаніях, урачыстасцях, формамі іх дзейнасці станавіліся такія віды, як агітацыйная п’еса, паказальны агітсуд, жывая газета і інш. [2, 111, л. 5].

Па гэтай прычыне самадзейныя тэатральныя гурткі можна было актыўна выкарыстоўваць у масавай палітыка-асветніцкай рабоце. Праблема бачылася ў тым, каб распрацаваць формы ідэйнага і практычнага кіравання імі, аб’яднаць іх працу з агульнай сістэмай палітасветработы, адначасова пакінуць за драмгурткамі справу культурнага асветніцтва на вёсцы. Партыйнае кіраўніцтва лічыла, што гурткі павінны садзейнічаць “выяўленню народнай творчасці. Кожны верш, казка, анекдот, п’еса, якія нагадваюць мясцовым сялянам іх жыццё, павінны выклікаць пільную ўвагу драматычнага гуртка. Вечары самадзейнасці – вось лепшая форма метадычнага пераходу ад драматычных гурткоў з іх казёншчынай і халтурай да гурткоў сапраўднай народнай творчасці” [14, 159, л. 68].

У рэчышчы падобных ідэй значная ўвага надавалася арганізацыі палітычных гульняў. З’явілася шмат метадычных рэкамендацый па арганізацыі вечарын з самымі падрабязнымі і вельмі далёкімі ад сапраўднага жыцця парадамі, напрыклад, як па-новаму перарабіць старыя народныя гульні і жарты. У аснову перабудовы быў пакладзены ідэалагічны прынцып супраціўлення старога ладу новаму, перавагі апошняга. З гэтага пункту гледжання рэкамендаваліся такія гульні, як “Цягнуць вяроўку”, “Фанты”, “Знаёмыя асобы” і інш. З улікам тагачаснай палітыкі прапаноўваліся новыя гульні: “Перасоўны даведачны стол”, “Галоўныя пытанні”, “Спартлато” і “Прафлато”, “Палітфанты” і нават “Палітдурачок” і “Прафдурачок” [14, 208, л.195].

Да масавай палітыка-выхаваўчай работы спрабавалі прыцягнуць нават вясковых музыкаў. Перад імі ставілася задача “выкінуць з рэпертуару старыя, нудныя, нікому не патрэбныя песні, яднацца ў аркестры, прасоўваць на вёску новыя, рэвалюцыйныя песні, музыку. Яны павінны стаць актывістамі барацьбы за новы быт” [9, 166, л. 50]. Мінскі акруговы палітасвет рэкамендаваў раёнам правесці нарады вясковых музыкаў: гарманістаў, скрыпачоў і цымбалістаў. Да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтай справы далучаліся ўсе раённыя ўстановы: выканкамы, партыйныя і камсамольскія камітэты (адны – арганізацыйна, другія – матэрыяльна). План правядзення нарады акруговы палітасвет распрацаваў даволі падрабязна. Аднак раёны паведамлялі, што “хаты-чытальні не маюць належнага ўліку ўсіх вясковых музыкантаў” [14, 208, л. 209]. У асобных раёнах адбыліся нарады, яны “выявілі значную частку музыкантаў, якія не жадаюць без аплаты ісці ў хату-чытальню, па гэтай прычыне часткова адсутнічае карысна-масавая праца, звязаная з музыкай” [14, 217, л. 27].

Як бачым, за некалькі гадоў падыход адпаведных інстанцый да самадзейнага драматычнага мастацтва змяніўся – ад заклікаў, тэрміновага стварэння драмгурткоў да адмаўлення станоўчых момантаў у іх дзейнасці. Месца дзеі, незвычайнай і цікавай сялянству, занялі афіцыйныя мерапрыемствы з абавязковымі нумарамі мастацкай самадзейнасці, якія, на думку кіраўніцтва, “адхілялі моладзь ад п’янства, хуліганства і іншых шкодных з’яў, прывучалі жыць больш культурна” [4, 250а, л. 173].

### *2.3.2. Нацыянальна-культурнае адраджэнне*

На нашу думку, адна з самых цікавых старонак культурнага жыцця вёскі – пачатак беларусізацыі і дзейнасць беларускіх культурна-асветніцкіх гурткоў. Неабходна звярнуць увагу на тое, што працэс нацыянальнага адраджэння ў 1920-я гг. навукоўцы звязваюць з афіцыйнымі пастановамі па гэтым пытанні. Аднак па-за ўвагай засталіся праявы ранняй беларусізацыі, якія мелі месца ў вёсцы пачатку 1920-х гг. Кіраўніком гэтага патрыятычнага руху, што ўзнік па ініцыятыве знізу, выступіла вясковая інтэлігенцыя, пераважна настаўнікі. Распаўсюджанне ідэі беларусізацыі ў вясковым асяроддзі яскрава пацвярджае факт разумення неабходнасці нацыянальнага адраджэння значнай часткай сялянства. Самы першы крок у кірунку беларусізацыі быў зроблены загадчыкам беларускага аддзела НКА П.В.Ільючонкам. Так, 2 ліпеня 1920 г. ён накіраваў Мінскай губернскай тройцы, што выконвала функцыі ЦК КП(б)Б, запіску, у якой даказваў неабходнасць пераводу школ на беларускую мову [536, с.14].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мабыць, гэтая ідэя выклікала прыняцце 4 лютага 1921 г. пастановы ЦВК рэспублікі аб планамерным і паступовым пераходзе на працягу 1921 г. усіх установ, дзе вучацца і выхоўваюцца дзеці беларусаў, на іх матчыну мову. Дакумент прадугледжваў падрыхтоўку лектараў, якія б маглі працаваць на настаўніцкіх курсах і ў школах другой ступені. У маі пры НКА адчыніліся шасцімесячныя курсы лектараў па беларускай мове, гісторыі і геаграфіі Беларусі. Ад кожнага павета пасылаліся па 25 чалавек [18, 190, л. 1].

Да працэсу беларусізацыі далучалася і Хата беларускага мастацтва (ХБМ) памяці І.Буйніцкага. 17 жніўня 1921 г. яе ўправа даручыла павятовым аддзелам асветы арганізаваць у сябе аддзелы ХБМ і звязацца з усімі мясцовымі беларускімі гурткамі, а таксама стварыць валасныя аддзелы ХБМ. Мэтай плануемай структуры павінна была стаць падтрымка беларускай культуры. На аддзелы ХБМ ускладаліся абавязкі “запісваць мелодыі беларускіх народных песень, казак, легендаў, замалёўваць узоры беларускіх народных паясоў, тканін, ганчарных вырабаў, клапаціцца аб захаванні помнікаў старажытнасці” [18, 190, л. 6). Праз некаторы час узнікаюць павятовыя хаты беларускай культуры і мастацтва, а ў валасцях – беларускія культурныя гурткі, якія ставяць мэтай пашырэнне беларускасці.

Трэба падкрэсліць, што на працэс беларусізацыі звярнуў увагу і Галоўпалітасвет рэспублікі. У канцы 1921 г. ён прасіў нізавыя ўстановы сваёй структуры паведаміць аб “дасягненнях у адраджэнні беларускай нацыянальнай культуры, адносінах сялян да беларускага руху”, назваць “свядомых, актыўных беларускіх працаўнікоў, якіх можна скарыстаць для арганізацыі працы; якія воласці паветаў больш адклікаюцца на адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры” [18, 170, л. 45]. Працэс беларусізацыі пачаўся па-рознаму. З некаторых валасцей, напрыклад Астрашыцка-Гарадоцкай, паведамлялі, што “беларуская мова набыла ў школах пераважнае значэнне. Адносіны вучняў і бацькоў – добразычлівыя” [44, 49, л. 51], а на з’ездзе дэлегатаў мясцовых камітэтаў Міншчыны большасць выказалася за выкладанне на беларускай мове [44, л. 51; 44,48, л. 59].

Другі кірунак першапачатковай беларусізацыі – культурнае асветніцтва – аказаўся больш відовішчным і цікавым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Думкі аб нацыянальным адраджэнні ўзніклі ў розных кутках рэспублікі. Яны матэрыялізаваліся ў дзейнасці беларускіх культурна-асветніцкіх гурткоў, дакладней, іх драматычных секцый. Заснавальнікамі іх станавіліся галоўным чынам настаўнікі, дзе-нідзе – студэнты. Адзін з першых гурткоў, які ўзняў праблему адраджэння, стварылі настаўнікі мястэчка Крайск у красавіку 1920 г., але аб яго дзейнасці – трохі ніжэй. Некаторыя настаўнікі дзейнічалі ў азначаным кірунку самастойна. Напрыклад, у красавіку 1921 г. школьнікі і моладзь вёскі Весніца Барысаўскага павета паставілі п'есу Ф.Аляхновіча "Калісь". Перад пачаткам спектакля настаўніца сказала прамову аб карысці асветніцтва [18, 155, л. 36].

Узніклі гурткі на Случчыне, Міншчыне, Ігуменшчыне. Напрыклад, у культурна-асветніцкае аб'яднанне вёскі Севінка Слуцкага павета ўвайшлі 37 чалавек. Яны знайшлі памяшканне, нават з раялем, ладзілі музычна-літаратурныя вечарыны, асабліва падчас канікул. Аднак дзейнасць гуртка не прыйшлася даспадобы мясцовым уладам, якія адабралі памяшканне, што прывяло да спынення дзейнасці гуртка. Актыўна дзейнічалі гурткі "Рунь" на Ігуменшчыне і "Крыніца" на Случчыне. У тагачасным друку паведамлялася аб спектаклі "Чорт і баба", які паставіў Баслаўскі гурток, і асабліва адзначалася "вельмі добрая ігра кабет". Сябры Бабруйскай беларускай павятовай хаты беларускай культуры і мастацтва вандравалі летам па вёсках, "сеючы культурнае насенне" [508, с. 3].

Вядома, што драматычнае мастацтва патрабуе пэўнай падрыхтоўкі як выканаўцаў, так і гледачоў. І тыя форма і змест, якія былі прапанаваны вяскоўцам, зрабілі гэта мастацтва блізкім і зразумелым сялянству. Зацікаўленасць аднавяскоўцаў аказалася такой, што гуртkоўцы вымушаны былі праводзіць рэпетыцыі ноччу, каб захаваць неспадзяванасць, нечаканасць сустрэчы з героямі п'есы. Рэпертуар гурткоў у большасці складаўся з беларускіх п'ес. Кожны гурток выбіраў п'есу па сваіх магчымасцях, асабліва складана аказвалася падабраць выканаўцаў жаночых роляў. Не даводзілася вельмі перабіраць і з памяшканнямі, спектаклі ладзілі ў школе, у хаце-чытальні, нават у сялянскіх свірнах, на таку. Затое дэкарацыі і адзенне акцёраў былі самыя што ні на ёсць натуральныя, ды сюжэт п'есы як найлепш упісваўся ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навакольнае асяроддзе. Змест п'есы, яе мова былі для гледачоў блізкімі і зразумелымі, а галоўнае, яны чулі, што гучыць са сцэны, а значыць, існуе, захавалася сваё, роднае слова, з дапамогай якога так трапна перадаюцца і жарт, і прымаўка. Сам працэс падрыхтоўкі спектакля, апантанасць моладзі не маглі не захапляць і астатніх вяскоўцаў, не маглі не ствараць уражання нейкай незвычайнай падзеі.

У сувязі з актывізацыяй беларускага руху перад кіруючымі органамі паўстала пытанне адбору беларускіх п'ес для пастановак самадзейнымі калектывамі. У канцы 1922 г. спіс быў апублікаваны, у яго ўвайшлі 42 п'есы дваццаці аўтараў, напрыклад "Паўлінка", "Раскіданае гняздо" Я.Купалы, "Модны шляхцюк" К.Каганца, "Антось Лата" Я.Коласа, "Цені", "Каліcь", "Чорт і баба" Ф.Аляхновіча, "Апошняе спатканне", "Бязвінная кроў", "Ганка" Ул.Галубка і інш. [18, 170, л. 446].

Найбольш шырокае распаўсюджанне ідэя беларусізацыі знайшла на Барысаўшчыне. Ужо ў пачатку 1921 г. адсюль паведамлялі: "Беларусы павета сталі арганізоўвацца, таму патрэбныя беларускія п'есы і ноты" [18, 148, л. 50]. Гэтая акалічнасць мела пад сабой гістарычныя карані. Яшчэ ў 1905 г. вучні гарадскога вучылішча заснавалі беларускі гуртох, праца якога была хутка забаронена з прычыны здрады аднаго з сяброў. У пачатку 1914 г. у гэтым жа вучылішчы, акрамя дзейнасці аднаўленага беларускага гуртка, распачынаецца праца па збіранні народных твораў, знаёмстве з роднай мовай. Аднак Першая сусветная вайна прыпыніла гэтую работу. У паслярэвалюцыйныя гады аднаўляецца праца на ніве беларускага адраджэння і робіцца збор на карысць беларускага фонду, ставяцца беларускія спектаклі. Праўда, гэтаму перашкаджае частая перамена лініі фронту, але пасля стабілізацыі палітычнай сітуацыі справа зноў ажывае [21, 1, л. 6].

На сходзе 29 чэрвеня 1921 г. слухачы павятовых двухмесячных педагагічных курсаў, на якіх займаліся настаўнікі з усіх валасцей, па ініцыятыве М.Таразевіча з крайскага гуртка "Вянок" аб'явілі аб стварэнні беларускага гуртка пры курсах. Яны ставілі перад сабою мэту "пашырэння беларускай культуры шляхам пастаноўкі спектакляў, чытання лекцый, выступленняў хору і арганізацыі літаратурных вечароў" [18,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

197, л. 1]. Безумоўна, задума для свайго часу цікавая, але, здаецца, гурткоўцы не ўлічвалі часовасці свайго знаходжання ў Барысаве і цяжкага эканамічнага стану павета. Гурток прасіў дапамогі ў павятовага камітэта палітасветы, дэманструючы сваё жаданне працаваць на платформе савецкай улады. Для пачатку патрэбныя былі беларускія плакаты, падручнікі па беларусазнаўстве і беларускай літаратуры, газеты, тэатральныя прылады. Аднак кіруючая арганізацыя з-за адсутнасці сродкаў нічым дапамагчы не змагла.

Справа беларускага адраджэння атрымала моцны імпульс пасля прыезду ў Барысаў А.Іванова-Казельскага. Ён меў дачыненне да тэатральнай творчасці, якою займаўся паўтара дзесятка гадоў як акцёр, рэжысёр і аўтар адначасова. Таму і быў прызначаны інструктарам-рэжысёрам рускай і беларускай труп і адначасова старшынёй беларускай секцыі (потым пададдзела) у аддзеле асветы. Ён абраў псеўданім Сымон Музыка [18, 391, л. 2]. Шкада, але ў “Слоўніку беларускіх псеўданімаў” Я.Саламевіча яго імя не згадваецца.

На другім агульным сходзе беларускага гуртка пры настаўніцкіх курсах Сымон Музыка (так ён падпісваўся нават на афіцыйных дакументах) зрабіў даклад аб агульным стане беларускай культуры і прапанаваў стварыць пастаянна дзеючы гурток у Барысаве, прыцягнуўшы да працы ў ім мясцовых беларусаў. Ён выступаў некалькі разоў і вельмі пранікнёна гаварыў аб “неабходнасці падцягнуцца, каб не было закідаў, што беларусы нічога не ўмелі, не ўмеюць і не зробяць у будучым”. Ён даводзіў прысутным аб паспешлівых рашэннях, аб немагчымасці дапамогі з боку дзяржаўных устаноў. Пад уплывам выступлення Сымона Музыкі сход прыняў рашэнне рэарганізавацца ў “Беларускі культурна-асветніцкі гурток у складзе драматычнай, харавой, літаратурнай і выдавецкай секцый” [18, 197, л. 7, 7 адв.].

У хуткім часе гурток стаў называцца “Беларуская навукова-культурная грамада”. Яна была зарэгістравана 10 студзеня 1922 г., яе статут зацвердзіў наркам асветы У.М.Ігнатоўскі. Новая арганізацыя ставіла вельмі шырокія мэты: вывучэнне асаблівасцей і старажытнасцей Бацькаўшчыны, арганізацыю артыстычных выстаў на базе беларускіх драматычных, музычных і літаратурных твораў, адкрыццё беларускага музея, выстаў культуры краю, правядзенне курсаў, чытанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лекцый па краязнаўстве [18, 170, л. 42]. Разуменне Грамадою неабходнасці захавання і развіцця народнай спадчыны, на наш погляд, не выклікае сумнення, але праграма аднаўлення ўсіх "старых культурна-навуковых помнікаў, якія захаваліся ў народзе і ходзяць сярод яго ў легендах, казках, спевах," адразу аказалася нерэальнай. Гэтак жа варта ацаніць і заклікі да ўсіх культурнікаў запісваць "арыгінальныя дыялекты беларускай мовы, народныя мелодыі, легенды, казкі, вершы, паданні, апавяданні і збіраць мастацкія, ткацкія, ганчарныя вырабы" [1, 21, л. 9].

Пасля заканчэння летніх курсаў настаўнікі раз'ехаліся па сваіх школах, і ў васьмі валасцях павета былі арганізаваны беларускія культурна-асветніцкія гурткі, якія працавалі незалежна ад валасных палітасветаў. Галоўным відам іх дзейнасці стала пастаноўка спектакляў. Як пісалася ў справаздачы аднаго з гурткоў, "гэта давала магчымасць гледачам зразумець, што на простай мужыцкай мове можна не толькі чытаць альбо пісаць, але нават адбіваць малюнкі жыцця з усёй прыгажосцю, пекнатой, а найбарджэй зразумеласцю" [18, 399, л.2, 4].

З мясцовых гурткоў самы цікавы і дзеяздольны склаўся яшчэ ў красавіку 1920 г. у мястэчку Крайск. Дванаццаць настаўнікаў мясцовай школы, прымаючы пад увагу "пэўную адсутнасць, бадай, якое асветніцкае працы ў той час, калі сялянства вёскі, асабліва моладзь, адчувае надзвычайна пякучую патрэбу ў асвеце і павышэнні агульнакультурнага ўзроўню" [18, 395, л. 5], ствараюць гурток з прыгожай назвай "Вянок". За першы год існавання сябры гуртка паставілі шэсць спектакляў, галоўным чынам фальклорнага кшталту. Арганізатарам і рэжысёрам быў В.Таразевіч, хор узначальваў І.Чачык, струнны аркестр – Я.Таразевіч, артыстам і лектарам па беларусазнаўстве быў Я.Трубач [21, 4, л. 4]. Гурток існаваў, як сведчаць дакументы, да 1923 г., і яго дзейнасць, безумоўна, яркі і прыгожы прыклад таго, што многа можна было зрабіць невялікімі, але актыўнымі сіламі.

Статут вянкоўцаў, паўтараючы асноўныя палажэнні статута Грамады, ставіў сваёй задачай пашырэнне беларускай культуры і роднай мовы, прадугледжваў "адкрыццё беларускіх хат, кнігарняў, пастаноўку спектакляў, выступленні перад рознымі таварыствамі, каб бараніць беларускую справу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і асвету, знаёмства насельніцтва з гісторыяй Бацькаўшчыны, роднай літаратурай, збіранне беларускіх народных твораў, запіс мелодый і беларускіх спеваў, этнаграфічнага і гістарычнага матэрыялу”. Паказальным з’яўляецца наступнае патрабаванне: “Сябрам гуртка размаўляць паміж сабою і ўсюды на беларускай мове” [18, 399, л. 14].

Неабходна заўважыць, што мясцовыя ўлады да працы вянкоўцаў, мякка кажучы, адносіліся абыякава. Справа даходзіла нават да рабавання тэатральнай маёмасці гуртка. Затое вясковае насельніцтва ставілася да самадзейных артыстаў вельмі прыхільна. Адчуваючы гэта, гурткоўцы ў сваю чаргу выказвалі падзяку гледачам, выязджаючы са спектаклямі ў навакольныя вёскі. Іх усюды чакалі і нават запрашалі. Сяляне вёскі Заброддзе, напрыклад, напісалі заяву, каб у іх вёсцы паказалі п’есу “Збянтэжаны Саўка”, абяцаючы за свой кошт “падрыхтаваць усё патрэбнае для спектакля”. Гурткоўцы выканалі пажаданне сялян, перад паказам спектакля была прачытана лекцыя па гісторыі Беларусі [18, 399, л. 19]. Трэба дадаць, што амаль кожны спектакль суправаджаўся ці лекцыяй па беларусазнаўстве, ці выступленнем хору. Спектаклі былі ў асноўным платныя, на здабытыя сродкі куплялі тэатральныя прылады, а частку аддавалі ў розныя фонды: то Чырвонай Арміі, то галадаючым Паволжа, то Грамадзе.

Гурток крайскіх настаўнікаў адыграў важную ролю ў справе надання беларускім народным традыцыям афіцыйнага прызнання. Прыкладам можа быць святкаванне Купалля. Двойчы, у 1921 і 1922 гг., «вяскоўцы ладзілі гэтае свята па дакладна распрацаванай праграме. На адкрытай сцэне ставіўся спектакль “На вёсцы” Ф.Аляхновіча, потым хор выконваў беларускія песні, а струнны аркестр іграў беларускія мелодыі. Апоўначы пачыналіся карагоды і скокі праз вогнішча...» [18, 399, л. 38]. Звернем увагу, што гэта адзінае ўпамінанне ў дакументах, якімі карыстаўся аўтар, аб прызнанні народнага свята.

З пачаткам афіцыйнай беларусізацыі дзейнасць гуртка зліваецца з палітычным асветніцтвам і губляе сваю адметнасць. Аднак яго творчасць аказалася самай прыметнай з усіх беларускіх гурткоў. Поспех гэты цалкам можна аднесці на рахунак сяброў гуртка, якія з’яўляліся найбольш адукаванымі

людзьмі мясцовага асяроддзя, добра разумелі мэты сваёй дзейнасці і многае паспелі здзейсніць.

Шкада, што такіх высноў нельга зрабіць наконт астатніх беларускіх гурткоў, хаця і сярод іх сяброў сустракаліся апантаныя людзі. Так, 4 верасня 1921 г. былы барысаўскі курсант Я. Бабкоўскі, настаўнік Гасцілавіцкай школы на Лагойшчыне, арганізаваў гурток пад назвай “Працаўнік”. Большасць яго сяброў складалі сялянская моладзь і вучні мясцовых школ. Памяшканне гуртка мела назву “Беларуская хата”. Тут праводзіліся лекцыі па гісторыі і геаграфіі Беларусі, два разы ў тыдзень непісьменныя сябры гуртка вучыліся чытаць і пісаць, тут знаходзілася бібліятэка. “Працаўнік” распачаў сваю дзейнасць 18 верасня 1921 г., паставіўшы спектаклі “Міхалка” і “Гутарка рабочага і селяніна аб харчовым падатку”. Мясцовыя ўлады спачатку даволі скептычна аднесліся да гуртка, але пасля першага спектакля адбыліся некаторыя станоўчыя змены. Праўда, патрэбнай матэрыяльнай дапамогі гурток не атрымаў, бо выканкам лічыў, што “зараз нэп, і ўсё трэба купляць за свае грошы” [18, 393, л. 3, 5, 16].

За восень 1921 г. гуртоўцы паставілі 5 спектакляў, зімою абмежаваліся арганізацыяй літаратурных вечарын, выступленнямі хору ў вёсках Лагойшчыны і лекцыямі па гісторыі і геаграфіі Беларусі. Кіраўнік гуртка займаўся запісам абрадавых і калядных песень. Вясною 1922 г. зноў пачалі ладзіць спектаклі, летам праца спынілася. Восенню 1922 г. спектаклі паказвалі ў розных вёсках, таму што ў Гасцілавічах памяшкання не знайшлі. У 1923 г. праца гуртка стала патроху слабець, бо яго кіраўніцтва “пачало працаваць у валасным выканкаме, і гурток паступова пераарыентаваўся на палітыка-асветніцкі і антырэлігійны кірункі” [18, 393, л. 17 адв.]. Безумоўна, гурток гасцілавіцкай моладзі не змог дасягнуць узроўню вянкоўцаў, аднак самай станоўчай ацэнкі заслугоўвае яго дзейнасць па пашырэнні беларускасці і ў цэлым адукацыі і культуры.

Беларускія культурна-асветніцкія гурткі дзейнічалі ў вёсках Корань, Малыя Ухалоды, Кішчына Слабада, Гарадзішча, Слабада, Забяшэвічы. Сябрамі іх былі ў асноўным прадстаўнікі сялянскай моладзі, арганізатарамі і кіраўнікамі – мясцовыя настаўнікі, былыя барысаўскія курсанты. На іх лёг

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

увесь цяжар арганізацыйнай і творчай працы, аб чым сведчыць ліст з Гайна-Слабадской воласці на імя Сымона Музыкі: «Сябра Сымоне! Мы ўжо пачалі збольшага сваю гуртковую працу. У суботу, 22 красавіка 1922 г., у Корані адбыліся першыя гуртковыя спектаклі: “Чорт і баба” і “Міхалка”. Пасля вучні дэкламавалі вершы Я.Купалы і Я.Коласа. Кепска толькі з тым, што кругом і ва ўсім недахваты, перш за ўсё няма культурных сіл, ледзь не аднаму мне даводзіцца збіраць і зносіць на плячах дошкі для сцэны, ды і пазычыць гэтых дошчак не так лёгка – ніхто не хоча даваць. Кепска, што ўся праца ляжыць на мне не як на старшыні арганізацыі, а як на нейкім дыктатары, бо няма з кім раіцца – ніхто не папсуе і не наладзіць справы. Язэп Гладкі, 25 красавіка 1922 г.» [18, 398, л. 1].

Мясцовыя ўлады вельмі мала дапамагалі гурткоўцам. Напрыклад, моладзь вёскі Малыя Ухалоды прасіла валасны палітасвет, каб ён перадаў беларускаму гуртку хату-чытальню, якая амаль не дзейнічала. Аднак кіраўніцтва нават не адказала на гэтую просьбу [18, 395, л. 5].

У некаторых месцах стварыць беларускія гурткі не змаглі па прычыне адсутнасці адпаведных умоў. У гэтым выпадку ініцыятыву бралі на сябе настаўнікі, якія далучалі вучняў да пашырэння беларускай асветы. Напрыклад, настаўнік Ігнат Платон паведамляў: «Я ў Цімкавіцкай школе ў святочныя дні часта разыгрываю з вучнямі з беларускіх сцэнічных твораў і навучыў іх пець беларускія песні. У Бытчы прайшоўшымі святамі я з вучыцелямі ставіў “Па рэвізіі”, “Пашыліся ў дурні”, “Чорт і баба”, “Антон Лата”. У Кішчанскай Слабадзе перад Калядамі я паставіў толькі “Па рэвізіі”. Але і тамака ёсць гурток маладых хлопцаў, разумных і любячых беларускую мову, і яны сяткамі ставілі “Чорт і баба”, “Калісь” і многа іншых твораў» [18, 413, л.5, 5 адв.].

Такім чынам, відавочна, што беларусізацыя знізу паступова, але настойліва рабіла крокі да абуджэння свядомасці народа. На жаль, гэтыя крокі не толькі не падтрымліваліся ўладай, а часта выклікалі крытыку. Працытуем на мове арыгінала адзін з афіцыйных дакументаў: “Период нашей жизни ознаменовался тем, что потребность населения в просвещении и саморазвитии, потребность, которая прежде всячески убивалась царским правительством, в этот период

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

смогла широко развиться и приняла к настоящему моменту стихийный характер. Стали образовываться всевозможные культпросветучреждения (клубы, избы-читальни, народные дома, театры), возникли и возникают массовым образом драматические кружки, труппы... . Необходимо отметить, что эти драмкружки часто ставят пьесы, которые очень многим вредят зрителям, вредно влияя на их психологию и развивая нездоровые наклонности... . Так, пьеса ярко шовинистического (национально-патриотического) содержания развивает в зрителе национально-патриотические наклонности" [18, 383, л. 55]. Менавіта гэта і не падабалася кіруючым колам. Безумоўна, калі мець на ўвазе вядомы лозунг аб адсутнасці радзімы ў пралетарыя, то выказаныя ў дакуменце думкі справядлівыя. Калі ж разглядаць чалавека як сацыяльную адзінку, то пачуццё патрыятызму, любові да радзімы – галоўная рыса кожнай цывілізаванай асобы.

Абыякавае стаўленне кіруючых інстанцый да беларускіх аб'яднанняў вяло да заняпаду іх дзейнасці. Без матэрыяльнай і маральнай падтрымкі працаваць аказалася немагчыма. У першай палове 1923 г. спыніла сваё існаванне Беларуская навукова-культурная грамада, паціху замірала дзейнасць валасных беларускіх гурткоў. У дакументах наступных гадоў не сустракаецца ніякіх звестак аб іх. Аднак важна, што на самым пачатку мірнага жыцця менавіта знізу робіцца спроба беларускага адраджэння, абуджэння нацыянальнай самасвядомасці, інтарэсу і павагі да сваіх мінуўшчыны, мовы і культуры. Ля вытокаў гэтай патрыятычнай з'явы стаяла вясковае настаўніцтва, якое тым самым выконвала сваю галоўнейшую і высакароднейшую задачу народнага асветніцтва. Распаўсюджванне гэтага працэсу на шырокія колы павінна было садзейнічаць далейшаму развіццю нацыянальнай культуры.

Першым афіцыйным прызнаннем самабытнасці беларускага мастацтва і народнай культуры стала культурная праграма нашай дэлегацыі на 1-й Усерасійскай сельскагаспадарчай і кустарнай выставе. Яна пачала працу ў жніўні 1923 г., аднак яе адкрыццю папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа.

На выставе былі прадстаўлены праца Балотнай і Банцараўскай станцый, раздзелы па паляводстве, агранамічнай дапамозе і жывёлагадоўлі. Было ясна, што без экспанатаў па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфіі і народным побыце выстава проста можа не адбыцца, бо не будзе чаго паказваць. Белвысткам усклаў галоўную адказнасць за іх збор на Інстытут беларускай культуры, які прыцягнуў да гэтай працы вясковае настаўніцтва. Але, нягледзячы на заклікі і ўгаворы, значных вынікаў не было. Напрыклад, з Сёмкава-Гарадоцкай воласці паведамлялася, што “насельніцтва ў лепшым выпадку паказвала рэчы для апісання, не даючы іх у рукі, таму што не бачыла ніякіх гарантый з боку агітатара”. Настаўнікі абышлі ўсе вёскі, але ўсюды вынікі аказаліся нездавальняльнымі. Некаторыя школьныя работнікі з Ігуменскага і Барысаўскага паветаў закладвалі ўласныя рэчы, трацілі грошы, каб набыць што-небудзь для выставы [45, 49, л. 262]. Толькі ў ліпені, незадоўга да адкрыцця, Белвысткам выдзеліў на экспанаты па побыце і этнаграфіі для Мазыра 20 тыс. руб., астатнім паветам па 300 пудоў збожжа. Акрамя гэтага, былі выдадзены пасведчанні на вызваленне ўдзельнікаў выставы ад падаткаў на 500 пудоў жыта [49, 7, л. 499 адв., 814].

Дзякуючы гэтым мерам і самаадданасці настаўніцтва ўдалося сабраць цікавыя экспанаты: каля 70 беларускіх паясоў, 40 вышывак, 10 музычных інструментаў, мадэлі дзвюх тыповых сядзіб, каля 50 вырабаў з бяросты і лазы, шмат відаў лячэння з народнымі замовамі [49, 7, л. 500].

На выставе планаваліся ў асобным выставачным тэатры пастаноўка п’ес, паказ гульняў і іншых нумароў культурнай праграмы, каб бліжэй пазнаёміцца з мастацтвам і побытам розных народаў. Вызначэнне культурнай праграмы беларускай дэлегацыі ішло даволі складана. Аднаму з кіраўнікоў рэспублікі падалося неабходным паслаць у Маскву сляпога лірніка, але праз некаторы час перадумалі, і ў Слуцк пайшла такая тэлеграма: “Прыміце ў тэрміновым парадку ўсе захады да пошуку ў павеце лірніка і дамоўцеся з ім аб умовах яго паездкі на адзін месяц у Маскву. Пажадана, каб лірнік быў не сляпец-жабрак, а стары селянін і каб, акрамя святарных песнапенняў, мог паказаць у сваіх песнях карціны з мінулага Беларусі” [49, 12, л. 124, 393]. На Случчыне, у вёсцы Мусічы, знайшлі лірніка К.Караленку, у рэпертуары якога было больш за 20 песень, сярод іх “Беларуская марсельеза”, “Захацела бабуленька разам узбагацеці”, “Маці Боска” і інш. У Барысаў і Ігумен былі адпраўлены тэлеграмы падобнага

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

зместу, але размова ўжо ішла пра дудароў, якія павінны былі выконваць народныя танцы і песні, абавязкова быць апранутымі ў беларускае адзенне. З вёскі Нэтаўка Ігуменскага павета ў Маскву паехаў В.Р.Знак, а з Барысаўскага – Хатчанка. За выступленні народным музыкам абяцалі па пуду жыта і 75 кап. золатам у дзень [49, 7, л. 279; 12, л. 254]. Самабытнае мастацтва лірніка і дудароў павінна было з'яўляцца своеасаблівай ілюстрацыяй да экспазіцыі этнаграфіі і побыту.

Па загаду старшыні СНК Беларусі А.Р.Чарвякова доўга шукалі тэатр марыянетак – батлейку. У рэшце рэшт дзеючая батлейка была знойдзена, і камісія Белвысткама зрабіла яе агляд. Батлейка была паказана ў раздзеле побыту як прыклад "вымiраючага беларускага народнага тэатра". Культуру і мастацтва Беларусі паказвала трупа з 23 артыстаў Дзяржаўнага тэатра, а таксама хор пад кіраўніцтвам У.Тэраўскага, аркестр у складзе музыкаў і балет з 12 артыстаў. Праграма ўключала музычныя драмы "Машэка", "На Купалле", п'есу "Пінская шляхта", вечар беларускай народнай песні.

19 жніўня 1923 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё выставы. Тагачасная прэса і шматлікія наведвальнікі адзначалі афармленне беларускага павільёна, дзе вельмі ўдала быў паказаны менавіта побыт беларускага народа. На самай справе хваліцца дасягненнямі ў эканоміцы падстаў не было, таму аўтары экспазіцыі зрабілі (можа, чыста інтуітыўна) правільны націск на своеасаблівасці прыродных умоў, этнаграфіі і культуры Беларусі. У адной з газетных вытрымак вельмі трапна адзначалася, што ніякія гаспадарчыя дасягненні савецкай улады не прыцягвалі гэткай увагі публікі і замежных гасцей, як беларускі хор, што заўсёды выступаў у нацыянальным адзенні, як тэатр і балет.

Трэба заўважыць, выступленне прадстаўнікоў беларускага мастацтва і культуры на выставе стала яскравым доказам самабытнасці беларускага этнасу, яго мовы і культуры, своеасаблівым абгрунтаваннем права беларусаў на самастойнае існаванне і развіццё.

Улічваючы наяўнасць шматлікіх работ па праблемах беларусізацыі, мы абмежаваліся толькі разгледжанымі аспектамі.

На падставе вышэйпрыведзеных дакументаў можна канстатаваць факт існавання на пачатку 1920-х гг. палітычнага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнага асветніцтва. Апошняе зарадзілася ў вясковым асяроддзі і адпавядала яго настроям і інтарэсам. Носьбітам культурнага асветніцтва з'яўляліся ў першую чаргу вясковае настаўніцтва і моладзь.

Дзейнасць беларускіх культурна-асветніцкіх аб'яднанняў сведчыць аб шырокім распаўсюджанні ідэі беларусізацыі ў вясковым асяроддзі і аб яго зацікаўленым успрыманні гэтай ідэі. Таму неабходна падкрэсліць факт аб'яднання ў адзіны паток намаганняў вясковай інтэлігенцыі і імкненняў перадавых колаў сялянства да нацыянальнага адраджэння і паглыблення нацыянальнай самасвядомасці. Аднак нізавая ініцыятыва была абмежавана пасля афіцыйна абвешчанай беларусізацыі, якая разгарнулася пад кіраўніцтвам партыі і савецкіх органаў.

## 2. 4. Культурна-асветніцкая дзейнасць вандроўнага тэатра пад кіраўніцтвам У.Галубка

Пры размове аб ролі самадзейных драматычных гурткоў у культурным асветніцтве вёскі нельга абысці дзейнасць У.Галубка і яго трупы.

Трэба зазначыць, што ў культурнай палітыцы ўлад адсутнічаў найважнейшы момант, найгалоўнейшая ўмова яе духоўнай вартасці – пераемнасць. Партыя бальшавікоў заклікала да стварэння новай пралетарскай культуры. Шматвяковая культура народа была адсунута на задні план, прыніжана на дзяржаўным узроўні, прызнавалася як бы другараднай. Афіцыйныя культурныя мерапрыемствы арганізоўваліся людзьмі, якія не мелі дастатковых ведаў, навыкаў ды нават і адукацыі. Большасць мерапрыемстваў мелі стэрэатыпны прымітыўны характар і не выклікалі зацікаўленасці гледачоў, не адыгрывалі ніякай станоўчай ролі, не неслі ў сабе творчага зместу.

Таму такой блізкай і зразумелай вясковаму люду стала асветніцкая дзейнасць тэатра Уладзіслава Галубка. Сам кіраўнік плённа працаваў як драматург, яго п'есы ў рукапісным выглядзе разыходзіліся па ўсёй рэспубліцы. Дапамагаў ён і самадзейным артыстам. Напрыклад, у жніўні 1922 г. у Хаце селяніна павятовага цэнтра Ігумен курсанты настаўніцкіх курсаў наладзілі беларускую вечарыну. Гледачы вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыхільна сустрэлі п’есу “Двужэнцы”, якая была пастаўлена пры ўдзеле У.Галубка [135, с. 41]. Як вядома, сістэматычныя выезды трупы на вёску пачаліся з вясны 1922 г. Да гэтага часу, пачынаючы са жніўня 1920 г. (з моманту стварэння), галубкоўцы паказвалі свае спектаклі на рабочых ускраінах Мінска. У гэты час сам Уладзіслаў Язэпавіч быў не толькі рэжысёрам і акцёрам, але і савецкім служачым. Спачатку ён працаваў у беларускім аддзеле Наркамата асветы. У архіве захавалася заява, напісаная рукою У.Галубка, наконт пераходу з Наркамата ў павятовы аддзел. Уладзіслаў Язэпавіч у гэтым выпадку дбаў пра інтарэсы тэатральнай справы, таму што новая пасада давала больш шырокія магчымасці для дзейнасці ў рамках павета. Адначасова ён займаўся і падборам кадраў, пра гэта сведчыць яго заява з просьбаю накіраваць у павятовы аддзел артыста Рычарда Ленцкага, які ў хуткім часе заняў пасаду інструктара тэатральнай агітацыі ў агітацыйным аддзеле. Аднак зрушыць з месца бюракратычны махавік было амаль немагчыма. Не выпадкова ў адной з тагачасных справаздач гаварылася, што ёсць мастацкі пададдзел, ёсць яго загадчык, а работы не відаць.

Разумеючы немагчымасць дасягнення поспехаў у кіраванні мастацтвам павятовага маштабу і адчуваючы вялікія фізічныя перагрузкі, У. Галубок 21 лістапада 1921 г. піша заяву з просьбай звольніць яго з гэтай пасады: “Ввиду того, что ощущается острая нужда в театральном репертуаре, который нужен для белорусского театра, я, как литератор, должен приступить к немедленной переписке для печати своих пьес, которых у меня имеется довольно много. Будучи ежедневно на службе в Уполитпросвете до 4-х ч. дня, а затем с 4-х ч. до ночи, как актёр и режиссер, я ровно ничего не могу сделать для литератского вопроса и потому вынужден службу в Уполитпросвете оставить, сохраняя за собою должность руководителя трупою (у арыгінале апошнія радкі падкрэслены. – *М.Б.*). Вследствие чего прошу Вашего распоряжения об исключении меня с должности заведующего художественным п/о” [134, с. 46].

Відавочна, што з канца 1921 г. У.Галубок сканцэнтраваў свае сілы на кіраўніцтве трупаю, адсюль і пачынаецца ўжо новы, вандроўны этап у яе дзейнасці. З навуковых даследаванняў вядома, што Уладзіслаў Язэпавіч становячы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ставіўся да савецкай улады, падтрымліваў яе культурную праграму, як мог садзейнічаў яе выкананню. Былы артыст трупы М.Грынблат успамінаў на старонках “Чырвонай змены” ў маі 1977 г.: “Пасля спектакляў акцёры выступалі перад гледачамі з вершамі ці фельетонамі на тэмы дня. Асабліва любіў выступаць У.Галубок з прамовамі, палітычнай інфармацыяй на антырэлігійныя тэмы, прычым яны вызначаліся рэвалюцыйным запалам...”. Аднак нельга сказаць, каб у сваю чаргу дзяржава таксама дапамагала артыстам. Наадварот, патрабуючы ад трупы частых выступленняў сярод жыхароў мінскіх ускраін і ваколіц, у верасні 1921 г. улады знялі яе з дзяржаўнага забеспячэння і разам з іншымі культурна-асветнымі ўстановамі перавялі на самазабеспячэнне. У выніку чаго, як сказана ў “Гісторыі беларускага тэатра”, некалькі асенніх месяцаў перад новым, 1922 г. калектыў зусім не працаваў. У 1923 г. народны камісарыят асветы зноў узяў трупу на матэрыяльнае ўтрыманне, якое, аднак, было чыста сімвалічным. Дзейнасць трупы трымалася на энтузіязме і самаадданасці артыстаў і высокім аўтарытэце яе кіраўніка.

Дарэчы, да месца будзе сказаць аб тым, што ў снежні 1924 г. быў прапісаны загад па Наркамату асветы № 22 наступнага зместу: “Дзеля павелічэння магчымасцей пашырэння беларускага драматычнага мастацтва ўтвараецца пад кіраўніцтвам вядомага беларускага драматурга і артыста У.Галубка Беларуская дзяржаўная трупа са складу арганізаванае ім драматычнае грамады, якая разам са сваім кіраўніком зрабіла за апошнія тры гады вялікую культурную працу сярод працоўных мас Беларусі” [45, 11, л. 55]. З 1926 г. афіцыйная назва трупы – Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр, але часцей яго называлі Вандроўны тэатр У.Галубка.

Пытанне пра матэрыяльны стан трупы абмяркоўвалася на розных узроўнях: у перыядычным друку, асабліва часта пра гэта пісала “Савецкая Беларусь”, у кіруючых установах. У адным з дакументаў апісваецца пасяджэнне мастацкай рады трупы сумесна з прадстаўнікамі Галоўліта, Рабіса (прафсаюз работнікаў мастацтва), Галоўрэперткама, Галоўпалітасвета, палітаддзела 7-й дывізіі і Нарваенкама, якое адбылося 10 сакавіка 1924 г. Уладзіслаў Галубок рабіў даклад пра становішча трупы. У храналагічным плане, апісваючы працу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектыву ў Мінску і на вёсцы, ён адзначыў, што яна праходзіла з вялікімі цяжкасцямі. Неаднойчы даводзілася на сабе пераносіць шматлікія прыстасаванні для пастановак, рознымі сродкамі дабірацца да месца выступленняў, часта самім абсталёўваць сцэну і глядзельную залу і г.д. Уладзіслаў Язэпавіч запэўніў прысутных у тым, што трупа моцная, рэпертуар ёсць, аднак прасіў звярнуць увагу на дрэннае матэрыяльнае становішча. Дыскусію па справаздачы пачаў прадстаўнік Рабіса Касталянскі, які станоўча ацаніў заслугі трупы і ў той жа час адзначыў, што яна не мае вызначанага агітацыйнага рэпертуару і плана работы. Ён заклікаў прысутных звярнуць увагу на матэрыяльнае забеспячэнне калектыву і стварэнне рэпертуарнага плана. Прадстаўнік Галоўліта Шукевіч адзначыў, што з яго пункту гледжання галоўнае – трупа ідэйная, аднак тэхнічны стан яе вельмі расхістаны ды і рэпертуар аднабокі. На яго думку, калектыў трэба забяспечыць матэрыяльна, рэарганізаваць, зрабіць яго больш прыдатным для працы на вёсцы [45, 11, л. 277].

У сітуацыі, калі ўсе давалі парады, а канкрэтна дапамагаць не збіраліся, Уладзіслаў Язэпавіч павёў сябе вельмі дыпламатычна: ён пагадзіўся з усімі заўвагамі і пажаданнямі. Аднак падкрэсліў, што ён сам апрацоўвае ўсе п’есы і рэпертуар і ўважліва сочыць за ўтрыманнем артыстаў, паказаўшы тым самым, што ён разумее патрабаванні часу. Згодна з тагачаснымі правіламі, была прынята пастанова: стварыць камісію з пяці чалавек для вывучэння адзначаных праблем. Праз 2 тыдні яна павінна была паведаміць мастацкай радзе свае высновы, а У.Галубок павінен быў перадаць у Галоўліт па адным экзэмпляры сваіх п’ес.

Змест прыведзенага дакумента яшчэ раз ілюструе існуючае правіла гульні: спачатку хваляць, потым знаходзяць нейкія нязначныя недахопы, урэшце заклікаюць кагосьці аказаць матэрыяльную дапамогу, рэдка абяцаюць яе самі, а пасля абмеркавання хутка забываюць, і застаецца калектыў сам-насам са сваімі праблемамі. Напрыклад, па прычыне цяжкага матэрыяльнага становішча калектыў не змог выплаціць страхавыя ўзносы за 1925 г., і страхавая кампанія пачала справу супраць трупы. Ніхто не прыйшоў на дапамогу, і У.Галубок быў вымушаны звярнуцца ў прафсаюз з просьбай пахадайнічаць аб закрыцці справы [45, 36, л. 63]. Можна захапляцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самаадданасцю артыстаў, кіраўніка калектыву, асабліва чытаючы апісанні ў прэсе іх вандраванняў ад вёскі да вёскі па бездарожжы, зімою і восенню, у дождж і сцюжу. Такі прафесійны і чалавечы подзвіг галубкоўцаў, безумоўна, выклікае павагу. Разам з тым нельга не абурацца адносінамі савецкай улады да адзінага калектыву, які пастаянна займаўся культурным асветніцтвам сялянства. Дзейнасць трупы і яе кіраўніка была прызнана з высокіх трыбун, аднак лепш штодзённы клопат і дапамога, чым кампанейскія абяцанкі.

Пытанне матэрыяльнай падтрымкі так і не было вырашана за час існавання Вандроўнага тэатра. Аднак існавалі і іншыя, не менш важныя праблемы, і адна з іх – фарміраванне калектыву. Бясспрэчна, галоўная роля ў гэтым працэсе належала Уладзіславу Язэпавічу Галубку. Сёння дакладна вядомы склад трупы, прынцыпы яе фарміравання. Зразумела, яны не маглі быць адметнымі ад тагачасных правілаў. Напрыклад, у кастрычніку 1924 г. на агульным сходзе па прапанове У.Галубка было вырашана, каб кожны, хто паступае ў трупу, запаўняў анкету з рэкамендацыямі дзвюх асоб, вядомых у трупе. Кіраўнік калектыву лічыў, што трэба наводзіць даведкі аб прэтэндэнце: хто ён, адкуль, якая яго палітычная арыентацыя, каб не атрымалася, што чалавек не падыходзіць для трупы [45, 26, л. 161]. Што можна сказаць? Безумоўна, Уладзіслаў Язэпавіч заняў правільную пазіцыю, таму што ў час доўгіх вандровак вельмі важнымі былі камунікатыўнасць членаў калектыву, іх псіхілагічная сумяшчальнасць.

Праўда, гэты метад фарміравання трупы не мог забяспечыць добры мікраклімат і гарантаваць ад памылак. Адзін з выпадкаў узрушыў увесь калектыў. Вясною 1925 г. на працу была прынята В.Лапко. Пасля падрыхтоўкі ролі яна разам з усёй трупай выехала на гастролі ў Мазырскую акругу. У Мазыры сабрала свае рэчы і ноччу ўцякла праз акно, пакінуўшы запіску, што пайшла замуж. На просьбу ўсёй трупы, каб яна яе не пакідала, таму што другой артысткі няма, каб пачакала да Мінска, В.Лапко адказала, што справы трупы яе не цікавяць. Калі ж трупа вярнулася ў Мінск, то яна зноў прыйшла прасіцца, каб яе ўзялі, таму што ў яе дрэннае матэрыяльнае становішча. Дырэкцыя доўга не згаджалася, урэшце пагадзілася залічыць В.Лапко, але з умоваю быць больш адданай калектыву. Аднак артыстка працягвала

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

адносіцца да працы несур'ёзна, за што атрымала некалькі вымоў і нарэшце была звольнена [45, 78, л. 4, 4 адв.].

Яшчэ адзін прыклад кадравай ці, можа дакладней, псіхалагічнай памылкі. Пра яе Уладзіслаў Язэпавіч паведамляў 20 чэрвеня 1927 г. з Добруша ў ЦК Саюза мастацтва: «Год таму назад у БДВТ быў прыняты як тэхнічны працаўнік М.Л., якога памылкова залічылі як музыку. М.Л. хаця і мае скрыпку і ў п'есах падыгрывае "Лявоніху", але музычнымі ведамі ён зусім не валодае, нават ніколі нот у вочы не бачыў і не разумее, што гэта такое...

Пакуль Л. адносіўся да працы як трэба, прыходзілася мірыцца і маўчаць пра тую памылку, якую зрабілі пры залічэнні. Цяпер Л. зусім зазнаўся і патрабуе невядома чаго: "Я, моў, музыкант, хачу, каб мне плацілі як музыканту, тэхнічнай працы рабіць не хачу"» [45, 149, л. 77, 77 адв.].

Каб неяк уздзейнічаць на маральна-псіхалагічны стан калектыву, Уладзіслаў Язэпавіч на адным з агульных сходаў прапанаваў завесці ганаровую кніжку з асобнымі старонкамі для кожнага ганаровага працаўніка з поўнай яго біяграфіяй і партрэтам [45, 31, л. 2]. Аднак гэтая мера не змагла ліквідаваць канфлікты ў трупе, большасць з якіх была звязана з бытавымі паводзінамі артыстаў. Як ужо адзначалася, падбор іх не заўсёды аказваўся ўдалым, ды і цяжка было набраць трупу з прафесіяналаў. Даволі часта на пасяджэннях мясцовага камітэта ці на агульных сходах абмяркоўваліся пытанні аб спазненні артыстаў на працу ці наогул нез'яўленне на рэпетыцыі. Напрыклад, артыстка Мартыненка, нягледзячы на папярэджанні, дазваляла сабе сядзець у час выступлення хору. Калі рэгент звярнуў на гэта ўвагу, яна пайшла са сцэны і адмовілася спяваць. Таму на агульным сходзе ёй аб'явілі вымову [45, 81, л. 10].

Падчас гастроляў мелі месца выпадкі няправільнай выдачы марак на бясплатны ўваход без згоды і нават ведама Галубка. За гэтай непрыстойнай справай быў заўважаны Чэ-скі, які выконваў абавязкі адміністратара, таму што артыстам быў не вельмі здольным. У яго ж былі і яшчэ праблемы. На адным з пасяджэнняў мясцкама падымалася пытанне аб яго сістэматычных п'янках. Адзначалася, што на гастролях у Глуску ён быў не зусім цвярозы, хадзіў па мястэчку п'яны і ў такім жа стане з'явіўся на спектакль, лаяўся ў інтэрнаце і, нягледзячы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на вымову, праз некаторы час у Рагачове зноў напіўся і зусім не з’явіўся на спектакль. Артысту была аб’яўлена суровая вымова з папярэджаннем аб звальненні [45, 81, л. 50].

Гэтымі фактамі аўтар зусім не хоча прынізіць ролю і значэнне Вандроўнага тэатра ў жыцці нашай роднай Беларусі. Наадварот, хацелася б звярнуць увагу не толькі на матэрыяльныя цяжкасці, але і на складанасці сацыяльна-псіхалагічнага кірунку. Як любы сацыяльны калектыў, трупа Галубка не была пазбаўлена ўнутраных недарэчнасцей ці невялікіх канфліктаў. Была б ненатуральнай адваротная з’ява. У тэатры падбіраліся розныя людзі, і нават аўтарытэт Уладзіслава Язэпавіча не мог стрымаць эмоцый і псіхалагічнай напружанасці ад доўгага сумеснага знаходжання ў не вельмі спрыяльных умовах. Таму і адбываліся псіхалагічныя зрывы, калі артысты спрачаліся за шклянкаю гарбаты і ішлі яшчэ на большае абвастрэнне адносін.

Аднак вельмі паказальнае і другое: усе канфлікты вырашаліся неяк памяркоўна, па-добраму. Вось гэта якраз і ёсць паказчык псіхалагічнай еднасці калектыву і высокага маральнага аўтарытэту яго кіраўніка. Мабыць, самае суровае рашэнне было прынята ў адносінах да Ю.Бернатовіча, які надта часта спазняўся на працу. На ўсе заўвагі і абмеркаванні на мясцкаме ён адказваў: “Пішыце хоць 100 пратаколаў”. Таму справу перадалі ў вышэйшую арганізацыю, дзе яму “прачыталі натацыю” [45, 81, л. 63].

Вандроўнае жыццё, якое на працягу не аднаго месяца вёў тэатр, асабліва пачынаючы з 1925 г., патрабавала ад артыстаў не толькі цярплівасці і ўзаемнай павагі, але і шматлікіх навыкаў, уменняў. Ніхто не цураўся сваіх ранейшых прафесій, галоўнае было – адзінства калектыву, усё – на яго карысць і ўрэшце – на яго аўтарытэт. Напрыклад, Баляслаў Бусел добра ведаў сталярку, Чайлытка ўмеў маляваць і вышываць беларускі арнамент на кашулях і ручніках, многія ўмелі ткаць, шыць, вязаць. Былі нават майстры імітацыі гукаў розных жывёл або звяроў, як, напрыклад, Блажэвіч, Згіроўскі.

Уладзіслаў Галубок падабраў вельмі цікавы калектыў, у асноўным маладыя таленты. Неаднаразова ўспаміналіся прозвішчы У.Дзядзюшкі, К.Быліча. Брат Дзядзюшкі – Мікалай, студэнт БДУ, кіраваў хорам. З “Беларускай хаткі” прыйшлі вядомы музыка Ю.Бернатовіч, З.Лазарчык і інш. Тут



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачынаў і Несцер Сакалоўскі. З 1 красавіка 1925 г. салісткай хору была залічана Л.Александроўская. С.С.Бірыла ўспамінаў: “У калектыве ўжо ясна вызначыліся творчыя амплуа некаторых акцёраў – Дзядзюшка, з яго непаўторнай індывідуальнасцю, Быліч – акцёр ярка выражанага гераічнага складу знешнасці і характару, Бусел (Рэйзман) – незаменны ў ролях т.зв. простых людзей, Кашынская – актрыса вялікай цеплыні і душэўнасці” [3, 134, л. 12].

Цікавыя ўспаміны пра тэатр і асобу яго кіраўніка пакінуў М.Грынблат. «Знаёмства з Уладзіславам Язэпавічам адбылося ўвосень 1920 г., калі разам з сябрам Алесем (Алесем Мустафавічам Міськевічам) я пачаў хадзіць на галубкоўскія рэпетыцыі ў Беларускі рабочы клуб і дакучліва прасіцца ў трупу. Падставай да гэтага быў мой удзел у школьных драматычных гуртках і канцэртах... Ды дзе ж там! Мне было тады ўсяго 15 год, і Галубок толькі лагодна пасмейваўся з майго настойлівага жадання стаць акцёрам... Мой “дэбют” у тэатры Галубка адбыўся нечакана, дзесьці ў маі ці чэрвені 1921 г. Дапамог выпадак. У той вечар не хапала ўдзельнікаў канцэрта... і тут на вочы заклапочанага Уладзіслава Язэпавіча трапіў я. “Ану, – з нейкай безнадзейнасцю ў голасе сказаў мне Галубок, – пакажы, на што ты здатны”. Ад страху ў мяне перасохла ў горле, але, хутка схамянуўшыся, я выканаў адну са сваіх хадавых сцэнак. “От чарцяня, – рагатаў Галубок, – дык ты ж добры комік!” Тут жа мне падабралі вышываную кашулю, далі пояс, і я ўпершыню выступіў у спектаклі. А звалі мяне Васільком, паводле тагачаснай моды на псеўданімы» [1, 5, л. 3].

Юнак аказаўся здольным артыстам, актыўным прафсаюзным дзеячам, узнёслаю натураю. У жніўні 1925 г. з адной вандроўкі ён пісаў кіраўніку галіновага прафсаюза: «Лічу патрэбным даць некаторыя веды аб працы нашай трупы на вёсцы. Выехалі мы з Менска 18 ліпеня ў Смалявічы, і да гэтага дню намі пастаўлена 19 спектакляў, лічачы дзённыя для сялян. Усюды нашы спектаклі прайшлі з надзвычайным пад’ёмам. Нам аказваюць з боку грамадзянства і ад савецкіх установ самы лепшы прыём і належную дапамогу. Усюды сыплюцца прывітанні нашай трупе, адрасы і г.д. Па мястэчках нашы спектаклі размяркоўваюцца такім чынам: Смалявічы – 2 платныя, 1 дарэмны, Плешчаніцы – 5 платных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і 1 для сяброў (праф)саюзаў па даступных цэнах, Крайск – 2 агульнадаступныя. Трэба сказаць, што ўсе платныя спектаклі з’яўляюцца агульнадаступнымі, білеты ад 20 да 60 капеек. Затым на кожны спектакль пускаюцца сяляне, беспрацоўныя, чырвонаармейцы зусім дарма. Зборы, нягледзячы на поўныя народу тэатры, – мізэрныя, хістаюцца... да 80 р. за спектакль, таму артысты... працуюць амаль штодзень і за “сутачныя”, якія яны атрымоўваюць у дарозе, і субсідыю, якую адпускае дзяржава. Гэта... не адчуваецца на настрою нашых працаўнікоў. Усе працуюць дружна, з вялікім пад’ёмам, што наша матэрыяльнае становішча з гэтага часу палепшыцца...

Мы цяпер знаходзімся ў м. Крайск, на самай граніцы. Нашы спектаклі адбываюцца ў якіх-небудзь 50 кроках ад польскай тэрыторыі, на самым краі нашай Радзімы. Тут жа недалёка, за лясочкам, – мяжа, далей не паедзем... а мы ўжо чакаем таго часу, калі ЦВК Беларусі дасць нам камандзіроўку не ў Барысаўскую акругу, а ў Вілейскую, Гродзенскую. З Крайску мы накіроўваемся ў Мсціж, Бягомль, Лепель. Правядзём у дарозе яшчэ месяц.

Што тычыцца нашай унутранай працы ў трупе, то яна ў дарозе не замерла... За гэты час адбыўся адзін агульны сход, нарада па вытворчасці. Рыхтуецца да выпуску сцянная газета. Спаўняецца пастанова па гігіене і ахове здароўя, кожнаму выданы свае ўласныя сцэнічныя прылады, закуплена невялічкая аптэчка, артыстам прадастаўлены добры начлег» [45, 44, л. 2, 3].

Несумненна, малады калектыў быў захоплены плынню новага, незнаёмага жыцця, як бы нейкай тэатральнай дзеяй. У невялікім вандроўным калектыве ўсё было навідавоку, аднак ствараліся такія ж органы, як і ў сталым тэатры. У студзені 1925 г. па прапанове Уладзіслава Язэпавіча была створана расцэначна-кантрольная камісія, а ў лютым гэтага ж года – мясцовы камітэт, потым ячэйка МОПРа, сакратаром якой быў абраны У.Дзядзюшка. Першапачаткова ў склад мясцкама ўвайшлі М.Грынблат, Э.Галубок і Круцько, у далейшым яго склад мяняўся. У мясцкаме дзейнічалі розныя камісіі, нават культурная.

На справе атрымлівалася так, што асноўныя пытанні вырашаліся на агульным сходзе, а мясцкам іх толькі дубліраваў. Тым не менш распрацоўваліся планы, пісаліся справаздачы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыклад, на пасяджэнні 11 ліпеня 1925 г. планавалася: 1. Арганізаваць палітгурток для падняцця палітведаў, лічачы, што акцёр, які працуе сярод сялян і рабочых, павінен быць усебакова палітычна адукаваны, і прасіць вызначыць лектара. 2. Арганізаваць гурток беларусазнаўства, аб’яднаўшы яго з гуртком самаадукацыі, каб палепшыць тэатральную кваліфікацыю і веды па беларусізацыі. 3. Узмацніць працу па ўцягненні ў клубную дзейнасць. 4. Актывізаваць працу па выпуску насценнай газеты. 5. Арганізаваць ячэйку Асаавіяхіма, аб чым зрабіць даклад на агульным сходзе, і наогул ажывіць працу ячэек, а на агульным сходзе заслухаць даклад Дзядзюшкі аб ячэйцы МОПРа [45, 44, л. 5, 5 зв].

Праз колькі дзён адбылося чарговае пасяджэнне мясцовага камітэта, на якім абмяркоўваліся пытанні, у ліку іх заключэнне калектыўнага дагавора дапамогі па сацыяльным страхаванні. У мэтах гігіены прадугледжвалася выдаць кожнаму артысту грым, вазелін, пудру. На кожным спектаклі за кулісамі павінна быць вада, 2 ручнікі, мыла. Падымалася праблема позняга заканчэння спектакляў. У канцы ліпеня на агульным сходзе пад старшынствам Уладзіслава Язэпавіча быў зацверджаны план працы мясцкама і прынята рашэнне дапамагаць Галубку ў яго ажыццяўленні. Тады ж абралі рэдкалегію, якую ўзначаліў М.Грынблат; у яе склад увайшлі Шабад, Б.Галубянка [45, 44, л. 6, 7, 8].

Цікава, што дастаткова актыўна працавала культкамісія. У справаздачы за 7 сакавіка 1927 г. яе старшыня Сурко далажыў, што план работы выкананы на 70 працэнтаў, праведзена падпіска на часопіс “Рабіс”, выпушчана першая насценгазета, арганізавана экскурсія на Усебеларускую мастацкую выстаўку, для бібліятэкі закупілі шмат літаратуры. Не правялі толькі вечар пытанняў і адказаў. А пастанова была прынята такая: працаваць далей гэтак жа і арганізаваць масавае чытанне газет. Бывалі выпадкі, што мясцовы камітэт не пагаджаўся з рашэннямі кіраўніцтва. Напрыклад, мясцовы камітэт 29 снежня 1927 г. не падтрымаў вымовы артыстам Бірылу і Бандарэнку за спазненне, таму што на дзеянне яны не спазніліся, а таксама не пагадзіўся на скасаванне пасады кіраўніка балета [45, 78, л. 13а, 15, 15 адв.].

Акрамя прафсаюзнага органа ў тэатры існавала мастацкая рада. Працэс яе стварэння пачаўся ў снежні 1924 г., было

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прынята рашэнне на час адсутнасці Уладзіслава Галубка кіраванне працай перадаць часовай мастацкай радзе. Гэтае пытанне падымалася ў 1925 г. на Усебеларускай канферэнцыі работнікаў мастацтва. У выступленні Язэпа Дылы адзначалася неабходнасць стварыць у вандроўным тэатры мастацкую раду. Потым, у лістападзе 1926 г., на нарадзе інспектуры ГПА было вырашана стварыць для мастацкага і ідэалагічнага кіраўніцтва трупай мастацкую раду ў складзе дырэктара, рэжысёра, прадстаўніка артыстаў і Інбелкульта. На пачатку 1927 г. на агульным сходзе калектыву прадстаўнік Галоўпалітасвета Ляжневіч адзначыў: “Мінусы працы тэатра тлумачацца тым, што няма моцна выяўленага арганізацыйнага плана. Тэма кіраўніцтва тэатрам павінна быць свая, уласная, з прычыны спецыфічных умоў, і таму тэатру неабходна арганізаваць кіраўнічы мастацкі савет. Усё мастацкае кіраўніцтва не ўскладваць на аднаго Галубка, а даручыць мастацкай радзе, куды ўваходзіць рэжысёр, хормайстар, балетмайстар, прадстаўнік ад артыстаў. З прычыны таго, што тэатр мае толькі 7 п’ес, каб абслужыць насельніцтва вёскі, трэба дабавіць яшчэ 5 новых. Кожны рэжысёр павінен апрацаваць асобную пастаноўку, і, акрамя таго, у план трэба ўключыць педстудыю” [45, 78, л. 7].

Наркамат асветы зноў вярнуўся да гэтага пытання ў канцы 1927 г. і загадам ад 11 лістапада стварыў мастацкую раду ў складзе: старшыня Галубок, мастацкія кіраўнікі Сакалоўскі і Бандарэнка, прадстаўнікі ад камсамола – Сурко, ад мясцкама – Бірыла.

Як бачым, у трупе існавалі некалькі грамадскіх арганізацый, актыўную ролю ў якіх выконвала моладзь. Аднак самае напружанае жыццё бурліла вакол асобы кіраўніка калектыву. Ні адна справа не адбывалася без яго, ён адчуваў сваю адказнасць за кожнага. С.С.Бірыла, які працаваў у трупе з канца 1926 г. па 1928 г., успамінаў: “У яго (У.Я.Галубка) былі цудоўныя фінансавыя здольнасці. Прычым у яго не было ніякай бухгалтарскай справы, накшталт гросбуха. Усё было больш у галаве, усе фінансавыя справы рашаліся вельмі проста: прыход – расход, а трупа рэгулярна атрымлівала зарплату, усё, што трэба было для спектакля, заўсёды было...” [3, 134, л. 12]. Трупа поўнасцю давярала Галубку, таму што ведала яго як сумленнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уладзіслаў Язэпавіч менавіта сваімі паводзінамі і адносінамі да людзей стараўся выхаваць трупу. На адным з агульных сходаў ён падымае пытанне аб адносінах з Першым беларускім тэатрам. На яго думку, недапушчальным з'яўляецца адсутнасць сувязей паміж імі. Трупа нават не ведала пра смерць адной з артыстак Першага тэатра, і Уладзіслаў Язэпавіч прапануе занесці яе прозвішча ў ганаровую кніжку трупы.

Вандроўны тэатр цалкам апраўдваў сваю назву. За летнія месяцы ён аб'язджаў многія вёскі і мястэчкі, паказваў спектаклі, ладзіў канцэрты, тым самым выконваў задачу, якую настойліва ставіла перад калектывам кіраўніцтва рэспублікі. Добра, што гэтыя патрабаванні супадалі з настроем трупы, і таму артысты з вялікім задавальненнем неслі ў масы тэатральную культуру. Напрыклад, у 1926 г. тэатр выехаў у правінцыю і выступаў у Бабруйску, Глуску, Жлобіне, Рагачове, Гомелі, Быхаве, Навазыбкаве, Клінцах, Клімавічах, Барысаве, Койданаве, Заслаўі. Было паказана 178 спектакляў, дадзена 45 канцэртаў. З мая 1927 г. тэатр гастраляваў у Горках, Клімавічах, Мсціславе, Чэрыкаве, Касцюковічах, Унечы, Добрушы, Гомелі, Рэчыцы, дзе паказаў 75 спектакляў і 20 канцэртаў [45, 71, л. 97].

Не ўсюды трупу прымалі аднолькава добра. Вось вельмі характэрны допіс аднаго з артыстаў у "Савецкай Беларусі" за 27 кастрычніка 1926 г.: «Першую пастаноўку ў Рэчыцы мы далі ў гарадскім тэатры. Каля афішы стаялі гурткі людзей, беларускага тэатра тут не бачылі ні разу, усе былі пад уражаннем пастановак Маскоўскай аперэты. Танныя білеты ад 25 кап. да 1 руб. выклікалі думку, што, мусіць, трупа нічога паважнага і добрага не дасць. Каля 600 месц у тэатры былі запоўнены. П'еса "Пан Сурынта" прайшла з поўным поспехам і змяніла настрой гледачоў... Публіка здаволілася пастаноўкай і нават непрыхільнікі і "крытыкі" беларускага тэатра і мовы згаджаліся – "добра іграюць". Былі і такія мовазнаўцы, што казалі: "Гэта ж украінская, толькі мешаная з расійскай". Нашы спектаклі спадабаліся сялянам і дапрызыўнікам, якія прыходзілі паглядзець на свой тэатр. Тутэйшы беларускі актыў наведваўся на ўсе нашы пастаноўкі і аж неяк ажыў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На агульным фоне добрых адносін да нас з боку працоўных мас зусім нейкай недарэчнасцю выглядаюць адносіны савецкага чыноўніцтва. Напрыклад, загадчык Рэчыцкага дзяржаўнага тэатра пасля першай пастаноўкі не даў нам памяшкання, хоць кіно там ідзе 3 разы ў тыдзень. Ён пачаў рэкламаваць сваё кіно, завёў танныя білеты, каб канкурыраваць з намі.

Загадчык Рэчыцкага Уліта, ён жа загадчык Упалітасвета, выкрасліў са спіска дазволеных Гомельскім гублітам п’есу “Падкідыш” У.Галубка... Праўда, свой загад рэчыцкі цэнзар скасаваў, калі мы яму напомнілі, што мы дзяржаўная трупа, а не якая-небудзь халтура, і свавольства не сцерпім. Тады дазвол на п’есу ён даў, а не даваў клубаў, як загадчык палітасветкама, гаворачы: “Нельзя превращать клубы в театры”».

Пісьмо вельмі дакладна абмалёўвае сітуацыю на той частцы Гомельшчыны, якая ў 1926 г. увайшла ў склад БССР. Тут бачны і пагардлівыя адносіны часткі мясцовай інтэлігенцыі да беларускай мовы і тэатра і, наадварот, зацікаўленасць навакольнага насельніцтва, але і невуцтва новага чыноўніцтва, якое хацела паказаць найперш сваю значнасць. Вынікі падарожжа па Гомельшчыне абмяркоўваліся на пасяджэнні нарады інспектуры Галоўпалітасвета 26 лістапада 1926 г. Было зазначана: “Маючы на ўвазе вельмі дрэнныя матэрыяльныя ўмовы працы на Гомельшчыне, што, аднак, не адбілася на паспяховасці правядзення працы, толькі дзякуючы напружанасці ўсяго калектыву артыстаў і яго кіраўніка ў прыватнасці, лічыць неабходным у якой-небудзь форме адзначыць гэтыя моманты” [45, 71, л. 99].

Трэба спыніцца на праблеме адносін кіруючых устаноў да дзейнасці тэатра. Факты сведчаць, што, пакуль улады былі заняты наладжваннем сацыялістычных асноў эканамічнага і палітычнага жыцця, яны не звярталі пільнай увагі на вандроўную трупу. Пасля таго, як па просьбе Наркамата асветы ў канцы 1924 г. Саўнаркам узяў трупу на дзяржаўнае забеспячэнне, пачынаюцца больш уважлівыя адносіны да яе дзейнасці. Згодна з партыйнай дактрынай кожны работнік культурнага фронту (больш дакладна – ідэалагічнага) павінен быць камуністам па сваіх поглядах, а асветніцтва павінна мець найперш агітацыйна-палітычны характар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чым больш працаваў калектыў і праходзіла часу, тым больш і больш актуальным станавілася пытанне рэпертуару. У гэта ўмешваліся партыйныя і савецкія органы. У дакуменце, які атрымаў назву “Дзяржаўны вандроўны тэатр. Кароткі агляд работы” і быў накіраваны ў партыйныя інстанцыі, гаварылася пра тое, што за час свайго існавання (1921–1928) тэатр падрыхтаваў каля 130 спектакляў; увесь рэпертуар складаецца з твораў, напісаных самім Галубком (за выключэннем 2–3 п’ес), якія з’яўляюцца невялікімі вадэвілямі камедыйнага характару або меладрамамі. Усяго ім напісана і пастаўлена 45 п’ес, частка якіх носіць бытавы характар, частка з гістарычных часоў. Асабліва папулярныя былі “Падкідыш”, “Пан Сурынта”, “Помста”, “Пісаравы імяніны”, “Ганка” і інш. Далей адзначалася: “П’есы напісаны яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы, і гэта, безумоўна, адбіваецца на іх змесце. Праўда, за апошні час Галубок гэтыя п’есы перапрацаваў і ўнёс элементы рэвалюцыйнасці, але рэвалюцыйнасць чыста вонкавая і заключаецца ў тым, што герой п’есы лічыцца рэвалюцыянерам і ў сувязі з гэтым вымаўляе сярод сваіх любоўных перажыванняў 2–3 рэвалюцыйныя фразы” [45, 149, л. 110].

Дакумент сведчыць, што ў сферы культуры працягвалася партыйная перабудова. У першай палове 20-х гг. дзейнасць тэатра і яго рэпертуар задавальнялі і гледачоў, і кіраўніцтва. З умацаваннем партыйна-бюракратычнай машыны пачынаецца больш актыўнае ўмяшанне ў справы культуры. Гэтаю плынню быў закрануты і Вандроўны тэатр. Прыкладна пасля 1926 г. назіраецца пералом у жыцці тэатра. Гэтаму садзейнічалі і частыя абмеркаванні кіруючымі ўстановамі пытанняў аб дзейнасці трупы. Яшчэ ў маі 1925 г., выступаючы на Усебеларускай канферэнцыі работнікаў мастацтва, Язэп Дыла адзначыў неабходнасць запрашэння рэжысёраў з іншых тэатраў, паляпшэння рэпертуару [2, 142, л. 1 адв.]. Ды і самі артысты пасталелі, многія паверылі ў свае сілы і ўжо не хацелі выконваць даўно вядомыя і, мабыць, трохі надакучлівыя ролі. Хацелася творчага росту, гэтае жаданне было справядлівым, своечасовым і правільным. Было зразумела, што неабходны сталая студыйная падрыхтоўка, пашырэнне рэпертуару. На нарадзе інспектуры ГПА 26 лістапада 1926 г. было выказана пажаданне ў дадатак да пастановак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галубка запрашаць рэжысёраў з іншых тэатраў для асобных пастановак і перагледзець рэпертуар тэатра, папоўніць яго новымі п'есамі. Планавалася на працягу зімы арганізаваць курсы па перападрыхтоўцы артыстаў у галіне акцёрскай тэхнікі, мізансцэн, рухаў, слова, грыму, вопраткі і афармлення цэлага спектакля. Рэкамендацыі былі выкананы, што засведчыў Уладзіслаў Язэпавіч у дакладзе аб тэатральным сезоне 1927/28 г. Ён адзначыў, што з 1 кастрычніка 1927 г. трупа распачала працу над п'есай "Краб" і дзвюма п'есамі з рэпертуару Другога беларускага тэатра пры іх рэжысуры [45, 149, л. 112 адв.].

У сувязі з такой сітуацыяй трэба засведчыць вялікі дыпламатычны талент У.Галубка. Ён адкрыта прызнаваў некаторыя недахопы сваіх п'ес. Вось што ён гаварыў 5 красавіка 1928 г. на нарадзе беларускіх пісьменнікаў, дзе абмяркоўвалася пытанне стварэння рэпертуару: "Наш тэатр карыстаецца ў правінцыі вялікім поспехам і сімпатыяй, яна вельмі цягнецца да беларускага тэатра. Трэба задумацца аб тым, каб тым, хто можа пісаць п'есы, даць адпаведныя ўмовы для гэтага. Я пісаць не ўмею, але вучуся. Мне нельга пісаць, бо прыходзіцца клапаціцца аб розных тэхнічных справах тэатра, што патрабуе шмат часу" [45, 71, л. 91].

Можна меркаваць, што не выпадкова так гаварыў Уладзіслаў Язэпавіч. Змянілася жыццё, мяняліся людзі, шмат размоў вялося вакол партыйных лозунгаў індустрыялізацыі, калектывізацыі. Гэтая акалічнасць не магла не дзейнічаць на калектыў, ён сталеў, набываў вопыт, па-новаму ўсведамляў змест сваёй працы, імкнуўся да творчага росту. Здаецца (калі меркаваць па дакументах), што ў калектыве меў месца нейкі ўнутраны канфлікт. Трохі больш чым праз месяц пасля выступлення Уладзіслава Язэпавіча перад літаратарамі на пасяджэнні вытворчай камісіі пры мясцовым камітэце абмяркоўвалася пытанне "Аб рэпертуары тэатра ў час падарожжа". Выказаліся сябры камісіі: К.Быліч, С.Бірыла, Н.Сакалоўскі і інш. Прамоўцы адзначылі, што з боку дырэктара і рэжысёра заўважана сістэматычнае нежаданне ставіць п'есы іншых аўтараў. Пастанавілі: лічыць, што падобнае становішча рэзка разыходзіцца з жаданнямі большасці трупы і з інтарэсамі тэатра, і прапанаваць дырэктару і рэжысёру ў кожным мястэчку, дзе трупа будзе 3 дні, ставіць адну з п'ес іншага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтара, а дзе трупа будзе больш за тры дні, пытанне аб рэпертуары распрацаваць сумесна з вытворчай камісіяй. На гэтым пратаколе стаіць рэзалюцыя старшыні прафсаюза работнікаў мастацтва – "Добра" [45, 97, л. 141].

Былі выказаны заўвагі на не зусім этычныя паводзіны дырэктара падчас спектакля, калі ён дазваляў сабе крытыкаваць акцёра з-за куліс, што збівала апошняга і перашкаджала яго ігры. Катэгарычна прапанавалі спыніць гэткія выпадкі. Крытыкавалі і самі сябе, таму што за заслонай загады аддаваліся надта зычнымі галасамі. Гэты недахоп вырашылі знішчыць шляхам самакантролю (кожны сочыць, каб гэтага не было). Абмяркоўвалася пытанне і аб пазыках дырэкцыі на падарожжа са сродкаў трупы. Чаму яно ўзнікла? Справа ў тым, што дырэкцыя мела спецыяльны дарожны фонд, які чамусьці быў пакінуты ў Мінску, а карысталася сродкамі трупы. Што гэта за сродкі трупы? Мабыць, меліся на ўвазе адлічэнні ў курортны фонд ад спектакляў, якія ставіліся ў выхадныя дні. Рашэнне аб гэтым было прынята ў красавіку 1928 г. на агульным сходзе. Таму вытворчая камісія палічыла дзеянні дырэкцыі несправядлівымі. Па яе рашэнні 27 чэрвеня 1928 г. на ст. Бігасава адбыўся сход усёй трупы, дзе абмяркоўваліся тыя ж самыя пытанні і былі прыняты тыя ж самыя рашэнні. Дарэчы, аб канфлікце ў трупе ўспамінаў і С.Бірыла: "...у Галубка ўзнік канфлікт з калектывам... выспявала жаданне быць дзяржаўным тэатрам, а не самакіруемым калектывам. Галубок гэта зразумеў. За ім былі пакінуты пасады дырэктара і мастацкага кіраўніка, ён стаў запрашаць рэжысёраў з другіх тэатраў" [45, 97, л. 146 адв.].

Гэтыя падзеі адлюстравалі новы этап у дзейнасці тэатра. Мянялася навакольнае жыццё, мяняўся і тэатр. Ён пражыў цікавы перыяд станаўлення, вызначэння свайго месца ў культурным жыцці рэспублікі. Асабліва вялікая заслуга маладога калектыву ў асветніцкай працы на вёсцы. Галубкоўцы былі самым масавым калектывам маладой нацыянальнай інтэлігенцыі, якая прыхільна ставілася да сялянства. Не толькі творчае жыццё калектыву было напружаным і цікавым. За час сваіх вандровак ён сфарміраваўся як моцны і здаровы сацыяльны арганізм, як калектыў аднадумцаў на чале з прызнаным лідэрам. Ён узнік у савецкі час і не мог стаяць у баку ад тагачаснага грамадскага жыцця. Гэта праяўлялася і ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

стварэнні некалькіх грамадскіх арганізацый у рамках невялікага калектыву, і ў прапагандзе новага ладу, якую праводзілі артысты і сам Уладзіслаў Язэпавіч падчас мітынгаў ці іншых мерапрыемстваў, і ў рашэнні пытання аб рэпертуары трупы. Перыяд актыўнай вандроўнай дзейнасці тэатра супаў з часам, які не быў яшчэ цалкам падпарадкаваны палітыцы, шанаваліся яшчэ традыцыі народнай культуры. За гэты час (1921–1927) галубкоўцы паказалі 1230 спектакляў і далі 240 канцэртаў, на якіх прысутнічала больш мільёна гледачоў. На першым з'ездзе хатнікаў многія гаварылі, што асабліва трэба адзначаць карысную дзейнасць Дзяржаўнага вандроўнага тэатра, які аб'ездзіў усю Беларусь і пабываў у самых глухіх кутках [23, 113, л. 38].

## 2. 5. Агракультурнае асветніцтва

Нельга не прызнаць, што для вясковага люду самым неабходным і карысным сярод іншых відаў асветніцтва з'яўлялася сельскагаспадарчае. Кіруючыя інстанцыі, разумеючы гэта, неаднаразова прымалі рашэнні аб разгортванні шырокай прапаганды агранамічных ведаў. У рэспубліцы была захавана дарэвалюцыйная структура агранамічнай і ветэрынарнай службаў. У Наркамаце земляробства (НКЗ) быў створаны культасветаддзел, у канцы 1920 г. яго ўзначальваў Язэп Лёсік. Аддзел, "становячы сабою рассаднік культуры і прасветы паміж шырокіх мас работніцка-сялянскага насялення Беларусі", лічыць патрэбным "дзеля пашырэння сельскагаспадарчых ведаў выдаваць адпаведныя брашуры, лістоўкі, адозвы, плакаты, а ў першую чаргу намеціў выданне сельскагаспадарчага часопіса. Да справы перабудовы гаспадаркі ў Беларусі на новыя камуністычныя асновы трэба падыходзіць вельмі асцярожна, прымаючы пад увагу асаблівасці краю" [35, 157, л. 30]. Аднак нядзейсненай аказалася ідэя выдання часопіса "Вясковая гаспадарка Беларусі". Змаглі выдаць толькі насценны беларускі каляндар з сельгасматэрыяламі.

Культурна-асветніцкі аддзел НКЗ планаваў прыняць меры па аднаўленні сельскагаспадарчых бібліятэк пры павятовых і валасных зямельных аддзелах, зборы матэрыялаў для арганізацыі музеяў, каб на іх аснове чытаць лекцыі ў паветах. Вывучалася пытанне арганізацыі сельскагаспадарчых курсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ідэі культасветаддзела НКЗ прадубліраваў агранамічны з’езд, які адбыўся ў Мінску 27–30 студзеня 1921 г. У рэзалюцыі з’езда ставіліся задачы “выдання сельскагаспадарчых кніжак, часопісаў, брашур і распаўсюджвання іх праз клубы, хаты-чытальні, стварэнне сельскагаспадарчага музея, запрашэнне ўсіх аграномаў для чытання лекцый” [35, 130, л. 13].

Аднак на аснове аналізу многіх дакументаў, адзін з якіх будзе працытаваны ніжэй, можна зрабіць вывад аб існаванні ўсё той жа дыспрапорцыі паміж задуманым і ажыццёўленым, ці, калі карыстацца філасофскімі катэгорыямі, паміж рэальнасцю і магчымасцю.

Звернемся да сведчання дакумента – справаздачы аднаго з аграномаў: «Насельніцтва вельмі некультурнае, адчуўшы за сабою ўладу і сілу, не ўмеючы карыстацца першай, часта абапіраецца на другую пры самых нязначных выпадках, напрыклад неправераныя чуткі, хлуслівыя даносы... Не адчуваючы хуткіх вынікаў ад аграноміі, насельніцтва крычыць “Далоў аграномаў!”. Што тычыцца лектарскай дзейнасці, то яе можна выкарыстоўваць заўсёды: у час палявых работ магчымыя чытанні, лекцыі; курсы – толькі па святочных і нядзельных днях; зімой магчымыя доўгатэрміновыя курсы... Важна, каб слухачы былі пастаяннымі і каб іх было не вельмі многа. На кожным агранамічным участку можна адкрыць народную сельскагаспадарчую школу, завесці школьную гаспадарку, як у сялян» [32, 67, 4, л. 5а, 6]. Вядучыя вучоныя рэспублікі, напрыклад А.Смоліч, звярталі ўвагу на неабходнасць разумення псіхалогіі сялянства, каб разбурыць “сцяну халоднага недаверу паміж аграномам і селянінам” [32, 1731, л. 10].

Адной з формаў аграрнага асветніцтва сталі сельскагаспадарчыя курсы, пачатак якіх быў пакладзены ў 1920 г. З гэтага часу кароткатэрміновыя шырокапрофільныя курсы працавалі ў Мінску, Бабруйску, Слуцку, Барысаве, а з 1922/23 навучальнага года на курсах вялося навучанне па сельскагаспадарчых галінах. Дзеля лепшай падрыхтоўкі да пасяўной кампаніі 1923 г. планавалася арганізаваць курсы ў Заслаўі, Койданаве, на Случчыне і Ігуменшчыне, але на гэта не хапіла сродкаў. На вучобу накіроўваліся сяляне, якія ўмелі пісаць, чытаць і ведалі чатыры арыфметычныя дзеянні. Для дэмабілізаваных чырвонаармейцаў таксама арганізоўваліся спецыяль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя курсы па сельскай гаспадарцы. Нізавой формай аграрнай асветы павінны былі стаць сельскагаспадарчыя гурткі, перад якімі ставілася задача вывучаць пытанні павышэння ўраджайнасці. Калі ў 1922–1923 гг. іх было толькі 4, то ў далейшым іх колькасць рэзка ўзрасла.

Важная роля надавалася лекцыям на сельскагаспадарчыя тэмы, аб чым было прынята рашэнне яшчэ ў 1919 г. на з'ездзе КП(б) ЛіБ. У сакавіку 1922 г. гэтую задачу перад сваімі нізавымі арганізацыямі паставіў Галоўпалітасвет. У навуковых даследаваннях гаворыцца аб сотнях лекцый, праведзеных у 1922– 1923 гг. Аднак адразу паўстае пытанне: "А хто іх праводзіў і на аснове якіх матэрыялаў?" Звернемся да дакумента. 31 сакавіка 1922 г. пазашкольны савет Беларуцкага валвыканкама паведамляў: "23 сакавіка сабраны ўсе шкрабы воласці, абавязаныя праводзіць чытанне лекцый і распрацоўваць іх план. Матэрыялаў для чытання няма. Тыя ж, якія ёсць, тычацца толькі размеркавання зямлі, а не самой культуры раслін. Газетнымі звесткамі могуць карыстацца не ўсе шкрабы, бо няма газет. У адзінкавых выпадках былі прачытаны лекцыі з газет аб засухаўстойлівых раслінах і штучным затрымліванні вільгаці" [17, 228, л. 29]. Цытуемы дакумент дастаткова пераканаўча сведчыць і аб узроўні лекцый, і аб магчымасцях лектараў. Тым самым ён пацвярджае нашу думку аб неадпаведнасці кабінетных планаў рэальным магчымасцям і сапраўднага становішча справаздачам з месцаў.

Агітацыйнымі кампаніямі і дутымі лічбамі праведзеных лекцый падняць культуру земляробства было немагчыма, што сцвярджаў і А.Смоліч: "Шляхам лекцый мы вёскі не зрушым". Садзейнічаць гэтаму маглі толькі добра адукаваныя людзі, а іх якраз і не хапала. Не хапала спецыялістаў не толькі для вёскі, але і для ўзгаданых сельскагаспадарчых курсаў. Іх нязначная папулярнасць прызнавалася нават у тагачасным друку. У 1923 г. ва ўсёй рэспубліцы працавалі 26 аграномаў, якія атрымлівалі зарплату ніжэй канцылярыста. Такімі ж былі выдаткі і на падтрымку сельскай гаспадаркі. Напрыклад, у 1921–1922 гг. на патрэбу раслінаводства было расходавана 0,01% ад агульнай сумы па НКЗ, а ў 1922–1923 гг. – 0,77% [33, 9, л. 25 адв.].

Не спрыялі пашырэнню сельскагаспадарчых ведаў шматлікія лістоўкі, якія распаўсюджваліся ў межах розных сельска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаспадарчых кампаній: пашырэнні пасяўной плошчы пад лубін і другія тэхнічныя культуры, ачысткі насення і інш. Не надта змянілася справа пасля стварэння серыі “Сялянская сельскагаспадарчая бібліятэчка”, на аснове якой штогод невялікім тыражом выдаваліся 10–15 брашур.

Аднак, як канстатавалася ў адной з рэцэнзій, “памеры кніжак не адпавядаюць умовам вёскі, бо аб’ём іх 30, 48, 59 і нават 74 старонкі. Малаадукаванай вёсцы такая кніжка не пад сілу” [10, 575, л. 2а]. Нічога дзіўнага ў тым, што такія кніжкі мала хто купляў і чытаў. Напрыклад, на Мазыршчыне са ста экзэмпляраў брашуры “Жыта і пшаніца” не было прададзена ні адной, а з 30 экзэмпляраў кніжкі “Аб насенні” прадалі 20 [38, 2178, л. 4 адв.].

Неабходна адзначыць, што да вайны справай распаўсюджання сельскагаспадарчых ведаў займаліся земствы, якія распрацавалі асноўныя кірункі сельскагаспадарчага асветніцтва ў галіне аграноміі: арганізацыя вопытных палёў і станцый, пастаноўка калектыўных доследаў, паляпшэнне сельскагаспадарчай адукацыі і г.д. У Мінску з 1911 г. існавалі земляробчыя курсы, праз якія прайшлі дзесяткі сялян. У 1914 г. былі нават арганізаваны экскурсіі сялян у Данію і Швецыю. З 1911 г. пры Мар’інагорскай сельскагаспадарчай школе працавалі курсы для настаўнікаў па земляробстве, садоўніцтве, агародніцтве і малочнай справе [187, с. 51]. З 1910 г. на Міншчыне пачала аказвацца агранамічная дапамога. Шырокае распаўсюджванне атрымалі ў Беларусі сельскагаспадарчыя таварыствы, пры якіх дзейнічалі пракатныя пункты, пітомнікі, паказальныя ўчасткі, музеі, бібліятэкі, выставы. Тут чыталі лекцыі, праводзілі гутаркі на сельскагаспадарчыя тэмы. Земствы выпускалі адпаведную літаратуру, праўда, невялікім тыражом [187, с. 53–55]. Хацелася б звярнуць увагу на тое, што асігнаванні на сельскую гаспадарку па бюджэце земстваў у 1913 г. былі большымі, чым асігнаванні па мясцовых бюджэтах 1923 г. Акрамя таго, да 1914 г. на агракультурныя мерапрыемствы па дзяржаўнай лініі выдзяляліся значныя сродкі [34, 9, л. 26].

Аўтар прыводзіць гэтыя факты дзеля таго, каб паказаць, што ў Беларусі быў назапашаны значны вопыт пашырэння агранамічных ведаў. Пасля Грамадзянскай вайны земская сістэма аказалася разбуранай, кадраў не хапала, аднак савец-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кая ўлада спадзявалася хутка распаўсюдзіць сельскагаспадарчыя веды ўшыркі і ўглыб. Зноў жа, як і ў іншых відах асветніцтва, рэчаіснасць засланялі кабінетная творчасць, жаданне хутчэй атрымаць вынік. Інакш не з'яўляліся б у тагачасным друку праекты стварэння ў кожнай вёсцы пры школах сельскагаспадарчых клубаў моладзі і агранамічных участкаў. Аднак праекты і заставаліся праектамі. Для таго каб наладзіць фундаментальную асвету ў галіне земляробства, не было ні сродкаў, ні кадраў.

Разам з тым яшчэ з даваенных часоў у Беларусі існавалі моцныя, правільна арганізаваныя гаспадаркі. Іх было не надта многа, аднак на агульным фоне разбурэння і беднасці вёскі яны аказваліся дастаткова прыметнымі. Большасць такіх культурных гаспадарак знаходзіліся на Віцебшчыне. Да гэтай з'явы прычыніліся шырокае распаўсюджванне хутароў і актыўная праца земстваў. Гаспадарамі-культурнікамі (паводле тэрміналогіі таго часу) станавіліся сяляне-самародкі, якія мелі першапачатковую сельскагаспадарчую адукацыю або на сваім жыццёвым вопыце спасцігалі яе асновы. Сярод іх былі тыя, хто вёў гаспадарку ўжо 30–40 гадоў, і ўчарашнія чырвонаармейцы, што атрымалі зямлю, большай часткай няўдобіцу. Апантана працуючы, яны за некалькі гадоў змаглі дасягнуць выдатных поспехаў. Многія з сялян-культурнікаў займаліся селекцыяй, дамашнімі промысламі, пчалярствам, мелі нядрэнныя сельскагаспадарчыя бібліятэкі. Некаторыя дасягнулі настолькі прыметных поспехаў, што іх дзейнасцю зацікавілася агранамічная секцыя Інстытута беларускай культуры [1, 6, л. 53].

У якасці прыкладу нагадаем гаспадарку Язэпа Кандратавіча Мароза з Лепельшчыны. У 1888 г. сям'я Марозаў праз банк у растэрміноўку на 56 гадоў набыла фальварак Фатынь недалёка ад мястэчка Бачэйкава, былога ўладання графаў Ціханавецкіх.

Праз два дзесяцігоддзі шляхам руплівай паўсядзённай працы ўсёй сям'і, гэта каля 25 чалавек, былі дасягнуты вялікія поспехі. Толькі пад садам было 8 дзесяцін, вінаграднік займаў 10 кв. сажняў, дэкаратыўныя саджанцы – 184 кв. сажні, агарод – больш 2 дзесяцін, ворнай зямлі было каля 30 дзесяцін, сенажаці больш за 28 дзесяцін, у цэлым фальварак займаў плошчу 119 дзесяцін. Гаспадарка была шматпольнай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прычым калі вырошчвалася канюшына, дык некалькіх гатункаў, бульба таксама некалькіх відаў і г.д. Рабілася гэта дзеля таго, каб шляхам шматгадовых назіранняў адабраць лепшыя гатункі. Дзякуючы селекцыі Я.К.Мароз атрымаў яблык, які назваў "салодкая антонаўка", вывеў гатунак белай куставой фасолі, высокаўраджайны і высокаякасны гатунак капусты "зімняя Мароза" і інш.

Яго працаю зацікавілася агранамічная секцыя Інстытута беларускай культуры. У маі 1925 г. яна запрасіла Язэпа Кандратавіча на сваё пасяджэнне, і ён 25 мая зрабіў даклад аб дасягненнях сваёй гаспадаркі. Усхваляваныя слухачы, сярод іх быў наркам земляробства Зм.Прышчэпаў, вучоны-эканаміст А.Смоліч, вучоны-аграном С.Скандрыкаў, прапанавалі залічыць Я.Мароза членам-карэспандэнтам Інстытута з правам назвы яго гаспадаркі як маючай культурна-навуковае значэнне "Гаспадарка члена-карэспандэнта ІБК", выдаць манаграфію Я.Мароза з малюнкамі, прызнаць яго героем працы з выдачай яму ордэна Працоўнага Сцяга. Узнікла ідэя арганізаваць сялянскую школу па садоўніцтве і пчалярстве пры фальварку, былі і другія ідэі [1, 6, л. 93].

Яшчэ адным звяном у пашырэнні сельскагаспадарчых ведаў на вёсцы стала дзейнасць студэнтаў. На практыку прыязджалі студэнты з Масквы, актыўна працавалі навучэнцы Мар'інагорскага і Чырвонабярэжскага саўгасаў-тэхнікумаў. Студэнты Пятроўскай акадэміі праходзілі практыку на агранамічнай станцыі ў Банцараўшчыне. У 1922 г. яны стварылі сельскагаспадарчы музей, у якім паказалі тыповыя сялянскія гаспадаркі з 7 навакольных вёсак, праводзілі асветніцкую работу. З мясцовай моладзі быў створаны культурна-асветніцкі гурток імя Якуба Коласа, сябры якога раз'язджалі па вёсках. Перад выступленнямі хору заўсёды чытаў лекцыю аграном [480, с. 3].

Да сельскагаспадарчай асветы была прыстасавана ідэя агіт-цягнікоў, якую шырока выкарыстоўвалі падчас Грамадзянскай вайны. У 1922 г. Наркамат земляробства РСФСР арганізаваў агранамічныя цягнікі. У ліпені адзін з іх прыбыў з Масквы ў Барысаў. У яго склад уваходзілі невялікі сельскагаспадарчы музей, кніжная крама ў 500 выданняў па розных галінах сельскай гаспадаркі. Асветніцкую работу пры ім здзяйснялі вучоны-аграном і вучоны-ветэрынар. Яны чыталі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лекцыі, давалі парады па пытаннях вядзення гаспадаркі [311, с. 3].

Падобны вопыт быў выкарыстаны і ў Беларусі. Да IV Усебеларускага з'езда Саветаў у канцы 1922 г. была адкрыта сельскагаспадарчая выстава з аддзеламі травасеяння, малочнай гаспадаркі, насенняводства і пчалярства. Яе экспанаты склалі экспазіцыю перасоўнай коннай сельскагаспадарчай выставы, якая 11 студзеня 1923 г. у суправаджэнні чатырох аграномаў пачала свой асветніцкі рэйд. Першы прыпынак быў зроблены ў вёсцы Крупіца, дзе была прачытана лекцыя і праведзены гутаркі па пытаннях садоўніцтва і агародніцтва, барацьбе з насякомымі, кааперацыі, аб сельскагаспадарчай выставе ў Маскве. На працягу студзеня–лютага выстава пабывала ў племсаўгасе "Ігнацічы", найбольш буйных сёлах Самахвалавіцкай, Магільнянскай валасцей, у Станькаве і Койданаве. За гэты час аграномы прачыталі 58 лекцый, выставу наведалі больш за 6,5 тыс. чал. [442, с. 2].

Пэўны ўплыў на жыццё вёскі аказала кампанія падрыхтоўкі да I Усерасійскай сельскагаспадарчай і кустарнай выставы 1923 г. Многія разумелі несвоечасовасць выставы, немагчымасць праўдзіва адлюстраваць на ёй гаспадарчы стан рэспублікі. Напрыклад, намеснік наркама земляробства, член Белвысткама А.Хатэнка пісаў: "Калі б у краіне існавала мноства тавараў, калі б вытворчасць патрабавала збыту, калі б існавала колішняе аматарства ў сельскай гаспадарцы, тады знайшліся б асобы, якія былі б зацікаўлены ў тым, каб паказаць сваю вытворчасць хаця б дзеля рэкламы, як гэта рабілася ў ранейшых умовах. Выстаўкі тады з'яўляліся самым танным і самым надзейным сродкам рэкламы, таму раней на іх ехалі з вялікаю ахвотаю... Прапагандуемая выстава не рэкламная, а асветна-паказальная і справаздачная. На ёй трэба паказаць сапраўдны стан нашай гаспадаркі, не маскіруючы яго унікумамі" [49, 6а, л. 2]. Заўважым, наколькі трапна быў паказаны характар плануемай выставы. Вядома, да гэтай вельмі слушнай думкі ніхто з вярхоў не збіраўся прыслухоўвацца. Ды і сам аўтар рабіў усё магчымае для таго, каб як мага лепш паказаць дасягненні Беларусі.

Выстава арганізоўвалася на спалучэнні двух прынцыпаў: з аднаго боку, трэба было паказаць матэрыяльныя рэсурсы рэспублікі і дасягненні сельскай гаспадаркі, з другога –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурны і бытавы стан сялянскага жыцця. Безумоўна, кіруючыя колы Беларусі не маглі не надаваць вялікага палітычнага і прапагандысцкага значэння ўдзелу ў выставе.

Адносіны сялянства да выставы былі ў большасці адмоўнымі. Гэта зусім не дзіўна, асабліва калі прыняць пад увагу ўсе абставіны тагачаснага жыцця вёскі. Цяжка было селяніну зразумець, куды і навошта трэба было аддаваць лепшую частку сваёй маёмасці. Таму экспанаты збіраліся вельмі марудна. Не дапамагалі агітацыя ў прэсе, лістоўкі пад загалоўкам "Што трэба ведаць беларусу пра Усерасійскую сельскагаспадарчую выставу", агітацыйныя тыднёвікі. Праўда, мясцовым работнікам чамусьці падабалася спісваць гэта на забітасць насельніцтва па той, мабыць, прычыне, што "сяляне да ўсялякіх аглядаў іх жывёлы і гаспадаркі адносіліся недаверліва, думаючы, што гэта ўсё робіцца на прадмет большага абкладання. Вяскоўцы скаціну заганялі ў лес, лепшыя экзэмпляры хавалі" [49, 12, л. 86]. Заўважым, што ў дакуменце досыць выразна адлюстраваны сялянскі страх перад павелічэннем падатку.

З 15 па 22 чэрвеня па ўсёй рэспубліцы праводзіліся прапагандысцкія мерапрыемствы, прысвечаныя выставе. У афіцыйных дакументах указвалася, што ўсе вёскі і гарады Беларусі, усе земляробы і рабочыя павінны азнаёміцца з яе задачамі. Усе партыйныя і грамадскія арганізацыі, усе прафсаюзы, усе работнікі асветы, аграномы, ляснічыя павінны "кінуць свае сілы ў вёску, каб заклікаць сялян да шырокага ўдзелу ў выставе". Але "папяровыя заклікі" не далі жаданых вынікаў, і агітацыйныя мерапрыемствы былі працягнуты яшчэ на тыдзень. У рэшце рэшт улады былі вымушаны аб'явіць аб падатковых ільготах для гаспадароў, якія згадзіліся прыняць удзел у выставе. Абяцалася памяншэнне падатку ад 5 да 75 пудоў у залежнасці ад значнасці экспаната [32, 1168, л. 54].

Ва ўсе паветы былі адпраўлены спецыяльныя ўпаўнаважаныя. На месцах ствараліся выставачныя бюро, аднак яны не мелі сродкаў, таму работа па зборы экспанатаў пачалася на голым энтузіязме і вельмі пасіўна. Не трэба забываць, што гэтыя падзеі адбываліся ў самыя гарачыя летнія месяцы і пры крытычных настроях многіх выканаўцаў. Напрыклад, кіраўніцтва Мар'інагорскага сельгастэхнікума лічыла, што "стан

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх гаспадаркі паказвае не дасягненні, а, наадварот, моцны заняпад. Толькі спынілася разбурэнне старога, пачаўся паварот у бок некаторага ўмацавання новага, і таму момант для выставы абраны самы няўдалы” [49, 6а, л. 55].

Але некаторыя выстбюро прымалі досыць рашучыя пастановы ў адрас, на іх думку, не зусім актыўных выканаўцаў. Нават пагражалі прыцягваць да адказнасці па арт. 107 і 108 Крымінальнага кодэкса. Так было ў Ігуменскім павеце, а ў Барысаве пагражалі нікога не пасылаць у Маскву на экскурсію [50, 12, л. 119]. Складвалася ўражанне адсутнасці на месцах зацікаўленасці ў выставе. Мабыць, людзі разумелі нейкую дваістасць сітуацыі, калі няма чаго паказваць, а трэба. Кіраўнікі Белвысткама, якія быў створаны ў сакавіку 1923 г. на чале з камісарам земляробства А.С.Славінскім, таксама не маглі канкрэтна вызначыцца, якія ж дасягненні трэба паказваць. То прапаноўвалася паказаць яшчэ толькі плануемыя гідратэхнічныя пабудовы на адным з балот недалёка ад Мінска, то даць звесткі аб колькасці зямлі, якая знаходзіцца ў сялян. Але, звернем увагу, Цэнтральнае статыстычнае бюро адказала, што “ў іх такіх звестак няма”. Камусьці прыйшла думка зрабіць апісанне эвалюцыі сельскай гаспадаркі пад уплывам агранамічнай працы на працягу некалькіх гадоў. Агранамічны аддзел НКЗ паведаміў, “што ў Беларусі няма аграномаў, якія працавалі б тут дастаткова доўга” [49, 7, л. 554, 67].

Вельмі многа размоў вялося вакол пытання аб паказе на выставе тыповай сялянскай сядзібы. Па прапанове А.Смоліча была абрана гаспадарка Я.Сцефановіча з вёскі Крупіца Мінскага павета, але ж гаспадар не згадзіўся з перспектывай разбурэння сваіх пабудоў і нават адмовіўся паехаць у Маскву са сваёй сям’ёй у якасці “жывой карцінкі” да макета сялянскай хаты [49, 5, л. 27].

Перад выставай ставілася яшчэ адна, можа, самая важная задача – прапаганда дасягненняў рабоча-сялянскай улады. Аб выставе шмат пісалася ў прэсе, арганізоўваліся спецыяльныя экскурсіі. Была спушчана спецыяльная разнарадка на колькасць экскурсантаў. Ад Беларусі, напрыклад, планавалася паслаць 1500–2000 чалавек, пажадана, каб большасць іх была з сялян. Па валасцях адбываліся з’езды старшынь сельскіх Саветаў, камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, школьных ра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ботнікаў і членаў кааператываў па абмеркаванні кандыдатур на паездку ў Маскву. Аднак жадаючых знайсці было цяжка, таму што адарвацца селяніну жніўеньскім днём было не тое што немагчыма, гэта было неразумна. Але мясцовыя ўлады не вельмі засмучаліся такой акалічнасцю, і іх прадстаўнікі ахвотна ехалі самі. Таму ў першай экскурсіі сялян было каля 20%, у другой – каля 30%, і толькі ў трэцяй, якая адпраўлялася ў канцы верасня, – ужо 75%. На экскурсіі выдзяляліся грошы, але іх, безумоўна, не хапала. Таму рэкамендавалася "браць з сабой бялізну і запас харчоў на 7–8 дзён", "апранацца ў беларускае нацыянальнае адзенне" [49, 7, л. 816 адв.; 12, л. 214].

Па завяршэнні выставы падводзіліся вынікі і лепшым выдаваліся прэміі: плугі, косы, мануфактура, сепаратары, розная дробязь. Наколькі можна зразумець з дакументаў, большасць удзельнікаў беларускага павільёна атрымалі прэміі, асабліва вялікі поспех чакаў удзельнікаў раздзела жывёлагадоўлі, якія былі ўзнагароджаны ўсе [50, 7, л. 669].

Безумоўна, у 1923 г. перад рэспублікай, асабліва перад вёскай, стаялі больш важныя задачы, чым удзел у выставе. Аналіз падрыхтоўчай работы дазваляе зрабіць некаторыя высновы. Па-першае, ідэя выставы не захапіла сялян, яна была навязана зверху, прычым у вельмі неспрыяльны момант і ў цяжкіх эканамічных абставінах. Па-другое, непасрэдныя вытворцы не былі зацікаўлены ў выставе, таму што яшчэ не акрыялі пасля вайны. Не магло быць з іх боку нават жадання рэкламаваць сваю прадукцыю. Нам падаецца неразумнай трата вялікіх сродкаў, якія былі ўзяты з тых жа сялян у выглядзе розных падаткаў, на арганізацыю своеасаблівай калекцыі не самых лепшых дасягненняў.

У сувязі з рашэннямі партыйных органаў з 1924 г. самая значная роля сярод іншых кірункаў палітыка-асветніцкай работы пачала надавацца аграрнаму асветніцтву як аднаму з важнейшых сродкаў аднаўлення сельскай гаспадаркі. У распрацаванай схеме яго нізавымі ячэйкамі станавіліся сельскагаспадарчыя гурткі пры хатах-чытальнях, другой ступенню – курсы па розных галінах сельскай гаспадаркі з вывучэннем тэарэтычных і практычных пытанняў і апошнім звяном – масавае свята Дзень ураджаю з выставамі сельскагаспадарчай прадукцыі [14, 197, л. 29]. Наркамат земляробства планаваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізаваць у кожнай з 10 акруг не менш за пяць сельскагаспадарчых курсаў і ў кожным раёне адзін гурток або праводзіць экскурсіі сялян на доследныя палі, арганізоўваць конкурсы, аграсуды і да т.п. У галіне ветэрынарыі прадугледжвалася наладзіць выезды спецыялістаў на вёску не менш за 120 разоў на год, каб чытаць лекцыі, даклады на сялянскіх канферэнцыях і сходах, у сельсаветах і хатах-чытальнях. Існавалі планы стварэння перасоўных ветмузеяў, выстаў, кааператыўных ветпунктаў, выдання неабходнай літаратуры, лістовак, брашур, плакатаў, арганізацыі кампаній у форме дзён ветэрынарыі, тыдняў ветэрынарыі і г.д. [33, 5, л. 25 адв.].

Відавочна, падобныя рашэнні з'яўляліся далёкімі ад магчымасцей асветніцкіх арганізацый. Для іх рэалізацыі кадраў палітасветы і спецыялістаў не хапала. У 1925 г. у Беларусі працавалі 210 участковых і 10 акруговых аграномаў, каля 200 работнікаў ветэрынарнай службы [33, 5, л. 28; 23, 135, л. 17]. У той жа час сярод вясковай моладзі пачынаецца масавае стварэнне сельскагаспадарчых гурткоў, якімі кіравалі часцей за ўсё настаўнікі, гаспадары-культурнікі, што перайшлі на шматполле, і толькі дзе-нідзе аграномы. Часцей за ўсё апошнія абмяжоўваліся рэдкімі наездамі ў вёску і чытаннем лекцый, пасля чаго прымаліся рэзалюцыі аб пераходзе слухачоў на новыя формы землекарыстання [44, 123, л. 38].

У некаторых мясцовасцях ідэю аграрнага асветніцтва прынялі вельмі шчыра, асабліва моладзь і настаўніцтва. Напрыклад, нарада загадчыкаў народных Дамоў і хат-чытальняў Мінскай акругі ў снежні 1926 г. пастанавіла стварыць гурткі пры кожнай хаце-чытальні і чырвоным кутку [8, 300, л. 73]. Аб энтузіязме сведчаць прымаемыя рашэнні. На сваім агульным сходзе працаўнікі асветы Койданаўскага раёна ў снежні 1925 г. прынялі пастанову, дзе запісалі: "Савецкая школа-ферма павінна стаць маяком сельскагаспадарчай асветы. Не павінна быць школы, якая б не імкнулася да прынцыпу аб'яднання навучання і вытворчай працы, таму неабходна пры школах утрымліваць зямельныя ўчасткі; арганізаваць сельскагаспадарчыя курсы; закласці апорныя пункты для доследаў пад кіраўніцтвам аграномаў" [44, 199, л. 185]. У Чэрвеньскім раёне пайшлі далей і прапанавалі ўсім школам прыняць тэрміновыя меры па закладцы паказальных участкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па шматполлі, якія павінны апрацоўвацца “выключна сіламі навучэнцаў і навучаючых” [44, 56, л. 61].

Галоўную ролю ў арганізацыі сельскагаспадарчых гурткоў узяў на сябе камсамол, чарговы з’езд якога ў 1924 г. пастанавіў пры кожнай вясковай ячэйцы стварыць гурткі. Перад камсамольцамі ставіліся задачы ліквідацыі агранамічнай непісьменнасці, набыцця элементарных ведаў па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі, ліквідацыі палітычнай і агульнай непісьменнасці. У гурткі прымаліся члены ячэек і лепшая беспартыйная моладзь, а іх сродкі фарміраваліся за кошт узносаў. Кіраванне гуртком ускладалася на агранома або хатніка ці настаўніка [23, 19, л. 140]. На наш погляд, апошняя акалічнасць выразна прадэманстравала нежыццяздольнасць плануемых добраахвотных аб’яднанняў. Пацвердзіць гэты вывад могуць тагачасныя дакументы, напрыклад справаздача старшыні Астрашыцка-Гарадоцкага райпалітасвета ад 21 красавіка 1926 г.: “Добра, што сельскагаспадарчыя гурткі растуць як грыбы, але дрэнна, што ў іх нездавальняюча пастаўлена справа. Яны будуць жыццёвыя толькі тады, калі будуць кадры адпаведных кіраўнікоў” [8, 202, л. 15]. З другіх месцаў паведамлялі: “Просім-просім агранома, а ён не прыязджае, таму зімой чытаем кніжкі, няма праграм, практыкі” [14, 208, л. 206].

Пытанню дзейнасці сельскагаспадарчых гурткоў надавалася значная ўвага з боку кіруючых арганізацый, і не толькі партыйных. У кастрычніку 1925 г. адбыўся пленум сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта, на якім абмяркоўвалася пытанне працы гурткоў. Асноўны дакладчык вучоны-аграном М.Сцяпура звярнуў увагу на хуткі рост гурткоў, за якімі не паспявала статыстыка, таму дакладную іх колькасць вызначыць немагчыма. Галоўнымі недахопамі работы гурткоў дакладчык лічыў “адсутнасць належнага кіраўніцтва, затэарэтызаванасць і сезоннасць дзейнасці” [1, 11, л. 32]. Удзельнікі пленума выказалі незадаволенасць распрацаванай Галоўпалітасветам праграмай для сельскагаспадарчых гурткоў, якая аказалася проста нежыццёвай. Чаму маглі навучыць аднаразовыя гутаркі на тэмы “Зямельны і Лясны кодэксы”, “Трохполле – пагібель, выратаванне – шматполле”, “Аб правільным доглядзе за дамашняй жывёлай”, “Перавага калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай” і інш. Яшчэ больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далёкімі ад жыцця аказаліся плануемыя практычныя заняткі – назіранні за паказальнымі кармленнямі жывёлы па нормах, ацяпленне гаспадарчых пабудоў і назіранне за вынікамі гэтага і да т.п. [22, 7, л. 56].

Удзельнікі пленума Інбелкульта прызнавалі бяздзейнасць аматарскіх гурткоў і ў якасці галоўнай прычыны вылучалі думку аб адсутнасці пэўнага цэнтральнага органа, які б узначаліў іх працу. Досыць паказальным з’яўлялася ўяўленне аб яго задачах: “...распрацоўка методыкі па вытворча-практычнай літаратуры; стварэнне інстытута інструктараў па арганізацыі гурткоў; складанне каталога для гуртковых бібліятэчак; арганізацыя курсаў для кіраўнікоў” [1, 11, л. 34]. Як бачым, рэальнае ўяўленне аб стане і магчымасцях тагачаснай вёскі адсутнічала як у партыйнага кіраўніцтва, так і ў навукоўцаў. Вера ў магутнасць і непахіснасць ідэі засланяла рэальную карціну. З аднаго боку, выступоўцы звяртаюць увагу на тое, што большасцю гурткоў кіруе малаадукаваная камсамольская моладзь, з другога, прымаюцца нерэальныя рашэнні з адначасовым прызнаннем цяжкага матэрыяльнага стану гурткоў, якія падтрымліваюцца толькі за кошт добраахвотных узносаў.

Каб актывізаваць працу гурткоў, адны выступоўцы прапаноўвалі перадаць кіраванне і забеспячэнне гурткоў ЦК КСМБ, другія лічылі неабходным актыўней выкарыстоўваць настаўнікаў, нават арганізаваць летнія курсы па іх перападрыхтоўцы; для трэціх ідэалам з’яўлялася самадзейнасць саміх сялян, як гэта адбывалася ў заходніх краінах. Пасля доўгага абмеркавання навукоўцы прынялі пастанову, на жаль, не адпаведную стану праблемы: склікаць Усебеларускі з’езд працаўнікоў сельскагаспадарчых гурткоў, на якім прапанаваць аграномам выкарыстоўваць гурткі як сродак аграпрапаганды [1, 11, л. 34 адв.].

Большасць спецыялістаў сельскай гаспадаркі не ўспрымалі ідэалагічнага падыходу да практычных праблем. З непакоем мясцовыя ўлады паведамлялі аб ігнараванні імі курсаў палітасветы, прысвойвалі ярлыкі грамадска неактыўнага элемента лепшым аграномам, што па тых часах адпавядала дрэннай характарыстыцы [38, 2175, л. 39]. Можна дапусціць, што, будучы рэалістамі, назіраючы на практыцы разыходжанне паміж словам і справай, нешматлікі атрад аграномаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не жадаў удзельнічаць у чарговым прапагандысцкім мерапрыемстве. Ды і што маглі зрабіць "папяровыя" сельскагаспадарчыя гурткі ў справе пашырэння спецыяльных ведаў, калі не было ніякага парадку ў іншых відах афіцыйнай аграпрапаганды?

Што тычыцца арганізацыі сельскагаспадарчых курсаў, то згодна з дакументамі яны існавалі. У асобных раёнах праводзіліся месячныя курсы з вопытна-паказальным кармленнем жывёлы і тэарэтычнымі заняткамі, у другіх – 10-дзённыя або 20-дзённыя тэарэтычныя курсы з дэманстрацыяй ілюстрацыйнага матэрыялу [24, 543, л. 258]. Толькі немагчыма вызначыць практычную карысць гэтых курсаў, калі яны існавалі на самай справе.

Наступная ступень аграпрапаганды – святкаванне Дня ўраджаю з арганізацыяй сельскагаспадарчых выстаў. Праз афіцыйныя дакументы праходзіць ідэя замены гэтым масавым мерапрыемствам аднаго з любімых сялянствам рэлігійных свят – Пакровы. Ініцыятыву ў арганізацыі Дня ўраджаю ўзяў на сябе камсамол. ЦК ЛКСМБ распрацаваў парадак святкавання: "...падвядзенне вынікаў сельскагаспадарчага года; выяўленне недахопаў вядзення сельскай гаспадаркі і праграма падрыхтоўкі да яго (абмеркаваць пытанне на агульных сходах); у хатах-чытальнях развесіць лозунгі, плакаты; асабістыя гутаркі з сялянствам; падрыхтоўка выставы" [23, 19, л. 101].

14 кастрычніка 1923 г. пачалося святкаванне Дня ўраджаю, а праз год яно стала масавым. Толькі па Мінскай акрузе ў 1924 г. адбылося 7 раённых сельскагаспадарчых выстаў, і "хаця ў некаторых вёсках сялянства аднеслася да іх з недаверам, у большасці яны прайшлі з вялікім поспехам. У Самахвалавіцкім раёне прысутным прадэманстравалі працу трактара. Паказальна, што на Міншчыне асобным гаспадарам прэміі не прысуджаліся, а даваліся толькі калектывам і цэлым вёскам за шматполле, ранні пар, добрае ўтрыманне жывёлы. У другіх месцах матэрыяльныя прэміі давалі бяднейшым, заможным – дыпломы. У якасці прэмій выкарыстоўваліся трыеры, збожжаачышчальныя машыны, наборы лугавых прылад, масларобчыя прылады і г.д. [4, 72, л. 162]. Аналагічна праходзіла святкаванне Дня ўраджаю ў другіх месцах, дзенідзе ў ім прымалі ўдзел саўгасы, сярод экспанатаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

траплялiся вырабы кааператыўных аб'яднанняў [4, 276, л. 7]. З цягам часу святкаванне Дня ўраджаю пачало ажыццяўляцца ўрадам праз органы Наркамата земляробства з наданнем яму палітычнага значэння і характару шырокай народнай гульні з "калектыўнымі народнымі скокамі і спевамі" [8, 311, л. 352]. Але, як сведчаць дакументы, святкаванне Дня ўраджаю адбывалася шаблонна: мітынг з прывітаннямі ад розных арганізацый, даклад агранома і інш. [4, 276, л. 92 адв.].

Святкаванне Дня ўраджаю паступова ператваралася ў малацікавае мерапрыемства. Газета "Савецкая Беларусь" у нумары за 23 кастрычніка 1928 г. паведамляла аб выніках рэйду па раённых цэнтрах Міншчыны 14 кастрычніка, у дзень свята: "Выставы ў большасці былі пабудаваны ў гразі, пад адкрытым небам або ў цёмных хлявах... Пашпарты для экспанатаў рыхтаваліся ў дзень выстаўкі ў пажарным парадку... У Койданаве толькі паспелі раскласці экспанаты пад адкрытым небам каля касцёла, аж раптам загад з райвыканкама – перайсці ў народны дом... Старшыня Плешчаніцкага РВК не наведаў выставу, старшыня Заслаўскага РВК паказаўся на выставе і праз 10 хвілін пакінуў яе, а загадчыца народнага дома адмаўлялася даць памяшканне для ўрачыстага сходу... У Прылепскім сельсавеце на выставу з'явіліся толькі два сябры сельсавета... Камсамольцы Плешчаніц і Прылеп адмовіліся прымаць удзел у выставе... Саўгасы і кааператывы Заслаўскага раёна зусім не ўдзельнічалі ў выставе..." Пад уражаннем усяго гэтага некаторыя спецыялісты Наркамата земляробства прыйшлі да высновы аб "непатрэбнасці гэтых выстаў наогул або правядзенні іх раз у тры гады. Пры такой неарганізаванасці выставы не апраўдваюць сябе ні гаспадарча, ні палітычна, толькі дыскрэдытуюць у вачах сялянства работу аграномаў і савецкай улады" [248, с. 3].

Акрамя сельскіх палітасветустаноў, аграпрапагандай павінны былі займацца Дамы селяніна, якія ствараліся ў акруговых цэнтрах і ў некаторых раёнах ужо ў 1921 г. Ім надавалася значэнне перш за ўсё ідэалагічных, а потым культурных устаноў. У Цэнтральным Доме селяніна (ЦДС) у Мінску існавалі юрыдычны і агранамічны аддзелы, бібліятэка-чытальня, музей, праводзіліся кансультацыі па сельскагаспадарчых пытаннях, лекцыі і гутаркі па грамадазнаўстве, кааперацыі, медыцыне, падатковай палітыцы, чыткі газет і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часопісаў. Напрыклад, у верасні 1925 г. планаваліся лекцыі на тэмы “Восеньская ўборка яравых і азімых палёў”, “Уборка гародніны”, “Чырвоная армія і яе значэнне”, “Падатковая палітыка’ і інш. [38, 2178, л. 57]. Тры разы ў тыдзень паказвалі кіно. Падтрымлівалася пісьмовая сувязь з сялянамі розных акруг.

Усе ўстановы гэтага тыпу мелі фінансавыя праблемы, таму эфектыўнасць іх дзейнасці не магла быць высокай. Каб падтрымаць Цэнтральны Дом селяніна як арганізацыю, што выконвае работу дзяржаўнай важнасці ў справе паляпшэння матэрыяльна-гаспадарчага стану сялянства і распаўсюджвання сярод яго палітычных і агранамічных ведаў, Наркамат фінансаў вызваліў ЦДС ад гербавага і канцылярскага збору [16, 138, л. 53].

Акруговыя выканкамы не ўдзялялі дастатковай увагі Дамам селяніна (ДС), вынікам чаго стала іх “паніжаная жыццяздольнасць пры страце дзяржаўнага значэння” [32, 1652, л. 3, 3 адв.]. Афіцыйныя дакументы паведамлялі аб “цяжкім, ненармальным стане” Талачынскага ДС, ператварэнні Полацкага ДС у “простую начлежку без адзінай культурнай установы”, перамяшчэнні Цэнтральнага ДС з месца на месца і г.д. [32, 3611, л. 129; 25, 184, л. 70]. Вось якое ўражанне пакінуў Аршанскі Дом селяніна пасля наведвання яго загадчыкам ЦДС: “Калі я трапіў у Аршанскі ДС, то здалося, што трапіў у харчэўню. Памяшканне не адпавядае працы ДС. Культурная праца не вядзецца, хаця ёсць загадчык і бібліятэкар. Трэба яго зачыніць, бо ён прыносіць больш шкоды, чым карысці. Віцебскі ДС трохі лепшы, але і там культурнай працы мала” [14, 187, л. 344].

Пытанні аграпрапаганды, асноўныя кірункі якой пастаянна ўдакладняліся, заставаліся пад кантролем партыйных і савецкіх органаў. На Усебеларускай нарадзе агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелаў КП(б)Б у кастрычніку 1926 г. звярталася ўвага на неабходнасць прапаганды 5-гадовага плана развіцця сельскай гаспадаркі БССР. Прадугледжваліся стварэнне бюро па аграпрапагандзе, абавязанага наладзіць улік і вывучэнне вопыту работы сельскагаспадарчых гурткоў, правядзенне нарад гаспадароў-культурнікаў, экскурсій у вопытна-паказальныя гаспадаркі, падрыхтоўку выстаў, арганізацыю выступленняў у друку [23, 50, л. 378].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як нам падаецца, створаная сістэма аграпрапаганды не справілася з пастаўленай задачай пашырэння сельскагаспадарчых ведаў сярод шырокіх мас сялянства. Справаздачныя даныя, сярод якіх немагчыма знайсці хаця б некалькі аднолькавых лічбаў і якія паказваюць сотні гурткоў, тысячы паказальных участкаў, дзесяткі курсаў і да т.п. [25, 135, л. 17], не адлюстроўваюць сапраўднага стану справы. За лічбамі хаваюцца невырашальныя праблемы: адсутнасць спецыяльных кадраў, дрэннае матэрыяльнае забеспячэнне і, безумоўна, кампанейскі падыход да выканання рашэння ў партыйных органаў. У адказ на пастанову XIII з'езда РКП(б) пачалі рапартаваць аб масавым энтузіязме сялянства ў стварэнні гурткоў. Як было прынята, спачатку паведамлялася аб станоўчых момантах: зацікаўленасці сялянства, удзеле ў пасяўной кампаніі. Потым пераходзілі да абмеркавання недахопаў: адсутнасць спецыяльнай літаратуры (не толькі кадраў), слабы абмен вопытам, сябры гурткоў і слухачы курсаў не павялічваюць эфектыўнасць сваіх гаспадарак, не праводзяць практычных заняткаў і г.д. [24, 1341, л. 25]. Як бачна, недахопамі перакрываліся нязначныя станоўчыя вынікі. Не выпадкова яшчэ ў 1928 г. прымаліся рэзалюцыі аб пашырэнні сеткі гурткоў, пераарыентацыі іх працы ў кірунку прапаганды калектыўных формаў гаспадарання.

Пашырэнню спецыяльных ведаў закліканы былі садзейнічаць сельскагаспадарчыя школы дарослых сялян (ШДС) з 5-месячным курсам навучання. 6 жніўня 1924 г. было распрацавана адпаведнае палажэнне, згодна з якім у школу прымаліся юнакі і дзяўчаты старэй за 18 гадоў, што ўмелі чытаць і пісаць. Як заўсёды, перавага аддавалася чырвонаармейцам, перадавым беднякам і сераднякам, накіраваным партыйнымі, прафсаюзнымі і зямельнымі ўстановамі. Курс навучання павінен быў даваць “асноўныя сельскагаспадарчыя веды з канцэнтрацыяй увагі на адной галіне сельскай гаспадаркі... неабходную для новага гаспадара грамадска-палітычную асвету, пазнаёміць з прагрэсіўнымі формамі сельскагаспадарчай і агракультурнай тэхнікі” [14, 177, л. 5]. Заняткі ў ШДС праводзіліся з 1 лістапада па 1 красавіка, практыка прадугледжвалася ў выглядзе экскурсій на даследчыя станцыі, у паказальныя саўгасы. Аднак самае галоўнае заключалася ў тым, што выпускнікам не выдавалі ніякіх пасведчанняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Атрымлівалася, што сродкі проста выкідаліся на вецер, бо існаванне такіх школ патрабавала наяўнасці многіх умоў: штатных працаўнікоў, узгаднення з мясцовым аграномам, забеспячэння памяшканнем, існавання паблізу добрай савецкай гаспадаркі і г.д. Згодна з тагачаснымі звесткамі, мясцовыя ўлады не ўсюды падтрымлівалі школы, наадварот, "адбіралі памяшканні, здымалі з працы загадчыкаў, зачынялі школы" [14, 177, л. 3, 107].

З 17 лістапада 1924 г. пачала працаваць першая школа дарослых сялян у Лошыцы. Праз месяц пачалі прыбываць першыя слухачы, але, даведаўшыся, што стыпендыя толькі 10 руб., многія вярталіся дадому. Школа знаходзілася на вучнёўскай ферме "Лошыца" ад сельскагаспадарчага інстытута, карысталася інтэрнатам, сталовай, класамі, бібліятэкай у 240 кніг, "чароўным ліхтаром" з дыяпазітывамі, плакатамі, калекцыяй угнаенняў. На першы погляд умовы неблагія, аднак работнікі скардзіліся на адсутнасць падручнікаў, мікраскопаў і інш. За першы год навучэнцы зрабілі 6 экскурсій, правялі 12 гутарак і дакладаў у клубе, паставілі 4 спектаклі, арганізавалі вусную газету, вывучылі 5 песень, выпусцілі 2 нумары насценнай газеты [14, 177, л. 67, 69, 76, 84 адв.]. Шкада толькі, што аб добрых выніках у сельскагаспадарчых ведах у справаздачы размова не ішла.

Дзеля поўнага ўяўлення пра магчымасці школ дарослых сялян выкарыстаем прыклад Жодзінскай школы, якая пачала працу ў снежні 1925 г., маючы наступнае абсталяванне: 2 лямпы, 3 адзінкі шкла да іх, 2 бідоны для газы, адно вядро, 2 мяшкі, 32 кніжкі, сярод іх "Як жывуць сяляне ў Даніі", "Данія пад Масквой" і да т.п. Праграма заняткаў была распрацавана вядомым аграномам М.Лайковым і складалася з 7 вялікіх тэм: чытання і практыкавання ў лічэнні, знаёмства з родным краем, сельскагаспадарчай культурай, якая дзялілася яшчэ на 22 канкрэтныя спецыяльныя тэмы, таксама знаёмства з рэвалюцыйным рухам і інш. За два месяцы заняткаў школа зрасходавала дзесятак каробак запалак, дзве банкі чарніла, два блакноты [14, 177, л. 22, 24]. Праграмы другіх школ таксама складаліся пры ўдзеле агранома і мелі на мэце павышэнне культурнага ўзроўню сялянскай гаспадаркі, бо інакш расцаніць, напрыклад вывучэнне тэм "Апрацоўка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

глебы сахой і касуляй і іх адмоўныя бакі”, “Пераход да плуга і яго перавага над сахой” [10, 575, л. 20], немагчыма.

Не выклікае сумнення, што з-за адсутнасці праўдзівай і зразумелай інфармацыі аб мэтах ШДС сярод вяскоўцаў пашыраліся чуткі аб падрыхтоўцы ў іх аграномічных кадраў. Па гэтай прычыне Наркамат земляробства, які курыраваў школы, звяртаў увагу акруговых аддзелаў земляробства на імкненне мясцовых улад “перарабіць пяцімесячныя сялянскія школы, змяніўшы іх сутнасць як школ, што ставяць мэтай пашырэнне сельскагаспадарчых ведаў сярод сялянскіх мас, ператвараючы іх у школы па падрыхтоўцы нейкіх недаробленых спяцоў...” [14, 177, л. 107].

Аналагічная задача надавалася школам сялянскай моладзі (ШСМ), якія пачалі стварацца ў той жа час, восенню 1924 г. Кіраўніцтва рэспублікі палічыла неабходным падтрымаць імкненне сялянства да новых метадаў гаспадарання, сельскагаспадарчых ведаў. Улічваліся таксама наяўнасць прыметнага беспрацоўя на вёсцы, немагчымасць працаўладкавання ў горадзе. Аддавалася належнае ідэалагічнаму штампу аб росце палітычнай свядомасці сялянства, звярталася ўвага на незадаволенасць вяскоўцаў станам сельскіх сямігодак. Адзначаныя прычыны, на думку адпаведных інстанцый, з’яўляліся досыць пераканаўчай падставай для арганізацыі ШСМ [23, 56, л. 499].

Ідэя стварэння школ сялянскай моладзі абмяркоўвалася на розных узроўнях на працягу некалькіх месяцаў. У жніўні 1924 г. камісія Наркамата асветы прапанавала свой праект: навучанне на працягу трох гадоў зімой і летам; прымацца павінна моладзь 15–18 гадоў; тры выкладчыкі – аграном, прыродазнавец і грамадазнавец; кабінеты – паляводства з глебазнаўствам, садоўніцтва, грамадазнаўства; бібліятэка. Планавалася выдзяляць школам ад 25 да 100 і болей дзесяцін зямлі, мець ад 3 да 5 коней і 6–8 кароў, двух работнікаў для абслугоўвання гаспадаркі [23, 19, л. 11].

У сувязі з тым, што ў школы прымалася моладзь, ЦК камсамола прапанаваў распрацаваць план паступовай рэарганізацыі ўсіх вясковых школ-сямігодак у ШСМ, далучэння да іх па адным саўгасе з усімі пабудовамі, жывым і нежывым інвентаром, падбору аграномічных кадраў [23, 19, л. 20].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першы год у Беларусі было арганізавана 10 школ, дзве з іх былі ўтвораны з сельскагаспадарчых тэхнікумаў. Адразу выявіліся дрэнны матэрыяльны стан, недахоп спецыялістаў і інш. Таму вывад зацікаўленых інстанцый аказаўся несуцяшальным: “ШСМ ствараліся з вялікай падсобнай гаспадаркай, што накладвала вялікую нагрузку на вучня. Бюджэт школы будаваўся на гэтай гаспадарцы. Навучэнцы набіраліся з усёй акругі, што рабіла яе вельмі дарагой, не давала магчымасці падтрымліваць сувязь з бацькавай гаспадаркай. І наогул ШСМ сябе не апраўдалі, камсамол нам іх навязаў” [23, 19, л. 502].

У наступныя гады колькасць ШСМ узрасла толькі да 17, што тлумачылася іх дарагоўляй. За выключэннем дзвюх, астатнія займалі свае будынкі, амаль усе мелі майстэрні, але дрэнна абсталяваныя. Большасць з 476 навучэнцаў належалі да маламаёмных пластоў вёскі і з’яўляліся камсамольцамі. Безумоўна, ідэя стварэння такіх школ для сялянскай моладзі аказалася досыць прывабнай (аб чым сведчыць конкурс тры чалавекі на месца), бо гэта давала магчымасць атрымаць адукацыю за сямігодку і пэўныя спецыяльныя веды. Вучэбны план адводзіў на сельскагаспадарчыя навукі 5 гадзін, на грамадазнаўства – 6, матэматыку – 4, беларускую мову – 4, рускую – 4, хімію – 2, фізіку – 2, біялогію – 2, пытанні кааперацыі – 2 [8, 300, л. 39]. Таму, закончыўшы ШСМ, можна было паступіць у сельскагаспадарчы тэхнікум.

Летам 1926 г. Наркамат асветы прыняў рашэнне аб адкрыцці вячэрніх школ сялянскай моладзі, тэрмін навучання ў якіх прадугледжваўся два гады па 24 тыдні ў год, каб у выніку даць адукацыю за курс пачатковай школы. Мэтай гэтай структуры з’яўлялася падрыхтоўка больш культурнага, палітычна выхаванага селяніна. Прынцып падбору навучэнцаў быў такі ж, як і пры дзённай форме навучання, галоўныя кірункі навучання таксама такія [23, 20, л. 84]. Перашкоды, з якімі сустрэліся вячэрнія школы, не адрозніваліся навізною: усё той жа недахоп падручнікаў, педагагічных і спецыяльных кадраў, цяжкі матэрыяльны стан [14, 208, л. 64, 114].

Згодна з устаноўкай XII з’езда РКП(б), з 1923 г. пачалася агіткампанія па каапераванні сялян. Перад вясковымі паліт-асветустановамі ставілася задача “прыцягваць усю сялянскую масу да актыўнага ўдзелу ў кааператыўным будаўніцтве,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

развіваючы любую ініцыятыву сялян па калектыўным (кааператыўным) ажыццяўленні той ці іншай справы (закупка інвентару, угнаенняў, асушэнне балота і г.д.)” [14, 159, л. 67 адв.]. Органы Галоўпалітасвета распрацавалі план распаўсюджання кааператыўных ведаў. Нізавым установам прапаноўвалася арганізоўваць гутаркі на кааператыўную тэматыку. У сваю чаргу спажывецкая кааперацыя павінна была садзейнічаць арганізацыі новых хат-чытальняў і аказваць матэрыяльную і культурную дапамогу існуючым [17, 339, л. 96]. Мясцовае кіраўніцтва абмяркоўвала праблему матэрыяльнай дапамогі культасветустановам з боку кааператываў, аднак спадзяванні аказаліся нерэальнымі па прычыне вялікай слабасці кааперацыі.

На першай нарадзе загадчыкаў хат-чытальняў Мінскай акругі ў студзені 1925 г. пытанне кааператыўнай прапаганды абмяркоўвалася вельмі падрабязна. У выніку былі выпрацаваны самыя дакладныя рэкамендацыі: “...кааператыўную прапаганду пачынаць з самага важнага для сялян пытання, беручы за аснову мясцовыя факты; хатніку трэба падштурхоўваць кааператыўных работнікаў; тлумачыць сялянам выпадкі дрэннай працы мясцовага кааператыва (калі яны ёсць); паказваць станоўчыя факты: тавар у кааператыве таннейшы і лепшы, прыбытак ідзе не прыватнай асобе, а на хату-чытальню, школу, газету; паказваць усе станоўчыя прыклады ў працы калектыўных гаспадарак і г.д.” [14, 159, л. 67].

У справе кааператыўнай прапаганды хатнікам раілі выкарыстоўваць адпрацаваныя метады: ставіць інсцэніроўкі, спектаклі, праводзіць вечарыны, гутаркі, у час якіх “параўноўваць работу кааперацыі раней і цяпер, пазбягаючы лозунгаў і незразумелых слоў, арганізоўваць куткі кааперацыі” [23, 137, л. 72]. У адказ на прынятыя пастановы з месца сталі паступаць справаздачы аб правядзенні гутарак і лекцый, адкрыцці дзесяткаў куткоў, арганізацыі гурткоў і г.д. Адначасова мясцовыя ўлады прымушалі кааператывы аказваць матэрыяльную дапамогу вясковым палітасветустановам: выпісваць газеты, часопісы, купляць бібліятэкі, браць шэфства над піянерскімі арганізацыямі, хатамі-чытальнямі. Дайшло да таго, што пры кааператывах сталі стварацца культкамісіі [4, 344, л. 157; 357, с. 148]. У выніку эканамічная нарада пры СНК БССР была вымушана прыняць наступную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастанову: “Лічыць недапушчальным умяшанне адказных асоб сельсаветаў і райвыканкамаў у гаспадарча-аперацыйную дзейнасць кааператываў і накладанне на іх прымусовых абавязкаў” [10, 587, л.68].

Больш пільная ўвага кааператыўнай прапагандзе стала надавацца пасля XV з’езда ВКП(б). У цыркуляры ГПА падкрэслівалася, што калгасы ў сувязі з тым значэннем, якое ім надаюць партыя і ўрад, павінны стаць адной з асноўных баз палітыка-асветніцкай работы на вёсцы. Вясковыя ўстановы павінны былі тэрмінова заняцца поўнай ліквідацыяй непісьменнасці калгаснікаў, аказваць дапамогу чырвоным куткам у калгасах, выпісваючы на іх адрас газеты, часопісы, арганізуючы ячэйкі, у насценных газетах паведамляць аб поспехах калгаса, ажыццяўляць культурнае абслугоўванне і г.д.

У такім рэчышчы вялася ўся далейшая работа па ўкараненні на вёсцы агракультурных ведаў. Пры абмеркаванні любога пытання галоўная ўвага надавалася калгаснаму будаўніцтву. З’явілася многа інструкцый, у іх ліку “Інструкцыя па правядзенні абгаворвання пытання аб павышэнні ўраджайнасці”, у якой быў раздзел “Ураджайнасць індывідуальных гаспадарак і выгаднасць калектыўных” [8, 471, л. 47].

Аднак, як паказваюць дакументы, ход кааператыўнай прапаганды таксама адлюстроўваў неадпаведнасць паміж заклікамі, пастановамі партыйных органаў і вынікам работы на месцах. Мінская акруговая нарада работнікаў асветы ў пачатку 1928 г. адзначала, што палітасветустановы не прыступілі да выканання рашэння XV з’езда партыі ў галіне кааперацыі. Была прынята чарговая рэзалюцыя аб уліку каапераванага насельніцтва з характарыстыкай яго сацыяльнай праслойкі, дапамозе беднаце ў справе кааперацыі, выкрыцці спроб кулацтва стварыць ілжэкааператывы, аб арганізацыі справаздач мясцовых кааператываў і іншых пытаннях [41, 587, л. 68].

Падводзячы вынік, адзначым, што ў 1921–1923 гг. былі зроблены толькі першыя крокі ў кірунку агракультурнага асветніцтва. Прычым перавага аддавалася масавым мерапрыемствам: выставам, агітцягнікам і іншым, якія характарызаваліся кароткатэрміновасцю, значнай колькасцю выканаўцаў і адсутнасцю патрабаванняў да агульнаадукацыйнага ўзроўню ўдзельнікаў. Арганізаваць планамерную сістэму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аграрнага асветніцтва дзяржава не змагла па прычыне адсутнасці матэрыяльных сродкаў і неабходных кадраў.

Бясспрэчна, сельскагаспадарчае асветніцтва заслужана карысталася павагай сялянства, таму што гэта было ім блізка, гэта было іх жыццём. Многія разумелі неабходнасць пашырэння сельскагаспадарчых і агульных ведаў для таго, каб весці сваю гаспадарку больш культурна і прыбыткова. Толькі з 1924 г. савецкая ўлада прыступіла да стварэння сістэмы агракультурнай асветы. Яна складалася з сельскагаспадарчых гурткоў, курсаў, масавага свята Дзень ураджаю з выставамі сельскагаспадарчых дасягненняў. Важнейшая роля ў пашырэнні агранамічных, заатэхнічных ведаў сярод вяскоўцаў адводзілася школам дарослых сялян і школам сялянскай моладзі. Аднак дзяржава не змагла аказаць ім належнай дапамогі з прычыны матэрыяльнай і кадравай слабасці, надання галоўнага значэння кааператыўнай прапагандзе.

## 2. 6. Інфармацыйнае забеспячэнне дзяржаўнай палітыкі

Не выклікае сумнення, што палітыка любой дзяржавы мае патрэбу ў грунтоўнай інфармацыйнай падтрымцы, якая ў кожным храналагічным прамежку мае свае адметныя рысы. З паскарэннем тэмпаў грамадскага развіцця пашыраецца і інфармацыйная плынь, павялічваецца колькасць людзей, занятых апрацоўкай і распаўсюджваннем інфармацыі. Гэтая інфармацыя заклікана адлюстроўваць перш за ўсё галоўныя ідэі дзяржаўнай палітыкі. Працэсы, якія адбываліся ў вёсцы 1920-х гг., таксама патрабавалі грунтоўнай інфармацыйнай падтрымкі. У сувязі з пераходам да мірнага жыцця немагчыма было карыстацца ідэалагічнымі прыёмамі часоў Грамадзянскай вайны. Актыўна прапагандуемая новая эканамічная і культурная палітыка патрабавала ўсебаковага інфармацыйнага забеспячэння, без якога не маглі працаваць ні асобныя агітатары, ні палітасветустановы. Кіруючыя колы дзяржавы разумелі, што без шырокага распаўсюджвання друкаванага слова немагчыма дастаткова эфектыўна ўздзейнічаць на масы, праводзіць партыйную лінію. Па гэтай прычыне кіраўніцтва прымала актыўныя захады па выпуску разнастайнай палітычнай літаратуры для сялянства. Літаратура павінна была канцэнтравацца ў сельскіх бібліятэках, а часцей за ўсё ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хатах-чытальнях. Звернем увагу на гэты факт, таму што ён ілюструе імкненне дзяржавы надаць бібліятэчнай рабоце перш за ўсё палітычны характар.

Бясспрэчна, ні бібліятэчная, ні кніжная справа не магла развівацца незалежна ад дзяржавы, яна павінна была забяспечваць інфармацыйную падтрымку дзяржаўнай і партыйнай палітыкі. Ужо на лістападаўскай нарадзе палітасветаў у 1920 г. звярталася ўвага на неабходнасць папаўнення бібліятэчных каталогаў кнігамі, якія асвятляюць праграму партыі.

У 1920-я гг. у беларускай вёсцы самастойных бібліятэк не існавала. Яны ўваходзілі ў структуру палітыка-асветных установаў, а дакладней, знаходзіліся пры народных Дамах і хатах-чытальнях. Кіруючыя органы надавалі бібліятэчнай рабоце важнае значэнне і спрабавалі кіраваць ёю звыклымі метадамі інструкцый. Вось некалькі вытрымак з інструкцыі аб фарміраванні бібліятэк пры хатах-чытальнях: "1. Пры камплектаванні аддзела белетрыстыкі на першы план неабходна ставіць рускую і замежную класіку і сацыялістычную белетрыстыку. 2. Найбольш дакладны падбор кніжак неабходны пры складанні навуковага аддзела, які павінен мець усе найбольш каштоўныя экзэмпляры не толькі па даступнасці зместу, а і па сутнасці пытання, каб у далейшым чытачу не прыйшлося перавучвацца ці берагчы разумовае багацце, якое не дае яму патрэбнага базісу для працягу самаадукацыі. 3. Павінна знайсціся месца і для брашурачнай літаратуры, якая ва ўмовах перажываемага моманту будзе сувяззю глухой вёскі з жывым населеным пунктам, дзе на лекцыях, мітынгах устанаўліваецца пастаянная сувязь аўтараў са слухачамі. 4. Лубачнай літаратуры хата-чытальня мець не павінна зусім. Тых жа чытачоў, якія патрабуюць яе, кіраўнік павінен задаволіць мастацкімі творамі з больш яркай і маляўнічай фабулай" [18, 134, л. 42]. Змест цытуемага дакумента выразна ілюструе кабінетнае ўяўленне яго аўтараў аб стане справы.

У той жа час мясцовыя работнікі паведамлялі аб "немагчымасці нават скласці бібліятэку з усёй літаратуры, бо кнігі ўстарэлі", ці звярталі ўвагу на цяжкі стан бібліятэкі, якая "два гады не папаўнялася кнігамі" [18, 410, л. 7]. У якасці аўтарытэтнага сведчання выкарыстаем некалькі радкоў са справаздачы інспектараў Наркамата рабоча-сялянскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інспекцыі па выніках праверкі некаторых хат-чытальняў: «Большасць раёнаў за 1925 г. і за новы бюджэтны год (з кастрычніка 1925 г.) ніякай літаратуры не куплялі, акрамя газет і часопісаў... Ва ўсіх хатах-чытальнях ёсць бібліятэкі. Кнігі да 1923 г. выдання, толькі ў асобных ёсць новыя, якія падарылі шэфы. У Сутацкай бібліятэцы ёсць кнігі, недапушчальныя для чытання. Са 110 кніг для дзяцей 65 выдадзена да 1917 г. Сярод іх творы Л.Талстога "Не забі", "Дзе Бог, там і любоў", "Хлопчык у Хрыста на ёлцы..."» [38, 1277, л. 15]. Ідэалагічная пазіцыя аўтараў дакумента акрэслена досыць выразна, не выклікае сумнення і яе адпаведнасць партыйнай лініі. Вядома, у гэтай сітуацыі ні аб якой класіфікацыі кніг у бібліятэках пры хатах-чытальнях размова ісці не магла. Тым больш, што, напрыклад, ва ўсіх палітыка-асветных установах Міншчыны налічвалася 27 881 кніга, з іх па сельскай гаспадарцы – 4452, антырэлігійнага кірунку – 835, палітычнага – 8145, белетрыстыкі – 6623, іншых – 7826, бібліятэчак-перасовак 119 [14, 159, л. 77]. У некаторых месцах выспела ідэя стварэння бібліятэк–чытальняў пры школах, дзе павінны былі захоўвацца ўсе выпісваемыя мясцовымі ўладамі газеты, палітычная і сельскагаспадарчая літаратура.

Галоўным зместам работы палітасветустаноў былі ўдзел у прапагандзе і тлумачэнні афіцыйнай палітыкі. Без актыўнай агітацыі народных Дамоў, хат-чытальняў і бібліятэк на вёсцы не адбывалася ні адна палітычная акцыя. Напрыклад, у інструкцыі аб удзеле бібліятэк у пасяўной кампаніі 1921 г. іх супрацоўнікаў заклікалі ўзяць на сябе агітацыйна-прапагандысцкую работу. Меліся на ўвазе "мабілізацыя кніг, якія ёсць ва ўсіх бібліятэках, выдача іх для работы актывістам. З дапамогай агранома тэрмінова арганізаваць аддзелы сельскагаспадарчай і эканамічнай літаратуры. У памяшканні бібліятэк стварыць перасоўную вітрыну з літаратурай па пасяўной кампаніі, дзе рэгулярна вывешваць дэкрэты савецкай улады, газетныя артыкулы, прысвечаныя кампаніі" [50, 17, л. 109]. Цытуемы дакумент цікавы ваенна-рэвалюцыйным тонам і зместам, верай, што бібліятэкі змогуць забяспечыць поспех пасяўной.

Работнікі палітасветустаноў і бібліятэк павінны былі займацца тлумачэннем асноўных кірункаў падатковай, аграрнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітыкі, агітаваць за кааперацыю, пашырэнне засяваемай плошчы, культурную гаспадарку, перавыбары сельскіх Саветаў, калектывізацыю і многае іншае.

Бібліятэкі абслугоўвалі і культурна-асветніцкія мерапрыемствы сярод сялянства, якое больш за ўсё цікавілася аграрным асветніцтвам. Вёска хацела даведацца аб дасягненнях сельскагаспадарчай навукі, каб выкарыстаць іх і ў сваёй гаспадарцы і тым самым падняць яе прыбытковасць. У некаторых з сялян (так званых культурнікаў) былі сельскагаспадарчыя бібліятэкі. Напрыклад, у селяніна Язэпа Мароза з фальварка Фатынь, што ў Лепельскім павеце, была бібліятэка амаль у 1000 экзэмпляраў, якой карысталіся ўсе, хто жадаў. Гаспадар выпісваў спецыяльныя часопісы "Сам сабе аграном", "Пчалярская справа" і інш. [309, с. 44]. П.Бенгарт з Полаччыны меў высокаарганізаваную і прыбытковую гаспадарку, адно са сваіх памяшканняў ён аддаў пад бібліятэку сельскагаспадарчай літаратуры таварыства "Культура", сябрам якога з'яўляўся [310, с. 44].

Трэба сказаць, што існавала нават серыя "Сялянская бібліятэчка", куды ўваходзілі кніжкі па самых разнастайных пытаннях, напрыклад "Чыя вера правільная і які бог праўдзівы", "Аб насенні", "Жыта і пшаніца", "Выбар каня", "Аб пладазмене", "Як шматполле ўратавала сялянства" і многія інш. Але ўзнікла праблема з распаўсюджваннем кніг на беларускай мове, таму што вяскоўцы чытаць па-беларуску не ўмелі, ды і кніжкі друкаваліся вельмі няякасна, на што, паводле думкі спецыяліста, "уздзеянне аказваюць нявызначаныя формы беларускай мовы. Аўтары і перакладчыкі выказваюцца непісьменна, карэктары нявопытныя, кніжка праходзіць пяць карэктур. Памеры кніжак не адпавядаюць умовам вёскі" [38, 2178, л. 4 адв.].

Вялікім попытам карысталіся зборнікі п'ес для драматычных гурткоў. Асаблівым дэфіцытам з'яўляліся творы беларускіх аўтараў, таму што ў пачатку 1920-х гг. па ініцыятыве знізу пачынаецца актыўны рух сярод моладзі за вывучэнне гісторыі і культуры свайго краю. У розных месцах узнікаюць беларускія культурна-асветніцкія гурткі, асноўным зместам дзейнасці якіх сталі пастаноўкі беларускіх п'ес. Карысталіся творамі К.Каганца, Ф.Аляхновіча, Ул.Галубка. Але набыць гэтыя п'есы было амаль немагчыма, таму яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разыходзіліся ў рукапісным выглядзе. У адным з архіўных дакументаў засведчаны факт крадзяжу з кіёска “Саюздрук” у мястэчку Бачэйкава не чаго-небудзь, а трох беларускіх п’ес [43, 70, л. 47]. Дзяржвыдавецтва друкавала ў першую чаргу рэвалюцыйныя п’есы: Касоўскі “Вясёлы тэатр”, Брадзячы “П’еса для рабоча-сялянскага тэатра”, Гарэлаў “Беднякі і кулакі” і інш.

Пакуль што вядома адзіная спроба наладзіць недзяржаўнае выданне. Было гэта ў канцы 1921 – пачатку 1922 г. на Барысаўшчыне, дзе мясцовыя настаўнікі арганізавалі Беларускую навукова-культурную грамаду. Арганізацыя складалася з чатырох секцый, у тым ліку выдавецкай, якая пачала актыўна шукаць маладыя таленты і сродкі на выданне кніг. На агульным сходзе секцыі ў красавіку 1922 г. было вырашана прыцягнуць да літаратурнай працы ўсіх вядомых Грамадзе маладых беларускіх пісьменнікаў. З гэтай мэтай былі разасланы звароты наступнага зместу: «З павагай звяртаемся да Вас, каб Вы прынялі ўдзел у супрацоўніцтве з намі ў выданні часопіса-зборніка “Наш край” дасыланнем сваіх твораў, апісанняў, уражанняў аб тым, што дзеецца навокал, звычаяў, абрадаў, запісаў народных песень, легендаў, пагамонак, дыялектаў» [18, 386, л. 13].

З пошукам сродкаў таксама былі вялікія праблемы. Выдавецкая секцыя звярталася за дапамогай у розныя ўстановы. У красавіку 1922 г. звярнуліся ў выканкам, спрабуючы запэўніць, што Грамада арганізавалася “з мэтаю шырокае працы навуковага напрамку па абследаванні Бацькаўшчыны і выкарыстанні нацыянальнай культуры як сродку выхавання народных мас у камуністычным духу на роднай мове” [21, 1, л. 39]. Дзеля гэтага Грамада планавала выданне артыкулаў на палітычныя тэмы: “Як чытаць Карла Маркса на беларускай мове”, “Аб дапамозе Паволжу” і інш.

На запытанне выканкама Грамада паведаміла, што «да друку падрыхтаваны: 1. Драматычныя творы (перадрук са старых выданняў і новыя). 2. Першы выпуск двухтыднёвіка. У стадыі падрыхтоўкі знаходзяцца: работа К.Лібкнехта “Павукі і мухі” і “Зборнік папулярных артыкулаў па сельскай гаспадарцы...”» [21, 5, л. 7, 8]. Аднак выканкам адмовіў у сродках, не дапамог нават з паперай у крэдыт дзеля першага выпуску зборніка драматычных твораў. Тады кіраўніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамады звярнулася ў Наркамат асветы і папрасіла крэдыт у 500 млн. руб. на выдавецкую дзейнасць. З просьбай аб грашовай дапамозе звярталіся і ў Наркамат земляробства, абяцаючы выдаваць артыкулы па розных галінах сельскай гаспадаркі.

Пошук сродкаў ішоў і ў другім кірунку. На агульным сходзе ў сакавіку 1922 г. вырашылі сабраць грашовыя ахвяраванні па ўстановах, дзе працавалі сябры Грамады (па падпісных лістах, у рамках правядзення тыдня дапамогі беларускаму выдавецтву). І тады ж кіраўніцтва Грамады папрасіла беларускі пададдзел звярнуцца з адозвай ва ўсе беларускія культурна-навуковыя ўстановы павета аб дапамозе беларускаму выдавецтву з мэтай збору сродкаў на выданне некалькіх кніжак з драматычнымі і літаратурнымі творамі [21, 4, л. 2].

Ідэя ўзнікла не выпадкова. Як указвалася вышэй, на Барысаўшчыне ў гэты час дзейнічалі каля 10 культурна-асветніцкіх беларускіх гурткоў. Сярод іх быў аб'яўлены тыднёвік дапамогі беларускаму выдавецтву, на працягу якога прапаноўвалася збіраць ахвяраванні на выдавецтва, ставіць спектаклі на яго карысць. Напрыклад, на агульным сходзе гуртка "Вянок" было вырашана: "Дзеля пашырэння і развіцця беларускага выдавецтва кожнаму сябру ў пільным парадку заняцца зборам розных казак, песень і іншага і апрацаваны матэрыял адпраўляць у Грамаду. Лічачы мэты беларускага выдавецтва сур'ёзнымі, паслаць 2 мільёны рублёў". Раней гурток выслаў 1,5 млн. руб., аказаўшы Грамадзе значную дапамогу [18, 399, л. 22, 32]. Сябры самой Грамады таксама ставілі спектаклі на карысць выдавецтва, аднак выканкам нават не ліквідаваў 30-працэнтны падатак са спектакля, таму што "гэта ідзе ўразрэз з дэкрэтамі ўрада" [18, 400, л. 17].

З Гасцілавіцкага гуртка прыйшла дапамога ў 2 млн. 200 руб. З другіх жа гурткоў паведамлялі, што сабраць нічога не змаглі "па прычыне вялікай беднасці вёскі". Шкрабы, знятыя з дзяржаўнага забеспячэння, адмаўляліся ад дапамогі Грамадзе. Амаль ніякіх сродкаў не прынёс і кубкавы збор на карысць выдавецтва, праведзены з дазволу выканкама. Прафсаюзы таксама адмовілі ў дапамозе з прычыны цяжкага матэрыяльнага становішча [21, 5, л. 25, 28, 31].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынік быў заканамерны: ідэя арганізацыі недзяржаўнага выдавецтва аказалася нежыццёвай, таму што не ўлічвала рэальных магчымасцей культурных сіл павета. У з'яўленні такой ідэі, на наш погляд, галоўную ролю адыгралі рэвалюцыйная рамантыка, спроба выдаць жаданае за сапраўднае.

Яшчэ адзін кірунак, па якім кніга пранікала на вёску, – гэта ліквідацыя непісьменнасці. Лікпункты мелі ў асноўным па адной праграме, рэдка па дзве, буквары чырвонаармейца, буквары "Наша ніва – наша сіла", часопіс "Далоў непісьменнасць!", задачнік Масленнікава [38, 2178, л. 33]. Для батракоў выдаваўся спецыяльны лемантар, перакладзены з рускай на беларускую мову. У адозве секцыі беларускага мастацтва Інбелкульта адзначалася: «З мастацкага боку ілюстрацыі да "Лемантара" ніжэй за ўсякую крытыку. Аўтар іх не ведае прапорцый чалавечых фігур і не валодае тэхнікай малюнка. Шмат якія кампазіцыі робяць карыкатурнае ўражанне. З боку этнаграфічнай сутнасці малюнкі не маюць ніякай каштоўнасці. Тыпы і твары батракоў узяты наогул з нейкага гумарыстычнага часопіса, дзе ўкраінскія хахлы з чумацкімі вусамі перамяшаны з тыпамі Замаскварэчча. Вопратка таксама ўкраінская і руская: украінскія світка і кажух, маскоўская касаваротка, шырокія ўкраінскія штаны, маскоўскія чуні, хахлацкія шапкі» [47, 225, л. 265]. Мабыць, на такім узроўні былі і другія беларускія выданні, таму няма нічога дзіўнага ў тым, што яны не карысталіся попытам.

Звернемся да пытання аб фарміраванні бібліятэчнага фонду. Трэба адзначыць, што кіраўніцтва рэспублікі разумела вялікую ролю бібліятэк і кнігі ў палітычнай асвеце сялянства. Праўда, гаворка на гэтую тэму ішла пераважна ў форме лозунгаў і заклікаў, накшталт наступнага: «Калі сяляне на вёсцы, калі ўсе вёскі нашай рабоча-сялянскай дзяржавы стыхійна кінуць кліч "Даеш нам газету і кнігу!" і калі яны трапяць у самыя глухія куткі і будуць чытацца, а не служыць курыцельнаю папераю, тады кожны селянін у вёсцы, тады ўсе вёскі будуць удзельнічаць у будаўніцтве пралетарскай дзяржавы» [38, 2178, л. 33]. Цяжка ўявіць, каб сяляне чыталі кніжкі, якія, напрыклад, былі ў Крайскай валаснай бібліятэцы: "Почему воюют польские паны", "В поход против голода", "Английский империализм", "Крестьянство и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трудовая повинность”, “Крестьянин, держись за коммуну!”, “Барин, поп и кулак” і іншыя (усе 160 кніг мелі ярка акрэслены прапагандысцкі характар). У Зембінскай хаце-чытальні сялянам прапаноўвалі брашуры “Новая экономическая политика”, «Пуанкаре – “Война”», “Черемисы и чуваши”, “Женщины в Японии” і інш. [15, 19, л. 5, 11].

Як бачна, працэс фарміравання фондаў сельскіх бібліятэк быў падпарадкаваны перш за ўсё ідэалагічным задачам. Галоўную ролю ў ім выконвалі партыйныя органы: Аддзел прапаганды і агітацыі пры ЦК КП(б)Б і Галоўпалітасвет пры Наркамаце асветы. За адпаведнасцю бібліятэчных фондаў задачам савецкай улады сачылі пільна. У адным з актаў рэвізіі бібліятэкі пры народным Доме ў Заслаўі падкрэслівалася, што пры аглядзе фонду “выданняў сацыялістаў-рэвалюцыянераў і іншых партый не аказалася, усе кнігі палітыка-асветніцкага і навуковага характару” [17, 339, л. 14].

У 1925 г. палітасветустановы перайшлі на свой бюджэт, якім прадугледжвалася і набыццё літаратуры. На ўтрыманне народнага Дома ў год выдзялялася 575,5 руб., у тым ліку на набыццё кніг – 75 руб., на хату-чытальню адпаведна – 431,5 і 60 руб. Усім існуючым у Беларусі сеткавым (дзяржаўным) палітыка-асветным установам на пашырэнне бібліятэчных фондаў выдзялялася 20 585 руб., што складала прыкладна 0,4% бюджэту Наркамата асветы. Па звестках ГПА, патрэба ў літаратуры задавальнялася толькі на 30% [38, 2178, л. 5 адв.].

У забеспячэнні вёскі кнігай прымалі ўдзел Палітасвет ЦК ЛКСМБ і Аддзел ЦК КП(б)Б па рабоце сярод жанчын. Каб актывізаваць паступленне літаратуры на вёску, была зроблена спроба стварыць розныя фонды за кошт узносаў гарадскіх ячэек ЛКСМБ і шэфскіх камісій. Што тычыцца шэфаў, то на іх ускладваліся вялікія спадзяванні ў культурнай дапамозе вёсцы. Яны абслугоўвалі і нават за свой кошт утрымлівалі хаты-чытальні, чырвоныя куткі, выпісвалі газеты, пасылалі кнігі. Мінскія шэфскія камісіі Ляхаўскага і Кастрычніцкага раёнаў выпісвалі для вёскі некалькі дзесяткаў экзэмпляраў газет, адправілі амаль 5 тыс. кніг, забяспечылі падшэфныя хаты-чытальні ленінскімі бібліятэкамі [38, 2178, л. 78].

Дзеля таго, каб бібліятэкі працавалі і выконвалі сваю асветніцкую ролю, былі неабходны адукаваныя кадры, але іх якраз і не хапала. У рэдкіх выпадках у народных Дамах была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасада бібліятэкара, і яе займаў адукаваны чалавек. Часцей за ўсё загадчыкам быў больш-менш пісьменны партыец або камсамолец, які мог расставіць кнігі па раздзелах, выдаць іх, правесці першапачатковы кантроль. Што ж тычыцца хатнікаў, то большасць з іх былі малаадукаванымі людзьмі, якія не маглі і, можна сказаць, не надта хацелі зацікавіць чытача.

Не трэба забываць: існавалі аб'ектыўныя прычыны для такога стаўлення да работы. Лепш за ўсё пра іх сведчаць дакументы, напрыклад вытрымка з пісьма загадчыцы Лагойскай бібліятэкі, напісанага ў 1921 г. (прыводзіцца на мове арыгінала): "Служу заведующей второй год (со дня открытия). Жалования и обмундирования не получала. С просьбой о получении жалованья обращалась к высшим органам – получила отказ. Без жалованья служить при такой дороговизне невозможно. В библиотеке холодно, нет дров, а если привезут, то длинные, которых не могу пилить и колоть. В настоящее время поместили военную библиотеку 29-го полка в одном помещении с местной. Заведующий очень часто забирает ключ и уходит куда-то, почему и не могу работать. Книги на дом не даю, потому что имею приказ зав.наробраза не выдавать книги до особого распоряжения. Имеется приказ за № 2183, что все библиотеки с 15 августа 1921 г. должны перейти к обязательной классификации по Международной Брюссельской десятичной системе, а на это требуются канцелярские принадлежности, которых не получала и не имею..." [18, 193, л. 8]. На гэтае пісьмо прыкладна праз паўгода Барысаўскі павятовы камітэт палітасветы адрэагаваў наступным чынам: "...бібліятэка знаходзіцца ў самым сумным стане. З боку адміністрацыі няма ніякай дапамогі, у бібліятэцы няма стала, лаўкі, пісьмовых прылад..." [18, 193, л. 9]. Аднак палітасвет ніякай канкрэтнай дапамогі не аказаў, толькі канстатаваў факт.

Яшчэ адно яскравае сведчанне – вытрымка са справаздачы загадчыка Смалявіцкага народнага Дома ад 19 мая 1925 г.: "Становішча бібліятэкі самае хаатычнае, кнігі разарваны і састарэлі. Было кніг каля 2000, многія раздадзены без запісу, адсутнічае дастатковая колькасць добрых кніжак" [14, 164, л. 341].

Галоўпалітасвет звяртаў увагу на нездавальняльны стан бібліятэчнай справы. У адным з цыркуляраў ГПА за 1926 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаварылася: “Нашы бібліятэкі папаўняюцца непатрэбнай літаратурай, праца з чытачамі пастаўлена дрэнна. Вялікай перашкодай з’яўляюцца малакваліфікаванасць бібліятэкараў, слабы абмен вопытам” [14, 187, л. 577]. Каб выправіць становішча, прадугледжвалася згодна з выпрабаванай схемай стварэнне Цэнтральнай бібліятэчнай камісіі пры ГПА і бібліятэчных аб’яднанняў на месцах. Адначасова Галоўпалітасвет рэспублікі катэгарычна папярэджваў загадчыкаў 148 хат-чытальняў, што “яны адказваюць за захаванне літаратуры і беражлівыя адносіны да яе”. У супрацьлеглым выпадку ГПА пагражаў “прыцягненнем да судовай адказнасці” [17, 339, л. 101]. З мэтай кантролю былі распрацаваны спецыяльны фармуляр, які ўключаў больш за 50 пытанняў. Загадчыкі запаўнялі гэтыя формы як хто хацеў: адны прыводзілі лічбы ў некалькі дзесяткаў, нават соцень чытачоў, прычым у асноўным дарослага насельніцтва, што, безумоўна, малаверагодна; другія па прычыне сваёй малапісьменнасці запаўнялі фармуляры без усялякага разумення. Напрыклад, на пытанне пад нумарам 49: “Якая чытальня (галосная ці ціхая)?” – загадчык Беларуцкай бібліятэкі напісаў “сярэдняя” [17, 228, л. 43, 44].

Безумоўна, галоўная роля ў знаёмстве сялян з кнігай належала настаўнікам. У разнастайных партыйных дакументах ім ставілі ў абавязак часцей чытаць сялянам газету, падрабязна тлумачыць сэнс прачытанага, старацца так зацікавіць слухачоў, каб яны пачалі выпісваць газету. Аднак відавочна, што настаўніцтва гэтым не займалася па шматлікіх прычынах: не хапала сіл і часу нават на сваю непасрэдную справу, не было асаблівага жадання, ды і не было чаго чытаць.

Метадычныя функцыі выконвала Мінская акруговая бібліятэка імя А.С.Пушкіна. Разам з раённымі аддзяленнямі ў 1924 г. яе бібліятэчны фонд налічваў 68 тыс. кніг, 151 перасоўную бібліятэчку ў сярэднім з 80 кніг. Але, як адзначалася на нарадзе загадчыкаў народных Дамоў і раённых бібліятэк, “яны складаліся са старых брашур”. З мэтай дапамогі хатнікам было зроблена сем выездаў у раёны, ва ўсе хатычытальні было адпраўлена чатыры цыркуляры з метадычнымі ўказаннямі па бібліятэчнай рабоце, праведзена нарада з культасветработнікамі акругі. Ім было выдадзена каля 20 да-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведак па розных пытаннях бібліятэчнай работы [14, 187, л. 577].

Акрамя цэнтралізаванага забеспячэння кнігамі, ажыццяўляўся і рознічны гандаль. У гэтай справе ініцыятыва належала Беларускаму дзяржаўнаму выдавецтву і Беларускаму прадстаўніцтву агенцтва “Сувязь”. Праўда, апошняе распаўсюджвала ў асноўным газеты. Белдзяржвыдавецтва на тэрыторыі рэспублікі адчыніла 25 раённых і 11 акруговых аддзяленняў, спрабавала стварыць сетку агентаў з аграномаў, настаўнікаў, урачоў. А з хатнікамі планавалася заключыць індывідуальныя дагаворы аб распаўсюджванні літаратуры на камісійных асновах. Хаця працэнт камісійных быў даволі высокі – 12%, але хатнікі вельмі неахвотна згаджаліся падпісваць пагадненні. Наогул рэалізацыя кніг індывідуальным пакупнікам ішла вельмі слаба, таму што, як пісаў адзін з агентаў, “насельніцтва з сялян, якія да ўсяго, дзе трэба плаціць грошы, ставяцца адмоўна” [38, 2178, л. 33; 44, 269, л. 1].

Безумоўна, такую пазіцыю вяскоўцаў можна зразумець. Яны адчувалі патрэбу перш за ўсё ў практычных рэчах: у адрыўных календарах, кнігах па сельскай гаспадарцы, п’есах і спеўніках для самадзейнасці, нават падавалі заяўкі на брашуру “Самадзейны радыёпрыёмнік”, а ім прапаноўвалі зусім іншае. Напрыклад, на складзе ў г. Рагачове захоўваліся для вёскі кніжкі серый “Хата-чытальня”, “Ленінская бібліятэчка”, “Сялянская бібліятэчка”, а таксама Канстытуцыя БССР, падручнік палітграматы і інш. Прычым трэба адзначыць, што літаратура трапляла на вёску не так проста. Спіс кніг неабходна было спачатку ўдакладніць з АПА райкама партыі, а толькі потым прадаваць іх [38, 1786, л. 14].

З 1925 г. галоўную ролю ў гандлі кнігай, ці, як тады гаварылі, у прасоўванні кнігі ў сялянскую масу, пачало адыгрываць акцыянернае таварыства “Кніга – вёсцы”. Беларускае аддзяленне, створанае сумесна Дзяржвыдавецтвам і Наркаматам сувязі, пачало дзейнічаць з верасня 1925 г. У Мінску знаходзіліся цэнтральная кантора і база, якія забяспечвалі літаратурай 5 гарадскіх кіёскаў і 278 агенцтваў па ўсёй рэспубліцы [43, 306, л. 36]. Кожны агент шукаў памочнікаў сярод паштальёнаў, настаўнікаў, аграномаў, камсамольцаў, хатнікаў. У кіёсках агенцтваў прадаваліся неабходныя селяніну дробязі і кнігі па рознай тэматыцы:

Зайцаў “Важныя рашэнні партыі аб сялянскай гаспадарцы”, Нікуліхін “Палітыка партыі ў вёсцы”, Здрок “Лес і сялянская гаспадарка”, Папоў “Перасяленні на новыя землі” і шмат іншых. На складзе таварыства “Кніга – вёсцы” ў 1926 г. захоўвалася 47 назваў кніг па палітычных пытаннях, 54 па сельскай гаспадарцы, 64 партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, піянерскія і камсамольскія значкі. Шырока быў прадстаўлены раздзел мастацкай літаратуры: Арлоў “Бабскія справы”, М.Някрасаў “Смерць селяніна”, І.Тургенеў “Муму”, “Прыгонная” і інш. Усяго 52 назвы. Былі на складзе і беларускія кнігі: падручнікі Я.Лёсіка, А.Смоліча, У.Ігнатоўскага, М.Гарэцкага [43, 2, л. 49, 53].

Але, як сведчаць матэрыялы абследавання дзейнасці таварыства, найбольш папулярнымі былі мастацкая і дзіцячая літаратура, кнігі па садоўніцтве, пчалярстве, спеўнікі і календары, асабліва на рускай мове. За 1927 г. іх было прададзена на 18 тыс. руб., а на беларускай мове ўдвая менш. Палітычная і навукова-папулярная літаратура попытам не карысталася. Наогул за першы год дзейнасці таварыства прадалі кніг усяго на 26 700 руб., за другі – на 44 700 руб. Былі кіёскі, у якіх на працягу месяца ніхто не купіў ніводнай кніжкі [43, 306, л. 37].

Цікавыя звесткі ўтрымліваюцца ў статыстычнай справаздачы аб продажы кніг у сёлах Беларусі. Усяго прапаноўвалася 42 найменні кніг, аднак некаторыя з іх не карысталіся попытам, напрыклад: Юзэфовіч “Яравая пшаніца”, Халецкі “Селькор Іваноў”, Хрушчоў “Самавучыцель шыцця абутку”, “Сялянскія сельскагаспадарчыя пабудовы”. Праўда, апошняя кніжка вельмі дарагая, 1 руб. 75 кап., а астатнія танныя, па 10–12 кап. Але, мабыць, справа не толькі ў цане, таму што зусім не разышлася брашурка цаною ў 6 кап. “Як арганізаваць суд над самагоншчыкамі”. Многа кніг, якіх было прададзена па 1–3 экз. Сярод тых, якія больш-менш разышліся, наступныя: Шэфер “Параскева Пятніца”, “Пугачоў”, М.Шолахаў “Алёшкава сэрца”, Фердынандаў “Развядзенне курэй”, Д.Фурманаў “Чапаеў”. Карысталася попытам брашура Пасадава “Метрычныя меры”, але самымі папулярнымі былі творы Дз.Беднага [43, 300, л. 365, 376], калі меркаваць па колькасці прададзеных экзэмпляраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На падставе гэтых даных напрошваецца выснова, што некаторых кніжак сяляне купіць не маглі з-за іх цаны, другіх купляць не хацелі, таму што не задавальнялі не толькі змест, а мабыць, яшчэ і якасць. Зацікаўленыя арганізацыі актыўна абмяркоўвалі праблему выдання больш таннай папулярнай дзіцячай, сялянскай літаратуры з каляровымі вокладкамі, малюнкамі. Ставілася пытанне аб перакладзе кніг з рускай на беларускую мову, таму што з развіццём працэсу беларусізацыі попыт на беларускамоўную літаратуру павялічваўся. На патрэбы вёскі павінны былі працаваць некалькі выдавецтваў, таму што адно ўжо не спраўлялася.

У другой палове 1920-х гг. пачалі практыкавацца папярэднія заяўкі на кнігі, якія выконваліся на працягу 2–10 дзён, што дазваляла не трымаць у кіёсках дарагіх кніг. Нізавому звяну ўвесь час нагадвалася аб рэкламе і падборы кніг, аб вывучэнні попыту насельніцтва і рэгулярных справаздачах аб сваіх назіраннях у Цэнтр. Шырока практыкаваліся гандаль у базарныя дні, правядзенне розных кампаній, напрыклад “каляндарных”. Міністэрства фінансаў нават вызваліла таварыства як культурна-асветніцкую, а не камерцыйную арганізацыю ад падатку за гандаль спадарожнымі таварамі.

Нельга абысці пытання распаўсюджвання газет, таму што яны, як і кнігі, а мабыць яшчэ больш чым кнігі, выконвалі важныя палітычныя і асветніцкія задачы. У рэспубліцы ў першай палове 1920-х гг. выходзілі 9 газет: 2 на рускай, 3 на беларускай, 2 на польскай і 2 на яўрэйскай мовах. У тагачасных газетах друкавалася шмат карысных для вёскі матэрыялаў: аб навуковых метадах вядзення гаспадаркі, новых культурах, асноўных кірунках савецкай палітыкі, каапераціі, меліярацыі і інш. Выдаваўся спецыяльны сельскагаспадарчы часопіс “Плуг”.

Аднак на больш чым 3,5 млн. жыхароў у 1924 г. вёска атрымлівала ўсяго 18 500 экзэмпляраў газет, з іх па падпісцы 1654 экзэмпляры [23, 11, л. 65]. Таму, на наш погляд, гаварыць аб дастатковым інфармацыйным забеспячэнні дзяржаўнай палітыкі на вёсцы няма сур’ёзных падстаў. Улічваючы сітуацыю, Бюро ЦК КП(б)Б у лютым 1925 г. звярнула ўвагу на неабходнасць “паставіць на належную вышыню распаўсюджванне газет і папулярызацыю кнігі на вёсцы” [22, 6, л. 53]. XIII з’езд РКП(б) абвясціў лозунг “На 10

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

двароў – 1 газета”, але ў Беларусі ён быў выкананы толькі на адну трэць: на 34 гаспадаркі – 1 газета. Распаўсюджваліся газеты праз сельскіх карэспандэнтаў. У пачатку 1925 г. гэтай справай займаліся да 80 чалавек. За работу яны атрымлівалі адзін экзэмпляр і 10% ад выручкі пры наяўнасці 10 падпісчыкаў. Шырока практыкавалася калектыўная выпіска газет. Напрыклад, у тым жа 1925 г. калектыўна выпісваліся 5482 экзэмпляры, а індывідуальна – 1812 [38, 1786, л. 7].

Трэба адзначыць, што палітасветустановы забяспечваліся газетамі і часопісамі цэнтралізавана, праз вышэйшыя арганізацыі. Напрыклад, для ўсіх хат-чытальняў і народных Дамоў з 1 лютага 1925 г. выпісваліся часопісы “Деревенский театр” і “Деревенский самоучитель”. Мінскі акруговы палітасвет спадзяваўся, што 151 часопіс будзе выкарыстаны для “арганізацыі гурткоў самаадукацыі і наладжвання здаровага і карыснага адпачынку бядняцкіх і серадняцкіх мас”. Праз некаторы час ужо акруговая бібліятэка паслала запыты аб якасці часопіса “Деревенский театр” і неабходнасці далейшай падпіскі на яго, адначасова паведамляючы, што выпісала для хат-чытальняў часопіс “Изба-читальня”. Самым забяспечаным быў Койданаўскі народны Дом (мабыць, улічвалася яго прыгранічнае становішча); іншыя раённыя палітасветустановы атрымлівалі выданні перыядычнага друку ў значна меншых памерах. Калі ў Койданаве ў наяўнасці было 11 відаў газет і часопісаў, то ў Лагойску 4. Яшчэ горшыя былі справы ў хатах-чытальнях: некаторыя з іх атрымлівалі толькі 1 экзэмпляр, у асноўным газету “Бедната”, распаўсюджаны былі таксама “Советская Белоруссия” і “Звязда”[14, 159, л. 74].

Досыць адметная рыса палітыка-асветніцкага жыцця вёскі – насценныя газеты, першыя з якіх з’явіліся ў Беларусі летам 1921 г. Яны выпускаліся ў некаторых камунах, а таксама актывістамі хат-чытальняў. Існавалі валасныя і нават вясковыя газеты [123, с. 118–120]. Актыўную ролю ў выпуску насценных газет выконвалі камсамольцы, аб чым сведчаць назвы газет: “Камсамольскі факел”, “Малады араты” і інш. Справа настолькі захапляла, што на канферэнцыі загадчыкаў хат-чытальняў у маі 1924 г. было вырашана “выпускаць насценную газету раз у 2 тыдні, а перад спектаклем вусную” [29, 927, л. 50 адв.]. Працэс развіваўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

досыць актыўна: напрыклад, за апошні квартал 1926 г. было выпушчана больш за тысячу насценных газет, у рэспубліцы працавалі 1755 селькораў [23, 137, л. 166]. Безумоўна, гэта была новая з'ява, невядомая, нават цікавая. Яна прывяла да ўзнікнення селькораўскага руху. Аднак нельга не ўлічваць другога боку гэтай з'явы: насценныя газеты сваімі выкрывальнымі матэрыяламі яшчэ больш абвастралі сацыяльна-псіхалагічную напружанасць у вёсцы, аб чым сведчаць працэсы селькораў сярэдзіны 20-х гг. і выпадкі забойства аўтараў допісаў.

Здавалася, рабілася ўсё магчымае і немагчымае дзеля таго, каб кніга, а з ёю і асвета прыйшлі ў вёску. Аднак ні эканамічныя, ні сацыяльна-псіхалагічныя абставіны не спрыялі таму, каб бібліятэка і кніга занялі належнае месца ў культурным жыцці вёскі. Мабыць, галоўным было тое, што савецкая ўлада вырашыла выхаваць вёску ў новым, савецкім кірунку. Замест развіцця асветы ў рэчышчы агульначалавечых, гуманістычных, хрысціянскіх традыцый пачалі насаджацца ідэі класавай барацьбы, вернасці партыі, савецкай уладзе. Таму вёску захліснула хваля нізкаякаснай, прымітыўнай літаратуры. Прычым адсутнічалі нават самыя элементарныя ўмовы для яе прапаганды, нягледзячы на шматлікія рашэнні вышэйшых органаў.

Важнымі прычынамі з'яўляліся адсутнасць кваліфікаваных кадраў, уменняў і жаданняў развіваць бібліятэчную справу. Не спрыяла пашырэнню кнігі сацыяльна-эканамічнае становішча вёскі, таму што якраз у гэты час вырашаліся жыццёва важныя для сялянства пытанні, адказу на якія не маглі даць ні палітасветустановы, ні кнігі, ні тыя, хто іх распаўсюджваў. Патрэбен быў час, каб сістэма палітычнага асветніцтва, у якой адна з галоўных роляў адводзілася бібліятэкам, пачала дзейнічаць.

З сярэдзіны 1920-х гг. Савецкая дзяржава стала карыстацца больш эфектыўнымі сродкамі масавай інфармацыі – радыё і кіно. Дзякуючы зрокавай і слыхавой даступнасці, яны маглі досыць актыўна ўздзейнічаць на малапісьменнае сялянства. Безумоўна, дзейнасць новых сродкаў інфармацыі адразу ж аказалася пад кантролем партыйных і савецкіх органаў і падпарадкоўвалася перш за ўсё выкананню ідэалагічных задач. Аб гэтым сведчыць, між іншым, абмеркаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытання кінематаграфічнай справы на пасяджэннях Бюро ЦК КП(б)Б і Галоўпалітасвета. Важнасць кіна- і радыёсправы, неабходнасць іх цеснай сувязі з усёй сістэмай палітасветработы падкрэсліваліся на Першым з'ездзе хатнікаў. У яго рэзалюцыі гаварылася: "...Вакол карціны павінна разгортвацца актыўная тлумачальная работа. Папярэдняя гутарка павінна праводзіцца праз галоснае чытанне надпісаў, тлумачэнне іх, заўвагі па сэнсе фільма. Пасля кіно гутарка павінна адбывацца на аснове матэрыялаў карціны і сувязі са з'явамі мясцовага жыцця..." [22, 136, л. 243].

На аснове архіўных звестак можна зазначыць, што развіццё кінасправы ў вёсцы пачалося з 1925 г. пасля набыцця па адной кінаперасоўкі на акругу. У гэтым жа годзе пачала дзейнічаць арганізацыя "Кіно – вёсцы". Першапачаткова па вёсках дэманстраваліся выпадковыя стужкі, якія былі ў наяўнасці, ад "Савецкія лекі" да "Збору ананасаў". Аднак з развіццём кінасправы на вёсцы з'явіліся новыя карціны: "Барацьба з засухай", "Жонка старшыні рэўкама", "Дарога да шчасця", "Усім на радасць" (аб каапераціі), "Вораг народа" (аб шкоднасці самагону) і інш.

З 1926 г. пачынаецца актыўная ідэалагічная прапаганда з выкарыстаннем 25 кінаперасовак. У наступныя гады іх колькасць хутка ўзрастала. З вясковых камуністаў і камсамольцаў на адпаведных курсах рыхтаваліся кадры кінамеханікаў. Гэты факт адлюстроўвае вялікае значэнне, якое ўлада надавала агітацыі і прапагандзе сродкамі кіно. Каб трымаць пад кантролем працэс, які толькі набіраў сілу, вясковыя кінамеханікі абавязваліся даваць справаздачы па кожным сеансе. Яны дапаўняліся заключэннем мясцовага настаўніка або палітасветработніка.

У 1927 г. у рэспубліцы дэманстравалася больш за 100 кінастужак, сярод іх «Браняносец "Пацёмкін"», "Як Пятунька ездзіў да Ільіча", "Хто каго", "Агні Кітая" і інш. Нельга не пагаджацца з тым, што для сялян кожны сеанс атаясамліваўся з цудам, якога яны не толькі ніколі не бачылі, але аб якім і не чулі. Паглядзець кіно сыходзіліся цэлымі вёскамі. Напрыклад, у лістападзе 1926 г. больш за 300 чалавек у адной з вёсак Шацкага раёна пад адкрытым небам сабраліся на прагляд карціны "Сігнал". Кінамеханік паведамляў: "Сеанс прайшоў добра. Усе былі зацікаўлены, бо першы раз бачылі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кіно”. Настаўнік дадаваў: “Карціна прайшла цудоўна. Зацікаўленасць сялян неймаверная...” [14, 208, л. 58]. Між тым у некаторых справаздачах можна знайсці нараканні на карціну “Павук і муха”, якую кінамеханік ахарактарызаваў так: “Нецікавая карціна. Сеанс прайшоў кепска”. Аб гэтай стужцы загадчык народнага Дома з мястэчка Шацк напісаў: “Карціна нікуды не вартая. За што плаціць грошы?” Настаўнік звяртаў увагу “на неабходнасць для вёскі больш рэвалюцыйных і сельскагаспадарчых карцін” [14, 208, л. 54, 55].

Неабходна адзначыць, што і ў кінасправе карысталіся класавым прынцыпам. Напрыклад, у Смалявіцкім раёне вызваляліся ад платы вучні, батракі і бедната пры прад’яўленні імі даведак Камітэта сялянскай узаемадапамогі. На карашках білетаў адзначаліся нумары членскіх білетаў батракоў і пасведчанняў беднаты [14, 208, л. 209].

Безумоўна, кіно мела вялікае значэнне ва ўздзеянні на псіхіку сялянства, ствараючы ілюзію цуда, існавання побач, недалёка ад роднай вёскі, другога жыцця, больш культурнага, багатага і лёгкага. Фарміраваліся ўстойлівыя ўяўленні аб тым, што справа ідзе цяжка і не так, як хацелася б, толькі ў блізкім наваколлі. А ўсюды быццам бы віруе больш цікавае жыццё, якім кіруюць адукаваныя, таленавітыя, рашучыя асобы. На наш погляд, праблема ўплыву кіно на псіхалагічную атмасферу вёскі патрабуе больш дэталёвага даследавання ў рамках псіхагісторыі.

Аднак неабходна прызнаць некаторую абмежаванасць магчымасцей кінасправы першых гадоў яе развіцця. Яна была абумоўлена матэрыяльнай слабасцю дзяржавы, якая не магла задаволіць патрэбы вёскі ў кінаперасоўках, кінастужках, кадрах кінамеханікаў. Нават у 1927 г. існавалі раёны (напрыклад, Бягомльскі), у якіх не дзейнічала кінаперасоўка, у другіх (напрыклад, у Лепельскім) не хапала кінамеханікаў [24, 1341, л. 25]. Згодна са справаздачамі за 1926 г. 25 кінаперасовак правялі больш тысячы сеансаў, якія наведалі амаль 272 тыс. чалавек [23, 50, л. 228], што складала нязначную частку сельскага насельніцтва. На сярэдзіну 1927 г. кіно паглядзелі каля мільёна вяскоўцаў [23, 20, л. 38].

Непараўнальна большыя магчымасці для ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва давала радыё, інфармацыя якога аказвалася аператыўнай і ўсёпранікальнай. Не выпадкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіраўніцтва Кампартыі Беларусі звяртала ўвагу на пашырэнне радыё і кіно на вёсцы, аб чым сведчыць пастанова ЦК КП(б)Б ад 11 лістапада 1927 г. [272, с. 457]. Аднак матэрыяльныя магчымасці рэспублікі не дазвалялі наладзіць шырокага радыёвяшчання. Распаўсюджванне радыё, як і кіно, пачалося больш-менш прыметна з 1926 г., калі трэць вясковых палітасветустаноў набыла гучнагаварыцелі і дэтэктарныя прыёмнікі. ЦК КП(б)Б канстатаваў, што "радыё ў асноўным устанаўліваецца за кошт грамадскасці" [23, 137, л. 166]. Каб устанавіць радыё, трэба было 300 руб., райвыканкамы не маглі выдзеліць такой сумы, а сярод насельніцтва сабраць яе аказалася досыць складана. У некаторых вёсках Магілёўшчыны на агульных сходах сяляне прымалі рашэнне аб самаабкладанні на карысць радыё [23, 136, л.678].

Падводзячы вынікі, неабходна зазначыць: інфармацыйнае забеспячэнне дзяржаўнай палітыкі на вёсцы не зусім адпавядала пастаўленым перад ім задачам. Сістэма інфармацыі перш за ўсё пакутавала ад недахопу сродкаў і кадраў, тым больш што аб'ектам дзейнасці з'яўлялася малаадукаванае вясковае насельніцтва. Нягледзячы на з'яўленне розных арганізацый, якія займаліся прасоўваннем на вёску кніг, кіно і радыё, на распрацоўку афіцыйных дакументаў, што надавалі важнае значэнне актывізацыі інфармацыйнай дзейнасці, яе збліжэнню з палітыка-асветніцкай работай, вёска, па словах наркама асветы А.Баліцкага, "у большасці жыве яшчэ чуткамі, часам вельмі фантастычнымі, жыве ў цемры" [88, с. 2].

Падзяляючы погляд наркама, мы лічым, што ў сялянскім асяроддзі 1920-х гг. чуткі з'яўляліся адной з галоўных крыніц задавальнення патрэбы ў інфармацыі, спробай растлумачыць незразумелую сітуацыю, атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні, тым больш, што падстаў для ўзнікнення чутак у тагачасным жыцці існавала шмат, ад сацыяльна-эканамічных да інфармацыйных.

Нязначныя інфармацыйныя магчымасці і непісьменнасць насельніцтва, характэрныя для 1920-х гг., сталі самай спрыяльнай глебай для ўзнікнення чутак. Дзяржаўныя дакументы на месцах тлумачылі хто як мог і хацеў і, самае галоўнае, праводзілі ў жыццё такімі ж сродкамі. Малаадукаванае мясцовае кіраўніцтва не заўсёды аказвалася на вышыні дзяржаўных задач, тое ж можна сказаць і аб сельскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

партыйцах. Непісьмсная вёска не магла задаволіць сваёй патрэбы ў інфармацыі праз перыядычны друк, выданні якога ў нязначнай колькасці распаўсюджваліся праз афіцыйныя палітыка-асветныя ўстановы. Трапляючы ў хаты-чытальні ці сельсаветы, вельмі рэдка газета ішла ў масы. Шматлікія лістоўкі, плакаты толькі заклікалі сялянства да выканання чарговага задання партыі і ўрада. Разнастайныя мітынгі, даклады і кампаніі дэманстравалі адсутнасць канкрэтнай інфармацыі. Літаратуру ў выглядзс брашур, кніг сялянства купляла мала, бо знешне яны былі малапрывабнымі і змест іх заставаўся незразумелым. Радыё і кіно толькі пачыналі сваё пранікненне ў вёску.

У 1921–1927 гг. былі вызначаны і прайшлі выпрабаванні на практыцы як структура, так формы і метады палітыка-асветніцкай работы. Распрацоўкай яе важнейшых кірункаў і задач на працягу многіх гадоў займаліся самыя вядомыя дзеячы Камуністычнай партыі. У якасці галоўнай мэты палітасветработы была вызначана неабходнасць далучэння шырокіх колаў дарослага насельніцтва да партыйнай ідэалогіі, выхавання яго ў рэчышчы савецкага патрыятызму. Дзеля дасягнення названай мэты стваралася і пастаянна ўдасканальвалася сістэма палітыка-асветных устаноў як у горадзе, так і ў вёсцы, падбіраліся адпаведныя кадры, формы і метады работы. У межах культурнай рэвалюцыі насаджаліся новыя ідэі і маральныя прынцыпы, прывіваліся новыя этыка і эстэтыка, прычым гэта рабілі людзі, зусім неадпаведныя ідэалу асветніка. У водаварот новай культуры была ўцягнута значная частка сялянства, асабліва моладзі, што садзейнічала расколу вёскі не толькі па эканамічнай, але па ідэалагічнай і ўзроставай прыметах. Лініі расколу не заўсёды супадалі, а ў многіх выпадках праходзілі праз асобныя сем'і, ускладняючы яшчэ больш унутрывясковую сітуацыю. Шумныя прапагандысцкія кампаніі, агітацыйная мітынгоўшчына не апраўдвалі ўскладзеных на іх спадзяванняў, бо праводзіліся няўмела, назойліва, ігнаруючы эканамічныя магчымасці і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці сялянства.

Арыентацыя дзяржавы на палітычнае асветніцтва рэзка змяніла духоўную атмасферу вёскі, яе характэрнай рысай стала суіснаванне этнічнай культуры сялянства і новай савецкай культуры. Народная культура замкнулася ў сваім развіцці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і нязменных формах, новая культура набыла значэнне дзяржаўнай і адпаведную падтрымку.

Немалаважнае значэнне для вёскі набываў працэс фарміравання нацыянальнай культуры і цесна звязаны з ім працэс пашырэння нацыянальнай самасвядомасці. Важнейшае значэнне ў гэтым сэнсе набывала дзейнасць вясковай інтэлігенцыі.

На ліквідацыю аграрнай непісьменнасці вяскоўцаў было скіравана афіцыйнае агракультурнае асветніцтва. Аднак, не маючы магчымасці скарыстаць папярэдні вопыт, адчуваючы абмежаванасць у сродках і спецыяльных кадрах, савецкая ўлада не змагла ў 1920-я гг. наладзіць эфектыўную сістэму сельскагаспадарчай асветы.

Па тых жа прычынах інфармацыйнае забеспячэнне ўсіх кірункаў дзяржаўнай культурнай палітыкі не адпавядала пастаўленым задачам.

# Глава 3
# УСПРЫМАННЕ ВЁСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

## 3. 1. Рэакцыя сялянства на падатковую палітыку дзяржавы першых гадоў нэпа

Без аналізу адносін сялянства да сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкі дзяржавы немагчыма ўявіць усю складанасць і шматграннасць працэсаў, якія адбываліся ў вёсцы і ўплывалі на яе сацыяльна-псіхалагічную атмасферу. На наш погляд, ігнараванне настрою сялянства ў значнай ступені садзейнічала неэфектыўнасці многіх дзяржаўных мерапрыемстваў. Праўда, кіраўніцтва краіны пры тэарэтычнай распрацоўцы галоўных кірункаў сваёй палітыкі звяртала ўвагу на рэакцыю вёскі, да чаго заклікаліся і мясцовыя ўлады. Не выпадкова ў 1927 г. на Першым з’ездзе хатнікаў – непасрэдных выканаўцаў партыйных і ўрадавых дырэктыў – былі прыняты тэзісы “Улік настрою і запытанняў насельніцтва вёскі”. У іх адзначалася: “Праца па вывучэнні масы, яе настрою зусім закінута. Палітасветы на вёсцы павінны прадбачыць настрой насельніцтва. Асабліва павінен быць улік узнікаючых незадавальненняў, неразумення таго ці іншага мерапрыемства савецкай улады” [23, 148, л. 9]. Аднак паміж афіцыйнымі пастановамі і іх ажыццяўленнем існавала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неадольная дыстанцыя, што, на наш погляд, дастаткова пераканаўча даказала ўся гісторыя савецкага грамадства.

У працах гісторыкаў партыі, даследчыкаў, якія працуюць на памежжы гісторыі і сацыяльнай псіхалогіі, разглядаліся тэарэтычныя погляды У.І.Леніна на псіхалагічныя аспекты некаторых гістарычных сітуацый. Кіраўнік партыі і ўрада разумеў немагчымасць правільнай ацэнкі перспектыў рэвалюцыйнай дзейнасці без усебаковага аналізу існуючай сітуацыі. Гэта давала магчымасць найбольш эфектыўнага прыстасавання партыйных ідэй да паўсядзённых патрэб. Тэарэтычныя адкрыцці У.І.Леніна склалі аснову многіх партыйных дакументаў, а для навукоўцаў сталі метадалагічнай базай даследаванняў. Можна заўважыць, што на з’ездах КП(б)Б ад IV да XI, якія адбыліся ў разглядаемы перыяд, і на большасці пленумаў ЦК КП(б)Б у той ці іншай ступені закраналіся пытанні сацыяльна-псіхалагічнага настрою вёскі.

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, заканчэння Грамадзянскай вайны ў аснову палітыкі партыі ў адносінах да вёскі была пакладзена ідэя перабудовы псіхалогіі дробных уласнікаў. Разглядаючы псіхалогію мас з пункту гледжання рэвалюцыянера і ў імя рэвалюцыі, У.І.Ленін не мог не заўважаць незадаволенасці большай часткі сялянства харчразвёрсткай, што праявілася ў значным антысавецкім настроі вёскі. Вынікам рэальнай ацэнкі сітуацыі стала новая эканамічная палітыка.

Нельга не зазначыць, што праблему адносін вясковага насельніцтва да савецкай аграрнай і культурнай палітыкі не абмiналі даследчыкі ранейшых часоў. Аднак згодна з тагачаснай метадалогіяй усе сацыяльныя з’явы разглядаліся праз прызму класавага падыходу. У сялянах бачылі не людзей з нармальнымі чалавечымі пачуццямі ўласнай годнасці, незадаволенасці дыктатам і неразумнай з іх пункту гледжання палітыкай, а беднякоў, сераднякоў і кулакоў. Такі сацыяльна-класавы падзел вёскі спрыяў пошукам галоўнага тормаза ў буксуючай дзяржаўнай палітыцы. Тым не менш прыведзеныя ў даследаваннях савецкага часу факты, лічбы і цытуемыя дакументы досыць яскрава адлюстроўваюць сацыяльна-псіхалагічны настрой вёскі. З пазіцыі сучаснай навуковай думкі яго можна ахарактарызаваць як нездавальняльны, аднак савецкія навукоўцы выкарыстоўвалі факталагічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыял толькі для ілюстрацыі класавага расколу і барацьбы на вёсцы.

Самай галоўнай і праўдзівай крыніцай пры вывучэнні сацыяльна-псіхалагічнага настрою вёскі з'яўляюцца шматлікія архіўныя дакументы. Асабліва неабходна выдзеліць фонды мясцовых органаў улады, дзе выяўлена мноства звестак па пытанні, якое нас цікавіць. Сур'ёзную крыніцу ўяўляюць справаздачы загадчыкаў народных Дамоў і хатчытальняў. Як адзначалася раней, яны павінны былі запаўняць спецыяльныя справаздачныя анкеты з вялікім мноствам падрабязных пытанняў, першым з якіх стаяла пытанне аб палітычным настроі вёскі. Безумоўна, кожны хатнік запаўняў анкету паводле свайго разумення, аднак у цэлым уяўленне складваецца пераканаўчае.

Найсур'ёзнейшай праблемай, з якой ушчыльную сутыкнулася вёска пасля заканчэння Грамадзянскай вайны, стала харчразвёрстка. Актыўнаму націску дзяржаўных органаў сялянства проціпаставіла ўхіленне ад яе выканання самымі рознымі сродкамі. Да гэтай тактыкі далучалася мясцовае кіраўніцтва, "старшыні валвыканкамаў у сваёй большасці не садзейнічалі нармальнаму ходу развёрсткі, нават замінал ёй" [30, 49, л. 11; 5, 7, л. 48]. Паведамлялася аб патрабаваннях солі ў абмен на хлеб, аднак солі не было, і людзі хваляваліся. Адны начальнікі бачылі ў гэтым толькі "псіхалогію вяскоўцаў як дробных уласнікаў", другія нават асцерагаліся паўстання [30, 48, л. 2; 30, 49, л. 10].

На Ігуменшчыне, у Пеpажырскай воласці, адбыўся дастаткова паказальны выпадак. (Ці сустракаліся падобныя з'явы ў другіх месцах, высветліць не ўдалося.) "Пеpажырская справа" пачала развівацца ў студзені 1921 г. па ініцыятыве ўпаўнаважанага па гэтай воласці А.Клейнберга. Ён напісаў дакладную на імя наркама харчавання, у якой паведамляў: "Калі агенты прыступалі да спагнання развёрсткі ў вёсках, дзе размяшчаліся кубанскія часці, то яны адкрыта выступалі і агітавалі супраць выканання развёрсткі. На агульных сходах грамадзян кубанцы, пераапрануўшыся ў цывільнае адзенне і выдаючы сябе за сялян, заяўлялі, што развёрстка ў іх вёсцы выканана быць не можа, лішняга хлеба няма... У вёсцы Пеpажыр нават быў арыштаваны харчагент, а сабраныя 50 пудоў жыта па прапанове палітрука былі раздадзены



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыхарам сяла... Ваенкам палка заявіў, што ўсё робіцца з яго ведама і што ён і яго чырвонаармейцы ніякім чынам не дапусцяць, каб адбіралі апошняе. Сялянам патрэбна пакідаць хлеб па норме, інакш яны будуць супрацьдзейнічаць выкананню развёрсткі... Даведаўшыся, што развёрстка выконваецца якой-небудзь вёскай, конныя кубанцы едуць туды кантраляваць агентаў і ратаваць сялян. Вяскоўцы, якія выканалі развёрстку, даведаўшыся пра гэткія падзеі, патрабуюць звароту хлеба...” [30, 71, л. 47, 47 адв.].

Дзеянні кубанцаў дастаткова паказальныя ў сэнсе незадаволенасці харчразвёрсткай. Справа не толькі ў іх непасрэднай матэрыяльнай зацікаўленасці, а мабыць, яшчэ і ў тым, што казакі – учарашнія хлебаробы – не маглі спакойна глядзець, як да апошняга рабуюць вёску. Не выпадкова яны раздавалі адабранае збожжа, арыштоўвалі харчагентаў.

Улады вымушаныя былі ў некаторай меры ўлічваць усеагульную незадаволенасць вёскі і не маглі ісці на далейшае абвастрэнне сітуацыі. У гэтым сэнсе характэрна тэлеграма, накіраваная ў Мазырскі павет наркамам земляробства А.С.Славінскім: «Слова “развёрстка” пужае сялян, будзьце асцярожныя з выказваннямі» [50, 13, л. 52].

Настрой вясковага люду вельмі добра адлюстраваны ў невялічкім пісьме селяніна вёскі Рэчань Любанскай воласці ў войска свайму сыну ці сваяку: “Жывецца нам цяпер вельмі дрэнна, кожны дзень ганяюць у падводы вазіць сена, жыта, авёс, ячмень... Вялікую рэквізіцыю ніяк нельга выканаць, таму што кожны дзень бяруць і цягнуць... Мы не ведаем, што з гэтага будзе. Як сонныя. Не ведаем, што рабіць” [30, 17, л. 261 адв.].

Вытрымка з прыватнай запіскі інструктара палітаддзела НКЗ Яроміна, які быў накіраваны спачатку ў Слуцкі, а потым у Мазырскі паветы, – яшчэ адзін выразны прыклад ілюстрацыі настрою вёскі. Ён вельмі актыўна стараўся праводзіць дзяржаўную лінію, амаль што ў кожнай вёсцы выступаў з дакладамі аб стане і задачах сельскай гаспадаркі. У афіцыйных паведамленнях піша аб добразычлівых адносінах сялян, а ў прыватнай запісцы ад 27 снежня 1920 г. канстатуе: “Псіхалогія сялян у адносінах да савецкай улады абыякавая, адчуваецца страшэнная нянавісць да армейскіх харчовых брыгад, таксама сялянам не падабаецца пазіцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносна камун. Наогул матэрыяльны стан як сялян, так і саўгасаў незайздросны, асабліва ўся развёрстка хлеба, падводы, пастой арміі ў вёсках, пажары пасля палякаў. Уся гэтая карціна надае змучаны выгляд сялянству” [32, 39, л. 46].

Выкананню развёрсткі перашкаджала і ўзброенае супраціўленне, асабліва на Мазыршчыне і Бабруйшчыне, а мясцовыя ўлады не мелі сілы для таго, каб справіцца з ім. Вядома, у Беларусі не было з’яў, аналагічных сялянскім выступленням на Тамбоўшчыне, аднак паўсюдная незадаволенасць вясковага люду харчразвёрсткай і метадамі яе выканання таксама садзейнічала прыняццю рашэння аб яе адмене.

Савецкая ўлада праводзіла мерапрыемствы, якія дэманстравалі перш за ўсё недавер да творчай ініцыятывы селяніна, яго зацікаўленасці ў справе, нявер’е ў талент прадбачання земляроба. Адной з такіх непатрэбных і незразумелых з’яў стала арганізацыя пасяўных камітэтаў дзеля дапамогі ў аднаўленні і ўмацаванні сялянскай гаспадаркі. Ідэя аказалася нежыццёвай ужо з самага пачатку. Інакш быць не магло, таму што вёска выконвала развёрстку, утрымлівала за свой кошт ваенныя часці, а тут яшчэ трэба было ствараць новыя камітэты. Дакументы паказваюць нежаданне мясцовых улад удзяляць увагу нікому не патрэбнай справе. Атрымлівалася так, што людзі, якія ніколі не займаліся земляробствам, больш дбалі пра яго развіццё, чым спрадвечныя земляробы і, што горш за ўсё, браліся іх вучыць таму, як, калі і чым сеяць. Вяскоўцы баяліся, што іх сілай будуць заганяць у камуну, што вернуцца камбеды ці пачнецца рэквізіцыя насення. Не выпадкова ўлады рэкамендавалі кідаць лепшыя агітацыйныя сілы ў вёску, арганізоўваць беспартыйныя канферэнцыі, з’езды, падрабязна тлумачыць задачу пасяўкамаў [50, 1, 14 адв.].

Цяжка ўявіць, як можна было пераадолець недавер вясковага люду да савецкай улады, асабліва пасля распараджэння аб браніраванні насення і ўтварэнні з сялянскіх лішкаў дзяржаўнага насеннага фонду. Па развёрстцы забіралі ўсё, што можна, і адначасова стваралі органы, якім трэба было аддаваць нават насенне. Некалькі радкоў з тэлеграмы НКЗ Беларусі ад 5 красавіка 1921 г.: “...насенне павінна быць сабрана ў калектыўных свірнах, таму што так лепш захоўваць, сарціраваць, а гаспадар можа схаваць, выкарыстаць на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

другія патрэбы” [50, 1, л. 66]. Забраніраванага дзяржавай насення ні ў якім выпадку нельга было прадаваць або пазычаць да заканчэння пасяўной. Забаранялася ўсялякая яго перавозка без дазволу пасяўкамаў у межах населенага пункта, а ў межах воласці – без дазволу валаснога пасяўкама. У выніку харчорганы змаглі забраніраваць 311 728 пудоў збожжа [558, с. 106].

На працягу лютага–сакавіка 1921 г. у Беларусі адбывалася стварэнне павятовых, валасных пасяўкамаў. Насельніцтва сустракала гэты працэс крайне недаверліва, некаторыя вёскі наогул адмаўляліся выбіраць іх. Тыя ж, хто займаўся арганізацыяй пасяўкамаў, лічылі, што “тормазамі ў гэтай справе з’яўляюцца тайная арганізацыя эсэраў і бандытызм” [51, 10, л. 66].

Вясною і летам 1921 г. у рэспубліцы крайне абвастрылася сацыяльна-палітычная сітуацыя, праяўленнем якой сталі актыўныя антыўрадавыя выступленні. З восені 1920 г. па восень 1921 г. у 177 населеных пунктах адбыліся пагромы. Наркам харчавання Я.А.Адамайціс паведамляў, што “вельмі ўзросшы бандытызм (афіцыйная тэрміналогія таго часу. – *М.Б.*) не дазваляе мясцовым органам весці нарыхтоўку”. З Мазыршчыны паступалі звесткі аб лютаванні бандытаў у чатырох валасцях, спыніць якое магчыма было “толькі тэрміновым увядзеннем войскаў”. Такая ж карціна назіралася і ў Якшыцкай, Пагарэльскай, Шацкай валасцях Ігуменскага павета [30, 205, л.23; 213, л.70 адв.]. Абставіны склаліся настолькі сур’ёзныя, што па прапанове ЦБ КП(б)Б 8 ліпеня 1921 г. стварыўся рэўваенсавет Мінскага раёна, а праз колькі дзён на ўсіх баявых кірунках ствараліся паліткамісіі, закліканыя мабілізаваць насельніцтва на барацьбу з бандытызмам. Па ўсёй рэспубліцы пачалася арганізацыя мітынгаў, на якіх заклікалі змагацца з бандытызмам.

На наш погляд, з’ява антыўрадавага пратэсту патрабуе дэталёвага вывучэння і новага падыходу. Патрэбны больш дасканалы за існуючы аналіз складу і мэт антыўрадавых фарміраванняў, праблемы іх масавасці. У якой ступені яны сталі адказам на палітыку савецкай улады у адносінах да сялянства? Не выпадкова ж нападу падвяргаліся савецкія ўстановы, кааператывы, нарыхтоўчыя канторы, мясцовыя актывісты. Гэта з аднаго боку. З другога, не выпадкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падчас аб'яўленага тыдня добраахвотнай яўкі ў жніўні 1921 г. здаліся ўладам каля 6400 чалавек. Значыць, незадаволенасць савецкай уладай ахоплівала значныя колы сялянства, была дастаткова масавай. Але ці ёсць падставы пры характарыстыцы гэтых з'яў ужываць тэрмін "рэзістэнцыя", як прапаноўвае даследчык праблемы Н.Стужынская? У некаторай ступені пастаўленыя пытанні закранаюцца ў дысертацыі М.В.Гудава [186]. Аўтар прытрымліваецца пазіцыі некаторых навукоўцаў аб немагчымасці адназначнай кваліфікацыі выступленняў пачатку 1920-х гг. як палітычнага бандытызму ці, наадварот, змагання за незалежную, дэмакратычную Беларусь [304, с. 147; 505, с. 4]. Бясспрэчна адно: антысавецкія выступленні ўяўлялі сабой складаную сацыяльна-палітычную з'яву, апіраліся на шырокую незадаволенасць сялянства дзяржаўнай палітыкай і адначасова адлюстроўвалі гэтую незадаволенасць.

Абвяшчэнне новай эканамічнай палітыкі, з нашага пункту гледжання, не стала для сялянства вызваленнем ад беззаконня развёрсткі. Як было паказана, для беларускай вёскі харчпадатак аказаўся вышэйшым за развёрстку і спаганяўся пры дапамозе тых жа метадаў. Архіўныя фонды адлюстроўваюць вострае супрацьстаянне вёскі і ўлады, якое аформілася вакол спробы дзяржавы паставіць пад кантроль сялянскую гаспадарку. Вяскоўцы скрывалі колькасць ворыва, жывёлы (нават у масавым парадку пазбаўляліся ад яе), запісвалі большую колькасць едакоў. На з'ездах сельсаветаў патрабавалі, каб разрады ўраджайнасці вызначалі не зверху, а на месцах. У перыяд арганізацыйнай падрыхтоўкі да спагнання збожжавага падатку ў Слуцку быў выдадзены загад № 20: "Назіраецца наўмыснае ўкрыццё ворыва, жывёлы, а таксама павелічэнне колькасці едакоў, таму загадваю аб'явіць грамадзянам праз сельсаветы, што з моманту атрымання загаду яны могуць на працягу 5 дзён унесці папраўкі ў спісы скрытага ворыва і жывёлы. У тых, хто не выкарыстае гэтага тэрміну, будзе праведзена рэквізіцыя на карысць беднаты і беззямельных, а самі яны будуць аддадзены пад суд Рэўтрыбунала. Сельскія Саветы, якія не праверылі спісаў і прапусцілі скрытыя даныя, нясуць такую ж адказнасць" [30, 204, л. 34].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што тычыцца сялянства, то яго адносіны да падатку ў большасці выпадкаў па многіх прычынах былі негатыўныя. Калі разглядаць пытанне з пункту гледжання псіхалогіі, то трэба прызнаць: кожнаму чалавеку цяжка аддаць частку свайго дабра, нават у імя самай высокай мэты. А сялянам, змучаным доўгай вайной, голадам, разрухай, харчразвёрсткай, на самай справе не было чым плаціць новы падатак. Некаторыя інспектары паведамлялі, што сяляне ставяцца да падатку вельмі дрэнна, як і да развёрсткі, а валвыканкамы – пасіўна. З Грэбеньскай воласці Ігуменскага павета нейкі начальнік паведамляў: “Сёння арыштаваў трох на 5 сутак з выкананнем службовых абавязкаў. Заўтра прышлю грамадзяніна з вёскі Студзёнка, які агітуе супраць падатку, яго трэба ізаляваць на ўвесь тэрмін”. З Якшыцкай воласці паступілі весткі аб тым, што выканкам “зусім не ў курсе харчработы, некаторыя яго дзеянні ідуць уразрэз з інтарэсамі харчработы”. На з’ездзе сельскіх Саветаў Плешчаніцкай воласці звярталася ўвага на тое, што “пасля здачы падатку ў сялян не будзе сродкаў плаціць за памол збожжа, за соль. Дэлегаты патрабавалі, каб кааперацыя прадавала тавары за грошы, а не за прадукты” [30, 214, л.3 адв., 8, 13, 26].

Яшчэ адно адценне ў карціну адносін сялян да харчпадатку дадае апісанне сходу ў вёсцы Гарадок Сёмкава-Гарадоцкай воласці ад 28 ліпеня 1921 г.: “На сход сабралася 30 мужчын, 5 жанчын і 8 падлеткаў. Тут жа адбывалася перапіска падатку, на што сяляне глядзелі некалькі варожа. Па размеры падатку інтарэсу не праяўлялі, таму што ведалі аб гэтым з мітынгаў. Аб бандытызме і тавараабмене чулі некалькі разоў і інтарэсу таксама не праяўлялі” [17, 226, л. 4]. Мабыць, улічваючы падобную сітуацыю, адзін з валасных інструктараў пісаў, што “трэба прымаць самыя энергічныя меры, бо сяляне на агітацыю звяртаюць мала ўвагі” [30, 210, л. 140]. Паказальна, што яшчэ перад пачаткам харчкампаніі, не маючы дастаткова фактаў для таго, каб рабіць вывады, кіраўніцтва рэспублікі сумесна з упаўнаважаным УЦВК па Беларусі Аркусам папярэджвала: “...заможнае сялянства праяўляе супраціўленне і сабатаж, ухіленне ад выканання падатку пад рознымі прычынамі” [5, 7, л. 151]. Нельга не заўважыць, што тэлеграма як бы давала ўстаноўку на пэўныя адносіны да будучых магчымых неплацельшчыкаў, вызна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаючы іх сацыяльны статус – заможныя. Адчуваецца ўплыў вядомай партыйнай тэорыі аб класавым падыходзе пры аналізе любых падзей.

Прыметна нервавалі вёску бясконцыя змены ў разгар кампаніі тэрмінаў здачы, замена аднаго віду харчавання другім, павелічэнне нормы здачы бульбы і іншыя спантанныя распараджэнні ўлады. З месцаў паведамлялі аб тым, што “гэта выклікала ў сялян недавер да новай эканамічнай палітыкі, і барацьба з такімі настроямі часта бывала няўдалай” [30, 204, л. 67]. Негатыўны псіхалагічны настрой вясковага люду немагчыма было ліквідаваць нават самым шырокім ужываннем разнастайнай агітацыі на мітынгах, сходах, праз лістоўкі, лозунгі і г.д. Дзеянні дзяржаўных органаў гаварылі самі за сябе.

Адным з важнейшых сродкаў уздзеяння на падаткаплацельшчыкаў сталі выязныя сесіі Рэўтрыбунала. “Просім, каб справы разбіраліся хутка і рэвалюцыйна, – абвяшчалася ў тэлеграме асобаўпаўнаважанага Штэрна, – каб судовыя працэсы адбываліся на месцах публічна, у прысутнасці насельніцтва, каб аказаць найбольшы эфект на жыхароў дадзенага раёна” [30, 205, л. 102]. Некаторыя кіраўнікі надавалі выязным сесіям не толькі застрашлівае, але і маральнае значэнне. Намеснік наркама харчавання Фрыд, напрыклад, лічыў, што “харчовыя сесіі мала ўздзейнічаюць на псіхіку мас, носяць сухі судовы характар. Прымаючы да ўвагі ўказанні Цэнтра аб маральным уплыве на псіхалогію грамадзян, выязным сесіям прапаноўваецца пасяджэнні рабіць на месцы, адкрытыя, агітацыйныя пастановы публікаваць шырока. Насельніцтва павінна ведаць, што ў выпадку далейшага невыканання падатку будуць прыняты больш рэпрэсіўныя меры, аж да ўводу войскаў на пастой” [30, 205, л. 82].

Нельга не заўважыць, што такая падатковая палітыка і метады яе правядзення абвастрылі непрыязныя адносіны паміж рознымі сацыяльнымі групамі. Дзеянні выканаўчых органаў ніяк не ўпісваліся ў рамкі лозунгаў падтрымкі бедняка, саюза з серадняком. Самі па сабе гэтыя лозунгі парушалі сацыяльна-псіхалагічную атмасферу вёскі, якая фарміравалася дзесяцігоддзямі і, вядома, была далёка не ідэальнай, а падатковая палітыка наогул усё заблытала. Ясна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адчуваўся яе галоўны змест: любой цаной сабраць запланаванае, не спыняючыся перад аслабленнем моцных і спусташэннем слабых гаспадарак. Інтарэсы селяніна, яго сям'і нікім не браліся ў разлік. Нездарма ў многіх афіцыйных дакументах сялянства выступала ў ролі сытага, прыжымістага, абмежаванага чалавека, які не хоча зразумець інтарэсаў дзяржавы і пралетарскай рэвалюцыі. Кіруючыя органы не надта памыляліся ў вызначэнні настрою вяскоўцаў. У завуаліраванай форме антыпадатковыя погляды сялянства прызнавалі і навукоўцы савецкага перыяду. Сярод мноства дакументаў і навуковых прац нам удалося знайсці толькі 3–4 апісанні добраахвотнай здачы падатку [558, с. 112; 30, 212, л. 53; 30, 214, л. 66].

Дрэннае паступленне падатку тлумачылі па-рознаму. Агенты называлі многа прычын: ад той, што ўсё забралі палякі, да ўплыву эсэраўскай агітацыі. На думку аднаго з харчработнікаў, асяродак апошняй знаходзіўся ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. З падачы ўпаўнаважанага быў нават знойдзены і арыштаваны адзін з эсэраў, малады хлопец з вёскі Арэшкавічы Пухавіцкай воласці. У яго абарону мясцовыя жыхары напісалі пісьмо наступнага зместу: "М.І.Траццяковіч – вучань Мар'інагорскага сельскагаспадарчага вучылішча, за час знаходжання ў адпачынку некалькі разоў абіраўся старшынёй агульнага сходу і праводзіў яго ў поўным парадку. Ніякай агітацыі супраць улады не праводзіў і намі заўважаны не быў, і цяпер не прызнаём яго зламыснікам супраць улады, а што тычыцца падатку, то ім было толькі сказана, што газеты пішуць пра 15%, а з сялян патрабуюць чамусьці 50%" [53, 14, л. 10]. Вядома, 1921 г. – гэта яшчэ не 1937 г., аднак метады ачарнення людзей дзеля апраўдання сваёй няўдачы такія ж самыя.

Як бачым, падатковая кампанія 1921 г. аказалася надзвычай складанай справай для ўсіх удзельнікаў. Разумелі гэта і некаторыя з адказных асоб, якія выконвалі план, а думкі мелі іншыя. Адзін з найцікавейшых дакументаў, што раскрывае псіхалагічны настрой вёскі і радавых выканаўцаў і міжволі паказвае сутнасць савецкай сістэмы, – пісьмо, напісанае загадчыкам інспектарскага пададдзела Барысаўскага павятовага камісарыята харчавання 31 кастрычніка 1921 г., у 12 гадзін ночы, свайму мінскаму начальніку: «Калі ў цябе ёсць час і ты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хочаш пазнаёміцца з сапраўдным станам работы па харчпадатку ў Барысаўскім павеце, то прачытай да канца. Ты разумееш, што ў афіцыйнай зводцы пра многія рэчы пісаць ні ў якім разе нельга.

Аб настроі сялян. Афіцыйна мы ўсё пішам, што настрой большасці сялян добры, аднак фактычна гэта хлусня: настрой сялян кепскі, ды і лепшага настрою быць не можа. Селянін, як кожны чалавек, незадаволены, калі ў яго што-небудзь бяруць, але калі ў яго бяруць хлеб, да таго ж яшчэ вялікі падатак, то, само сабой, ён не можа заставацца задаволеным. Да гэтага дадай яшчэ: замест 0,5 пуда насення – пуд, яму гавораць, што павінен плаціць 9 фунтаў мяса, а прымаюць па 22 з паловаю толькі жывой вагі. Але самае галоўнае, што выклікала моцнае незадавальненне, гэта тое, што з каровы, з якой ён заплаціў падатак маслам, з яго яшчэ патрабуюць мяса, з авечкі, з якой ён ужо адзін раз аддаў воўну, патрабуюць мяса і жывую авечку з воўнаю. Яны здзіўляюцца. Што мне ім адказваць? Адказвай ты.

А тут яшчэ гэты падатак на дамашнюю птушку і абавязкова з ворыўнай плошчы... Мы хочам гэтым падштурхнуць сялян да развядзення дамашняй птушкі, хаця я асабіста думаю, што лепшым стымулам было б даць сяляніну птушку, а не забіраць у яго. Але, як бы там ні было, сяляне не хочуць гэтага ведаць і з іроніяй пытаюцца: “А што, мая зямля яшчэ яйцы нясе?” А цяпер будуць пытацца: “А што, мая зямля птушку родзіць?” І калі-нікалі бывае нават смешна... Калі ты хоць трохі знаёмы з настроем сённяшняй вёскі, то ты ведаеш, што сяляне цяпер толькі і мітынгуюць аб тым, як бы гэта з іх знялі зусім той або іншы падатак ці хаця б трохі паменшылі, а калі станеш гаварыць пра тое, што трэба здаваць падатак, то з усіх бакоў пачуеш: ведаем, ведаем, ужо чулі. Хопіць!

Усё ж такі разам з партыйцамі вядзём палітычную работу, але можаш сабе ўявіць, як можа ўздзейнічаць на сялян сходка ці мітынг, калі аб’яўляюць загад выканкама, што калі не выканаюць падатак у тэрмін, то прыедзе Рэўтрыбунал і будзе судзіць, арыштоўваць і канфіскоўваць...» [30, 205, 94, 95].

Не намнога лепш аднеслася вёска да падатку 1922 г., а дзяржаўныя органы таксама не змянілі сваёй тактыкі. Сяляне скрывалі маёмасць, затое ў некаторых сельсаветах аб’екты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абкладання перапісваліся без гаспадароў, са слоў суседзяў, а канчатковыя спісы не зачытваліся [32, 493, л.18 адв.]. Каб дабіцца зніжэння падатку, многія вяскоўцы спрабавалі звярнуць увагу ўлады на прыродныя з’явы, якія прывялі да страты ўраджаю (моцны град, вымачка пасеваў і г.д.). Аднак усе спробы дабіцца дапамогі ад дзяржавы натыкаліся на моцныя бюракратычныя перашкоды. Спачатку трэба было пісаць заяву на імя валаснога інспектара, які накіроўваў яе вышэй, а павятовы камісарыят са сваім заключэннем накіроўваў яе ў Наркамат харчавання.

Яшчэ больш негуманна паставіліся ўлады да вёсак, у якіх перабралі ў 1920 г. развёрстку на мяса. Пытанне аб залічэнні лішкаў у падатак сяляне падымалі перад кіруючымі органамі ў 1921 г., да заяў дадавалі квітанцыі чырвонаармейскіх часцей. Такіх выпадкаў было нямала ва ўсіх паветах. Напрыклад, у сялян вёскі Лысуха са Случчыны звыш развёрсткі ўзялі 85 галоў жывёлы. Спачатку Наркамат харчавання вырашыў залічыць гэтую жывёлу ў парадку тавараабмену і выплаціць вызначаным прадуктам. Аднак тавару не было, а вёсак шмат, і ўсім бы не хапіла. Потым вырашылі залічыць лішкі ў харчпадатак, але зноў перадумалі. У рэшце рэшт сялянам было адмоўлена на падставе параграфа № 9 Дэкрэта аб вызваленні ад падатку на мяса, які канстатаваў, што вызваленне можа быць, калі перабор у 1920 г. быў па ўсёй губерні (нават не па павеце. – *М.Б.*), а не па асобных вёсках [32, 123, л.167, 219, л.17].

У сувязі з гэтым паўстае пытанне эфектыўнасці ўздзеяння новай эканамічнай палітыкі на ўздым сельскай гаспадаркі. Вышэйпрыведзеныя факты, на наш погляд, гавораць аб тым, што яе развіццё адбывалася дзякуючы цяжкай штодзённай працы сялянства. Якім чынам магла стымуляваць падатковая палітыка савецкай улады ўздым вёскі, аб чым сцвярджаецца апошнім часам, калі падатак 1921 г. быў вышэйшы за развёрстку 1920 г., а падатак 1922 г. перавышаў папярэдні, нам не зразумела. Такая палітыка дастаткова яскрава дэманстравала вясковаму люду, што яго інтарэсы на практыцы ўлада не ўлічвае, што вёска цікавіць яе толькі як аб’ект выкачвання сродкаў на розныя мэты пралетарскай дзяржавы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1922 г., акрамя агульнага сельскагаспадарчага падатку, сяляне выконвалі і некалькі грашовых. Ад мясцовых улад у Цэнтр паступалі трывожныя пісьмы накшталт наступнага з Бабруйскага павета: “Некаторыя гаспадаркі пры аплаце ўсяго падатку асуджаюць свае сем’і на галоднае існаванне ці пазбаўляюцца сваёй апошняй скаціны і да таго разбураюць сваю гаспадарку, што наўрад ці змогуць яе адрадзіць”. З Мазыршчыны пісалі: “...Сялянства ніжэй сярэдняга і бедната не толькі не маюць сала, жыта, але ў некаторых сёлах знойдзецца чалавек 30–40 зусім без хлеба. Напрыклад, Капаткевіцкая, Скрыгалаўская, Камаровіцкая воласці, у якіх 40–50% насельніцтва сядзіць па 2–3 месяцы без хлеба, капаюць дробную, няспелую бульбу”. З Барысава скардзіліся, што “кармоў зімою не хапала, скармілі дахі. Выганы і сенажаці пазабіралі лясніцтвы і саўгасы” [30, 219, л. 111; 483, л. 37]. На гэтыя просьбы аб літасці ўлады не звярталі ўвагі. Вёска, нават самая бедная, заставалася тым аб’ектам, з якога можна было штосьці ўзяць.

Як і раней, сяляне нідзе не маглі дабіцца праўды. Усе спробы дамагчыся зніжэння разраду ўраджайнасці з-за граду ці вымачкі, памяншэння падатку з-за вялікай беднасці або пажару заканчваліся безвынікова. Адмаўлялі ўчарашнім чырвонаармейцам, удовам, беднаце, прычым якую-небудзь логіку ў гэтым працэсе знайсці немагчыма. Спрабавалі сяляне заяўляць згодна з дзяржаўным палажэннем аб ільготах, што іх гаспадаркі пераходзяць на новыя формы землекарыстання (хутары і пасёлкі, ужываюць шматполле, высяваюць тэхнічныя культуры), аднак атрымлівалі толькі адмоўныя рашэнні [30, 912а, л. 5, 6, 15].

Як бачым, рэакцыя беларускага сялянства на асноўную праяву нэпа – падатковую палітыку – аказалася негатыўнай. Амаль адзіным фронтам выступіла вёска супраць намераў дзяржавы вырашыць эканамічныя праблемы за яе кошт. Незадаволенасць у сялян выклікалі спагнанне падатку, разыходжанне паміж абяцаннямі і іх ажыццяўленнем на практыцы. Сведчаннем незадаволенасці новымі падаткамі з’яўляецца вялікая колькасць скаргаў, атрыманых Бюро скаргаў пры Наркамаце харчавання. Калі ў кампанію 1921 г. было пададзена 12 156 скаргаў, то ў 1922 г. – 26 578 [30, 487, л. 63, 73 адв.; 499, л.26]. Як бачна, колькасць вырасла больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чым удвая. Неабходна дадаць, што ў абароне сваёй маёмасці сялянства карысталася такімі сродкамі, як укрыццё жывёлы і ворыва. Гэты від сацыяльнага супраціўлення атрымаў значнае распаўсюджанне. Згодна даных М.Е.Стральцова, амаль 200 тыс. дзесяцін беларускія сяляне змаглі ўтаіць [502, с. 49].

У рашэнні зямельнага пытання змяніць сітуацыю сялянства не магло і таму спрабавала паступова прыстасавацца да дзяржаўнай палітыкі, хаця ў кожным канкрэтным выпадку зрабіць гэта было складана. Абвешчаны лозунг “аб апоры на бедняка і саюзе з серадняком” на практыцы не дзейнічаў, таму што пры дасягненні асноўнай мэты – аднаўлення пасяўной плошчы, павелічэння ўраджайнасці як галоўнай крыніцы падатку – інтарэсы канкрэтнай гаспадаркі ў разлік не браліся. Таму, на наш погляд, абсалютна заканамерным з’яўляецца ўзнікненне негатыўнага настрою сярод сялянства. Яно шукала і ў некаторых выпадках нават знаходзіла эфектыўныя сродкі абароны сваёй прыватнай маёмасці і асабістых інтарэсаў. Такімі метадамі можна лічыць адмаўленне ад уплаты грошай за землеўладкаванне, ад выдзялення рабочай сілы і жывёлы ў дапамогу каморнікам, пагрозы фізічнай расправы, падзелы гаспадарак, захопы зямлі і інш. Аднак перавага аказалася на баку дзяржавы. Тым не менш, дзякуючы спрадвечнаму інстынкту хлебароба і велізарнейшаму напружанню ўсіх сіл, беларуская вёска падымалася з разрухі і голаду, цягнучы за сабой усё грамадства, і падышла да мяжы, за якой пачыналіся рэформы ў сельскай гаспадарцы.

## 3. 2. Стаўленне сялянства да пытання аб зямлі і формах землекарыстання

Спрадвечная сялянская праблема – спадзяванні на свой дастатковы для пражыцця надзел зямлі – з’яўлялася адной з прычын існавання сацыяльнай напружанасці на вёсцы. Заканчэнне Грамадзянскай вайны абудзіла ў сялян новыя надзеі на зямельную рэформу, абвешчаную Савецкай уладай. Свабодная зямля знаходзілася ў былых памешчыцкіх маёнтках, якіх на тэрыторыі Беларусі налічвалася больш за 900 і якія мелі каля 500 тыс. дзесяцін зямлі. У 1919 г. яны былі нацыяналізаваны. Планавалася 188 найбольш моцных маёнт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў ператварыць у савецкія (народныя) гаспадаркі, будучыя "фабрыкі хлеба", а землі астатніх перадаць у зямельны фонд, з якога данадзяляць беднату [32, 1, 3, л. 78].

У самым пачатку працэсу земленадзялення вёска стала сведкай слабых тэхнічных магчымасцей савецкіх зямельных органаў. Таму нічога дзіўнага не было ў тым, што ў такой важнейшай справе, ад якой залежаў лёс кожнага чалавека, не абыходзілася без спрэчак. Яшчэ больш накаляла сітуацыю спешка. Каморнікам з рызыкай для жыцця даводзілася наладжваць адносіны з насельніцтвам і папярэджваць крывавыя сутычкі, таму што "ў некаторых мясцовасцях сяляне з'яўляліся на размеркаванне з ручнымі гранатамі" [32, 23, л. 35 адв.]. Нярэдкія былі канфлікты паміж землямерамі і валасным кіраўніцтвам, якое пераразмяркоўвала ўчасткі, а дзе-нідзе каморнікі і сябе не забывалі – адмяралі лепшыя кавалкі [32, 1174, л. 19 адв.]. Усе гэтыя абставіны садзейнічалі ўзнікненню мноства спрэчных пытанняў. Як вынік, за 1921 г. у зямельныя органы паступіла 12 530 заяў [558, с. 57].

Выконваючы рашэнні вышэйшых інстанцый аб забароне куплі-продажу зямлі, савецкія органы не прызналі ўсе такія выпадкі падчас польскай акупацыі. На Случчыне ў многіх сялян адабралі хутары, купленыя яшчэ ў 1906–1908 гг., і пераразмеркавалі іх беднаце, якая не магла іх абрабляць, таму што не было чым [32, 1235, 39 адв.; 47, 51]. Гэтае рашэнне выклікала мноства скаргаў, аднак ніхто яго не адмяніў. Загадчык зямельнага аддзела Слуцкага выканкама ў пісьме на імя А.С.Славінскага паведамляў: "Купля зямлі пры польскіх акупантах у Слуцкім павеце насіла масавы характар, амаль не было маёнтка, дзе б не адбываліся пакупкі... У большасці выпадкаў яны рабіліся кулацкімі элементамі. Купленая зямля размяшчаецца цераспалосна і на самых лепшых землях". На запыт слуцкіх работнікаў Наркамат земляробства адказаў вельмі мудра: "...неабходна лічыцца з фактычным выкарыстаннем і ўкладзенай працай і разглядаць кожную пакупку зямлі па сутнасці. Гэта простае вытлумачэнне, а не цыркулярнае". А вось цыркулярнае: "Другіх думак быць не можа, як толькі цвёрда і адназначна ануліраваць пакупкі, інакш на месцах можа быць поўная анархія" [32, 1235, л. 50, 169, 170].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як бачым, савецкая ўлада прысвоіла сабе права распараджацца прыватнай уласнасцю людзей, абмяжоўваць магчымасці яе развіцця. Зямельная палітыка грунтавалася не на эканамічных законах і разліках, а на ідэях роўнасці, ці, лепш сказаць, ураўнілаўкі, якія былі папулярныя сярод бяднейшай часткі сялянства. Паказальна, што самі вяскоўцы прызнавалі факты куплі-продажу зямлі і не згаджаліся перасяляцца на гэтыя надзелы, матывуючы тым, што "магчымы сваркі, бойкі са старымі ўласнікамі". Аднак улада не звяртала ўвагі на ўзнікненне шматлікіх канфліктных сітуацый, наадварот, актыўна стварала іх, адбіраючы купленую зямлю ці забараняючы здымаць з яе ўраджай. Даходзіла да таго, што прымушалі зносіць пабудовы на новым месцы, канфіскоўвалі сена, калі аказвалася, што сяляне няправільна ўказалі памеры сваіх надзелаў зямлі і ім дадаткова выдзелілі ўчастак, вінаватых у падмане аддавалі пад суд [32, 1235, л. 83, 147, 153]. Падобнымі дзеяннямі дзяржава звужала сваю сацыяльную базу, выклікала масавую незадаволенасць людзей.

Канкрэтны прыклад са Случчыны. Вялікая група сялян, 31 чалавек, купілі зямлю ў лясной дачы. Яны паспелі пабудавацца, апрацаваць палі, аднак у разгар лета 1922 г. улады пастанавілі перадаць зямлю лясной гаспадарцы, а людзей выселіць. Зразумела, што сяляне адмовіліся гэта зрабіць. Загадчык Слуцкага зямельнага аддзела прапанаваў "разглядаць такія дзеянні сялян як контррэвалюцыйныя, як непадпарадкаванне савецкай уладзе і хадайнічаць аб перадачы сялян суду і высяленні за межы Беларусі" [32, 1235, л. 185 адв.].

Сялянства спрабавала абараняць свае інтарэсы, але машыну, што набірала моц, спыніць аказалася немагчыма. Некалькі прыкладаў. Амаль год змагалася група сялян з вёскі Чыжэвічы Старобінскай воласці за зямлю, якую яны купілі ў 1914–1919 гг. у памешчыка Крупскага. Прычынай канфлікту стала рашэнне Слуцкага зямельнага аддзела ад 27 мая 1922 г. абануляванні гэтай пакупкі. Хлебаробы накіравалі тэлеграму-скаргу спачатку ў Наркамат земляробства, потым у Маскву на імя М.І.Калініна. Сцэнарый развіцця падзей добра вядомы: тэлеграма вярнулася ў Мінск з рэзалюцыяй "Разабрацца", адтуль у сваю чаргу яе накіравалі ў Слуцк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мясцовыя органы пацвердзілі правільнасць свайго рашэння ад 27 мая, Наркамат земляробства зацвердзіў адказ [32, 1235, л. 226, 251]. Сяляне пісалі таксама ў Маскву, аднак рэспубліканскі НКЗ заняў жорсткую пазіцыю, ён заявіў, што "скарга сялян мае характар прыватнай зямельнай спрэчкі і тычыцца толькі Беларусі, не кранаючы інтарэсаў другіх рэспублік" [32, 1235, л. 83, 214]. Беззямельныя і малазямельныя грамадзяне вёскі Уланава Грэскай воласці скардзіліся на тое, што ў 1922 г. сенажаць, якую ім аддаў памешчык яшчэ да сусветнай вайны ў якасці сервітуту, перададзена савецкай уладай суседняй вёсцы для заснавання пасёлка [32, 1235, л. 238].

Згодна з Дэкрэтам аб зямлі царкоўныя і манастырскія землі таксама нацыяналізаваліся. Карыстаючыся частай зменай улады ў час Грамадзянскай вайны, у многіх месцах сяляне сталі самавольна засяваць гэтыя землі. На працягу 1921–1922 гг. падзеі вакол гэтых зямель не кантраляваліся і мясцовыя ўлады дзейнічалі па сваім разуменні. Маглі адвесці манахам надзел, як гэта зрабілі ў Слуцку, а маглі зрабіць наадварот – адмяніць права на карыстанне зямлёй [32, 1235, л. 4]. Не абыходзілася без сур'ёзных канфліктаў, як, напрыклад, у Эсьманах на Барысаўшчыне. Мясцовы поп катэгарычна адмовіўся выдзеліць тры дзесяціны царкоўнай зямлі на патрэбы школы. Ён не падпарадкаваўся загаду валвыканкама і не спыніў працы на ўчастку, а ўночы сабраў мясцовых жыхароў і засеяў яго. З гэтай сітуацыі камандзіраваны палітработнік зрабіў вывад, што "ўся контррэвалюцыйная дзейнасць грамадзяніна Бабенкі (прозвішча святара. – *М.Б.*) гэтым не абмежавалася. Ён збірае падпіску з жыхароў вёсак аб тым, каб зямля засталася за ім, у процілеглым выпадку пагражае драць дзесяць шкур за трэбы. Перапужаныя сяляне сталі варожа адносіцца да настаўніка і да мяне як палітычнага кіраўніка" [18, 165, л. 12 адв.].

Даходзіла да таго, што, каб захаваць зямлю як адзіны сродак існавання, нават манахі аб'яўлялі аб стварэнні манаскіх арцелей. Так, напрыклад, зрабілі манашкі Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра ў Полацку. Аднак у хуткім часе яго землі спатрэбіліся ваенным, і манашак сабраліся перасяліць у манастырскую арцель на Віцебшчыну. "Разнастайнасць тлумачэнняў на месцах пытання аб правах

служыцеляў культу на карыстанне былымі царкоўнымі землямі і пабудовамі” з’явілася падставай для стварэння ў 1923 г. спецыяльнай камісіі з прадстаўнікоў зямельных, савецкіх органаў і міліцыі, якая павінна была абмеркаваць праблему царкоўных зямель [26, 1590, л. 41].

Такім чынам, ёсць усе падставы зазначыць, што працэс надзялення зямлёй аказаўся недастаткова прадуманым і не мог задаволіць вёску. Нездарма на сходах сяляне заяўлялі, што “прадстаўнікі ўлады ўсё гавораць добра, аднак на самай справе ніякай палёгкі няма, зямлю далі, а потым аказваецца, што на ёй ствараецца саўгасная гаспадарка” [17, 253, л. 14]. Тагачасныя даследчыкі таксама прызнавалі факт незадаволенасці вясковага люду, які прама ставіў пытанне: “Куды ж падзеліся вялікія абшары зямлі, што былі адабраны ў паноў?” [187, с. 3].

Другой важнай і тэрміновай справай было землеўладкаванне, ажыццяўленне якога стварала магчымасць хутчэйшага ўздыму сельскай гаспадаркі. Аднак замест таго, каб улічыць вопыт сталыпінскай рэформы і жаданні хлебаробаў, савецкая ўлада прапанавала новую форму землеўладкавання – калектыўную апрацоўку зямлі.

На наш погляд, малая кампетэнтнасць бальшавіцкіх лідэраў у пытаннях сельскай гаспадаркі і псіхалогіі сялянства, іх прага падпарадкаваць законы эканамічнага развіцця палітыцы адбіліся ў імкненні да вытворчай кааперацыі. Пастановы з’ездаў і другія дакументы яскрава ілюструюць спробу інтэграцыі прыватнай гаспадаркі з сацыялізмам, прычым самымі паскоранымі і каманднымі метадамі. У сувязі з гэтым звернемся да пытання аб адносінах да калектыўных і дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, ці саўгасаў, навакольнага сялянства. Аўтар не засяроджвае ўвагу на праблемах стварэння саўгасаў і ўзнікнення калектыўных гаспадарак, таму што яна дастаткова распрацавана навукоўцамі [280, 281, 433, 493].

Нагадаем толькі, што тэарэтычна ідэя калектыўнай апрацоўкі зямлі пачала распрацоўвацца з 1919 г. У лютым УЦВК зацвердзіў “Палажэнне аб сацыялістычным землеўладкаванні і аб мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства”. У артыкуле 3 Палажэння адзначалася: “Дзеля канчатковага знішчэння ўсякай эксплуатацыі чалавека чалавекам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеля арганізацыі сельскай гаспадаркі на асновах сацыялізму з выкарыстаннем усіх заваёў навукі і тэхнікі, выхавання працоўных мас у рэчышчы сацыялізму, а таксама для аб'яднання пралетарыяту і сельскай беднаты ў іх барацьбе з капіталам, неабходны пераход ад аднаасобных формаў землекарыстання да таварыскіх. Буйныя савецкія гаспадаркі, камуны, другія віды... з'яўляюцца найлепшымі сродкамі для дасягнення гэтай мэты, – таму на ўсе віды аднаасобнага землекарыстання трэба глядзець як на пераходныя і аджываючыя” [58а, с. 17].

Асноўныя моманты Палажэння знайшлі адлюстраванне ў рашэннях VIII з'езда РКП(б), у якіх падкрэслівалася неабходнасць арганізацыі саўгасаў, падтрымкі сельскагаспадарчых камун, калектыўных гаспадарак і таварыстваў па апрацоўцы зямлі. Менавіта калектыўныя формы арганізацыі працы бачыліся як сацыялістычная перспектыва. Такая тэорыя магла ўзнікнуць толькі ў тым палітычным асяроддзі, якое слаба ведала псіхалогію земляроба. Сярод кіраўнікоў бальшавіцкай партыі практычна ніхто не займаўся вывучэннем асаблівасцей сацыяльнага развіцця вёскі і псіхалогіі сялян. Таму іх тэарэтычныя распрацоўкі былі далёкія ад рэальнага жыцця. Трапна сказаў рэктар Мінскага сельскагаспадарчага інстытута А.Кірсанаў на агранамічным з'ездзе ў студзені 1925 г.: “Вялікая справа – энтузіязм, але яшчэ лепш, калі ён ідзе пасля арыфметыкі” [32, 1, 173, л. 31].

Такую прадуманую арыфметыку прапаноўваў вядомы тэарэтык і практык сельскагаспадарчай навукі А.Чаянаў. Ён прапагандаваў ідэю сялянскай кааперацыі, якая, паводле яго разлікаў, уяўляла дастаткова дасканалую арганізацыю сялянскай гаспадаркі. Вучоны даказваў, што камуна будзе заўсёды слабейшая за каапераваную гаспадарку, таму што па сваёй структуры яна вымушана аб'ядноўваць у буйных формах не толькі тыя галіны гаспадаркі, якія ёй выгадныя, але і тыя, у якіх дробная вытворчасць тэхнічна заўсёды больш дасканалая [545, с. 42].

Рэвалюцыйны энтузіязм у справе перабудовы сельскай гаспадаркі ахапіў і партыйных, і дзяржаўных кіраўнікоў ССРБ. Ад паветаў патрабавалі звестак кожныя 15 дзён. Там, дзе кіраўнікі былі больш вопытныя, наглядаліся некаторыя вынікі. Так, з Мінскага павета паведамлялі: “З 15 снежня

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1920 г. ідзе энергічная работа па арганізцыі сельскагаспадарчых камун і арцелей. Зарэгістравана 1 камуна...” У той жа час з Барысаўскага паведамлялі, што з 15 снежня 1920 г. па 1 студзеня 1921 г. рэгістрацыі сельскагаспадарчых арцелей, камун, калгасаў не было і заяў на арганізацыю не паступала. Тое ж самае і ў наступныя дэкады”. З Мазырскага павета прыслалі справаздачу, ярка расквечаную палітычнымі фразамі пра тое, што сяляне “ўлічваюць калектыўную апрацоўку зямлі, згодны прыступіць да яе, аднак вельмі баяцца, што ўлада Саветаў ненадзейная, таму што ворагі народа, усемагчымыя эсэры, былыя лакеі памешчыкаў палохаюць сялян, распускаючы самыя непраўдападобныя чуткі” [32, 1, 34, л. 2, 3].

Значных поспехаў не было, і як толькі ў снежні 1921 г. XI Усерасійская партыйная канферэнцыя і IX з’езд Саветаў прынялі рашэнне аб свабодзе выбару формаў землекарыстання, Прэзідыум ЦВК БССР у студзені 1922 г. і VI з’езд КП(б)Б у сакавіку 1922 г. далучыліся да гэтага рашэння [419, с. 7].

Аднак ідэя вытворчай кааперацыі прадаўжала навязвацца сялянам. Яна атрымала больш грунтоўную і дэталёвую аргументацыю ў “Асноўным законе аб працоўным землекарыстанні” (1922) і ў “Зямельным кодэксе БССР” (1923). У дакументах звярталася ўвага на два кірункі сацыялістычнай перабудовы вёскі – калектыўную апрацоўку зямлі ў форме арцелей, камун і стварэнне дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў (саўгасаў).

Калектыўныя гаспадаркі арганізоўваліся без прадуманага плана і яснага ўяўлення пра асаблівасці іх будучай дзейнасці. Кожны, хто пажадаў уступіць у арцель ці камуну, меў на ўвазе свой канкрэтны інтарэс: у адных было мала зямлі ці зусім яе не было, другім хацелася працаваць у калектыве, бо ў сваёй гаспадарцы справы ішлі не надта добра, трэція свята верылі ў светлую будучыню і г.д.

Архіўныя дакументы сведчаць, што большасць членаў першых калектыўных гаспадарак складалі беднякі, батракі, былыя фабрычныя рабочыя і невялікі працэнт служачых. Арганізатарамі калгасаў ці арцелей станавіліся ў многіх выпадках члены ці кандыдаты партыі, вакол якіх аб’ядноўвалася невялікая група сяльчан. Большасць калгаснікаў аказаліся мала ці зусім непісьменнымі і, вядома, ні пра якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высокія ідэалы не думалі, галоўнае было неяк выжыць ва ўмовах разрухі. Што яны стваралі, дакладна не маглі сказаць нават самі арганізатары. Былі выпадкі накшталт арцелі "Трудолюбие" Слуцкага павета, калі арцель па статуце лічылася камунай, а "по жизни – коллективом" [49, 114, л. 1].

Нельга не заўважыць фактаў, праўда, нешматлікіх, калі актыўнымі агітатарамі за стварэнне калектыўных гаспадарак станавіліся больш-менш заможныя сяляне і нават служыцелі культу. Дакументы сведчаць, што некаторыя публічна, у прэсе, адмаўляліся ад свайго мінулага і актыўна агітавалі за стварэнне калектыўнай гаспадаркі. Падчас арганізацыі адной з іх у м. Малыя Бяседы Мінскага павета былы псаломшчык, які меў добрую гаспадарку: каня, дзве каровы і іншую жыўнасць – заклікаў прысутных наступнымі словамі: "...кожны, хто гаворыць, што ў арцелі не зможам разжыцца, думае ўзяць зямлю і разжывацца. Толькі я здзіўляюся таму, што аднаасобна можна разжыцца, а ў арцелі – не... Самы галоўны недахоп – нежаданне працаваць у арцелі і няма чаго спасылацца на хібы арцельнай работы, а адкрыта заявіць, што не жадаю быць у арцелі" [30, 10, л. 3 адв.]. Што ў гэтым праяўлялася – тонкі разлік ці глыбокая вера ў перспектыву калектыўнай працы, – сказаць цяжка.

Безумоўна, пытанне аб узнікненні калектыўных гаспадарак у першыя мірныя гады вельмі няпростае, бо нельга ігнараваць імкненне абяздоленай часткі вёскі знайсці выйсце з цяжкага становішча. Многія, асабліва партыйцы ці тыя, хто спачуваў, бачылі яго ў калектыўнай працы. Тэарэтычна ідэя здавалася прывабнай, але цяжкасцей узнікала шмат. Не хапала сельскагаспадарчага інвентару, рабочай жывёлы, малапрадукцыйнай была свойская жывёла, не хапала памяшканняў, але галоўнае – ніхто не меў вопыту калектыўнай працы. Кіраўніка арцелі ці калгаса ў многіх мясцінах называлі "барын", а астатніх – парабкамі, што адлюстроўвала сялянскае разуменне сацыяльнай іерархіі ў "савецкіх маёнтках".

Калектыўныя гаспадаркі былі маламоцныя, хуткіх поспехаў, на якія разлічвалі ініцыятары, не назіралася. Напрыклад, калгас "Агракультура" Заслаўскай воласці ў 1922 г. меў наступныя вынікі: сабралі 5 пудоў грэчкі з дзесяціны (высеялі таксама 5), ячменю 126 (высеялі 24), лён з'елі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чарвякі. За грошы купілі 40 пудоў збожжа, коней наймалі ў вайсковай часці. На адукацыю дзяцей патрацілі 5 рублёў, а падатку заплацілі 431 рубель. Тое ж самае можна сказаць і пра арцель "Путь к свету" ў в. Гатава, што недалёка ад Мінска, пра гаспадарку "Геркулес" Магільнянскай воласці. Некаторыя калектывы не мелі сродкаў, нават каб заплаціць землямеру за адбіццё меж [49, 21, л. 9, 11, 19].

Так, у Барысаўскім павеце 9 малазямельных гаспадароў у канцы 1921 г. аб'ядналіся ў арцель "Труд" на землях маёнтка Нежыцы. Сям'я былога памешчыка пражывала тут жа ў сваім доме, аднак арцель патрабавала сабе і жылыя, і падсобныя памяшканні. Пачалася цяжба, якая доўжылася больш за два гады. Чым яна скончылася, з дакументаў не зразумела. Аднак справа ў іншым. Арцель была настолькі бедная, што не магла заплаціць землямеру за адбіццё ўчастка, не змагла пасеяць і сабраць ураджай, а прэтэнзіі на чужое дабро выказвала вялікія. Мабыць, арцель "Труд" хутка распалася, бо яе землі засеялі сяляне [36, 11, л. 11, 12].

Першапачаткова калектыўныя гаспадаркі ствараліся на землях былых маёнткаў, якія не падыходзілі для арганізацыі саўгасаў, потым узнікалі і на землях ліквідаваных саўгасаў. Улады лічылі, што "лепш мець справу з арганізацыяй, чым з кожным паасобку...", таму настойліва ўгаворвалі ўчарашніх рабочых ліквідаваных саўгасаў ствараць арцелі.

У лютым 1924 г. былыя рабочыя і батракі народнага маёнтка Малыя Бяседы Хаценчыцкай воласці вырашалі пытанне аб стварэнні на гэтых землях арцелі. На сходзе прысутнічалі 22 чалавекі, валаснoе начальства. Прадстаўнік з Мінска заявіў прысутным: "Ні адна буржуазная дзяржава ў свеце не пасылае інструктараў для тлумачэння сялянам і беднякам, як будаваць сваё лепшае жыццё, толькі Савецкая ўлада здольна на гэта, аднак не ўсе беднякі заўсёды ўспрымаюць указаны правільны шлях". Ён заклікаў "быць дружнымі", каб добра зажыць. Аднак былыя рабочыя саўгаса гаварылі пра немагчымасць працаваць у арцелі, бо няма за што "рук зачапіць, няма ні скаціны, ні спайкі, ні дапамогі ад дзяржавы". Выступаўшыя спасылаліся на вопыт сумеснай працы ў саўгасе, калі адзін выходзіць на працу ў час, а другі сімулюе, перасцерагалі ад падобных з'яў у арцелі. Сход доўжыўся 6 гадзін і закончыўся кампрамісным рашэннем пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыю арцелі з тых, хто пажадае застацца. Назвалі яе “Надзея”, аднак Наркамат земляробства доўга не даваў дазволу на рэгістрацыю арцелі па прычыне адсутнасці ў яе складзе сялян [36, 11, л. 3, 3 адв., 4, 5].

Такім чынам, бачна, што калектыўныя гаспадаркі першай паловы 1920-х гг. аказаліся маламоцнымі, нешматлікімі і ў выніку нядоўгачасовымі. Спробы беднаты знайсці выйсце ў калектыўнай працы аказаліся неэфектыўнымі.

Саўгасы ствараліся на базе былых маёнткаў, якія сталі называцца народнымі, аднак іх задачы вызначаны былі не адразу. Арганізацыя саўгасаў пачалася са студзеня 1921 г. і суправаджалася шматлікімі канфліктамі з рабочымі і батракамі маёнткаў. Многія з іх не хацелі калектыўна працаваць і тым самым давалі падставу для сілавога рашэння ўзніклай сітуацыі. 22 лютага 1921 г. на партыйнай канферэнцыі Мінскага павета была прынята пастанова аб высяленні аднаасобнікаў з саўгасных памяшканняў на аснове таго, што “многія рабочыя атрымалі зямлю ў прыватнае карыстанне і не хочуць выходзіць на работу, не даюць сваіх коней, займаюць саўгасныя кватэры, і таму няма куды сяліць новых рабочых” [32, 511, л. 35]. Праз некаторы час пры Галоўным упраўленні народнымі маёнткамі была створана камісія для распрацоўкі тэрміновых мер па высяленні. Галоўнай з іх стала выкарыстанне міліцыі, таму што добраахвотна людзі высяляцца не хацелі.

Сітуацыя, безумоўна, склалася выключна канфліктная. У яе былі ўцягнуты многія інстанцыі, ад Наркамата земляробства да Бюро скаргаў Рабоча-сялянскай інспекцыі. У верасні 1921 г. А.С.Славінскі просіць Наркамат унутраных спраў зрабіць распараджэнне аб высяленні. Праз месяц, 11 кастрычніка 1921 г., была выпрацавана сумесная пастанова НКЗ і НКУС, якая патрабавала “да 1 снежня 1921 г. выселіць з саўгасаў усіх – батракоў, запашнікаў, установы, у выпадку нязгоды канфіскоўваць маёмасць” [32, 511, л. 75]. Бюро скаргаў пры разглядзе заяў у большасці выпадкаў падтрымлівала інтарэсы саўгасаў. Логіка высялення не зусім зразумелая, таму што высяленню з маёнткаў падлягалі былыя ўладальнікі, былыя арандатары, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, рабочыя, батракі, фельчарскія пункты, школы, валасныя выканкамы, юрыдычныя ўстановы і інш. Людзі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пісалі заявы, якія, здаецца, маглі ўзрушыць нават камень, аднак улада заставалася няўмольнай. Некалькі прыкладаў: "Я – сын рэвалюцыі і абаронца савецкай улады, поўны інвалід, – пісаў селянін Мадроўскі. – Зямлю купіў у памешчыка, але з сакавіка 1921 г. яна перайшла ў ваенсаўгас" [32, 511, л.59]. На яго заслугі ніхто не звярнуў увагі, ён быў выселены з дапамогай міліцыі. А вось справа двух братоў Валадковічаў. Старэйшы з іх шмат гадоў служыў у арміі, дэмабілізаваўся ў маі 1921 г. Братоў надзялілі зямлёй у адным з фальваркаў, яны яшчэ паспелі адсеяцца, а 1 верасня зямельныя органы "без тлумачэння прычын прапанавалі ім выселіцца" [32, 511, л. 182].

Што ж тычылася дзяржаўных устаноў, то і ў гэтым выпадку знаходзіліся аргументы. Напрыклад, Хаценчыцкі выканкам высялялі па той прычыне, што "яго памяшканне заўсёды перапоўнена народам, і гэта перашкаджала рабоце саўгаса. Выканкам пастаянна ўмешваўся ў распараджэнні па саўгасе, яго супрацоўнікі займалі падсобныя памяшканні. Выканкам не высяляў былых батракоў, якія сталі аднаасобнікамі, а гэтыя, у сваю чаргу, угаворвалі застаўшыхся не працаваць, выканкам наогул абяцаў навакольнаму сялянству размеркаванне саўгасных зямель" [32, 511, л. 48]. Некаторыя валвыканкамы адмаўляліся высяляць людзей і прама заяўлялі, што "ніхто на гэта не мае права".

Заўважым, што калі ў імя нейкіх уяўных дзяржаўных інтарэсаў трэба было разбурыць самыя карысныя і неабходныя для сялян установы, не спыняліся і перад гэтым. Так было, напрыклад, з ліквідацыяй фельчарскага пункта ў маёнтку Зубрэвічы Койданаўскай воласці. Не паглядзелі нават на тое, што гэта прыгранічная мясцовасць, і не ўлічылі заяву ад шасці з паловай тысяч мясцовых жыхароў у абарону лекара Захарава. Улады абвінавацілі яго ў антысавецкім уплыве на батракоў. Сяляне ж у заяве пішуць зусім іншае: "Лекар, акрамя сваёй асноўнай працы, прыносіў многа карысці – адкрыў хату-чытальню, памяшканне для лекцый і гутарак, тлумачыў сялянам, што жывуць яны ў Савецкай краіне, а не ў паноў". У канцы заявы цікавае заключэнне: "Каля нас недалёка польская мяжа, і мы павінны паказаць, што жывём добра" [32, 511, л. 137]. У антысаўгаснай агітацыі абвінавачваліся нават валасныя ваенкамы, як было, напры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клад, у Халопенічах. Адзін з нямногіх выпадкаў, калі ўладзе прыйшлося адступіць, адбыўся ў саўгасе “Астрашыцы”, дзе спрабавалі выселіць школу і настаўніцу па асабістым распараджэнні А.С.Славінскага. Наркама, мабыць, увялі ў зман, паведаміўшы, што “настаўніца не хацела высяляцца, падбухторвала рабочых і сялян навакольных вёсак, якія ўчынілі расправу над упраўляючым саўгаса”. Аказалася, што нічога такога не было. Наадварот, “калі ён аддаў загад вынесці школьныя дровы, то дзеці не далі гэта зрабіць”. Справа закончылася арыштам старшыні сельскага Савета і ўпраўляючага [32, 511, л. 217].

Некалькі прасцей ішлі справы з прыватнымі асобамі: іх абараняць не было каму, хаця некалькі выпадкаў і сустракаюцца ў дакументах. Напрыклад, у чэрвені 1921 г. з саўгаса “Над-Нёман” спрабавалі выселіць з дапамогай міліцыі адну з сем’яў, бацька ў якой з’яўляўся служачым. На яго абарону сталі пагранічнікі. Упраўляючы саўгаса напісаў спачатку скаргу ў Слуцкі павятовы зямельны аддзел на пагранічнікаў, на міліцыю, у рэшце рэшт яна дайшла да асобага аддзела Заходняга фронту. Упраўленне народнымі і калектыўнымі маёнткамі прасіла “даць распараджэнне пагранічнікам аб неўмяшанні ў справы мясцовых зямельных органаў і даць магчымасць выселіць усіх, хто падпадае пад прынятае рашэнне” [32, 511, л. 64].

Што ж тычыцца былых арандатараў і памешчыкаў, то яны аказаліся безабароннымі. Іх адладжаныя гаспадаркі, лад жыцця, нават сем’і разбураліся без жалю. Яшчэ не ствараўшы ўзамен нічога станоўчага, нават арганізацыйна не аформіўшыся, савецкія гаспадаркі падміналі пад сябе ўсё, што напрацавалі людзі за доўгія гады. У гэтым сэнсе прыкладам можа быць саўгас “Банцараўшчына”, створаны ў былым маёнтку, які з-за крайняй беднасці глебы не мог пракарміць уладальнікаў і пераходзіў з рук у рукі. Сяляне займаліся дадатковымі заробкамі, абслугоўвалі млын, але ў гады вайны іх становішча яшчэ больш пагоршылася. На восень 1921 г. у былым маёнтку існаваў зусім занядбалы саўгас, які нават не змог пасеяць азімыя, таму што не было чым. Інвентару было мала, ды і той патрабаваў рамонту, коням не хапала корму, збруі зусім не было (пазычалі ў сялян), будынкі былі запушчаны і напаўразбураны, лес

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

высечаны, лугі зараслі кустамі, масты спалены. У саўгасе пражывалі сем’і былых арандатара і млынара. Яны апрацоўвалі 63 дзесяціны, і таму, на думку ўлад, “падобнага вядзення гаспадаркі нельга дапусціць. У карыстанні зямлёй адмовіць”. На гэта арандатар заявіў, што “ніякіх правіл саўгаса не ведае і ведаць не хоча, хата належыць яму разам з надзелам зямлі. Ён выконвае падатак і таму можа весці аднаасобную гаспадарку, а савецкая ўлада хай што хоча робіць з ім і яго сям’ёй, хоць у ваду кідаюць, ён усё роўна не будзе падпарадкоўвацца саўгасу” [32, 511, л. 4, 5]. Вынік гэтай гісторыі – высяленне.

Не магла абараніць і больш талерантная пазіцыя, занятая некаторымі былымі арандатарамі. Напрыклад, арандатар маёнтка Уса Пархімовіч разам з дарослымі сынамі працаваў у саўгасе. Упраўляючы паведамляў, што “яны добрыя ўмельцы ў пакрыцці дахаў саломаю, у рамонце вазоў, работнікі старанныя і незаменныя”. Пархімовіч напісаў заяву, у якой прасіў не высяляць сям’ю, таму што “яны засеялі надзел і хацелі б сабраць ураджай”. Яго заява была падтрымана другімі рабочымі, якія пацвярджалі, што “нічога дрэннага Пархімовічы савецкай уладзе не зрабілі”. Але дзяржаўныя органы вырашылі інакш: “Пасля збору ўраджаю перавесці ў другі саўгас, калі ён не пагодзіцца, то выселіць тэрмінова, без права пражывання ў саўгасах” [32, 511, л. 12, 14].

У адносінах да былых памешчыкаў прымалася найбольш простая схема: патрабавалася толькі абвінаваціць у антысавецкай прапагандзе, і падстава да высялення была падрыхтавана. У адпаведныя органы паступалі паведамленні аб моцным уплыве былых памешчыкаў на рабочых, якія “адмаўляюцца працаваць і спадзяюцца на лепшыя часы” [32, 512, л. 30, 3].

Межы ўзніклых калектыўных гаспадарак часцей за ўсё вызначаліся адвольна, што выклікала незадавальненне навакольных вёсак. Мясцовыя выканкамы раздавалі сялянам сенажаці, чым былі не задаволены саўгасы. Як бачым, для ўзнікнення канфліктнай сітуацыі меліся грунтоўныя прычыны, аднак самая галоўная хавалася ў дзяржаўнай палітыцы, якая актыўна садзейнічала разбурэнню існуючай сістэмы, хаця новая, больш эфектыўная не была пабудавана. Савецкія гаспадаркі не змаглі прапанаваць вясковаму люду новыя адносіны, працягваючы карыстацца метадамі адпрацовак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

натуральнай платы за карыстанне сельскагаспадарчымі машынамі і інш. Аднак падобныя прапановы выклікалі адмоўную рэакцыю сялянства. Напрыклад, жыхары вёскі Асавец Мазырскага павета заявілі, што “другой паншчыны яны адбываць не будуць і слухаць наконт засявання саўгаснай зямлі не жадаюць” [32, 38, л. 41]. Але сістэма адпрацовак існавала, бо ні адзін, ні другі бок не маглі абысціся без яе. Часта назіраліся канфлікты паміж упраўляючымі і рабочымі, таму што апошнія не хацелі працаваць “за так”, а патрабавалі надзелаў, якіх ніхто не збіраўся ім даваць.

Прыметным было супрацьстаянне былых батракоў і навакольнага сялянства. Пры частай змене фронту ў маёнтках пакідалася жывёла, а коні не браліся ў падводную павіннасць, і рабочыя маёнткаў апынуліся трохі ў лепшым стане, чым суседзі. Аднак вяскоўцы не маглі спакойна перанесці гэтую сітуацыю і таму не саромеліся пасвіць скаціну на землях маёнткаў, шкодзіць на палях, садах, разбураць пабудовы, агароджы, аддаваць толькі частку сена за карыстанне сенакосам і г.д. Мелі месца і спрэчкі па зямельным пытанні. Напрыклад, батракі маёнтка Міхалкова Мазырскага павета засеялі азімы клін, а вясной хацелі атрымаць зямлі яшчэ, аднак сяляне не дазволілі гэта зрабіць на падставе таго, што “зямля ім патрэбна для рассялення” [32, 38, л. 76].

Вакол саўгасаў склалася досыць цяжкая сітуацыя. Не выпадкова на нарадзе каморнікаў адмежаванне саўгасаў вызначалася як галоўная задача на 1922 г., таму што ў большасці выпадкаў гэта адбывалася адвольна. Не магло не выклікаць абурэння вяскоўцаў няўмелае кіраванне былымі маёнткамі. Напрыклад, былы маёнтак Станькава графа Чапскага перадаваўся на баланс армейскіх органаў харчавання, якія накіравалі сюды атрад конных чырвонаармейцаў на чале з упраўляючым Бацвіннікам. Аказалася, што ён зусім не ведае земляробства, і ў выніку з 300 дзесяцін 34 чырвонаармейцы пры 33 конях узаралі толькі 30 [32, 17, л. 16].

Перадача былога маёнтка ў Станькаве армейскім органам прывяла да сур’ёзнага канфлікту, сутнасць якога бачна з пісьма батракоў ад 23 красавіка 1921 г.: “Пераход саўгаса Станькава ў веданне органаў харчавання пазбавіла нас нашых надзелаў, якія давалі нам і нашым дзецям магчымасць неяк пражыць. Пры цяперашнім становішчы нам пагражае поўны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

голад... Цэлае жыццё мы працавалі на памешчыка і жылі. Няўжо нам пры савецкай уладзе пагражае галодная смерць? Пагэтаму мы просім хутчэй прыйсці нам на дапамогу і надзяліць нас зямлёю. Няма ў нас ні насення, ні хлеба, а час не чакае...”. Улады прынялі рашэнне “срочно обеспокоиться” пераводам батракоў у другія маёнткі, дзе іх могуць прыняць [32, 512, л.39, 39 адв., 44]. Безумоўна, станькаўская гісторыя не надала большай папулярнасці савецкай уладзе, зусім наадварот. З такіх выпадкаў фарміравалася атмасфера вострай незадаволенасці вясковага люду зямельнай палітыкай савецкай улады.

Адна з малавядомых старонак першапачатковай калектывізацыі – камуны, якія стваралі былыя эмігранты. Безумоўна, з’ява гэта цікавая і сведчыць пра значны ўплыў рэвалюцыйных падзей на многіх людзей, якія захацелі вярнуцца на радзіму і садзейнічаць будаўніцтву новага грамадства.

У архіўных матэрыялах захавалася запіска на маленькім кавалку паперы, датаваная студзенем 1921 г., у якой адзін начальнік напісаў другому (даецца на мове арыгінала): “Что же Вы не используете работников, прибывших из Америки? Ходят товарищи и не ведают, что им делать. Это, братец, ненормальное явление. Вы должны о них позаботиться. Если возможно, пошли Рака и Харитончика в Иегумен” [32, 1, 34, л. 11].

Беларускія хлопцы, навучыўшыся ў Амерыцы і іншых краінах многім рабочым прафесіям, маючы вопыт працы ў заводскім калектыве і сякія-такія грошы, спадзяваліся выкарыстаць на радзіме свае веды і свядома ішлі на аб’яднанне сродкаў і стварэнне камун. Іх пажаданні падтрымліваліся савецкімі органамі, якія адводзілі эмігрантам былыя маёнткі. Ужо вясною 1921г. былі створаны камуны ў маёнтках Тадуліна Астрашыцка-Гарадоцкай воласці, Дайнічава Бабруйскага павета, Уса Мінскага павета і інш. [32, 1, 34, л. 71; 512, л. 74; 23, л. 58 адв.].

Некаторыя з эмігранцкіх камун змаглі наладзіць гаспадарку, купіць сельскагаспадарчыя машыны, пабудавацца і актыўна працаваць. Яны затым ператвараліся ў моцныя саўгасы, напрыклад “Дайнічава”, які ў 1922 г. у ліку 7 іншых меў нават сваю электрастанцыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некаторыя з эмігрантаў родам з мясцін, якія адышлі да Польшчы, не хацелі вяртацца туды і стваралі камуны. Напрыклад, у фальварку Багдановіча, што недалёка ад Старога Сяла Мінскага павета, эмігранты, ураджэнцы Піншчыны і Случчыны, і адна мясцовая сям'я арганізавалі камуну "Луч социализма". Яны прыступілі да працы 1 студзеня 1921 г. Фальварак аказаўся напаўразбураным, дом працякаў, гумно было без даху, вельмі дрэнна было з харчаваннем. Інвентар часткова камунары адрамантавалі, бо яны ўсе былі майстрамі па дрэве, па метале. А вось ці спраўдзіліся надзеі камунараў на лепшае жыццё, сказаць цяжка, вядома толькі, што ў 1924 г. камуна яшчэ існавала.

Дзве камуны абралі назву "Звязда". Адна з іх была арганізавана эмігрантамі ў пачатку 1921 г. у маёнтку Шарамысль Ігуменскага павета і прэтэндавала на маёнтак Шыпяны. Яе ядро склалі 19 эмігрантаў з Амерыкі і 2 былыя петраградскія рабочыя з сем'ямі. Камуна заявіла пра сябе актыўнай дапамогай галадаючым Паволжа, перадала ў фонд дапамогі ім каля 30 пудоў хлеба і ўзяла на выхаванне 5 дзяцей з раёнаў, што галадалі [46, 176, л. 8 адв.].

Камуна планавала правесці электрычнасць, адкрыць кавальскую і сталярныя майстэрні, паставіць цыркулярку і гантарэзку, завесці племянную жывёлу, для чаго прасілі пазыку. Значную дапамогу камуне аказваў Мар'інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум, які выдзеліў лакамабіль, а яго студэнты зрабілі перспектыўны план развіцця гаспадаркі. Савет камуны дзейнічаў досыць актыўна, не дапускаў сямейных непаразуменняў, прымаў у камуну толькі тых, хто мог прыстасавацца да калектыўнага жыцця. У параўнанні з суседняй камунай "Красный берег", якая ўзнікла ў маі 1921 г. па ініцыятыве эмігрантаў і праз 3 гады распалася, камуна "Звязда" дасягнула пэўных поспехаў. За 3 гады яна абзавялася шматлікімі жылымі і падсобнымі пабудовамі, сельскагаспадарчым інвентаром, майстэрнямі, дамашняй і рабочай жывёлай, птушкай, пасекай.

Ганарыцца было чым, і камунары вырашылі адзначыць сваё трохгоддзе ўрачыста. Яны запрасілі прадстаўнікоў ад Наркамата земляробства, ад 9 эмігранцкіх камун, якія існавалі ў межах Беларусі да ўзбуйнення, каб "наладзіць сувязь паміж камунамі". На ўрачыстым сходзе прысутнічалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камунары, 150 сялян з навакольных вёсак, прадстаўнікі з Мінска, ад сельгастэхнікума і ад камун. Было сказана шмат прамоў з заклікамі да працы “па камунізацыі сялянскага жыцця” [46, 176, л. 40, 41, 42, 43, 44].

Арганізатары камуны былі маладыя людзі, самаму старэйшаму, сталяру В.Булату, было 38 гадоў, астатнія, нават першы старшыня І.Жмырко, былі значна маладзейшыя. У хуткім часе І.Жмырко стаў студэнтам Камуністычнага універсітэта нацыянальных меншасцей. Камуна развівалася далей. У 1926 г. ураджайнасць жыта дасягала 90 пудоў з дзесяціны, было ўведзена шматполле, разбіты сад з гадавальнікам, пабудаваны млын з крупадзёркай, сталоўка, дзіцячыя яслі, працавалі вячэрняя школа для дарослых, бібліятэка, драмгурток. У 1924 г. камуна набыла трактар “Фардзон”. У 1925 г. за культурнае вядзенне гаспадаркі камунары былі ўзнагароджаны сельскагаспадарчымі машынамі, а ў 1926 г. на Усебеларускім конкурсе – дыпломам 1-й ступені.

Другая камуна з назвай “Звязда” таксама была створана ў 1921 г. групай рабочых-эмігрантаў з Амерыкі, але не дасягнула такіх поспехаў. Камуна атрымала 105 дзесяцін зямлі – ворыва, сенажаць, сад, агарод у маёнтку Тадуліна Астрашыцка-Гарадоцкай воласці. Аднак паступова рабочыя-“амерыканцы” пакінулі яе, ад’ехаўшы ў горад на заводы. На іх месца прыйшлі былыя члены калгасаў, бежанцы з Заходняй Беларусі, сяляне навакольных вёсак. У камуне на 1927 г. працавалі 25 чалавек, у асноўным былыя батракі.

Землі камуны былі ўпарадкаваны, але зямельнага плана яна не мела, бо шкадавала заплаціць за яго грошы. 23 дзесяціны сенажаці камуна здавала ў арэнду сялянам навакольных вёсак. Кантрольныя органы адзначалі недастатковы ўзровень развіцця жывёлагадоўлі, дрэннае харчаванне і ўтрыманне жывёлы, нізкую вытворчасць працы, слабую зацікаўленасць у яе выніках, нездавальняльную матэрыяльную забяспечанасць [8, 471, л. 34, 34 адв.].

Няпростымі былі адносіны камунараў і навакольнага сялянства. У некаторых выпадках гэтыя адносіны станавіліся прадметам абмеркавання. Так здарылася з камунай “1-е Мая” ў Плешчаніцах, створанай эмігрантамі ў маі 1924 г. Ёй адвялі 150 дзесяцін ворыва, 15 дзесяцін сенажаці, 150 дзесяцін



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

балота, якое яна здавала сялянам у арэнду і атрымлівала добрыя грошы.

Камуна мела свой млын і брала за памол столькі ж, колькі і прыватныя млынары, якія плацілі падатак, а камуна была вызвалена ад яго. Запасы збожжа камунары прадавалі перакупшчыкам-спекулянтам, а селяніну купіць хлеб у камуне было немагчыма. Сярод сялян камунары не вялі ніякай тлумачальнай работы наконт паляпшэння апрацоўкі зямлі, унясення ўгнаенняў, ды і ў сябе, у камуне, новага нічога не заводзілі. Мелі месца выпадкі, калі жыхароў навакольных вёсак збівалі за тое, што яны пасвілі кароў на незасеяным полі камуны ці ездзілі не па дарозе. Заключэнне пра дзейнасць камуны было наступнае: “Камуна гэтая толькі па назве. На самай справе яна штосьці накшталт калектыўнага памешчыка, які карыстаецца адведзенымі ўгоддзямі і сваёй маёмасцю для эксплуатацыі сялянскіх гаспадарак”.

Навакольныя савецкія і калектыўныя гаспадаркі, дакладней, іх безгаспадарчасць і імкненне навязаць вяскоўцам “сервітутныя адносіны” служылі пастаянным знешнім раздражняльнікам для вёскі. Сяляне патрабавалі “развярстаць” саўгасы, размеркаваць зямлю паміж малазямельнымі, таму што ніякай дапамогі з іх боку сялянства не бачыла. Адзін з хатнікаў паведамляў: «Сялянства лічыць, што саўгасы іх эксплуатуюць, наймаюць на працу, але мала плацяць, прымушаюць адпрацоўваць за пасьбу кароў і г.д. Вяскоўцы гавораць: “Каб не мы, дык саўгасы лопнулі б, а самі яны нічога паказальнага і дапамогі нам не могуць зрабіць, трэба іх развярстаць”» [14, 164, л.359].

Выпадкі ліквідацыі нерэнтабельных саўгасаў сялянства сустракала з вялікім задавальненнем, справядліва лічачы: “Як не зрабіў саўгас нічога паказальнага, дык і ў будучым зрабіць сваімі сіламі нічога не зможа” [14, 164, л. 336]. І, наадварот, незадаволенасць адносінамі з саўгасам сялянства пераносіла і на ўладу, разумеючы справу так, што “ўлада быццам бы спецыяльна трымае саўгас і не дае зямлі сялянам” [14, 164, л. 239]. Толькі ў канцы 1927 г. было прынята рашэнне ЦК КП(б)Б аб ліквідацыі сервітутных адносін паміж саўгасамі і вёскай і перадачы апошнім сенажацей у тым выпадку, калі “плошча сенажаці пераважае гаспадарчыя патрэбы савецкай гаспадаркі” [22, 22, л. 6]. Прымаліся і другія рашэнні агуль-

нага зместу, што дазваляла мясцовым уладам трактаваць іх па-свойму ці наогул не звяртаць на іх увагі. Напрыклад, Пухавіцкі райвыканкам, каб падняць аўтарытэт саўгасаў у вачах сялянства, лічыў неабходным “адмовіцца ад здачы з часткі зямлі і сенажаці на ўмовах, якія закабаляюць сялянства, палепшыць пастаноўку работы, паставіць на патрэбную вышыню інвентар, жывёлаводства, аказваць дапамогу сялянам пры пераходзе да ўдасканаленых сродкаў вядзення гаспадаркі” [47, 145, л. 202].

Такім чынам, першыя калектыўныя гаспадаркі ствараліся ці самымі абяздоленымі жыхарамі вёскі, ці бежанцамі і эмігрантамі. Калі першыя не мелі сродкаў, каб ператварыць калектыўную гаспадарку ў высокаэфектыўную, то другія валодалі некаторымі сродкамі для стварэння матэрыяльнай базы камун. Але і адны, і другія не мелі вопыту калектыўнай працы і ў большасці выпадкаў не змаглі дасягнуць прыметных поспехаў. Агульным у дзейнасці калектыўных гаспадарак было імкненне вырашыць свае матэрыяльныя праблемы за кошт навакольных сялян. Са свайго боку сяляне выказвалі незадаволенасць перадачай зямлі недзеяздольным калектывам, іх памкненнямі на ролю “калектыўных памешчыкаў”. У выніку аказалася, што замест таго, каб стаць для навакольных вёсак прыкладам перавагі сумеснай працы над аднаасобнай (як планавалася тэарэтычна), калектыўныя гаспадаркі выразна дэманстравалі матэрыяльную негрунтоўнасць і сацыяльна-псіхалагічную неадпаведнасць векавым нормам сялянскага ўкладу жыцця.

## 3. 3. Адносіны сялянства да сацыяльна-эканамічнай палітыкі другой паловы 1920-х гг.

Як ужо папярэдне адзначалася, пасля 1923 г. пачынаюцца шматпланавыя рэформы ў сельскай гаспадарцы, што было абумоўлена некаторай стабілізацыяй эканамічнага і ўнутрыпалітычнага жыцця краіны. Ад харчовага падатку ў рамках нэпа паступова перайшлі да грашовага, дапоўненага іншымі відамі спагнанняў з сялян. У зямельнай палітыцы – ад канфіскацыі памешчыцкіх маёнткаў і перадачы значнай часткі іх земляў у савецкія гаспадаркі, ад першых крокаў па надзяленні сялянства зямлёй да абвяшчэння новай зямельнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэформы праз абрэзку напаўпрацоўных гаспадарак. Калі ў першыя гады нэпа толькі пачыналіся размовы вакол кааперацыі, то з 1923 г. разгортваецца мэтанакіраваная прапаганда па стварэнні кааператыўных аб'яднанняў, ад спажывецкіх да вытворчых.

Сваю пазіцыю сялянства дэманстравала і ў адносінах да іншых праяў дзяржаўнай палітыкі, напрыклад класавага падыходу пры надзяленні зямлёй, спагнанні падаткаў, стварэнні грамадскіх аб'яднанняў у выглядзе камітэтаў сялянскай узаемадапамогі і інш. Настрой вёскі, яе стаўленне да савецкай палітыкі праяўляліся ў розных формах: глухая незадаволенасць, ігнараванне перавыбараў сельскіх Саветаў, крытычныя выступленні на розных сходах, шматлікія скаргі і інш.

Можна адзначыць, што сацыяльна-псіхалагічная сітуацыя ў вёсцы была складанай. Па выніках праверкі паказальных раёнаў у кожнай акрузе Наркамат унутраных спраў канстатаваў: "Капыльскі раён: актыўны бандытызм, крымінал, непрыязныя адносіны да савецкай улады. У Зембінскім раёне сяляне самавольна высякаюць лес. У Петрыкаўскім раёне недастатковым аўтарытэтам карыстаюцца лясніцтвы, калгасы, саўгасы, камітэты сялянскай узаемадапамогі, часткова сельскія кааператывы. Лясніцтвы – за няўмелы падыход, саўгасы і калгасы – за паўнейшую безгаспадарчасць і бяздзейнасць. У кааперацыі ўзносы плацяць самагонам" [28, 1129, л. 22, 23].

На наш погляд, самым хвалюючым для вяскоўцаў з'яўлялася зямельнае пытанне, якое закранала ўсе без выключэння пласты сельскага насельніцтва, безумоўна, часцей за ўсё з процілеглых пазіцый. У сваім выступленні на IV сесіі ЦВК БССР у 1925 г. старшыня ЦВК А.Р.Чарвякоў зазначаў: "Рэзка выявілася імкненне вёскі абараніць сябе ад умяшання ў яе гаспадарку, бо нормы зямельнага права знаходзяцца ў супярэчнасці з інтарэсамі селяніна-аднаасобніка" [22, 6, л. 160]. Негатыўныя моманты выразна выявіліся ў непрадуманасці і паспешлівасці палітыкі землеўладкавання і знайшлі сваё адлюстраванне на старонках партыйных дакументаў, а потым і ў навуковых працах гісторыкаў партыі. Аднак яны разглядалі праблему толькі з пункту гледжання выпраўлення памылак у партыйнай лініі і крытыкі поглядаў Зм.Ф.Прышчэпава, а не з пазіцый сялянства. Апошняе праяўляла незада-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

воленасць выхадам на пасёлкі, гаворачы: “Нашто я буду павялічваць прыбытковасць сваёй гаспадаркі праз угнаенне зямлі, калі прыйдзе землямер, намерае пасёлкі і перамесціць мяне з майго ўчастка на чужы, нязручны для мяне” [557, с. 263].

Земленадзяленне за кошт абрэзкі зямлі ў больш моцнай групы сялян законна выклікала варожы настрой сярод іх у адносінах як да дзяржавы, так і да малазямельных аднавяскоўцаў. У асобных дакументах сустракаюцца тлумачэнні гэтага нерацыянальнага рашэння як спробы савецкай улады “натравіць бедных на багатых” [25, 179, л. 13а].

Незавершанасць земленадзялення і адсутнасць перспектывы ў гэтым працэсе абумовілі незадаволенасць і недавер сялянства да другіх відаў работы. Зямельнае пытанне выклікала самыя разнастайныя чуткі, падачу шматлікіх скаргаў і заяў. На некаторых раённых канферэнцыях беспартыйных прымаліся заклікі да беззямельных і малазямельных “павесці актыўную барацьбу з укрывальнікамі зямлі, выяўляць напаўпрацоўныя гаспадаркі” [8, 9, л. 2 адв.]. Так, дзякуючы дапамозе беднаты летам 1926 г. у Астрашыцка-Гарадоцкім раёне былі выяўлены 2710 дзесяцін ворыва, 799 кароў і 154 кані, укрытыя аднавяскоўцамі [550, с.145]. Перад жаданнем мець зямлю адыходзілі ўбок сваяцкія ці суседскія пачуцці, наогул ігнаравалася магчымасць разумнага рашэння, адбывалася неймавернае абвастрэнне адносін.

Трэба прызнаць, што аптымальна задаволіць зямлёй усіх жадаючых было праблематычна. Прычыны розныя: значная перанаселенасць вёскі, хуткае драбленне гаспадарак, адсутнасць дастатковай колькасці ўрадлівай і свабоднай зямлі, неабходнага матэрыяльнага забеспячэння, кадраў і інш. Значэнне мела і сялянская псіхалогія: у адных рознымі праўдамі і няпраўдамі захаваць свае надзелы, у другіх давесці іх да вызначанага мінімуму.

Паспешлівасць і непрадуманасць многіх рашэнняў на месцах выклікалі глыбокія канфлікты між суседзямі. Напрыклад, на Гомельшчыне, у вёсцы Рудня, частка сялян выйшла на пасёлак, атрымаўшы зямлю з дзяржаўнага фонду, а сенакос – з абшчыны. Безумоўна, гэта выклікала незадаволенасць астатніх, у справу ўмяшалася міліцыя, бо “пачаліся лаянкі, пагрозы фізічнай расправы” [39, 215, л. 635]. Ці другі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпадак: на Мазыршчыне сяляне адзіным фронтам выступілі супраць аднавяскоўца, які купіў зямлю ў 1919 г. і ператварыў гэты ўчастак у ворыва. Вяскоўцы даказвалі, што яна патрэбна ім як выган, аднак дзяржава падтрымала ўласніка. І пасля гэтага пачалася "вайна" паміж варагуючымі бакамі: адны бясконца травілі пасевы, другія падавалі ў суд і спаганялі страты [39, 567, л. 7].

Не менш востры для вёскі з'яўлялася праблема, звязаная з лесам, які патрэбен быў і для будоўлі, і на апал, а таксама даваў магчымасць многім зарабіць якія-ніякія грошы. У гэтай жыццёва важнай сферы назіраліся праявы самых разнастайных злоўжыванняў. На акруговым з'ездзе Саветаў у сакавіку 1927 г. дэлегат ад Самахвалавіцкага раёна скардзіўся: "Лес адпускаецца не будаўнічы, а грошы бяруць як за будаўнічы. Лясы мясцовага значэння перададзены ў карыстанне насельніцтва, а іх высякаюць былыя гаспадары" [4, 318, л. 47].

Неабходна засяродзіць увагу на факце расколу вёскі, які адбываўся не толькі па эканамічных прычынах, што з'ўлялася б аб'ектыўна заканамерным, але больш за ўсё дзякуючы дзяржаўнай палітыцы. Менавіта класавы падыход пры вырашэнні любой эканамічнай праблемы садзейнічаў расколу сельскага грамадства. На нашу думку, у першыя гады нэпа, асабліва ў 1921–1922 гг., вёска ў цэлым была не задаволена падатковай і зямельнай палітыкай. Увядзенне шматлікіх, узрастаючых з кожным годам, пачынаючы з 1923 г., ільгот беднаце прывяло да абвастрэння ўнутрывясковай сітуацыі. Нельга не ўлічваць, што ў кожнай вёсцы існавалі свае падспудныя інтарэсы, пэўныя адносіны паміж суседзямі, вяскоўцамі і сельсаветамі. Немалаважнае значэнне набывала і розніца ў эканамічным стане паміж асобнымі сельсаветамі, раёнамі і рэгіёнамі рэспублікі. Па гэтых прычынах у беларускай вёсцы 1920-х гг. не магло існаваць такой выразнай лініі падзелу сялян на групы, як аб гэтым пісалі навукоўцы папярэдняга перыяду, якія разглядалі праблему толькі з класавай пазіцыі.

Аналізуючы сітуацыю, сучаснікі вельмі трапна адзначалі яе асаблівасці і псіхалагічныя нюансы, і ў гэтым яны аказаліся на галаву вышэй за наступныя пакаленні навукоўцаў. Спашлёмся на адно з даследаванняў тых гадоў: "Паміж заможнымі і серадняцкімі гаспадаркамі, з аднаго боку, і бяд-

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

няцкімі, з другога, існуе значны антаганізм, які праяўляецца ўсякі раз пры рашэнні тых ці іншых грамадскіх пытанняў. Антаганізм гэты выліваецца ва ўзаемныя нападкі адзін на аднаго, прычым заможныя і найбольш моцныя серадмякі схільныя лічыць прычынай беднасці выключна нядбайнасць і няўменне весці гаспадарку (лежабокі, маўляў, гультаі, толькі за чужы кошт хочуць пажывіцца). Беднякі ж схільныя лічыць заможных сялян і серадмякоў кулакамі, хаця б гэтыя гаспадаркі вяліся выключна на працоўных пачатках і не карысталіся чужой працай” [76, с. 177]. Дарэчы, наяўнасць у вёсцы гультаёў прызнавалася і партыйным кіраўніцтвам рэспублікі [22, 7, л. 799].

На наш погляд, для партыйнага і савецкага кіраўніцтва галоўнай у адносінах з сялянствам стала ідэя класавага расслаення вёскі. Асновай для яе шматварыянтнай распрацоўкі сталі высновы У.І.Леніна. Звяртаем увагу на выказванне наконт неабходнасці “...раздзяляць, размяжоўваць селяніна працоўнага ад селяніна-ўласніка, селяніна-работніка ад селяніна-гандляра, селяніна-працаўніка ад селяніна-спекулянта. У гэтым размежаванні ўся сутнасць сацыялізму” [336, с. 271]. Улады розных узроўняў прыстасоўвалі гэтую думку да мясцовых умоў згодна сваіх разумовых здольнасцей. Асабліва актыўна гэтая ідэя пачала распрацоўвацца пасля XIV з’езда ВКП(б), аб чым сведчаць рашэнні пашыранага пленума ЦК КП(б)Б (студзень 1926 г.). У партыйных дакументах канстатавалася: “Класавыя адносіны вельмі стракатыя, патрабуюць асобага падыходу да мясцовых умоў. Не дапускаць зблытвання серадняка з кулаком, асабліва ў пытаннях абрэзкі зямлі, у льготах культурным гаспадаркам, у пытаннях выбарчых правоў” [22, 7, л. 799].

Менавіта тэорыя класавай дыферэнцыяцыі вёскі, а потым абвастрэння класавай барацьбы ў ёй сталі тым ідэалагічным міфам, на стварэнне якога былі кінуты лепшыя партыйныя, савецкія і культурныя сілы. Гэта вяло прамым шляхам да калектывізацыі і яе негатыўных праяў як у эканоміцы, так і ў палітыцы. Першапачаткова носьбітам самых перадавых і гуманных ідэй быў прызнаны пралетарыят, саюзнікам яго ў вёсцы аб’яўлялася бяднейшае сялянства. Пачынаючы з сярэдзіны 20-х гг. уся палітыка партыі была скіравана на яго падтрымку. Прычым падтрымка ішла па ўсіх лініях: зямель-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най, падатковай, крэдытнай, адукацыйнай, палітычнай і інш. Таму не трэба здзіўляцца "вялікай долі недаверу", з якой вёска сустрэла чарговы лозунг партыі: "Тварам да вёскі!" [22, 7, л. 800].

Падстаў да такога настрою існавала дастаткова, і адна з іх – рашэнне пленума ЦК РКП(б) у снежні 1925 г. аб стварэнні груп беднаты. Мабыць, улічваючы антыкамбедаўскі настрой сярод сялянства яшчэ з часоў Грамадзянскай вайны, падкрэслівалася "немагчымасць звароту да камбедаў". І ў той жа час канстатавалася: "Групы беднаты павінны стаць надзейнай апорай пралетарскай палітыкі ў яе барацьбе за аб'яднанне сераднякоў вакол пралетарыяту" [290, с. 413]. Нам падаецца, што рашэнне аб стварэнні груп беднаты з'явілася не выпадкова, бо "камбедаўскія настроі на вёсцы прысутнічалі досыць яўна", і партыя вырашыла выкарыстаць іх. Групы беднаты працавалі пры сельскіх Саветах, камітэтах сялянскай узаемадапамогі, кааператывах, яны вызначалі памеры падатку, размяркоўвалі крэдыты і г.д. Як паведамлялася ў адной са справаздач Саюза сельскагаспадарчых рабочых, "назіраецца ўзаемадзеянне ў распрацоўцы прымет кулацкіх гаспадарак" [47, 113, л. 1].

Згодна з афіцыйна прапагандуемымі рашэннямі вясковая бедната аказалася самай прывілеяванай праслойкай у вёсцы. Яе надзялялі зямлёй і праводзілі землеўладкаванне, існавала скідка ў 30% на продаж будынкаў беднаце. З 1927 г. пачало дзейнічаць правіла аб бязвыплатнай перадачы бядняцкім вытворчым кааператыўным аб'яднанням дзяржаўнай маёмасці на вызначаную суму. 10 мая 1926 г. на падставе рашэння Эканамічнай нарады пры СНК БССР за кошт бюджэту ствараўся спецыяльны фонд дапамогі беднаце ў памеры 500 тыс. руб. [34, 23, л. 50]. Як аказалася, дзесятая яго частка засталася нявыкарыстанай, а размеркаваныя сродкі не прынеслі патрэбнага эфекту. Дзеля таго, каб пазбавіцца негатыўных момантаў, у 1927 г. вырашылі накіроўваць сродкі ў некалькі раёнаў кожнай з акруг, з чым рашуча не згадзіўся наркам земляробства Зм.Ф.Прышчэпаў: "Лічу такі прынцып ... немэтазгодным. Трэба распаўсюджваць крэдыты па ўсіх раёнах, але так, каб уладкаваць аднаго бедняка і не дзяліць па рублю на кожны нос" [33, 23, л. 15].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сакавіку 1926 г. паводле рашэння саюзных органаў пры Белсельбанку ствараўся спецыяльны фонд крэдытавання беднякоў, які паступова перайшоў да крэдытавання вытворчых кааператываў.

На нашу думку, у падобных рашэннях было некалькі нерацыянальных момантаў. З пункту гледжання чалавечай маралі трэба прызнаць неабходнасць падтрымкі слабейшых, аднак нельга забываць, што яна адбывалася за кошт такіх жа бедных. Калі бедната (да 30% у 1926 г., 40% у 1927 г. усіх гаспадарак) атрымала падатковыя льготы, то ўвесь цяжар падатку быў ускладзены на астатніх. Безумоўна, гэта не спрыяла ўздыму як асобных сялянскіх двароў, так і сельскай гаспадаркі ў цэлым і не магло не выклікаць незадавальнення ў вясковым асяроддзі. У сваёй безагляднай палітыцы падтрымкі беднаты дзяржава прымала самыя непрадуманыя рашэнні. Было, напрыклад, рашэнне аб аказанні дапамогі беднаце за кошт сродкаў хлебанарыхтоўчых і кааператыўных арганізацый у лік будучага ўраджаю. Для тых, хто прымаў такое рашэнне, галоўнае заключалася ў тым, каб пазбегнуць авансавання і закабалення бяднейшай часткі вёскі заможнікамі. Але калі больш уважліва прааналізаваць сітуацыю, атрымоўвалася, што бедната трапляла ў дзяржаўную кабалу, а на заможных яшчэ больш узмацняўся падатковы ціск.

Нельга пакінуць па-за ўвагай факт бескантрольнай выдачы дапамогі, што з пункту гледжання эканомікі было неразумным. Дзяржаўныя органы, з аднаго боку, выдзялялі дапамогу беднаце, а з другога, канстатавалі: “Прызнаць, што сродкі, адпускаемыя дзяржавай, а таксама па лініі кааперацыі і крэдыту ... даволі значныя. Аднак размеркаванне не гарантуе іх пападанне да беднаты і тое, што яны пойдуць на гаспадарку. У некаторых месцах зусім адсутнічае ўлік” [34, 22, л. 428]. Трэба падкрэсліць, што падобная дапамога не магла стаць эфектыўным стымулам уздыму бядняцкіх гаспадарак, а сама бедната не магла стаць моцнай апорай савецкай улады. Яна, за выключэннем былых чырвонаармейцаў, была настолькі прыгнечана цяжкім эканамічным становішчам, што не асмельвалася прэтэндаваць на значны ўплыў у грамадскіх справах. Бедната не з’яўлялася аўтарытэтам і для аднавяскоўцаў, якія зусім справядліва асцерагаліся: “Яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выберэш, а калі пракрадзецца, дык што з яго возьмеш. З голага, як са святога” [14, 164, л. 414].

Афіцыйная лінія на падтрымку бедняка найбольш выразна праявілася ў падатковай палітыцы і выклікала своеасаблівую, чыста практычную пазіцыю сялянства, якое лічыла: “Летась аслабанілі, дык і сёлета аслабаняць” [38, 92, л.2], – таму не спяшалася выконваць падатак. Падчас перавыбараў сельсаветаў беднякі патрабавалі “павялічыць падатак на кулакоў за кошт беднаты” [558, с. 321].

Самыя розныя пачуцці і настрой праяўляліся пры ажыццяўленні дзяржаўнай падатковай палітыкі, якая не была стабільнай і лагічнай. Памяншэнне падатку на 1925/26 гг. выклікала здзіўленне сярод сялянства, якое спрабавала знайсці прычыну гэтай неспадзяванасці. У некаторых дакументах зафіксавана такое тлумачэнне: “Улада адчула слабасць і давай браць на вуду” [14, 164, л. 414]. Гэта адлюстроўвала сумненні сялян наконт сілы савецкай улады, аб якой у іх не паспела сфарміравацца ўяўленне як аб сваёй. У другіх мясцовасцях лічылі, што памяншэнне падатку “адбылося пад ціскам сялянства, асабліва ў пагранічных раёнах” [14, 164, л. 239]. Выклікала абурэнне прымусовая нарыхтоўка хлеба, многія вёскі аказваліся незадаволенымі абкладаннем жывёлы, асабліва коней, падаткам на сенакос, разрадамі ўраджайнасці. У адной з вёсак Астрашыцка-Гарадоцкага раёна настаўнік на сходзе сялян выступіў супраць падатку, даводзячы, што “за падатак рамантуюць сінагогі” [4, 389, л. 139]. Дзеля выратавання ад павелічэння падатку больш моцныя двары пазбаўляліся ад жывёлы, што прыводзіла да аслаблення сельскай гаспадаркі ў цэлым.

Страшэнна хвалявала сялянства нелагічнасць рашэнняў улады. Напрыклад, спачатку дазвалялася ствараць мясцовыя камісіі з сялян для вызначэння колькасці падатку, а потым прапанаваныя ёю памеры павялічваліся ў некалькі разоў. Як паведамлялася ў пісьме чырвонаармейца, “сяляне гавораць: навошта ж было ствараць мясцовыя камісіі і замазваць вочы сялянам, а проста ўзяў бы райвыканкам ды па сваім меркаванні абклаў падаткам” [40, 146, л. 4]. Да праблемы падаткаў трэба аднесці і шматлікія спагнанні з сялян у выглядзе пазык, самаабкладання, страхавання. Пазіцыя беднаты, якая вызвалялася ад гэтых павіннасцей, зразумела, а больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

моцная частка вёскі была настроена досыць рашуча. На сходзе ў вёсцы Гальцава Коханаўскага раёна заявілі: “Калі вы, бедната, будзеце галасаваць за самаабкладанне, не дамо ні сена, ні хлеба” [550, с. 146].

Розныя арганізацыі аказаліся ўцягнутымі ў гэты працэс. Лесанарыхтоўчыя органы, кааперацыя, ваенныя часці разлічваліся з сялянамі аблігацыямі, такая ж практыка разлікаў існавала і па найме. У адным з дакументаў канстатавалася: “З боку заможнай і кулацкай часткі вёскі аблігацыі набываліся на нязначныя сумы ў параўнанні з іх маёмасцю (на 2 р. 50 к. – 5 р.) і толькі з той мэтай, каб стварыць уражанне, што і мы, маўляў, разам з вамі прымаем удзел у мерапрыемствах Савецкай дзяржавы, дапамагаем будаўніцтву. Здараліся выпадкі варожых выступленняў і агітацыі супраць набыцця аблігацый з боку кулацкай часткі вёскі. Распускаліся чуткі, што гэта другі падатак, хутка будзе вайна, савецкай уладзе патрэбны грошы” [4, 250а, 87 адв.].

Справаздачы загадчыкаў хат-чытальняў даюць выразнае ўяўленне аб разнастайнасці балючых праблем вёскі. Яе хвалявалі валакіта і бюракратызм у лясніцтве, дарагоўля лесу, высокі пай у сельскагаспадарчых таварыствах і інш. Прыметную незадаволенасць сялянства выклікалі рашэнні судовых органаў, накіраваныя супраць грабежнікаў, якім, на думку вяскоўцаў, “цяпер толькі і жыць. Савецкая ўлада не можа ніяк справіцца з гэтым злом, бо і сама сядзіць слаба” [14, 164, л. 359]. Праблема хуліганства суадносілася з дзеяннямі ўлады. Напрыклад, выступаючы на з’ездзе дэпутатаў Астрашыцка-Гарадоцкага раёна ў лютым 1927 г., адзін з сялян сказаў: “Барацьба з хуліганствам вядзецца зусім слаба. Пішуць, ездзяць, судзяць, толькі паперу псуюць, а злачынец на другі дзень з’яўляецца” [5, 389, л. 125].

Такая тактыка не задавальняла вяскоўцаў. Яны не адчувалі сілы савецкіх законаў у дзеянні. Адсюль браў свой пачатак недавер да іншых мерапрыемстваў улады. З’яўлялася сумненне ў яе прадбачлівасці. Таму адзін з выступоўцаў на раённым з’ездзе Саветаў заявіў: “За мяжу хлеб адпраўляюць, а што за яго атрымліваюць, невядома. Трэба выручаць за хлеб каровы і машыны. СССР багацейшы за ўвесь свет, ёсць руда, але нічога ж не робяць; старое нішчаць, а новага не робяць” [4, 389, л.125]. На наш погляд, гэтае досыць смелае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступленне паказвае ўменне аналізаваць і жаданне трымацца асноўных прынцыпаў, правераных жыццём і сфармуляваных у апошніх словах сялянскага дэлегата. З пункту гледжання традыцыйных, устойлівых поглядаў, безумоўна, савецкая ўлада рабіла вялікую памылку, разбураючы старое і не будучы ў стане ствараць больш лепшае новае.

Кааператыўная палітыка дзяржавы і яе праяўленне на месцах дастаткова моцна турбавалі сялянства і падрывалі веру ў яе здольнасць дапамагчы ва ўздыме гаспадаркі. Як сведчаць дакументы, сяляне выказвалі незадаволенасць высокім працэнтам крэдытаў, павольным разглядам заяў у крэдытных сельскагаспадарчых кааператывах. Яны выказваліся досыць выразна: “Можна здохнуць, пакуль атрымаеш. Патрэбную суму не даюць, а калі ўлічыць вялікі пай, то прыходзіцца атрымоўваць вельмі мала” [14, 164, л. 359]. Практычныя вяскоўцы бачылі, што паявыя ўзносы ў кааператывы – гэта выкінутыя грошы. Атрымаць праз іх патрэбныя тавары было фактычна немагчыма. Хаця ў навуковай літаратуры ранейшага часу сустракаюцца разважанні аб вызваленні беднякоў і сераднякоў, дзякуючы дзяржаўнаму крэдытаванню, ад ліхвярскага крэдыту кулакоў, у сапраўднасці так не адбывалася.

Сістэма крэдыту на вёсцы аказалася настолькі не прыстасаванай да яе ўмоў, што гэта прыводзіла да супрацьлеглых вынікаў. Крэдытныя таварыствы, каб застрахавацца ад магчымых страт, патрабавалі вопісу маёмасці, якая павінна была перавышаць пазыку. У сувязі з тым, што ў бядняцкіх гаспадарках такой маёмасці не было, патрабавалася паручыцельства больш заможнага селяніна. У выніку бедняку даводзілася плаціць і таварыству, і паручыцелю, прычым паявы ўзнос і працэнты ад пазыкі налічваліся адразу. Тагачасныя даследчыкі адзначалі дрэнную арганізацыю крэдыту, якая быццам бы “наўмысна кідае бедняка пад апеку кулака і заможнага селяніна”. Афіцыйна прызнавалася, што крэдыты выдаваліся на гаспадарчыя патрэбы, а на самай справе большасць сялян “выкарыстоўвала крэдыт для выплаты падатку” [76, с. 184]. Пазыка бядняцкім гаспадаркам устанаўлівалася ў памеры не больш за 200 руб. пры 4% гадавых [33, 23, л. 2]. Такім чынам, крэдыт не садзейнічаў уздыму сялянскай гаспадаркі. Нараканні земляробаў выклі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калі таксама высокі працэнт і кароткатэрміновасць яго – ад 3 да 6 месяцаў. Гэта ставіла сялян у крайне цяжкае становішча, бо вядома, што зварот капіталу ў сельскай гаспадарцы адбываецца досыць павольна.

Акрамя грашовага, існавала і натуральнае крэдытаванне. У 1924 г. Цэнтральны зямельны склад рэспублікі адпусціў у крэдыт насення і сельскагаспадарчых прылад на суму амаль 500 тыс. руб., у 1925 г. – больш чым на 1 млн. Для абсталявання малочных заводаў было выдадзена 10 камплектаў неабходнага інвентару [33, 23, л. 130]. Аднак, на наш погляд, разглядаць развіццё крэдытнай сістэмы ў якасці прыкладу станоўчых зрухаў няма падстаў (а тым больш лічыць, як гэта прынята апошнім часам, што вёска ўвачавідкі багацела). Такія вывады грунтуюцца на колькасці купленых сельскагаспадарчых прылад і іншага без уліку першапачатковага матэрыяльна-тэхнічнага стану вёскі. Нельга, напрыклад, уявіць, ці маглі б, купіўшы ў 1925 г. 70 плугоў і 98 барон на 5749 двароў [8, 362, л. 189], сяляне Бягомльшчыны адразу разбагацець. Гэты працэс вельмі доўгі і цяжкі, але ўлады не хацелі і не маглі чакаць, а гістарычная навука пазнейшых гадоў знайшла доказы прагрэсіруючага развіцця вёскі.

Разглядаючы сацыяльна-псіхалагічны стан беларускай вёскі, нельга не звярнуць увагу на наступствы падзелу тэрыторыі Беларусі дзяржаўнай мяжой, што садзейнічала ўзнікненню “непажаданых настрояў у некаторых вёсках, якія блізка сутыкаюцца з польскімі войскамі. Апошнія вядуць антысавецкую прапаганду праз польскіх агентаў і кулакоў” [6, 6, л. 10]. На думку аўтараў паведамленняў, “жыхары адносяцца да савецкай улады з недаверам, дапускаюць магчымасць звароту палякаў і асцерагаюцца працаваць на карысць савецкай улады” [50, 12, л. 8]. На наш погляд, справа была не толькі ў антысавецкай агітацыі. Прадстаўнікі ўлады сваімі дзеяннямі ўнеслі значны ўклад у яе дыскрэдытацыю. Вось вытрымка са справаздачы ўпаўнаважанага па барацьбе з бандытызмам у Магільнянскай воласці: “...Адносіны да савецкай улады не акрэслены, усе вельмі напалоханы часткова прыходам палякаў, часткова бандытызмам... На камуністаў глядзяць вельмі блага, як на такіх, якія ўсё забіраюць і нічога не пакідаюць гаспадару, і грошы ні за што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

не плацяць, а за нязначную ўпартасць садзяць у турму...” [18, 234, л. 15 адв.].

На сацыяльна-псіхалагічны стан прыгранічнай вёскі, безумоўна, уплывалі масавыя пераходы мяжы і частыя выпадкі антыўрадавых дзеянняў. У справаздачы з той жа Магільнянскай воласці канстатавалася: «Дэзерціраў ёсць вельмі многа, але большасць уцяклі ў Польшчу і знаходзяцца недалёка ад мяжы пад кіраўніцтвам графа Чапскага, “начальніка Стаўбцоў”, як ён сам сябе называе. Згодна з расказамі і дакументамі, ён з’яўляецца самым апантаным праціўнікам савецкай улады... Ён аб’яднаў многіх нашых дэзерціраў, праз якіх спрабуе рабіць усялякае зло. Дэзерціры па начах прыходзяць да сваякоў, распытваюць аб усім і перадаюць свайму графу» [18, 234, л. 18].

У адносінах з прыгранічнымі вёскамі ўжываўся адпрацаваны метад загаду, які ствараў уражанне (асабліва ў справаздачах з месцаў) аб бурнай дзейнасці розных упаўнаважаных і адлюстроўваў нежаданне сялянства выконваць іх распараджэнні. Можна зразумець адмоўную рэакцыю хлебаробаў пры адсутнасці гарантававага пераходу мяжы на ўказанне “поўнасцю сабраць свой ураджай, нават калі землі застаюцца на польскім баку” [32, 17, л. 113], або нежаданне вяскоўцаў выбіраць непатрэбныя пасяўныя камітэты, нягледзячы на “прыняцце адпаведных мер пераканання” [50, 12, л. 8, 14].

Трэба ўлічыць, што ў некаторых вёсках жылі беларусы каталіцкага веравызнання, якія лічылі сябе палякамі і арыентаваліся на Польшчу. У вёсцы Корань на Лагойшчыне, згодна са справаздачай хатніка, “заўважана імкненне да Польшчы, таму тут праводзілася актыўная работа па тлумачэнні палітычнага і эканамічнага становішча Польшчы. Спадзявацца на хуткі паварот усёй масы да Саветаў вельмі цяжка. Насельніцтва фанатычна каталіцкае, і весці антырэлігійную прапаганду прыходзіцца вельмі асцярожна” [14, 216, л. 47]. Загадчык Заслаўскага народнага Дома паведамляў: “Частка насельніцтва падтрымлівае савецкую ўладу, другая (шляхта) свайго настрою не паказвае, але здольная разносіць розныя небыліцы і, безумоўна, не зусім па-савецку настроена” [14, 164, л. 232]. Любыя дзеянні ўлады сумежных дзяржаў трактаваліся сялянствам адназначна: “Будзе вайна”. Напрыклад, арышты кіраўнікоў Беларускай сялянска-рабочай грамады і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступленне К.Я.Варашылава з гэтай нагоды садзейнічалі ўзнікненню трывожнага настрою і прывялі да масавых закупак газы і солі. Даходзіла да таго, што "сяляне баяліся трымаць камуністаў на кватэры" [4, 389, л. 139].

У адрозненне ад нездавальняльнага стаўлення значнай часткі сялянства да савецкай улады можна адзначыць у цэлым яго добрыя адносіны да Чырвонай Арміі, хаця і тут трэба звяртаць увагу на два моманты. З аднаго боку, вяскоўцы лічылі, што, прайшоўшы ваенную службу, "можна многаму навучыцца і паразумнець". Сярод моладзі наогул існавала думка: "Хто не схадзіў у армію, той не чалавек" [14, 164, л. 360]. З другога боку, адносіны паміж канкрэтнай вёскай і канкрэтнай вайсковай адзінкай не заўсёды з'яўляліся такімі ўзнёслымі. Сялян абурала, што "чырвонаармейцы самавольна пасвяць коней на сенакосе і ніхто не прымае мер, пагранічныя атрады не выплачваюць у час грошы за працу на кардонах" і г.д. [6, 38, л.278]. Напружанасць паміж вёскай і ваеннымі праяўлялася ў тым, што сяляне не дапускалі абрання чырвонаармейцаў у склад разнастайных таварыстваў, аб'яднанняў [37, 38, 278 адв.].

Вялікія страты наносіліся вёскам падчас ваенных вучэнняў. Ваенныя абяцалі выплачваць кампенсацыю згодна з ацэнкамі спецыяльнай камісіі. Але часцей за ўсё яны прапаноўвалі сялянам працаваць у полі толькі ў канкрэтны час. Вясною 1925 г. негатыўныя пачуцці ўскалыхнулі многія вёскі Полаччыны. Па рашэнні вышэйшых саюзных і рэспубліканскіх устаноў у раёне было запланавана пабудаваць артылерыйскі палігон, дзеля чаго падлягалі высяленню некалькі вёсак. Гэтая складаная з розных пунктаў гледжання справа цягнулася шмат месяцаў і закончылася на карысць ваенных, аб чым мы яшчэ будзем гаварыць ніжэй.

Досыць складанае пытанне і аб адносінах вёскі да мясцовых камуністаў. Трэба сказаць, што ў вёсцы працавала іх не так і многа, хаця дакладную лічбу вызначыць цяжка. Напрыклад, М.Е.Шкляр называе лічбу 2436 сельскіх камуністаў на люты 1924 г. і 5240 на студзень 1926 г. [558, с. 316], а ў дакументах ЦК КП(б)Б на люты 1925 г. падаецца лічба больш за 2 тыс. сяброў і кандыдатаў партыі на вёсцы [22, 6, л. 51]. Мы мяркуем, што ўсе лічбы адлюстроўваюць невялікую колькасць камуністаў у параўнанні з сельскім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насельніцтвам, паводле перапісу 1925 г. – 4135 тыс. чалавек. Акрамя гэтага, неабходна адзначыць нізкі адукацыйны ўзровень сельскіх камуністаў. Згодна даных М.К.Сакалова, у 1927 г. 90,8% членаў КП(б)Б мелі пачатковую адукацыю [456, с. 172]. Па гэтай прычыне іх уплыў на грамадскае жыццё вёскі і яе сацыяльна-псіхалагічны стан не мог быць прыметным. Тагачасныя навукоўцы адзначалі: "Усе пытанні, якія цяпер хвалююць сялянства, менш за ўсё хвалявалі мясцовыя партыйныя арганізацыі. Гэта самы слабы бок іх работы [76, с. 186]. ЦК КП(б)Б таксама звяртаў увагу на выпадкі "скажэння лініі партыі на вёсцы вясковымі камуністамі, што выяўляецца ў грубейшых палітычных памылках у падыходзе да сялянства, у бюракратызме, у беззаконні, ва ўкрыванні злачынстваў, у прамых злачынствах" [22, 6, л. 50]. Для паляпшэння работы ў вёску ў пачатку 1925 г. было накіравана 398 адказных работнікаў [558, с. 313], перад якімі ставілася задача стварэння актыву вакол партячэек. Аднак, па сведчанні сучаснікаў, "прысланыя камуністы неахвотна прымаюць удзел у рашэнні мясцовых спраў, лічачы іх дробнымі і нявартымі ўвагі і выступаюць толькі па агульных пытаннях"[76, с.181].

Навукоўцы папярэдніх гадоў удзялілі дастатковую ўвагу пытанню адносін паміж горадам і вёскай. Адзначалася, што існавалі часовыя супярэчнасці, выкліканыя неэквівалентнымі цэнамі на тавары прамысловасці і прадукцыю сельскай гаспадаркі. Праблема "нажніц цэн" існавала ўвесь нэпаўскі перыяд, станавілася то больш, то менш вострай. Восенню 1923 г. цэны на прамысловыя тавары былі максімальныя, вясною 1926 г. – не намнога ніжэйшыя. "Таварны голад" 1925 г., на думку даследчыкаў гэтай праблемы, "ствараў пагрозу аслаблення эканамічнай змычкі горада і вёскі" [550, с. 148]. Справядлівая незадаволенасць вёскі разглядалася толькі з пункту гледжання партыйных органаў на гэтую з'яву і хуткага пераадолення яе негатыўных праяў. Напрыклад, М.Е.Шкляр падкрэсліваў: "У тых абставінах, якія склаліся ў вёсцы ў 1924 г., калі стары маральны капітал, набыты ў сялянскіх масах у перыяд Кастрычніка і адмены харчразвёрсткі, стаў змяншацца, Камуністычная партыя ўзмацніла барацьбу за далейшае ўмацаванне саюза рабочага класа і сялянства" [558, с. 286]. Заўважым, што аўтарытэтны гісто-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рык партыі недвухсэнсоўна гаворыць аб складанасці сітуацыі ў вёсцы ў канцы 1924 г., якая, дарэчы, выразна праявілася падчас перавыбараў сельсаветаў, аб чым будзе сказана ніжэй.

Аднак, лічым, адносіны вёскі і горада патрабуюць больш дакладнага вывучэння і аналізу, таму што антырабочы настрой у вёсцы праяўляўся досыць выразна і шматгранна. У некаторых дакументах ёсць сведчанні такога характару: "Часам чуваць словы незадаволенасці ў адрас горада, маўляў, горад у лепшых умовах, рабочыя лепш жывуць..." [14, 164, л. 359 адв.]. У іншых: "Рабочыя атрымліваюць добрую пенсію і забяспечаны лепш, чым сяляне" [4, 389, л. 125]. Вяскоўцы разглядалі горад як асяродак дабрабыту, які ўтварыўся таму, што яго жыхары не плацяць падаткаў і атрымліваюць вялікую пенсію. Адкрыта вылучаліся патрабаванні: "Браць больш падаткаў з пяра ды з таго, хто піша, са шчыблетаў, а не з лапцей" [4, 276, л. 85]. Хутка пераадолець антырабочы настрой не дапамагло і шэфства горада над вёскай, якое ставіла галоўнай задачай арганізацыйна-гаспадарчую і ідэалагічную дапамогу апошняй.

Нягледзячы на мноства самых разнастайных лічбаў у працах гісторыкаў папярэдняга часу, якія павінны характарызаваць вялікія поспехі шэфскай работы і станоўчую ацэнку яе вынікаў, нам падаецца, што з улікам агульнай сацыяльна-псіхалагічнай сітуацыі ў вёсцы і матэрыяльнай слабасці горада няма падстаў прызнаваць значныя дасягненні шэфскай работы. У дакументах кантралюючых арганізацый адзначаецца, што "выезды шэфаў носяць кампанейскі характар, у іх удзельнічаюць няздатныя асобы, палова сродкаў траціцца на выезды. Сяляне толькі ведаюць, што прыехалі шэфы, спыніліся ў кагосьці, паелі і ад'ехалі. Нічога не зроблена для аказання гаспадарчай дапамогі вёсцы, мала зроблена для выяўлення актыву на месцы, аказання арганізацыйнай дапамогі" [23, 78, л. 165]. Крытычна ставіліся да сваёй дзейнасці і самі шэфы. Напрыклад, у справаздачы Барысаўскай акругі гаварылася: "Чаго ж ездзіць у вёскі рабіць даклады, сялянам гэта надакучыла. Трэба пра школу паклапаціцца, купіць бібліятэку" [23, 78, л. 17]. Выезды шэфаў характарызаваліся "параднасцю, мітынгоўшчынай, бессістэмнасцю, бясплана-васцю, спробай падмены вясковых устаноў, пошукамі самагонных апаратаў, выездамі-пагулянкамі" [23, 78, л. 20].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па прычыне адзначаных хібаў спарадычная дзейнасць шэфаў у вёсцы не магла прывесці да відавочных вынікаў і паступова ператварылася ў чарговую агульнадзяржаўную прапагандысцкую кампанію, якая мала кранала асноўную частку сельскіх жыхароў.

Невялікай пашанай у вяскоўцаў карысталіся камітэты сялянскай узаемадапамогі, якія ў Беларусі пачалі ўзнікаць у снежні 1921 г. і перад якімі ставілася задача барацьбы супраць эканамічнага закабалення беднаты больш заможнай часткай вёскі. Ажыццяўленне гэтай ідэі зноў-такі выявіла супрацьлегласць паміж тэарэтычнымі распрацоўкамі кабінетных творцаў і паўсядзённымі турботамі сялянства. Ды і ствараліся селькамы на аснове мясцовай эканамічнай падтрымкі, а больш дакладна, за кошт прымусовых узносаў заможных двароў і такой жа працы на карысць бедных, сем’яў чырвонаармейцаў, інвалідаў. Трэба думаць, што ў аснову іх дзейнасці быў пакладзены зразумелы з пункту гледжання маралі прынцып падтрымкі слабейшага, аднак заўважым, што рабілася гэта шляхам непасрэднага дзяржаўнага ўмяшання ў лёс іншых людзей, іх дабрабыт, матэрыяльныя магчымасці і планы далейшага развіцця. Палітыка падтрымкі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі працягвала лінію на аслабленне, нават разарэнне багатых гаспадарак, выраўноўванне вёскі. На нашу думку, не выпадкова ні ў адным архіўным дакуменце нельга знайсці станоўчага водгуку пра іх дзейнасць.

Камітэты атрымалі права назіраць за выкананнем на месцах савецкага заканадаўства і ўзбуджаць судовыя іскі супраць парушальнікаў. Адразу ўзнікае асацыяцыя са знакамітымі камбедамі, аднаўлення якіх сялянства баялася, як стыхійнай навалы. Не разумеючы значэння селькамаў, многія мясцовыя работнікі адносіліся да іх стварэння абыякава і нават варожа. Напрыклад, па гэтай прычыне адбыліся датэрміновыя перавыбары выканкама ў Ігумене. Вёска таксама ставілася да іх адмоўна і слушна лічыла, што “селькамы патрэбныя толькі гультаям, а самаабкладанне ў іх фонд – новы від падатку” [481, с. 51]. На І Усебеларускім з’ездзе камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, які адбыўся ў сакавіку 1924 г., канстатавалася іх дрэнная работа на ўсёй тэрыторыі рэспублікі [28, 424, л. 23 адв.]. Такім чынам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няўдачай закончылася спроба дзяржавы актывізаваць вясковую ініцыятыву з мэтай падтрымкі бяднейшых гаспадарак: вынік аказаўся супрацьлеглым чаканаму.

Вышэйшай інстанцыяй пры вырашэнні ўсіх праблем для сялянства з'яўляліся сельскія Саветы, якія ўвасаблялі ў іх вачах савецкую ўладу. На сельсавеце "замыкалася" большасць праблем, ад падзелу аднавяскоўцаў на сацыяльныя групы да размеркавання падаткаў. Як вядома, Камуністычная партыя надавала сельскім Саветам важнае значэнне, але пакідала за сабой права кіравання імі. Па яе ініцыятыве пры сельсаветах ствараліся камісіі, у веданні якіх павінна было знаходзіцца ўсё вясковае жыццё. З 1925 г. пачынаюць фарміравацца сельскагаспадарчая, фінансава-падатковая, мясцовай гаспадаркі і добраўпарадкавання, гандлёва-кааператыўная камісіі [24, 1341, л. 50]. Аднак, на думку аўтара, гэтая ідэя, як і многія іншыя, аказалася нежыццёвай. Яна ўяўляла сабой усё тыя ж "нажніцы" паміж тэарэтычнымі распрацоўкамі і рэальнымі магчымасцямі. Тагачасная вёска не мела спецыялістаў, каб стварыць патрэбныя камісіі. А калі яны ўзнікалі, дык толькі на паперы. Шматлікія архіўныя матэрыялы пацвярджаюць непрацаздольнасць такіх камісій.

Важнай праблемай, безумоўна, з'яўляліся кадры. Справа не толькі ў нізкім агульнаадукацыйным узроўні, але і ў прывабнасці сельсавецкай пасады для многіх вяскоўцаў. Нам падаецца, што знаходжанне на ёй давала магчымасць амаль поўнага кантролю над вёскай. Спашлёмся на акт праверкі ад 18 мая 1927 г. Бароўскага сельсавета Заслаўскага раёна, які знаходзіўся ў сямі вярстах ад Мінска: «Аўтарытэтам сельсавет і яго прэзідыум сярод устаноў і арганізацый раённага і сельскага значэння, а таксама сярод бяднейшага сялянства не карыстаюцца. Увесь аўтарытэт складаецца са старшыні сельсавета, якога найбольш падтрымлівае заможная частка насельніцтва. Калектыўнай працы ў сельсавеце няма, бо старшыня і разумець калектыўнай працы не хоча. Бяднейшае сялянства кажа: "Калі будзеш актыўным і захочаш дапамагаць у працы сельсавета, то будзеш пазбаўлены права голасу..." Старшыня не прызнае і не хоча выконваць дырэктыў партыі і Савецкай улады» [4, 404, л. 26]. Трэба думаць, што не намнога лепшая сітуацыя існавала ў іншых раёнах Беларусі. Не выпадкова сяляне выказвалі незадаволенасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адсутнасцю з боку сельсаветаў увагі да савецкай законнасці, жадання арганізаваць работу так, каб кожны мог атрымаць дакладны адказ, бо "законы ляжаць на паліцах не разрэзаныя, а хуліганства квітнее" [25, 543, л. 298]. Па сведчанні пракурорскіх органаў, "кіруючы склад сельсаветаў зусім не вывучае існуючых законаў, не ведае Палажэння аб сельсавеце" [55, 437, л. 23].

Трэба думаць, што становішча і пазіцыя сельсаветаў як самых масавых органаў савецкай улады ў многім вызначалі стан сельскай гаспадаркі. Спашлёмся на паведамленне з таго ж Бароўскага сельсавета: "Развіццё сельскай гаспадаркі ідзе кепска. Агранамічнай дапамогі сельсавет не атрымлівае, і аграном у сельсавеце ніколі не бывае. Ветэрынарнай дапамогі таксама не бывае. Няма ніякіх кааператыўных аб'яднанняў. Выкананне сельскагаспадарчага падатку і страхоўкі слабае, на 77,4%. Неплацельшчыкі ў большасці – заможныя сяляне. Праца камітэтаў сялянскай узаемадапамогі вельмі дрэнная, дапамогі бедным, інвалідам не аказваецца" [4, 404, л. 26]. Яшчэ адзін прыклад, таксама з прыгараднага сельсавета, Прылепскага: "Сельсавет не ведае аб становішчы меліярацыйных таварыстваў, камуна ўвесь час знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане, і, нягледзячы на гэта, сельсавет ніколі не пацікавіўся яе становішчам, сельгаставарыства мае млын, які працуе дзень і ноч, а прыбытку няма" [8, 346, л. 28, 29].

Усё сказанае вышэй, на думку аўтара, дазваляе прызнаць, што большасць сельскіх Саветаў не зусім адпавядала ўскладзеным на іх задачам. Каб падняць ролю вясковых Саветаў, актывізаваць іх дзейнасць, ператварыць у апору сваёй палітыкі, дзяржава надавала вялікае значэнне перавыбарам сельсаветаў. Аб гэтым сведчаць усебаковая падрыхтоўка да перавыбарных кампаній і далейшы скрупулёзны аналіз вынікаў з вызначэннем канкрэтных мер па пераадоленні негатыўных з'яў. Вядома, што падчас выбараў адбывалася фарміраванне дзвюх супрацьлеглых сіл: з аднаго боку, улада і яе прыхільнікі, з другога – больш-менш эканамічна незалежная частка вёскі. Першыя дзейнічалі па адпрацаванай методыцы: арганізоўвалі мітынгі, сходы, праводзілі агітацыю праз установы палітасветы, другія імкнуліся захаваць дэпутацкія месцы за сабою разнастайнымі сродкамі. Звернемся да дакументаў, напрыклад паведамлення са Слуцкай акругі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Кулацтва ўсямерна праводзіла вярбоўкі беднаты і серадняцтва шляхам склікання сямейных нарад, на якіх рабіліся папойкі, збіраліся розныя матэрыялы, якія кампраметавалі кандыдатаў камуністычных ячэек, адпускаліся на час перавыбараў бясплатна самагонныя апараты для беднаты і сераднякоў, і на выбарчыя сходы прыводзілі ўсё сваё сямейства, якое мела права выбіраць” [5, 2, л. 92].

Трэба адзначыць, што складанасць перадвыбарнай сітуацыі знайшла адбітак у партыйных дакументах, якія адлюстроўваюць недавер сялянства да выбараў: “Усё роўна выберуць, каго хочуць” [22, 5, л. 201]. Больш дакладная карціна складваецца пры знаёмстве з дакументамі мясцовых органаў. Праўда, усе негатыўныя факты тлумачацца толькі праз дзеянні галоўнага класавага ворага – кулацтва. З аднаго боку, канстатавалася, што многія сяляне не прынялі ўдзелу ў перадвыбарнай кампаніі, гаворачы: “А чаго я пайду? Гэтыя сходы толькі здароўе псуюць”, – з другога, што кулакі рыхтаваліся выступіць на перавыбарах арганізавана і правесці сваіх у склад сельсаветаў, але бедната дала ім адпор, кажучы: “Цяпер мы ведаем, хто наш вораг, вось дзе нашы крывапійцы, а мы часта папракалі ўладу” [8, 92, л. 2].

Нельга не заўважыць таго, што вынікі галасавання адлюстроўвалі сацыяльна-псіхалагічны настрой вёскі, успрыманне ёю дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Галоўнае заключалася не ў класавым падзеле вёскі, а ў псіхалогіі сялян: нельга пакідаць па-за ўвагай іх незадаволенасць нядбайнасцю, безгаспадарчасцю, некампетэнтнасцю мясцовага кіраўніцтва, чыста тэарэтычнымі заклікамі і нічым не падмацаванымі абяцаннямі і нерэальнымі праектамі. Менавіта гэтыя акалічнасці прывялі да “галасавання нагамі”, асабліва ў час перавыбараў сельсаветаў восенню 1924 г. Заўважым, што гэта адбылося пасля рашэнняў XIII з’езда партыі аб паляпшэнні працы на вёсцы і лістападаўскага пленума ЦК КП(б)Б з яго заклікам: “Тварам да вёскі!”.

Зразумела, для ўлады вынікі перавыбараў сельскіх Саветаў восенню 1924 г. аказаліся неспадзяванымі і несуцяшальнымі. Па даных Наркамата ўнутраных спраў, восенню 1924 г. у працэдуры выбараў прынялі ўдзел: у Слуцкай акрузе – ад 13,8% да 21,7% насельніцтва, у Полацкай – ад 8% да 100%, у Віцебскай – ад 7,2% да 46,1%, у Калінінскай – ад 14,7% да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

78,7%, па рэспубліцы ў сярэднім удзельнічалі ад 30% да 35% сельскіх жыхароў [28, 429, л. 1, 8, 9]. Толькі ў адным Сітнянскім сельсавеце Полацкай акругі на выбарчы ўчастак з'явіліся ўсе жыхары, бо сярод іх распусцілі чуткі, што “за няяўку – штраф 3 рублі, таму збор быў поўны” [26, 1590, л. 113]. У дадзеным выпадку спрацаваў досыць арыгінальны метад агітацыі, у другіх месцах так зрабіць не здагадаліся.

Трэба думаць, вынікі выбараў не задаволілі кіруючыя інстанцыі, хаця, згодна з аналізам, праведзеным на студзеньскім (1925) пленуме ЦК КП(б)Б, “працэнт камуністаў, абраных у сельсаветы, узрос, выразна праявіўся значны ўплыў дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, якія склалі 51,2% усіх сяброў сельсаветаў” [22, 5, л. 201]. Пленум вырашыў, спасылаючыся на “незадаволенасць асноўнай масы беднякоў і сераднякоў вынікамі”, вясною 1925 г. правесці перавыбары больш чым у 55% сельсаветаў [558, с. 320]. На гэты раз былі ўлічаны некаторыя памылкі папярэдняй кампаніі, праведзена больш дэталёвая арганізацыйная і ідэалагічная работа, і вынік атрымаўся трохі лепшы: у выбарах прынялі ўдзел каля 42,5% выбаршчыкаў [365, с. 40].

У перавыбарнай кампаніі 1925/26 г. удзельнічалі каля 43,3%, у 1926/27 г. – 44,4%, колькасць абраных камуністаў і камсамольцаў склала 21,4% [22, 20, ч. II, л. 603]. Аднак, на думку аўтара, гэта не дае падстаў лічыць, што “Кампартыя Беларусі заваёўвала сярод працоўных сялян усё большы давер” [558, с. 321]. Пасля аналізу вынікаў выбарчых кампаній за некалькі гадоў, праведзенага Шацкім валвыканкамам у студзені 1927 г., было запісана: “Калі ў мінулыя гады насельніцтва глядзела, каб выбраць добрага старшыню сельсавета, дык у гэтым годзе яно на гэта не глядзела, а толькі старалася абраць працаздольных, актыўных, гаспадарлівых сяброў сельсаветаў, каб мець у вёсцы гаспадара” [4, 332, л. 55]. І яшчэ адна, досыць цікавая заўвага ў тым жа дакуменце: “Без спрэчак, арганізавана выбіралі ў Савет рэкамендуемых ячэйкамі Кампартыі, камсамола і беднатой сяброў сельсавета” [4, 332, л. 55]. Як бачна, дзяржаўная сістэма перамагла, сялянства прыняло навязаныя яму правілы і падтрымала рэкамендаваныя зверху кандыдатуры.

У сувязі з вышэйсказаным неабходна заўважыць, што спроба далучэння сялянства да грамадскага жыцця не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выклікала масавага энтузіязму. Прычына, на наш погляд, у тым, што прапагандысцкія кампаніі і рэальная дзяржаўная палітыка не адпавядалі патрэбам, настроям большасці вяскоўцаў. За гады савецкай улады вёска не заўважыла станоўчых зрухаў у адносінах да яе праблем. Наадварот, яна аказалася фактычна падманутай у сваіх эканамічных і сацыяльных спадзяваннях і ў адказ прадэманстравала адмоўнае стаўленне да афіцыйнай лініі. Працэс адаптацыі вёскі да сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы аказаўся незавершаным.

Безумоўна, нельга не прызнаць, што ў той жа час у вясковым асяроддзі фарміравалася праслойка, якая актыўна падтрымлівала палітыку савецкай улады, верыла ў яе абяцанні і ў лепшую будучыню. У першую чаргу гэта былі бяднейшыя сяляне, былыя чырвонаармейцы, моладзь. Менавіта на гэтую частку вясковага насельніцтва апіралася ўлада і, па трапным выразе аднаго з даследчыкаў, бязмерна "песціла" яе [460, с. 138].

## 3. 4. Савецкая палітыка перасялення і сялянства

Нягледзячы на цяжкасці перасялення падчас сталыпінскай аграрнай рэформы, яно было вызначана і савецкай уладай як адзін з галоўных сродкаў зніжэння аграрнай перанаселенасці, аднак не зусім адпавядала разлікам сялянства. Стаўка рабілася на калектыўнае перасяленне, што выклікала адкрытыя нараканні сялян. "Хачу ехаць у Сібір, – гаварыў адзін з дэлегатаў з'езда Саветаў Астрашыцка-Гарадоцкага раёна ў лютым 1927 г., а акруга не пускае, кажа: арганізуйцеся ў арцель. У хадакі па адным не пускаюць, а жонкі служачых катаюцца па ўсёй Расіі" [4, 389, л. 125].

Аб пачатку працэсу перасялення было заяўлена ў кастрычніку 1924 г. На працягу трох гадоў аб жаданні перасяліцца заявілі 42 тыс. сем'яў [304, с. 149]. Цяжка вызначыць суадносіны гэтай колькасці з агульнай колькасцю сялянскіх двароў, таму што ў многіх выпадках сям'я і двор маглі не супадаць, але калі мы нават возьмем найбольш рэальную, на наш погляд, лічбу 680 тыс. двароў, то і ў гэтым выпадку толькі 6–7% двароў заявілі аб сваім жаданні перасяліцца, у пераліку на сем'і і таго менш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

28 верасня 1923 г. была прынята пастанова СНК СССР “Аб парадку адводу земляў пад лагеры, стрэльбішчы, палігоны”. На яе падставе Рэўваенсавет СССР прасіў выдзеліць на поўначы Беларусі зямельную плошчу для артылерыйскага палігона. У снежні 1923 г. пачаліся размовы пра мясцовасць вакол в.Дрэтунь. Быў складзены каштарыс, паводле якога кожнаму сялянскаму двару абяцалася кампенсацыя ў 755 чырвонцаў для новага землеўладкавання, найму кватэр, падвод і г.д. [26, 3, 52, л. 15, 16]. 20 лютага 1925 г. Рэўваенсавет унёс новы праект у Савет працы і абароны. У ім адзначалася: 1) прызнаць неабходным устройванне артылерыйскага палігона і лагера для Заходняй ваеннай акругі; 2) прыняць да ведама згоду ўрада БССР на перасяленне ў другія раёны СССР грамадзян вёсак Аглоблінкі, Вырвіна, Ланцужа, Васільева, Стурлыгі, Гора, Узмокі, хутароў Падсосна, Падсосніца, Фамічэнкі, Сосны і Жэльцы, усяго 305 двароў з 1575 едакамі; 3) усе выдаткі адносяцца на кошт Наркамата ваенных і марскіх спраў СССР, якія выплачваюцца на рахунак Савета народных камісараў БССР [26, 3, 52, л. 10]. Рэўваенсавет прасіў правесці высяленне вёсак вясною 1925 г.

Аднак праект Рэўваенсавета быў распрацаваны пры адсутнасці заключэння СНК БССР ці хаця б Наркамата земляробства (НКЗ) аб кошце перадаваемых земляў і без дакладнага плана перасялення. Трохі пазней НКЗ Беларусі паведамляў, што “ён не пярэчыць супраць адводу зямель з усімі ляснымі пасадкамі, якія не ўяўляюць сабою вялікай каштоўнасці, і перасялення землекарыстальнікаў па прычыне маламоцнасці гаспадарак, малаўраджайнасці зямлі і наяўнасці ў Віцебскай акрузе запасаў зямельнага фонду” [26, 3, 52, л. 15]. Заўважым, што сяляне характарызаваліся як карыстальнікі, а не ўласнікі зямлі, і таму дзяржаўныя органы лічылі магчымым пазбавіць сялян права ёю карыстацца. Як падаецца, распрацоўшчыкі дакумента абсалютна не бралі ў разлік лёс людзей. Улады спачатку прынялі рашэнне аб палігоне на вышэйшым узроўні. Ніякага папярэдняга абмеркавання з самым зацікаўленым бокам – сялянамі – не праводзілася.

Пры выкананні ўрадавай пастановы адразу ўзніклі праблемы. 18 сакавіка 1925 г. Полацкі акруговы выканкам давёў да ведама Пастаяннага прадстаўніцтва БССР пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Савеце Міністраў СССР, што “ў сувязі з малазямеллем, якое павялічваецца кожны дзень за кошт яўрэйскага насельніцтва, якое пераводзіцца на сельскую гаспадарку, унутры акругі можна перасяліць толькі 100 сямей” [26, 1, 1590, л. 41]. Днём раней Віцебскі акруговы выканкам пастанавіў: “Прымаючы да ўвагі адсутнасць у Віцебскай акрузе вольных зямель і наяўнасць вялікай колькасці малазямельных, лічыць перасяленне ў межы Віцебскай акругі немэтазгодным” [24, 536, т. 1, л. 211].

Да ўдакладнення некаторых пытанняў падключыліся іншыя ведамствы. Напрыклад, адказны работнік Наркамата фінансаў Карп накіраваў у беларускае прадстаўніцтва ў Маскве тэлеграму з просьбаю затрымаць канчатковае рашэнне пытання аб палігоне да яго прыезду. Аднак старшыня СНК БССР Я.Адамовіч указаў прадстаўніцтву, што для яго “абавязковымі з’яўляюцца дырэктывы СНК, а не Карпа” [26, 3, 52, л. 8, 9].

10 красавіка 1925 г. СНК БССР дае дазвол на адвод зямлі пад артылерыйскі палігон і вайсковы лагер. У дакуменце падкрэслівалася, што “перасяленне за межы БССР павінна адбывацца выключна па жаданні перасяляемых. У першую чаргу ім выдзяляюцца землі саўгасаў Полацкай і Віцебскай акруг. Высяленне павінна адбывацца на працягу месяца, за гэты час Наркамат земляробства павінен забяспечыць грамадзян магчымасцю правесці сяўбу, выдзеліць лес” [32, 2817, л. 110]. Была створана камісія па перасяленні на чале з прадстаўніком Наркамата земляробства. Аднак на падставе цытуемага дакумента можна канстатаваць неадпаведнасць яго зместу і сапраўднай сітуацыі, а таксама аб ігнараванні надзённых інтарэсаў сялян.

У некаторых месцах улады спрабавалі арганізаваць вясковы актыў з ліку высяляемых, каб яны самі праяўлялі ініцыятыву. Аднак спроба разбілася “аб неймаверную цемнату і забітасць перасяляемых, таму што яны пагалоўна непісьменныя і вядуць гаспадарку амаль першабытнымі сродкамі” [32, 2660, л. 25], па гэтай прычыне, безумоўна, ініцыятыву праявіць не маглі. Тым больш далікатна, на наш погляд, трэба было падыходзіць да рашэння гэтай праблемы, таму што яна кранала лёсы многіх людзей, якія спрадвеку жылі на гэтай зямлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першай перасялялі жыхароў невялікай вёскі Вырвіна. У дакументах яна характарызуецца як “вёска бедная, ураджаі азімых каля 30 пудоў, яравых – 36”. Перасялялі вырвінцаў недалёка, за 33 вярсты. Спачатку выдзелілі кампенсацыю, а потым хтосьці здагадаўся, што яны не сеялі яравых і агародаў, таму можна зняць 20% дапамогі, бо ўраджай кампенсаваць не трэба [32, 2662, л. 18, 30]. Аднак ніхто перасяленцаў на новым месцы не чакаў. З абурэннем пісаў адзін з членаў камісіі, Лабаноўскі, аб скаргах перасяленцаў на мясцовыя ўлады, якія “не даюць ім займаць пабудовы, зневажаюць”. Ён патрабаваў ад мясцовага (Гарадоцкага) райвыканкама “выехаць на месца і дабіцца тэрміновай перадачы былых савецкіх пабудоў перасяленцам”, папярэджваў аб неабходнасці “ўважлівых адносін да перасяленцаў” [32, 2660, л. 25]. І ў той жа час, калі ад пажару згарэла ўся в.Сосна і жыхары не ведалі, “ці ім самім будавацца на старым месцы, ці чакаць перасялення”, Наркамат земляробства 18 мая 1925 г. адказаў: “Перасяленне адбыцца не можа з-за адсутнасці грошай” [32, 2817, л. 51]. Нам падаецца, што гэтыя два прыклады добра ілюструюць не толькі абыякавыя адносіны да лёсу дзесяткаў людзей, але і немагчымасць выканаць рашэнне СНК БССР ад 10 красавіка 1925 г.

У 1925 г. было пераселена 138 двароў у асноўным на землі зліквідаваных дзяржаўных гаспадарак. Працэс “прайшоў даволі паспяхова” – так палічылі ў Наркамаце земляробства. У наступным годзе, згодна даных Наркамата, перасяліліся 86 двароў, з іх у Беларусі засталася толькі 41 гаспадарка, астатнія падаліся хто куды – на заводы, фабрыкі, да радні, а “частка дагэтуль (дакумент ад 4.04.1927 г.) хадайнічае аб зямлі” [32, 2817, л. 52 адв.].

Аднак, як нярэдка бывае, толькі пачнеш справу, і тут жа ўзнікае праблема за праблемай. Падчас артылерыйскіх стрэльбаў у 1925 г. праявіліся хібы першапачатковага праекта. 8 сакавіка 1926 г. камандаванне Заходняй акругі пачало хадайнічаць аб пашырэнні палігона і дадатковым высяленні ў сувязі з “ваенна-тэхнічнымі патрабаваннямі”. 16 мая 1926 г. СНК БССР прыняў станоўчае рашэнне па гэтым пытанні. Полацкі акруговы выканкам пагадзіўся з ім пры ўмове, што “грамадзяне будуць пераселены за межы акругі па прычыне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вялікай перанаселенасці”. Старшыня СНК Я.Адамовіч падтрымаў палачан.

Для перасяленцаў так званай “другой чаргі” быў вызначаны каланізацыйны фонд у Томскай акрузе на 178 сямей, Ачынскай – на 211, Саратаўскай – на 60, на Урале – на 40, на Паўночным Каўказе – на 200 сямей [32, 2817, л. 2, 53].

У пачатку жніўня 1926 г. пачаліся сходы сялян 15 вёсак па абранні хадакоў, якія павінны наведаць месца перасялення. Два тыдні не сціхалі палкія спрэчкі. Адразу адмовіліся ад вылучэння хадакоў жыхары вёсак Дрэтунь, Гора, Стурлыгі і хутара Салоха, а потым да іх далучылася вёска Сваты, хоць спачатку і вылучыла хадакоў. 20 жніўня на нарадзе ў Полацкім акруговым зямельным аддзеле ў прысутнасці прадстаўнікоў ваеннай акругі і выканкама хадакі заявілі, “што яны будуць аглядаць зямельны фонд Сібіры і на Паўночным Каўказе, але, нават у выпадку іх прыгоднасці, ад заліку зямель адмаўляюцца, толькі паведамяць вынікі на сходках аднавяскоўцаў” [32, 2817, л. 3 адв.].

22 жніўня 1926 г. група хадакоў выехала спачатку ў Томскую акругу, потым планавалі наведаць адведзеныя землі ў Ачынскай акрузе і на Паўночным Каўказе. У цэлым падарожжа заняло 4 месяцы. 31 жніўня прыбылі на першае месца, і хадакі адразу прызналі «непрыгоднасць гарыстых, таёжных участкаў, скардзіліся на дрэнную ваду і што “заядае машкара”» [20]. Па сведчанні кіраўніка группы, “хадакі адмаўляліся падпісваць акты, баючыся, каб іх насільна не пасялілі на гэтыя землі. Усё ж удалося ўгаварыць іх даць асобна сваё пісьмовае заключэнне па кожнаму фонду ў той форме і рэдакцыі, у якой яны пажадаюць” [32, 2817, л. 4 адв.].

Не спадабаліся хадакам і землі ў Ачынскай акрузе, хаця там і жыло многа “сталыпінскіх перасяленцаў” з Беларусі. Яны патрабавалі ад суправаджаючага прадстаўніка Наркамата абароны агляду зямель Паўночнага Каўказа. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося ўгаварыць хадакоў пагадзіцца на замацаванне зямель у Ачынскай акрузе выключна для добраахвотнага перасялення. 10 кастрычніка прыехалі ў Растоў, але і тут зямля не спадабалася, таму што “яна больш падыходзіць для жывёлагадоўлі”. 31 кастрычніка 18 хадакоў вярнуліся на радзіму, астатнія тры атрымалі наказ прадаўжаць агляд [32, 2817, л. 6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 4 па 15 сакавіка 1927 г. адбыліся сходы ва ўсіх вёсках і хутарах. З 326 двароў, якія падлягалі высяленню, згадзіліся перасяліцца на Паўночны Каўказ толькі 61 сям'я, астатнія адмовіліся па "кліматычных умовах" і таму, што "грашовая кампенсацыя нязначная". Але і тыя, што згадзіліся перасяляцца, заявілі, што "яны адмовяцца гэта рабіць, калі астатнім дадуць зямлю ў Беларусі". Сярод сялян упарта хадзілі чуткі, што, каб вызваліць землі для перасяленцаў, будуць расфарміраваны савецкія гаспадаркі [32, 2817, л. 42].

Самыя вялікія праблемы ўзніклі з перасяленнем в. Дрэтунь. Па прызнанні ўлад "на яе раўняюцца астатнія вёскі... Грамадзяне в. Дрэтунь маюць добрыя заробкі ў вайсковых часцях, на палігоне і таму да перасялення адносяцца рэзка адмоўна, адгаворваюцца нежаданнем перасяляцца за межы БССР". Па гэтай прычыне камісія па перасяленні лічыла неабходным прыступіць у першую чаргу да перасялення дрэтуньцаў, не грэбаючы нават прымусам [32, 2817, л. 49, 51, 52].

29 красавіка 1927 г. была прынята пастанова СНК, дзе адзначалася: "Прапанаваць перасяліць 70 двароў вёсак Дрэтунь і Стурлыгі ў Ачынскую і Данскую акругі за кошт ваеннага ведамства". 7 мая камісія па перасяленні прыехала ў Дрэтунь, на агульным сходзе сялянам прапанавалі накіраваць хадакоў, аднак, як і ў 1926 г., дрэтуньцы адмовіліся гэта зрабіць. Яны сцвярджалі, што "іх вёска не мяшае лагерам". Калі ж ім даказвалі адваротнае, то сяляне пачалі гаварыць, што "ў Сібіры суровы клімат, які яны не перанясуць, у Данской акрузе, акрамя гарачыні, яны не змогуць прыстасавацца да вядзення гаспадаркі". Адным словам, на кожны аргумент камісіі сяляне давалі адказ. Пасля таго, як прадстаўнік ваеннай акругі, што ездзіў з хадакамі ў 1926 г., расказаў аб сібірскіх землях, прысутныя заявілі, што "яны, і не ездзіўшы, знаюць усё. У рэшце рэшт яны могуць зусім адмовіцца ад зямлі з тою ўмоваю, каб ім дазволілі жыць на месцы, у сваіх дамах, а сродкі яны будуць дабываць, працуючы на палігоне і фабрыцы" [32, 2817, л. 109, 110, 116].

Як бачым, вяскоўцы трымаліся ўпарта, спадзеючыся сваім адзінствам перамагчы сілу ўлады і адмяніць урадавае рашэнне. Аднак яны не ўяўлялі, каму намерыліся супраціўляцца. Савецкая ўлада валодала такім сродкам падаўлення любой апазіцыі, аб якім сялянства мала што ведала. Мы маем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на ўвазе “класавы падыход”. Вынікі дрэтуньскіх падзей былі падведзены ў дакладзе камісіі па перасяленні, у якім, між іншым, канставалася: «Больш заможныя ўсімі сродкамі спрабавалі сарваць перасяленне, падкрэсліваючы, што ім нідзе не знайсці такіх заробкаў. Так як перасяленне праводзілася ў 1925 і 1926 гадах, грамадзяне Дрэтуні паспелі падрыхтавацца для арганізаванай адмовы. Яны заявілі, што “калі яны не пажадаюць перасяліцца, то прымусова іх ніхто не выселіць”. Акрамя таго, уся вёска, за выключэннем 2–3 двароў, знаходзіцца ў сваяцкіх адносінах. На ўсе довады заяўлялі, што “яны перасяляцца не будуць”. Гэтым яны ўздзейнічалі і на грамадзян другіх вёсак, якія гавораць “мы перасялімся, калі пераселяцца дрэтуньцы”» [32, 2817, л. 119 адв.].

Калі ж вяскоўцы зразумелі, што яны ўсё роўна будуць пераселены, то патрабавалі перасяліць іх на землі саўгаса “Доўжа” Віцебскай акругі. На ўсе довады аб немагчымасці ліквідацыі такога саўгаса (па даных НКЗ саўгас з’яўляўся племяннной гаспадаркай з добра развітой племяннной справай і перапрацоўкай мясамалочнай прадукцыі) дрэтуньцы заявілі, што “калі нас высяляць можна, то і саўгас ліквідаваць можна, якія б перашкоды да гэтага не былі” [32, 2817, л. 120].

Безумоўна, дрэтуньцы мелі рацыю. У Беларусі ў 1927 г. налічвалася 265 саўгасаў рознага падпарадкавання і рознага ўзроўню развіцця. Без вялікіх страт для эканомікі Беларусі можна было землі некалькіх саўгасаў прадаць перасяленцам, аднак улады не хацелі пастурпіцца прынцыпам калектыўнага вядзення гаспадаркі. Са свайго боку, сяляне лічылі магчымым для сябе патрабаваць такія землі, такі саўгас, якія ім здаваліся найлепшымі. Па нейкіх прычынах іх не задавальняў саўгас “Баяры-Валадута”, дзе з 1926 г. ужо жылі 20 сямей перасяленцаў і была магчымасць уладкавацца яшчэ тром дзясяткам сем’яў. 8 мая на сходзе адмовіліся перасяляцца і жыхары в. Стурлыгі.

Тым не менш камісія вяла падлік кампенсацыі і падрыхтоўку да перасялення. Кожнай сям’і аб’явілі суму кампенсацыі. Аднachасова ў Новачаркаску на кожны двор закупляліся сельскагаспадарчыя прылады і нават трактар на ўсю вёску, планавалася выдаць кожнаму гаспадару па 125 рублёў на набыццё каня. Сяляне ўпарціліся і заяўлялі, што “на Дон не паедуць, толькі ў Доўжу”. Усё ж на 29 мая была

запланавана выдача грошай, а на 10 чэрвеня – перасяленне [32, 2817, л. 76, 79, 81].

Аднак жыхары Дрэтуні адмовіліся ад грошай і як апошні сродак супраціўлення накіравалі хадакоў спачатку ў Мінск, а потым у Маскву. Адначасова ў Маскву была адбіта тэлеграма: "41 домаўласнік у складзе 200 душ, большасць дзяцей, высяляюцца артпалігонам, пазбаўляюцца працоўных надзелаў. Выдзяляецца зямля на Паўночным Каўказе, разлікі ўбытку не закончаны, выплаты няма. Перасяленне спазнілася. Не прыстасаваны да клімату, быту, умоў жыцця Каўказа. Пасеваў у нас няма, наступае год галаду. Просім выдзеліць нам працоўныя надзелы ў маёнтку Доўжа Віцебскай акругі, ці ў межах БССР, ці ў суседніх паветах РСФСР" [32, 2817, л. 110].

Як бачым, сялянства шукала выйсце з крытычнай сітуацыі, прапаноўвала кампрамісныя варыянты і спадзявалася на справядлівасць цэнтральнай улады. Да іх аргументаў неабходна было прыслухацца, таму што перасяленне сапраўды спазнілася. Куды б сялян не перасялілі, адсеяцца яны ўжо не паспелі б і, безумоўна, людзей чакаў голад. Аднак праблема вырашалася традыцыйнымі бюракратычнымі метадамі. З Масквы быў атрыманы наступны адказ на тэлеграму: "Прымаючы да ведама, што перасяленцы абавязаны перасяліцца ў тэрмін, і ўлічваючы цяжкасці іх уладкавання ў Данской акрузе, НКЗ РСФСР просіць НКЗ БССР уладкаваць іх па магчымасці ў межах Беларусі" [32, 2817, л. 102]. НКЗ БССР звярнуўся ў Пскоўскую акругу, але мясцовыя ўлады адмовілі ў выдзяленні зямельнага фонду для перасяленцаў з Полаччыны.

Нечаканае ўпартае супраціўленне сялян прымусіла сакратарыят ЦВК вынесці абмеркаванне пытання на пасяджэнне прэзідыума. Яно адбылося 4 чэрвеня 1927 г. у прысутнасці членаў камісіі па перасяленні. На парадку дня стаялі пытанні: «1. Хадайніцтва грамадзян аб невысяленні іх у Сібір і Паўночны Каўказ, аб астаўленні іх у Беларусі і надзяленні зямлёй з саўгаса "Доўжа". Пастанавілі: 1. Лічыць неабходным захаванне ўстаноўленых СНК тэрмінаў і парадку перасялення. 2. Канстатаваць, што адпаведнымі органамі прыняты ўсе меры па кампенсацыі сялянам. 3. Калі не пажадаюць перасяляцца, то надзяліць іх зямлёю ў першую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаргу (у Беларусі. – *М.Б.*)» [32, 2817, л. 84]. 9 чэрвеня НКЗ за подпісам наркама Зм.Прышчэпава выдае загад, аналагічны вышэйпрыведзенай пастанове. Аднак на наступны дзень у Полацк прыйшоў новы загад НКЗ з дабаўленнем, што “неабходна выкарыстаць землі ў межах Полацкай акругі, а ў некаторых выпадках і ў іншых акругах БССР” [34]. Мабыць, яго з’яўленне было выклікана тым, што сяляне на сходзе зноў адмовіліся і ад земляў у Полацкай акрузе, і ад грошай, а адправілі хадакоў у Мінск прасіць за перасяленне ў “Доўжу”. Яны ўказвалі, што кампенсацыя, прапанаваная ўладамі, гэта разарэнне іх гаспадарак, і прасілі павялічыць кампенсацыю ўдвая кожнаму двару і даць права пры адшуканні двара (самастойна) карыстацца зямлёй, якая да яго прымыкае [32, 2817, л. 87, 88, 96].

14 чэрвеня ў прысутнасці старшыні Полацкага акруговага выканкама адбыўся сход жыхароў Дрэтуні, на якім прысутныя заявілі, што “яны нікуды не паедуць, акрамя абраных імі зямель”, і патрабавалі кампенсацыі ад 8 да 5 тыс. руб. на двор. 15 чэрвеня адбылася сустрэча сялянскіх хадакоў з прадстаўнікамі ўлад. Вынікам яе стала рашэнне камісіі па перасяленні аб выплаце грошай і аб’яўленні тэрмінаў перасялення на свабодныя землі Полацкай акругі, а ў выпадку адмовы выслаць тры сям’і самых заможных і ўплывовых. У адказ хадакі адмовіліся ад агляду зямель і ад грошай.

Аднак спыніць дзяржаўную машыну аказалася немагчыма. 17 чэрвеня наркам земляробства Зм.Прышчэпаў у тэлеграме Полацкаму выканкаму і старшыні камісіі Сарокіну прапанаваў “узмацніць працу па выкананні пастановы ЦВК ад 4 чэрвеня. Пры адмове сялян высяляцца добраахвотна, не спыняцца перад высяленнем у прымусовым парадку”. Праз тыдзень тым жа адрасатам паступіла новая тэлеграма: “Дырэктывы на высяленне праводзьце ў жыццё”. 26 чэрвеня камісія па перасяленні перадала ваенным па акту сялянскія пабудовы ў Дрэтуні, пасевы азімых і вызначыла тэрмін перасялення – 7 ліпеня, а для трох заможных сямей – 3 ліпеня [32, 2817, л. 90, 91, 121 адв.]. Полацкі выканкам паступіў яшчэ больш рашуча і прапанаваў тры сям’і выслаць тэрмінова ў адміністрацыйным парадку, а астатніх – 4 ліпеня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для высялення першых трох сямей з Полацка прыбылі 10 міліцыянераў. Высялялі Бахаўцоў – Міхаіла, Восіпа і Антона – як найбольш заможных і “пад злосным уплывам якіх знаходзяцца астатнія”. 2 ліпеня прыступілі да пагрузкі рэчаў, а 3 ліпеня ў суправаджэнні міліцыі яны былі адпраўлены ў Данскую акругу. Астатнім аб’явілі, што “яны могуць добраахвотна рабіць пасадку, а ў выпадку адмовы будуць выселены прымусова”. 5 ліпеня амаль 70 сем’яў эшалонам былі адпраўлены. З даклада начальніка эшалона вядома, што па прыездзе ў Новачаркаск сяляне адмовіліся сяліцца, вырашылі вяртацца на радзіму, засталіся толькі 10 сямей, але і тыя ў хуткім часе вярнуліся [32, 2817, л. 119, 121 адв.].

Вёска Стурлыгі высялялася лягчэй, але за межы Беларусі сяляне выехаць адмовіліся. Некаторыя пасяліліся ў Баярах, а астатнія падаліся хто куды. Аналіз архіўных даных дазваляе зрабіць выснову, што пасля высялення ў 1927 г. 74 сем’яў з Дрэтуні і Стурлыг на наступны год у вёсках, якія падлягалі высяленню, засталося яшчэ каля 259 сем’яў. Мабыць, у 1927 г. былі выкарыстаны ўсе сродкі, таму пакінулі астатніх у спакоі, нават дазволілі жаць азімыя.

Дрэтуньская гісторыя высветліла шмат праблем. Пасля трохгадовага змагання з сялянамі старшыня камісіі па перасяленні, работнік Наркамата земляробства Сарокін у спецыяльнай запісцы зрабіў наступныя вывады: “Перш за ўсё неабходна знайсці свабодныя землі ў Беларусі і на іх перасяляць, а за межы рэспублікі – толькі жадаючых. Работы па перасяленні пачынаць з лютага, каб сяляне маглі прыступіць да палявых работ” [32, 2817, л. 123]. Безумоўна, ён меў рацыю, таму што, сапраўды, бюджэтны год пачынаўся ў кастрычніку і да лютага ваенныя паспявалі перавесці сродкі на перасяленне. Цікавай была прапанова Сарокіна аб замене грашовай кампенсацыі пабудовай жылля ці нарыхтоўкай леса на новым месцы. Запіска таксама сведчыць аб самых несправядлівых, ганебных адносінах да сялян, якім абяцалі падатковыя льготы і лес па льготных расцэнках, а на справе перасяленцы ніякіх ільгот не атрымалі.

Такім чынам, відавочна, што сяляне былі кінуты на волю лёсу. Пасля высялення Дрэтуні ЦВК і СНК БССР паспяшаліся адрапартаваць у Маскву аб паспяховым выкананні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

задання і выказалі спадзяванні, што “пасля дрэтуньскай гісторыі высяленне пойдзе лепш” [32, 2817, л. 111].

Лёс сялян-перасяленцаў па дакументах не праслежваецца. Безумоўна, кожны з іх уладкаваўся як змог, некаторыя абжыліся на новых месцах. Своеасаблівым помнікам апісваемых падзей можна лічыць чыгуначную станцыю Дрэтунь недалёка ад Полацка, у назве якой засталася жыць назва невялічкай вёскі.

З нашага пункту гледжання гісторыя дрэтуньскага перасялення досыць паказальная. Па дакументах можна прасачыць процістаянне сялянскай грамады і савецкай улады. Спасылкі першай на свае законныя правы, на нежаданне адрывацца ад роднай зямлі і іншыя важнейшыя аргументы не знайшлі паразумення ў другой. Перад выкананнем пастановы зыходзілі на нішто ўсе чалавечыя пачуцці, лёс, дабрабыт, будучыня людзей. Можна толькі меркаваць, колькі слёз было праліта сялянамі, колькі загублена здароўя і як была падарвана вера ў справядлівасць савецкай улады за гэтыя тры гады. Можна здзіўляцца іх упартасці. Мабыць, сілу ім давалі маральная ўпэўненасць у справядлівасці сваіх патрабаванняў, спадзяванні на спагадныя адносіны ўлады да іх як да пацярпеўшага па волі дзяржавы боку. Можна захапляцца адданасцю нашых дзядоў сваёй радзіме, любоў да якой не змаглі замяніць ніякія абяцанні і спакусы.

Разам з тым дрэтуньская гісторыя паказала, што пазбавіць людзей усяго – жылля, зямлі, будучыні – можна было без ніякіх наступстваў для ўлады. І калі мы разважаем аб рэпрэсіях у адносінах да сялянства ў гады калектывізацыі, то трэба прызнаць, што яны не былі выпадковымі і чымсьці новым. Наадварот, яны прадаўжалі, развівалі вопыт папярэдніх гадоў. Аб гэтым, між іншым, таксама сведчыць дрэтуньскае перасяленне.

## 3. 5. Вёска і савецкая культура

Поспех сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у многім залежаў ад хуткага ўкаранення новай культуры ў сялянскім асяроддзі. Менавіта сродкамі мастацтва партыя разлічвала хутчэй данесці да мас іх сутнасць, выклікаць масавую падтрымку ствараемых афіцыйнай прапагандай новых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыялістычных міфаў. Успрыманне вёскай новай культуры, суадносіны сялянскай і новай савецкай культуры, на наш погляд, – надзвычай цікавая і складаная праблема.

У 1920-я гг. актыўна працягваў развівацца працэс радыкальнай перабудовы духоўнага жыцця грамадства, галоўным зместам якога сталі пашырэнне партыйнай ідэалогіі і ўкараненне ў свядомасць народа новых уяўленняў. У гэтай праблемы ёсць некалькі важных аспектаў, і галоўны з іх наступны: ці гатова была вёска да ўспрымання новай ідэалогіі і культуры і ці адчувала патрэбу ў іх? Нельга адмаўляць, што ўнутрывясковая сітуацыя развівалася ва ўмовах вострага канфлікту, выкліканага сацыяльна-эканамічнай і культурнай палітыкай дзяржавы. Культурная сітуацыя характарызавалася супрацьстаяннем народнай духоўнай традыцыі і новай савецкай культуры, якая ўкаранялася ў сялянскім асяроддзі без уліку прынцыпу пераемнасці, пры адмаўленні спрадвечных духоўных каштоўнасцей.

Вышэй ужо было сказана аб матэрыяльнай беднасці беларускай вёскі, нават адзенне і жыллё селяніна адлюстроўвалі яе. Умовы, якія стварыла савецкая ўлада, аказаліся незразумелымі і нязвыклымі для селяніна. Гэта абумовіла ўзнікненне пачуцця няўпэўненасці, якое яшчэ больш абвастралася ад разумення немагчымасці дасягнення дабрабыту сваёй сям'і. Пазбаўлення ад такога ўнутранага дыскамфорту сялянства спадзявалася знайсці ў вопыце і традыцыях папярэдніх пакаленняў. Адзінай радасцю заставаліся рэлігійныя святы з усім іх рытуалам і тыя казкі, паданні, песні, прымаўкі, якія засталіся ад прашчураў і фарміравалі сялянскую ментальнасць з устойлівымі шматвяковымі вераваннямі і этычнымі нормамі.

Аднак рэвалюцыя прынесла зусім новыя погляды на навакольны свет і аб'явіла аб магчымасці яго перабудовы, у якой не прадугледжвалася месца для народнай культуры. Яна характарызавалася як дробнабуржуазная. Замест яе на вёсцы актыўна пачала насаджацца культура перамогшага пралетарыяту, сацыялістычная па змесце і нацыянальная па форме. Наколькі рэвалюцыйная тэрміналогія, заклікі аказаліся незразумелымі селяніну, занятаму сваёй спрадвечнай працай, досыць выразна паказваюць наступныя, на наш погляд, цікавыя факты. Яны тычацца настаўнікаў, самай адукаванай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на той час групы сельскіх жыхароў, якія таксама не маглі разабрацца ў палітычнай сітуацыі і ідэалагічных штампах. Некаторыя ўчынкі настаўнікаў, напрыклад вывешванне лозунгаў накшталт: “Хай жыве наш правадыр Якуб Колас!”, – сталі аб’ектам крытыкі на Усебеларускай нарадзе агітацыйна-прапагандысцкіх камітэтаў у жніўні 1927 г. [23, 151, л. 6]. Аб іншых выпадках, як “аб элементарнай палітычнай непісьменнасці”, паведамляў часопіс “Асьвета”. Настаўніца адной вясковай школы ў дзень 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі вывесіла ў школе лозунг “Няхай жыве міжнародная сацыял-дэмакратыя!”. Пры з’яўленні ў класе інспектара другая настаўніца загадала вучням устаць і заспяваць “Адвеку мы спалі, і нас разбудзілі” [431, с. 16].

Хацелася б звярнуць увагу на той факт, што вёска аказалася адзін на адзін з новым культурным уплывам. Нацыянальная інтэлігенцыя была нешматлікай, працэс яе фарміравання адбываўся досыць складана па прычыне неадназначнай пазіцыі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі. Сярод беларускай інтэлігенцыі таксама не існавала адзінага падыходу да палітыкі савецкай улады і да шляхоў нацыянальнага адраджэння. Па гэтых прычынах яна не магла ўзначаліць культурныя працэсы на вёсцы, якая апынулася пад уплывам палітыка-асветніцкай работы адпаведных устаноў.

Прапагандыстам партыйнай ідэалогіі, новай культуры стала моладзь, якая з энтузіязмам падтрымала прывабныя рэвалюцыйныя заклікі. Спашлёмся на слушную, на наш погляд, заўвагу А.Хоцінай наконт “маладнякоўцаў”: «Яны ўспрынялі рэвалюцыю як сваё кроўнае, марксізм-ленінізм лічылі вяршыняй дасканаласці і, нават не засвоіўшы лепшых дасягненняў сусветнай культуры... шырока размахнуліся: “Мы ўзышлі на беларускіх палях, узараных плугамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, расцём мы ў час пераходу яе да камунізму. Гэты час характарызуецца сваёй асаблівай культурай – культурай камуністычнага грамадства. Мы – маладняк гэтых новых усходаў – і разрастаемся на палях беларускага мастацтва, каб здзейсніць у ім ідэі матэрыялізму, марксізму і ленінізму”» [536, с. 14]. Таму не трэба здзіўляцца, што, напрыклад, свята Купалле вызначалася як “нацыяналістычны шабаш контррэвалюцыі”, а Каляды – як “свята буржуазна-кулацкай контррэвалюцыі” [417, с. 108].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўсе стагоддзі носьбітамі асветы і культуры з’яўляліся самыя адукаваныя і таленавітыя людзі. Памяць пра іх дзейнасць захавалася да сённяшняга часу і складае адну з самых цікавых старонак гісторыі. Аднак рэвалюцыйны энтузіязм выклікаў да жыцця адметных носьбітаў культуры, не вельмі адукаваных і нават малапісьменных, але поўнасцю адданых ідэям рэвалюцыі.

Трэба заўважыць, што сацыяльна-эканамічная палітыка партыі раскалола вёску на розныя групы. У той жа час культурная рэвалюцыя закранула кожную сям’ю, і падзел адбываўся ўжо на старэйшых і малодшых, бацькоў і дзяцей. Спрадвечны канфлікт пакаленняў набываў палітычнае адценне.

Праявай унутрывясковых канфліктаў, першапрычынай якіх з’яўляліся сацыяльна-эканамічныя праблемы, стала дзейнасць селькораў. Рэвалюцыйныя рамантыкі спрабавалі змагацца з контррэвалюцыйнымі, на іх погляд, паводзінамі асобных гаспадароў друкаваным словам або праз рукапісныя насценныя газеты. Некаторыя з іх за ідэю заплацілі жыццём, другія аказаліся вымушанымі пакінуць родныя мясціны. Асобныя канфлікты селькораў з вяскоўцамі набылі шырокі рэзананс і сталі прадметам абмеркавання ў вышэйшых партыйных інстанцыях і на судовых працэсах, якія актыўна асвятляліся ў друку.

У 1920-я гг. больш за ўсё размоў выклікаў камсамол. Тут было ўсё новае і незразумелае. Значная колькасць камсамольцаў мела сярэднюю адукацыю, і гэта дазваляла ім займаць аўтарытэтнае месца сярод моладзі. Паказальна, што большасць камсамольцаў паходзілі з заможных сем’яў. Па словах аднаго з сучаснікаў, “камсамол стаў праваднікам новых ідэй у масу і гушчу сялянскіх сем’яў і па... характары сваёй работы ламае вельмі многае ў старым сялянскім побыце. Старшае пакаленне сялянства вельмі туга разбіраецца, да чаго імкнецца новае пакаленне, аднак яны адчуваюць, што камсамолец ёсць нешта большае і вышэйшае, чым радавы селянін, і яны пагэтаму не толькі мірацца з тым, што іх дзеці – камсамольцы, але часта аб гэтым гавораць з гонарам” [76, с. 179]. Старшаму пакаленню прыйшлося мірыцца з бурнай мітынговай дзейнасцю моладзі, ператварэннем сваіх хат у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытальні, з’яўленнем драматычных гурткоў і іншымі праявамі юначага максімалізму.

З пераходам у 1924 г. да планавай палітыка-асветніцкай працы ў вёсцы, цэнтрам якой была вызначана хата-чытальня, адносіны сялянства да яе прыметна не змяніліся. Хаты-чытальні, нягледзячы на красамоўныя заклікі і падрабязную рэгламентацыю працы, усё роўна заставаліся “тапталам моладзі”, па трапным выразе аднаго з кіраўнікоў. У справаздачах хатнікаў вельмі часта сустракаюцца нараканні на тое, што “сяляне не хочуць ісці ў чытальню... Яны забітыя працай і стараюцца адпачыць. Сталаму чалавеку нельга зайсці ў хату-чытальню, бо там заўсёды непарадкі, якія падымае моладзь” [10, 78, л. 55 адв.]. Другія загадчыкі сельскіх палітасветустаноў больш шчырыя ў сваіх паведамленнях: “Сялянства беднае і само мала цікавіцца культурнымі справамі... Вынікаў культурнай працы на вёсцы пакуль што не відаць, аб гэтым больш гавораць, чым робяць. Прыйшлося шмат увагі звяртаць на стварэнне грамадскай думкі вакол хаты-чытальні” [10, 104, л. 25]. З вялікага мноства дакументаў толькі ў адным знайшоўся факт станоўчых адносін да працы хаты-чытальні. Сяляне (трэба думаць, моладзь) у вёсцы Суша Клічаўскага раёна “арганізавалі суботнік і далі 160 руб. на паляпшэнне хаты-чытальні” [23, 136, л.700].

Аналізуючы шматлікія дакументы, можна прызнаць, што аўтарытэт хаты-чытальні праз тэарэтычныя распрацоўкі, урадавыя пастановы, мясцовыя рэзалюцыі падымалі ўсе зацікаўленыя ў гэтым інстанцыі, ад старшыні Галоўпалітасвета да старшыні райпалітасвета. Аднак зацікавіць усіх жыхароў працай хаты-чытальні аказалася больш складанай справай, чым прыняць чарговую рэзалюцыю. Калі ўявіць, што ў 1927 г. у сярэднім адна хата-чытальня абслугоўвала 8–9 тыс. чалавек, а радыус дзеяння некаторых хат-чытальняў ахопліваў да 40 вёсак, пасёлкаў і хутароў, то каэфіцыент яе карыснага дзеяння ніяк не мог быць высокім. Спашлёмся на аналіз сітуацыі, якая сфарміравалася вакол сельскіх палітасветустаноў, падрыхтаваны Рабоча-сялянскай інспекцыяй. “Зацікаўленасць насельніцтва толькі пачынаецца, – гаворыцца ў адным з дакументаў. – Самі хаты-чытальні не знаёмяць людзей са сваёй работай і не робяць справаздач. Пастаянным наведвальнікам з’яўляецца моладзь, якая цікавіцца толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гульнямі. У некаторых месцах серадняki зацікаўлены ўздымам сваёй гаспадаркі і цікавяцца сельскагаспадарчай літаратурай. Наведванне хаты-чытальні грамадзянамі з другіх вёсак бывае ў тых выпадках, калі трэба пісаць заяву. Наведвальнікі дзеляцца на 3 групы: група ў 5–10 чалавек старэйшага ўзросту ў вольны час цікавіцца мерапрыемствамі і гутарыць; грамадзяне прыходзяць у сельсавет і заходзяць у хату-чытальню даведацца аб навінах; грамадзяне пасля службы ў царкве звычайна збіраюцца каля хаты-чытальні, і гэты момант выкарыстоўваецца для чыткі газет" [38, 1277, л. 16].

Паведамленні з месцаў дадаюць больш канкрэтнага ў гэты аналіз. Вось радкі са справаздачы Каралішчавіцкай хаты-чытальні Мінскага раёна: "Цяжка вывесці п'янства, бо назіраецца з'яўленне п'яных у чытальні з пагрозамі і вульгарнымі выразамі. У першыя дні работы хатніка прыходзіла да 9 чалавек п'яных" [14, 164, л. 248]. З клуба пры вучэбнай ферме ў Лошыцы паведамлялі, што "наведвальнікі паводзяць сябе нетактоўна, парушаюць цішыню, пры пастаноўцы спектакляў кураць і размаўляюць" [48, 38, л.8]. Безумоўна, можна спаслацца на адсутнасць агульнай культуры ў сельскіх гледачоў, аднак жа ў царкве ніхто не паводзіў сябе такім чынам. Новая культура, яе ўстановы, метады не здолелі заняць месца царквы, а яе работнікі не сталі "чырвонымі папамі".

Не карысталіся павагай сялянства і многія з хатнікаў. Праўда, у некаторых месцах яны так часта мяняліся, што насельніцтва не паспявала пазнаёміцца з чарговым загадчыкам. Напрыклад, "хатнік Струк па дарозе з Лепеля... валяўся ў п'яным выглядзе, быў падабраны і прывезены ў в. Красналучкі, і ўся вёска ім любавалася" [15, 359, л. 193]. У асобных дакументах прама ўказваецца, што "хата-чытальня працуе зусім слаба па прычыне неаўтарытэтнасці і непадрыхтаванасці хатніка" [14, 208, л. 152]. Кіруючыя інстанцыі на словах прызнавалі важнасць палітасветработы, аднак на справе не аказвалі хатнікам ніякай метадычнай дапамогі, і яны працавалі, як умелі і як хацелі. Нават падначаленыя, адчуваючы гэта, ставіліся да іх з пагардай. Спашлёмся на скаргу аднаго з загадчыкаў хаты-чытальні з Лагойскага раёна ў райвыканкам на вартаўніка, які "ні разу за месяц не падмёў памяшкання і пры людзях лаяўся" [9, 58, л. 29].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нельга абысці ўвагай і такія своеасаблівыя сродкі рэгулявання адносін паміж хатнікамі і навакольнымі жыхарамі, як скаргі і бескампрамісная крытыка. Напрыклад, восенню 1925 г. 20 жыхароў вёскі М.Бесяды з Лагойшчыны напісалі скаргу на загадчыка хаты-чытальні Зоркіна. У заяве тлумачылася, што ён "не правёў ні аднае чыткі, ні аднае гутаркі з грамадзянамі, у хаце-чытальні ніколі не бывае агню, нават дзверы заўсёды зачынены на кручок... І наогул наш хатнік не толькі не змог прыцягнуць масы да чытальні, але і адштурхнуў усіх..." [9, 98. л. 16]. Праз колькі часу, безумоўна, ужо чарговы загадчык гэтай хаты рабіў справаздачу на пасяджэнні райпалітасвета і станоўча характарызаваў сваю работу. Аднак судакладчык адзначаў: "Водгукі насельніцтва аб хаце-чытальні кепскія, таму што там няма ніякай чысціні, а хатнік не прытрымліваўся тых указанняў, якія яму даваліся" [14, 208, л. 156].

Не выклікала пажаданай рэакцыі і палітыка-асветніцкая работа, якая праводзілася сярод сялянства воінскімі, асабліва пагранічнымі, часцямі. Зноў, на наш погляд, выяўлялася неэфектыўнасць палітыкі пераносу цяжару адносін з сялянствам з эканамічнай у ідэалагічную плоскасць. Вёска не магла станоўча рэагаваць на палітыка-асветніцкія ініцыятывы ваенных, бо, заклікаючы сялян да выканання розных абавязкаў на карысць дзяржавы і арміі, яны рэгулярна забывалі плаціць ім за работу. Выступаючы на пасяджэнні Койданаўскага райвыканкама, камісар пагранічнага атрада канстатаваў: "Колькі нам ні прыходзілася арганізоўваць агульныя сходы, сяляне не заўсёды выслухоўваюць да канца даклады, а разыходзяцца без пары. Ёсць хаты-чытальні, створаныя ваеннымі часцямі, але з грамадзян іх ніхто не наведвае, за выключэннем вельмі маленькага працэнту моладзі, старых жа зусім не бачна" [49, 38, л. 8].

Не лепшыя адносіны былі паміж сялянствам і жыхарамі раённых цэнтраў, паміж вёскай і шэфамі. Што менавіта накладвала свой адбітак на праявы негатыўных паводзін з аднаго і другога бакоў, з упэўненасцю сказаць цяжка. Безумоўна, пэўны ўплыў аказвалі і адсутнасць агульнай культуры, і выразны антаганізм паміж горадам і вёскай. На гэтую акалічнасць звяртаў увагу сакратар ЦК КП(б)Б А.Крыніцкі ў сваім дакладзе на пленуме ЦК у снежні 1924 г.:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“...Горад, галоўным чынам па нацыянальнай прымеце, вельмі адарваны, нават супрацьпастаўлены вёсцы...” [22, 5, л. 57]. Гэтыя моманты, з аднаго боку, праяўляліся ў “нежаданні моладзі прыгарадных вёсак удзельнічаць у рабоце супольных самадзейных гурткоў, з другога – у ганарлівых паводзінах шэфаў на вёсцы, якія ніколі не паведамляюць аб сваіх выездах” [14, 216, л. 39]. Адзін з эпізодаў такой фанабэрыі трапіў на старонкі афіцыйнага дакумента: «Бываюць моманты, калі шэфы не дапамагаюць, а “абследуюць”, потым пішуць у газетах, нічога практычна не вырашаючы на месцы. Напрыклад, у Прылепскай ячэйцы (Астрашыцка-Гарадоцкі раён) былі шэфы, камсамольцы, нават адказныя асобы. Быў сход, ячэйка слабенькая, дакладчык, вясковы хлопец, вельмі коратка абгаварыў пытанне. Гэта дало нагоду шэфам напісаць фельетон у газету” [44, 187, л.503].

Праблема адносін сельскай грамады да ўстаноў палітасветы хвалявала адпаведныя кіруючыя інстанцыі, аднак вырашалася яна шляхам прыняцця чарговых указанняў: “палепшыць”, актывізаваць”, “удзяліць увагу” і г.д. У рэзалюцыі адной з нарад так і запісана: “Слаба пастаўлены ўлік масавых настрояў сялянства па важнейшых мерапрыемствах партыі і савецкай улады” [23, 109, л. 15].

У 1926 г. Галоўпалітасвет рэспублікі ўшчыльную зацікавіўся нізкай аддачай ад работы на вёсцы. Старшыня ГПА С.Шамардзіна выдала загад, у якім канстатавалася, што “насельніцтва ўжо менш цікавіцца нашымі святамі, яшчэ горшыя справы з мясцовымі кампаніямі...” [14, 187, л. 572]. Каб пераадолець гэтыя негатыўныя моманты, на Усебеларускай нарадзе агітацыйна-прапагандысцкіх камітэтаў у кастрычніку 1927 г. прапаноўвалася: “У агітацыйнай рабоце сярод сялян неабходна аб’ядноўваць агульнапалітычныя моманты з канкрэтнымі мясцовымі пытаннямі, каб сходы сялян мелі, акрамя палітычных мэт, і характар рабочых нарад, якія прымаюць пад кіраўніцтвам партыі рашэнні практычнага зместу” [23, 50, л. 377].

Пры азнаямленні з афіцыйнымі дакументамі ствараецца ўражанне бурнай і эфектыўнай дзейнасці сельскіх палітасветустаноў, аднак іх работнікі так не лічылі. Свае хваляванні наконт дрэннага стану хат-чытальняў, бібліятэк яны выказвалі ў пісьмовых справаздачах, заявах. Селькоры пісалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крытычныя заметкі. На I Усебеларускім з’ездзе хатнікаў адзін з дэлегатаў прама сказаў: “Моладзь павінна гуртавацца вакол хаты, але хатнік нічога не можа ёй даць, каб зацікавіць, адной гармоні мала...” [29, 1840, л. 138].

Усё сказанае вышэй дазваляе пацвердзіць вывад аб пасіўных адносінах большай часткі вясковага насельніцтва да дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. Вобразна можна ўявіць падзел тагачаснага вясковага грамадства на дзве часткі, склад якіх пастаянна мяняўся і якія не разумелі адна адну. Актыўнаму наступу культурнай рэвалюцыі, якая не ўлічвала маральны і культурны народны вопыт, сялянства супрацьпаставіла сілу традыцый, этычных і маральных нормаў і правіл, адпрацаваных стагоддзямі. Аднак адмоўная рэакцыя сялянства амаль на ўсе кірункі дзяржаўнай палітыкі не спыніла пранікнення яе ў вёску. Галоўнымі сродкамі гэтага працэсу былі абраны дыктат і сілавое вырашэнне кожнай, нават самай нязначнай, задачы. Адначасова савецкая ўлада фарміравала ў вёсцы сваю апору, выкарыстоўваючы для гэтага беднату і рэвалюцыйна настроеную моладзь, якія склалі сацыяльны фундамент для далейшых пераўтварэнняў.

* *
*

Сацыяльна-псіхалагічная атмасфера ў беларускай вёсцы 1920-х гг. фарміравалася ва ўмовах адсутнасці цэласнага падыходу да асобы сельскага працаўніка. Непаслядоўнасць афіцыйнай палітыкі, яе неадпаведнасць ментальнасці і спадзяванням беларускага селяніна пазбаўлялі яго пачуцця ўпэўненасці, надзеі на перспектыву, абмяжоўвалі яго ініцыятыву і звужалі яго жыццёвую стратэгію да ідэі простага выжывання ў канкрэтных умовах. Адзначаныя абставіны стваралі павышаную псіхалагічную напружанасць у вёсцы.

Вялікі ўплыў на сацыяльна-псіхалагічную атмасферу вёскі аказала рэзкая змена сацыяльнай палітыкі. Калі ў часы сталыпінскай аграрнай рэформы галоўнай апорай і аб’ектам дзяржаўнай падтрымкі з’яўляліся моцныя хутарскія гаспадаркі, то пасля рэвалюцыі арыентацыя змянілася на процілеглую. Неабходна прызнаць, што ідэі чорнага перадзелу і ўраўнілаўкі яшчэ да рэвалюцыі былі шырока распаўсюджаны сярод сялянства. Па гэтай прычыне ў многіх мясцовасцях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адмоўна ставіліся да жадання аднавяскоўцаў выйсці на хутар, сведчаннем чаго можа быць факт павелічэння ў 1913 г. больш чым у 2 разы [557, л. 130] падпалаў маёмасці хутаран у параўнанні з 1907 г. Пасля рэвалюцыі набыла афіцыйны характар палітыка абмежавання кулакоў і падтрымкі бедня-коў за кошт першых. Яна грунтавалася на адсутнасці на дзяржаўным узроўні ўяўлення аб недатыкальнасці прыватнай уласнасці. Наадварот, падтрымлівалася і ўкаранялася праз падатковую, зямельную палітыку, шматлікія грамадскія арга-нізацыі ідэя неабходнасці абмежавання магчымасцей развіц-ця перспектыўных гаспадарак, пераразмеркавання сродкаў на карысць слабых. Гэтым дзяржава фарміравала сваю сацыяль-ную апору на вёсцы.

Рэвалюцыя прынесла новыя погляды на навакольны свет і аб'явіла аб планах яго перабудовы. Рэвалюцыйны энтузіязм ахапіў многіх, асабліва моладзь, якая падтрымала культур-ную палітыку ўлады і стала яе актыўным носьбітам. Для большасці вяскоўцаў не зусім зразумелымі аказаліся формы і метады прапагандуемай культуры, яе ідэалагічныя штампы. Працэс укаранення новых духоўных каштоўнасцей закрануў амаль кожную сям'ю. Спрадвечны канфлікт пакаленняў набываў палітычную афарбоўку і садзейнічаў яшчэ большаму паглыбленню сацыяльна-псіхалагічнай напружанасці на вёсцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Працэс развіцця савецкага грамадства сведчыць, што 1921–1927 гг. з'яўляюцца своеасаблівым перыядам. У гэты час назіраўся некаторы плюралізм у падыходах да эканамічных, ідэалагічных, культурных і сацыяльных праблем. З'явіліся першыя станоўчыя зрухі ў справе ліквідацыі непісьменнасці, наладжванні сістэмы аховы здароўя, арганізацыі сеткі кааперацыі, аднаўленні сельскай гаспадаркі і інш. Аднак тэмпы і вынікі гэтых зрухаў не задавальнялі савецкую ўладу, і паступальнае развіццё грамадства было перарвана яе рашучым умяшаннем у ход падзей. Наступствы гэтага дастаткова добра вывучаны і даведзены да шырокай грамадскасці.

Разам з тым развіццё савецкага грамадства ў 1920-я гг. пацвярджае справядлівасць думкі, што адсутнасць навуковай канцэпцыі кіравання такім складаным сацыяльным арганізмам, як вёска, ігнараванне шматвяковых, правераных жыццём законаў сельскагаспадарчага развіцця, нежаданне ўлічваць асаблівасці вясковай духоўнай традыцыі вядуць да нечаканых адмоўных вынікаў. Гэта праявілася асабліва выразна на мяжы 1920–1921 гг. і 1927–1928 гг. І калі ў першым выпадку ўзніклыя негатыўныя з'явы савецкая дзяржава імкнулася ліквідаваць шляхам абвяшчэння новай эканамічнай палітыкі, то ў другім – праз адміністрацыйна-камандныя метады.

Ідэі новай эканамічнай палітыкі, яе падатковая праграма аказаліся мала прыстасаванымі да ўмоў беларускай вёскі. Штогадовае павелічэнне памераў харчовага, а потым грашовага падаткаў не стымулявала ўздыму і якасных змен у сельскай гаспадарцы. Арэндныя адносіны, наём рабочай сілы, свабодны выбар формаў землекарыстання былі дэклараваны, але не сталі прыметнай з'явай. Па гэтай прычыне складана пацвердзіць шырока распаўсюджаную тэорыю аб галоўнай ролі нэпа ў адраджэнні сельскай гаспадаркі. З метадалагічнай, навуковай і грамадзянскай пазіцый, якіх прытрымліваўся аўтар, відавочна, што гэты працэс адбываўся перш за ўсё на аснове руплівай працы сялян, натуральнага жадання кожнага палепшыць як мага хутчэй дабрабыт сваёй сям'і.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Малаэфектыўнай аказалася зямельная палітыка дзяржавы. Атрымаўшы ў спадчыну шматлікія праблемы: перанаселенасць вёскі, значная колькасць беззямельных, нізкая агракультура земляробства і інш. – савецкая ўлада не змагла з імі справіцца. Выкананне Дэкрэта аб зямлі зацягнулася на доўгія гады. У форме, якая першапачаткова абяцалася, працэс земленадзялення і землеўладкавання завершаны не быў і спадзяванні сялян не здзейсніў. З самага пачатку ён набыў непажаданы для вёскі кірунак класавага падыходу пры надзяленні зямлёй і прапаганды вытворчай кааперацыі. "Зямельная рэформа сярэдзіны 1920-х гг. наогул аказалася эканамічна бесперспектыўнай. Яна фактычна разбурала адносна моцны эканамічны фундамент, на якім можна было будаваць дабрабыт усяго грамадства. Эвалюцыя пазіцыі савецкай улады па зямельным пытанні знайшла адлюстраванне ў змене прыярытэтных кірункаў – ад абяцання падзелаў памешчыцкіх маёнткаў да абрэзкі напаўпрацоўных гаспадарак і потым да вытворчай кааперацыі.

Эканамічная і сацыяльная палітыка дзяржавы выклікала незадаволенасць значнай часткі вясковага насельніцтва. Падатковая палітыка 1921–1922 гг. амаль не ўлічвала прынцып класавага падыходу, таму ў вёсцы мела месца масавае незадавальненне харчпадаткам і метадамі яго спагнання. Сялянства змагалася з імі даступнымі яму сродкамі. Тым самым беларуская вёска знаёмілася не толькі з пафасам рэвалюцыі, але і з яе адваротным бокам.

З 1923 г. выразна праявілася арыентацыя ўлады на выкарыстанне класавага прынцыпу ў адносінах з вёскай. Лозунгі партыі на саюз з серадняком і апору на бедняка актыўна праводзіліся ў жыццё. Аднак бяднейшая праслойка вёскі не магла стаць эканамічнай базай дзяржавы. Наадварот, яна чакала дапамогі ад апошняй, сродкі на якую можна было знайсці толькі ў заможнай частцы. Палітыка апоры на бедняка кардынальна адрознівалася ад практыкі, якая існавала да рэвалюцыі і ўлічвала перш за ўсё інтарэсы заможных пластоў вёскі. Тым самым савецкая ўлада да ўвагі прымала галоўным чынам ідэалагічныя варункі, эканамічная перспектыва адсоўвалася на другі план. Шматлікія льготы бяднейшым садзейнічалі абвастрэнню традыцыйна складаных унутрывясковых адносін, росту сацыяльнай напружанасці на вёсцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яшчэ большаму яе расколу не толькі па маёмаснай, але і па ідэалагічнай прымеце. Класавая дыферэнцыяцыя вёскі паскарала фарміраванне савецкага і партыйнага актыву, стварэнне сацыяльнай апоры з асяроддзя незаможнага сялянства.

Неабходна канстатаваць наяўнасць разыходжання паміж тэарэтычнымі распрацоўкамі кіруючых інстанцый і іх практычным ажыццяўленнем. Рэальная сітуацыя аказалася больш складанай і шматграннай, чым уяўляла сабе кіраўніцтва партыі і дзяржавы. Доказам можна прызнаць неэфектыўнае ўкараненне эканамічнай і культурнай дзяржаўнай палітыкі на месцах, негатыўную рэакцыю большасці сялян на яе асобныя праявы, недакладнасць падзелу сялянства на заможнікаў, сераднякоў і беднякоў. Адной з прычын існавання такіх своеасаблівых "нажніц" паміж задуманым і здзейсненым стала адсутнасць кадраў сярэдняга і нізавога ўзроўняў, якія б маглі выконваць пастаўленыя задачы. Можна зазначыць, што партыйныя і дзяржаўныя пастановы на практыцы ўспрымаліся не так, як меркавалася, а некаторыя аказваліся нават малавядомымі. Шматлікія дакументальныя факты ў межах разглядаемай тэмы пацвярджаюць тэарэтычную выснову сённяшняй навукі аб тым, што сацыяльная рэвалюцыя адбылася ў малаадукаванай краіне і гэта абмежавала сацыяльныя і культурныя магчымасці як насельніцтва, так і многіх прадстаўнікоў кіруючай праслойкі. Некрытычна, дагматычна ўспрынятыя дырэктывы, спушчаныя зверху, неабходнасць іх абавязковага выканання любымі сродкамі значна ўскладнялі сітуацыю на месцах. Тым самым не сфарміравалася навукова абгрунтаваная сістэма кіравання дзяржавай. Прадбачанне аднаго не змагло замяніць шматвяковы вопыт многіх пакаленняў, імкненне людзей да самавыяўлення праз рацыянальнае вядзенне гаспадаркі.

Культура была прынесена ў ахвяру палітыцы. Савецкая ўлада, адыходзячы ад агульначалавечых духоўных і маральных каштоўнасцей, адмаўляючыся ад спрадвечнай народнай культуры, прыклала вялікія намаганні для таго, каб стварыць новую культуру. Галоўным метадам яе стала культурная рэвалюцыя, асноўным зместам – усебаковая ідэалагізацыя грамадства. Традыцыйная народная культура, носьбітам якой заставалася сялянства, поўнасцю ігнаравалася. Замест яе ўстойлівых формаў насаджаліся мітынгі, сходы, лекцыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разнастайныя масавыя кампаніі. Насычаныя ідэалогіяй і гатовымі вывадамі, яны павінны былі без асэнсавання ўспрымацца і падтрымлівацца сялянамі. Малаадукаванасць носьбітаў новай культуры стварала добрыя падставы для рэвалюцыйнага рамантызму з яго верай у лепшую будучыню.

Новая савецкая культура была неадназначна ўспрынята агульнай масай сялянства з-за поўнай неадпаведнасці духоўнаму жыццю вёскі. Нягледзячы на яе актыўнае ўкараненне, традыцыйная народная культура аказалася вельмі ўстойлівай і захавала свае пазіцыі ў сялянскім асяроддзі, у яго паўсядзённым і святочным жыцці. Эфектыўнасць новай культуры залежала ад яе ўспрымання маладым пакаленнем, якое ў асноўным на хвалі рэвалюцыйнага энтузіязму і летуценняў падтрымала яе. Гэтая акалічнасць садзейнічала расколу вёскі на “бацькоў і дзяцей”, у аснове якога знаходзіўся ідэалагічны прынцып.

Афіцыйную імперскую ідэалагічную трыяду “народнасць, праваслаўе, самадзяржаўе” замянілі новыя савецкія міфы, якія павінны былі пераарыентаваць унутраны свет людзей, традыцыйную сістэму правіл і нормаў на партыйную хвалю. Ставілася задача хутчэйшага ўкаранення міфаў аб сацыялізме “як самым гуманным і справядлівым грамадскім ладзе”, аб “двух дружалюбных класах”, “роўнасці нацый і народнасцей”, “адсутнасці эксплуатацыі” і інш. Аднак слабая матэрыяльная база афіцыйных палітыка-асветных устаноў, абмежаваныя кадравыя магчымасці не дазвалялі дзяржаве ў поўнай меры забяспечыць інфармацыйную падтрымку працэсу фарміравання новай ідэалогіі і культуры, укараненне савецкіх міфаў.

Адсутнасць прагрэсу ў развіцці сельскай гаспадаркі, недастатковая эфектыўнасць культурнай рэвалюцыі вымушалі дзяржаву бесперапынна шукаць новыя кірункі развіцця. Многія тэарэтычныя ідэі аказаліся настолькі не адаптаваныя да аб’ектыўных працэсаў, што не змаглі прыстасавацца да існуючых умоў і захаваліся толькі ў дакументах. Іншыя атрымалі надзвычай важнае значэнне. Да такіх неабходна аднесці планы кааперацыі, якія прайшлі шлях ад ідэі прасцейшай кааперацыі да вышэйшых формаў вытворчай кааперацыі ў выглядзе калектыўных гаспадарак. Не здолеўшы справіцца са шматлікімі праблемамі вёскі, зблізіць яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтарэсы з інтарэсамі дыктатуры пралетарыяту, узяць пад свой поўны кантроль аднаасобную сялянскую гаспадарку, дзяржава знайшла выйсце з крызіснай сітуацыі на шляху поўнай калектывізацыі праз разбурэнне векавых натуральных працэсаў.

Адраджэнне сельскай гаспадаркі адбывалася складана. Апіраючыся на вопыт не аднаго пакалення, сялянства не спадзявалася на рацыянальнасць дзяржаўнай палітыкі. Да гэтага далучаліся непаслядоўнасць савецкай улады ў абяцаннях і неадпаведнасць абвешчаных рэформаў аб'ектыўным эканамічным законам і надзеям вёскі. Селянін мог разлічваць толькі на сябе, сваю сям'ю, свой вопыт вядзення гаспадаркі. Самай галоўнай каштоўнасцю для яго заставалася зямля. Хлебароб хацеў адчуваць сябе поўным гаспадаром на ёй, згодна з інтарэсамі сваёй сям'і планаваць будучыню. Менавіта ў гэтым савецкая ўлада не прыйшла яму на дапамогу. Улічваючы недасканаласць крэдытнай сістэмы, слабасць кааператыўнага руху, падатковы ціск, абмежаванасць і незавершанасць зямельнай рэформы, можна зрабіць выснову, што адраджэнне сельскай гаспадаркі адбывалася ў асноўным за кошт працы сялянства, а не дзякуючы толькі дзяржаўнай палітыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС КРЫНІЦ

**I. Архіў Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь**

*1. Фонд 67.* Інстытут беларускай культуры. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 2, 3, 5, 6; вопіс 2. – Адзінка захавання: 11.

**II. Беларускі дзяржаўны архіў – Музей літаратуры і мастацтва**

*2. Фонд 53.* Я.Л.Дыла. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 111, 114, 115, 142, 143, 151, 152, 159.

*3. Фонд 238.* С.С.Бірыла. – Вопіс 1. – Адзінка захавання: 134.

**III. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці**

*4. Фонд 3.* Мінскі акруговы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 20, 24 т.2, 59, 72, 121, 149, 159, 193, 196, 234, 248, 250а, 276, 318, 332, 344, 361, 385, 389, 404, 537, 554а, 561.

*5. Фонд 4.* Слуцкі акруговы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 2, 5, 4, 6, 7.

*6. Фонд 9.* Мінскі павятовы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 6, 7, 21, 23, 32, 36, 38, 39.

*7. Фонд 23.* Чырвонаслабодскі раённы Савет дэпутатаў працоўных і яго выканкам. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 2, 4, 15, 18, 19, 20, 21, 22, 42, 59.

*8. Фонд 24.* Астрашыцка-Гарадоцкі раённы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканкам. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 5, 6, 77, 78, 79, 92, 185, 202, 226, 235, 300, 301, 311, 346, 411, 429, 471 ,605.

*9. Фонд 25.* Лагойскі раённы Савет дэпутатаў працоўных і яго выканкам. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 23, 49, 98, 116, 166, 341.

*10. Фонд 26.* Бягомльскі раённы Савет дэпутатаў працоўных і яго выканкам. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 2, 7, 19, 29, 30, 63, 71, 104, 114, 116, 302, 362, 575, 587, 602, 658, 659.

*11. Фонд 28.* Самахвалавіцкі раённы Савет дэпутатаў працоўных і яго выканкам. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 34, 52а, 71, 73, 78, 92, 95, 104, 130, 224, 362.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Фонд 37.* Беларучанскі валасны Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканкам. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 30, 43, 120, 131, 146.

*13. Фонд 302.* Фінансавы аддзел выканкама Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 3, 4, 5.

*14. Фонд 320.* Інспекцыя народнай адукацыі Мінскага акруговага выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 4, 48, 49, 64, 131, 139, 158, 159, 164, 166, 177, 187, 188, 191, 197, 204, 205, 208, 209, 211, 213, 215, 216, 217, 218, 221, 241, 431, 435, 444, 448, 495, 570, 584.

*15. Фонд 321.* Акруговы аддзел народнай адукацыі Барысаўскага акруговага выканаўчага камітэта Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 9, 10, 11, 12, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 20, 21, 23, 28, 72, 73, 74, 75, 76, 77, 80, 81, 82, 84, 85, 92, 182, 188, 202, 214, 215, 216, 218, 219, 289, 291, 310, 329, 350, 359, 368, 368а.

*16. Фонд 322.* Аддзел народнай адукацыі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. – Вопіс 1. – Адзінка захавання: 138.

*17. Фонд 323.* Аддзел народнай адукацыі выканаўчага камітэта Мінскага павятовага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 218, 219, 226, 228, 229, 238, 251, 253, 339, 364.

*18. Фонд 324.* Аддзел народнай адукацыі выканаўчага камітэта Барысаўскага павятовага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 12, 15, 26, 31, 62, 64, 67, 79, 89, 90, 91, 97, 100, 126, 128, 134, 137, 146, 147, 148, 149, 150, 151, 153, 154, 155, 156, 157, 158, 159, 160, 161, 162, 163, 164, 165, 166, 167, 171, 174, 175, 176, 177, 178, 179, 180, 181, 182, 183, 184, 185, 186, 187, 188, 189, 190, 191, 192, 193, 194, 195, 196, 199, 216, 234, 275, 381, 383, 384, 385, 386, 387, 389, 391, 393, 394, 395, 397, 398, 399, 400, 401, 402, 406, 409, 410, 412, 413, 414, 470, 652, 655, 658, 659, 666.

*19. Фонд 325.* Аддзел народнай адукацыі выканаўчага камітэта Чэрвеньскага павятовага Савета рабочых, сялянскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і чырвонаармейскіх дэпутатаў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 17, 22, 23, 32, 132, 187, 190, 216, 218.

*20. Фонд 489.* Барысаўскі акруговы прафесіянальны савет. – Вопіс 1 . – Адзінкі захавання: 5, 6, 9, 11, 14, 17, 213, 216.

*21. Фонд 585.* Беларускае культурна-навуковае таварыства Барысаўскага павятовага аддзела народнай адукацыі. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11.

**IV. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь**

*22. Фонд 4(П).* Бюро ЦК КП(б)Б. Прataколы. – Вопіс 3. – Адзінкі захавання: 5, 6, 7, 14, 15, 19, 20 ч. 1; 20 ч. 2; 22.

*23. Фонд 4(П).* ЦК КП(б)Б. Агітацыйна-прапагандысцкі аддзел. – Вопіс 7. – Адзінкі захавання: 5, 11, 19, 20, 23, 50, 53, 54, 56, 65, 78, 82, 96, 109, 113, 135, 136, 137, 147, 148, 151, 175.

*24. Фонд 6.* Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 168, 178, 184, 186, 343, 536, 541, 543, 678, 846, 872, 886, 894, 904, 921, 925, 945, 1341, 1366, 1882, 2549.

*25. Фонд 7.* Савет Народных Камісараў БССР – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 61, 73, 179, 182, 184, 267, 282, 310, 368, 423, 446, 476, 689.

*26. Фонд 15.* Пастаяннае прадстаўніцтва ўрада БССР пры ўрадзе СССР у Маскве. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 1, 15, 16, 17, 26, 28, 38, 46, 48, 50, 121, 628, 809, 953, 1590, 1766. – Вопіс 3. – Адзінка захавання: 52.

*27. Фонд 18.* Эканамічны савет пры СНК БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 2, 6, 18, 21, 33, 34, 36.

*28. Фонд 34.* Міністэрства аховы грамадскага парадку БССР – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 338, 424, 425, 429.

*29. Фонд 42.* Народны камісарыят асветы БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 93, 927, 929, 930, 931, 933, 946, 1041, 1064, 1840, 1841, 1934, 1950, 6732.

*30. Фонд 43.* Народны камісарыят харчавання БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 7, 8, 9, 10, 17, 20, 48, 49, 50, 51а, 70, 71, 72, 73, 79а, 80, 82, 87, 90, 91, 92, 93, 95, 104, 108, 109, 110, 112, 113, 119, 121, 123, 204, 205, 207, 210, 211, 212, 213, 214, 215, 216, 219, 246, 255, 284, 450, 451, 453, 481, 483, 485, 487, 490, 493, 494,495, 496, 499, 504, 505, 506, 534, 536, 891, 897, 902, 903, 904, 905, 912а.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*31. Фонд 44.* Народны камісарыят працы БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 296, 299, 1012, 1568.

*32. Фонд 48.* Народны камісарыят земляробства. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 3, 5, 13, 16, 17, 23, 25, 31, 34, 37, 38, 39, 42, 43, 57, 58, 67, 75, 91, 98, 111, 116, 117, 123, 125, 130, 145, 146, 147, 148, 149, 150, 151, 158, 169, 173, 207, 213, 214, 215, 219, 223, 231, 259, 260, 262, 267, 270, 271, 272, 288, 290, 291, 292, 293, 301, 307, 320, 323, 327, 329, 341, 345, 354, 368, 370, 372, 407, 409, 416, 426, 432, 448, 451, 452, 455, 458, 460, 476, 481, 487, 511, 512, 523, 565, 567, 623, 624, 625, 628, 641, 665, 671, 682, 684, 687, 691, 707, 709, 714, 716, 826, 830, 903, 904, 922, 964, 947, 1031, 1069, 1084, 1090, 1095, 1103, 1107, 1113, 1142, 1146, 1160, 1166, 1167, 1168, 1171, 1172, 1174, 1178, 1225, 1235, 1236, 1652, 1731, 1777, 1834, 2042, 2049, 2237, 2248, 2280, 2660, 2662, 2817, 2901, 3434, 3611, 3648, 3869, 3870.

*33. Фонд 48.* Народны камісарыят земляробства. – Вопіс 4. – Адзінкі захавання: 5, 6, 9, 19, 23, 34.

*34. Фонд 48.* Народны камісарыят земляробства. – Вопіс 5. – Адзінкі захавання: 7, 9, 13, 22, 23, 26, 48, 66, 67, 68, 72.

*35. Фонд 48.* Народны камісарыят земляробства. – Вопіс 8. – Адзінкі захавання: 4, 14, 21а, 22, 42а, 130, 136, 157, 158, 173, 174, 176, 177, 183, 208, 216, 217, 224.

*36. Фонд 53.* Беларускі трэст савецкіх гаспадарак. – Вопіс 3. – Адзінкі захавання: 3, 11, 14, 17, 38, 46, 95, 128, 213, 227. – Вопіс 5. – Адзінкі захавання: 70, 71.

*37. Фонд 93.* Народны камісарыят фінансаў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 491, 594, 1130, 5041, 5796, 6248.

*38. Фонд 101.* Народны камісарыят Рабоча-сялянскай інспекцыі. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 640, 648, 655, 1277, 1447, 1526, 1619, 1626, 2137, 2174, 2175, 2176, 2177, 2178, 2314, 2768, 2825, 2838, 3081, 3443, 3489, 3555, 3603.

*39. Фонд 101.* Народны камісарыят Рабоча-сялянскай інспекцыі. – Вопіс 2. – Адзінкі захавання: 4, 142, 143, 144, 146, 155, 170, 215, 223, 226, 235, 238, 467, 527, 528, 534, 539, 544, 567, 577, 579.

*40. Фонд 239.* Рэдакцыя газеты “Савецкая Беларусія”. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 5, 6, 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*41. Фонд 246.* Дзяржаўны беларускі трэст кінапрамысловасці “Белдзяржкіно”. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 10а, 29, 31, 33, 44, 59, 62, 93, 112, 134, 147, 172.

*42. Фонд 258.* Цэнтральны савет таварыства “Далоў непісьменнасць” БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 1а, 2. – Вопіс 2. – Адзінкі захавання: 1, 2, 5, 8, 9, 11, 12.

*43. Фонд 264.* Беларускае аддзяленне акцыянернага таварыства “Кніга – вёсцы”. – Вопіс 1 . – Адзінкі захавання: 2, 8, 70, 285, 300, 306.

*44. Фонд 306.* Цэнтральнае праўленне прафесійнага саюза работнікаў асветы. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 48, 49, 64, 96, 109, 114, 123, 127, 155, 161, 185, 187, 195, 199, 205, 206, 264, 269, 316.

*45. Фонд 307.* Цэнтральнае праўленне прафесійнага саюза работнікаў мастацтва БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 6, 11, 12, 15, 18, 22, 26, 27, 28, 29, 31, 36, 41, 44, 45, 46, 48, 49, 50, 51, 52, 62, 63, 64, 67, 68, 71, 77, 78, 79, 81, 83, 84, 85, 92, 93, 94, 97, 115, 120, 121, 122, 145, 148, 149, 161, 162, 163, 164, 165.

*46. Фонд 334.* Беларускі цэнтральны саюз сельскагаспадарчых, кустарна-прамысловых і кааператыўных таварыстваў. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 176, 233, 235, 249, 255, 257, 278, 284.

*47. Фонд 500.* Цэнтральнае праўленне прафесійнага саюза сельскагаспадарчых і лясных рабочых БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 5, 17, 18, 31, 60, 91, 113, 115, 136, 145, 184, 209, 210, 211, 212, 219, 225, 227, 258, 302, 304, 305, 400.

*48. Фонд 500.* Цэнтральнае праўленне прафесійнага саюза сельскагаспадарчых і лясных рабочых БССР. – Вопіс 2. – Адзінкі захавання: 1, 2, 17, 19, 28, 38, 39, 41, 42, 43, 68, 71, 93, 108.

*49. Фонд 645.* Выставачны камітэт БССР Галоўнага выставачнага камітэта Усерасійскай сельскагаспадарчай і кустарна-прамысловай выставы. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 5, 6, 6а, 7, 11, 12, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 25, 29, 34, 37, 41, 49, 58, 67, 74, 82, 84, 113.

*50. Фонд 647.* Пасяўны камітэт Наркамата земляробства БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 1, 9, 10, 11, 12, 13, 14, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*51. Фонд 648.* Вышэйшая зямельная камісія пры Наркамаце земляробства БССР. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 1, 1а, 1б, 132, 153, 163, 199, 248, 251, 381, 386, 407, 442, 454, 472, 492.

*52. Фонд 712.* Выязная сесія Рэўтрыбунала БССР па Мазырскаму павету. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 5, 6, 7, 9, 11, 13, 14, 15, 85.

*53. Фонд 715.* Выязная сесія Рэўтрыбунала БССР па Ігуменскаму павету ў г. Ігумене. – Вопіс 1. – Адзінкі захавання: 1, 2.

